Нацыянальны інстытут адукацыі

Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

# Беларуская мова

## Навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы

## 10–11 класы

Аверсэв

Нацыянальны інстытут адукацыі

## Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

# Беларуская мова

# Навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы

## 10–11 класы

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

*2-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2014

УДК 373.3.016:811
ББК 74.268.1Беи
Б43

*Серыя заснавана ў 2012 годзе*

**Аўтары:**
Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, А. А. Радзевіч, С. М. Якуба

Б43 **Беларуская** мова : навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы : 10—11 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — 2-е выд. — Мінск : Аверсэў, 2014. — 221 с. — (Кантрольна-вымяральныя матэрыялы).

ISBN 978-985-19-1354-7.

Выданне ўключае дыктанты і пераказы розных відаў, а таксама метадычныя каментарыі па іх правядзенні. Пададзеныя ў дапаможніку тэксты маюць пазнавальную і навучальную каштоўнасць, характарызуюцца багаццем і выразнасцю моўных сродкаў, уключаюць арфаграмы і пунктаграмы, вывучэнне якіх прадугледжана вучэбнай праграмай.

**УДК 373.3.016:811**
**ББК 74.268.1Беи**

*Вучэбнае выданне*

КАНТРОЛЬНА-ВЫМЯРАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Валочка** Ганна Міхайлаўна
**Зелянко** Вольга Уладзіміраўна
**Радзевіч** Аляксандр Аляксандравіч
**Якуба** Святлана Міхайлаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы**

**10—11 класы**

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Д. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк 04.09.2014. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,07. Ул.-выд. арк. 10,87. Тыраж 2100 экз. Заказ

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/15 ад 02.08.2013. Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, Мінск.
**E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by**
Кантактныя тэлефоны: (017) 268-09-79, 268-08-78. Для пісьмаў: а/с 3, 220090, Мінск.

УПП «Віцебская абласная друкарня».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/19 ад 26.11.2013. Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, 210015, Віцебск.

**ISBN 978-985-19-1354-7**

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012
© Афармленне. ТДА «Аверсэў», 2012

# Прадмова

Дапаможнік для настаўнікаў «Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы: 10—11 класы» падрыхтаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па беларускай мове для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (2012) і ўключае дыктанты і пераказы розных відаў, а таксама метадычныя каментарыі па іх правядзенні. Пададзеныя ў дапаможніку тэксты для дыктантаў і пераказаў маюць пазнавальную і выхаваўчую каштоўнасць, характарызуюцца багаццем і выразнасцю моўных сродкаў, уключаюць арфаграмы і пунктаграмы, вывучэнне якіх прадугледжана вучэбнай праграмай.

**Дыктант** з'яўляецца эфектыўным сродкам фарміравання арфаграфічных і пунктуацыйных уменняў і навыкаў вучняў, а таксама дзейсным спосабам развіцця маўленчых уменняў (дыктанты са змяненнем моўнага матэрыялу). У дапаможніку падаюцца разнастайныя віды навучальных дыктантаў:

*папераджальны дыктант* (магчымыя памылкі папярэджваюцца перад напісаннем слоў, сказаў, тэксту);

*тлумачальны дыктант* (памылкі выпраўляюцца вучнямі пасля запісу слоў, сказаў, тэксту);

*каменціраваны дыктант* (напісанне асобных слоў, пастаноўка знакаў прыпынку каменціруецца ў час пісьма);

*дыктант «Правяраю сябе»* (пасля запісу слоў, сказаў, тэксту ўдакладняецца правільнасць напісання асобных слоў, пастаноўка знакаў прыпынку);

*выбарачны дыктант* (выпісваюцца словы, словазлучэнні, сказы, якія адпавядаюць пэўнаму правілу);

*выбарачна-размеркавальны дыктант* (выбіраюцца і запісваюцца моўныя адзінкі на пэўнае правіла, адбываецца іх групоўка на падставе аднолькавай прыметы);

*вольны дыктант* (узнаўленне вучнямі тэксту, які па частках чытаецца настаўнікам, па памяці);

*узноўлены дыктант* (узнаўленне тэксту на аснове выпісаных апорных слоў, словазлучэнняў, граматычных асноў сказаў);

*пісьмо па памяці* (*самадыктант*) (вучні самі дыктуюць сабе тэкст, спецыяльна імі вывучаны);



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

*творчы дыктант* (прадугледжвае змену тэксту, які дыктуе настаўнік: скарачэнне, пашырэнне тэксту, замена адной граматычнай формы другой і г. д.);

*дыктант з працягам* (вучні запісваюць пад дыктоўку тэкст, потым у якасці працягу ствараюць свой тэкст, тэматычна звязаны з прапанаваным);

*дыктант-пераклад* (настаўнік дыктуе словы, словазлучэнні, сказы на рускай мове, вучні запісваюць іх па-беларуску);

*графічны дыктант* (прадугледжвае замену слоў, словазлучэнняў, сказаў умоўнымі графічнымі абазначэннямі);

*слоўнікавы дыктант* (акцэнтуецца ўвага на вывучаных арфаграмах).

**Колькасць слоў у слоўнікавых дыктантах, кантрольных дыктантах**

| Клас | Аб'ём кантрольнага дыктанта | Аб'ём слоўнікавага дыктанта |
|---|---|---|
| 10 | 145—170 слоў | 35—40 слоў |
| 11 | 170—200 слоў | 40—45 слоў |

Да канца першай чвэрці захоўваецца аб'ём тэксту дыктанта, рэкамендаваны для папярэдняга класа. Пры падліку колькасці слоў у тэксце бяруцца пад увагу загаловак, усе самастойныя і службовыя часціны мовы, выклічнікі. Калі праводзіцца кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі, аб'ём тэксту памяншаецца на 20 слоў.

У кантрольнай рабоце, якая складаецца з дыктанта і дадатковых заданняў (маўленчых, фанетычных, лексічных, граматычных і інш.), выстаўляюцца дзве адзнакі — за кожны від працы. Пры гэтым арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі, дапушчаныя пры выкананні дадатковых заданняў, уключаюцца ў лік памылак дыктанта. Калі дадатковае заданне мае творчы характар, то яно ацэньваецца ў адпаведнасці з нормамі ацэнкі творчых работ.

Навучальны дыктант з працягам ацэньваецца дзвюма адзнакамі: адна ставіцца за напісанне тэксту дыктанта, а другая — за яго працяг, які ацэньваецца згодна з нормамі ацэнкі творчых работ. Пры гэтым у залежнасці ад аб'ёму зробленай работы за працяг можна ставіць адну ці дзве адзнакі (першую — за змест і моўнае афармленне, другую — за пісьменнасць).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

**Пераказ** з'яўляецца сродкам фарміравання ў вучняў навыкаў звязнага маўлення. У дапаможнік уключаны разнастайныя віды пераказаў:

*падрабязны пераказ* (задача — дакладная і поўная перадача зместу тэксту-арыгінала з захаваннем яго жанрава-стылістычных і моўных асаблівасцей);

*сціслы пераказ* (задача — перадаць галоўнае ў змесце тэксту-арыгінала, апусціўшы дэталі, другарадную інфармацыю; тып і стыль пры гэтым звычайна захоўваюцца);

*выбарачны пераказ* (задача — пераказаць не ўвесь тэкст, а толькі пэўную частку, што мае адносіны да прапанаванай тэмы; пры гэтым стыль выказвання звычайна захоўваецца, а тып, кампазіцыя, асноўная думка, як правіла, змяняюцца);

*пераказ з дадатковым заданнем* (можа ставіць задачы як творчага характару (увесці ў тэкст апісанне прыроды, прадмета, знешнасці чалавека; дапісаць тэкст па пачатку; дапоўніць некаторымі падрабязнасцямі; напісаць заканчэнне і г. д.), так і лінгвістычнага (пераказаць тэкст з захаваннем пэўных моўных адзінак, са зменай часу, асобы ці ладу дзеяслова і г. д.)).

Метадычны каментарый да змешчаных у дапаможніку пераказаў накіраваны на фарміраванне ў вучняў наступных уменняў:

уменняў, звязаных з разуменнем зместу (слухаць і ўспрымаць тэкст, асэнсоўваючы тэму і асноўную думку, тып, стыль і жанр маўлення, логіку і паслядоўнасць выкладу, узаемаабумоўленасць тэмы і падтэм, асаблівасці аўтарскага выкладу);

логіка-кампазіцыйных уменняў (складаць план, вызначаць спосаб і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце і г. д.);

моўных уменняў (адбіраць моўныя сродкі ў залежнасці ад тыпу, стылю і жанру, задач маўлення);

умення правіць тэкст, удасканальваць напісанае.

Такім чынам, прапанаваны ў дапаможніку комплексны аналіз тэксту пераказу складаецца са:

*зместавага аналізу* (асэнсаванне загалоўка і яго суадноснасці з тэмай і асноўнай думкай або вызначэнне тэмы і асноўнай думкі тэксту, падбор загалоўка);

*стылістычнага аналізу* (вызначэнне стылю і жанру маўлення);

*тыпалагічна-кампазіцыйнага аналізу* (вызначэнне тыпу маўлення, колькасці тэм, падтэм і мікратэм, спосабу і сродкаў сувязі сказаў у тэксце);



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

*аналізу функцыянавання моўных сродкаў* (вызначэнне ролі выяўленчых моўных сродкаў, выкарыстаных аўтарам для вырашэння камунікатыўнай задачы).

**Колькасць слоў у кантрольных пераказах**

| **Клас** | **Аб'ём тэксту для кантрольнага пераказу** |
|---|---|
| 10 | 340—450 слоў |
| 11 | 450—600 слоў |

Такім чынам, змест дапаможніка «Беларуская мова: навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы: 10—11 класы» арыентаваны на вырашэнне актуальных задач сучаснай моўнай адукацыі — развіццё моўнай, камунікатыўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Змешчаныя ў дапаможніку тэксты для дыктантаў і пераказаў спрыяюць пашырэнню культурнага кругагляду вучняў, маральна-этычнаму выхаванню, развіццю цікавасці да сучаснага эканамічнага, культурнага, спартыўнага жыцця нашай краіны, ствараюць магчымасці для рэалізацыі міжпрадметных сувязей з урокамі беларускай літаратуры.

Выбар канкрэтнага віду дыктанта ці пераказу залежыць ад мэты і дыдактычнага напаўнення ўрока беларускай мовы, а прапанаваны метадычны апарат (пытанні і заданні) дапаможа настаўніку эфектыўна арганізаваць працу з моўным і маўленчым матэрыялам.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

# Навучальныя і кантрольныя дыктанты

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

# 10 КЛАС

## Роля роднай мовы ў жыцці чалавека і грамадства

### НАВУЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

◆ *Пісьмо па памяці*

Запішыце верш па памяці.

Хацеў бы я,
Каб ты не забывала,
Што мову я не для сябе бярог.
Хацеў бы я,
Каб так ты размаўляла,
Каб папраўляць цябе ніхто не змог.
Дачка мая,
Хачу, каб шлях кароткі
Да шчасця быў,
Каб ты яго знайшла,
Каб мову ты
Сваіх бацькоў і продкаў,
Як вернасць, як сумленне,
Берагла.

*Ю. Свірка.*

- Сфармулюйце асноўную думку верша.
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе.

◆ *Вольны дыктант*

Праслухайце тэкст. Запішыце яго па памяці па частках.

**Родная мова**

1. Існуюць розныя азначэнні і характарыстыкі роднай мовы.

Родная мова — тая мова, што першай засвоена ў дзяцінстве ў сямейным асяроддзі і што застаецца зразумелай на ўсё жыццё.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

2. Родная мова — гэта мова, якой чалавек валодае максімальна глыбока і поўна. На ёй лягчэй, хутчэй і прасцей мысліць, больш зручна, чым на якой-небудзь іншай мове, выказваць думкі і пачуцці.

3. Роднай называюць і мову нацыі, засвоеную з дзяцінства. Гэта мова бацькоў, мова свайго народа. Пры двухмоўі і шматмоўі роднай з'яўляецца мова штодзённых зносін.

4. Зыходзячы з гэтых меркаванняў, паняццю роднай мовы можна даць наступнае азначэнне. Роднай называецца мова, на якой чалавек мысліць без дадатковага самакантролю, з дапамогай якой лёгка і натуральна выражае свае думкі, якая служыць падмуркам яго этнічнага самаўсведамлення (*Паводле А. Міхневіча*).

- Як вы разумееце сэнс выразу ***этнічнае самаўсведамленне***?
- Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у сказах, знакаў прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў.
- Пабудуйце схему апошняга сказа тэксту.
- Ахарактарызуйце віды сувязі сказаў у тэксце.

# Маўленне

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Маўленне як працэс маўленчых зносін. Умовы маўленчых зносін

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

**Застольныя жарты**

Народнае застолле мела выпрацаваны многімі пакаленнямі этыкет, свае ўстойлівыя формулы ветлівасці.

У час бяседы гаспадар і госці нібы спаборнічалі паміж сабой у дасціпнасці. Увайшоўшы ў хату, гаваркі госць адразу ж мог сказаць: «Іду ад каміна да каміна, дзе пахне саланіна». Гаспадар запрашаў паспытаць усё, што стаяла на стале: «Госць, не дзьміся, еш, што ў місе». Для большага смеху гаспадар мог дадаць: «Ешце, госцейкі, ужывайце, толькі ў кішэні не хавайце». Размова за сталом раз-пораз пера-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

рывалася выбухамі смеху. Госць-жартаўнік, падчапіўшы відэльцам скварку, гаварыў: «Без сала куса няма жыцця ў беларуса». Пасмейваючыся, сустракалі таго, хто спазніўся: «Спазніўся пан да абеду, а вячэра не зараз». Пры развітанні госці дзякавалі гаспадарам за гасціннасць, жартавалі: «Аб'еўся куцці, не магу пайсці» (*Паводле М. Грынблата*).

• Ахарактарызуйце сітуацыю маўлення, у якой могуць быць выкарыстаны прыведзеныя ў тэксце жартоўныя выслоўі.

• Растлумачце сэнс беларускага слова ***бяседа*** і рускага ***беседа***. (*Бел.* бяседа *'збор гасцей з пачастункам'*, *рус.* беседа *'гутарка'*.) Як называюцца такія пары слоў? (*Міжмоўныя амонімы.*)

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце тэкст па-беларуску. Растлумачце напісанне **д** і **дз**, **т** і **ц**.

Канадские и американские учёные долгое время исследовали жизнь тюленей, обитающих в водах холодных морей. Было установлено, что у каждого крупного стада существует особый язык. Ластоногие обитатели полуострова Палмер при обмене информацией используют более двадцати звуков, а их сородичи в заливе Мак-Мёрдо — около тридцати. При этом тюлени, переселённые из одного стада в другое, быстро усваивали чужой диалект, но пользовались им только в новой среде. Когда же они возвращались в родные места, то снова переходили на «родной» язык (*По А. Михневичу*).

• Дайце тэксту загаловак, каб перадаць яго тэму.

• Ахарактарызуйце сітуацыю маўлення, у якой можа быць выкарыстаны гэты тэкст.

## Віды маўленчай дзейнасці, іх роля ў фарміраванні асобы. Вуснае і пісьмовае, дыялагічнае і маналагічнае маўленне

◆ *Дыктант з працягам*

Запішыце тэкст. Прадоўжыце яго, апісаўшы смайлікі, якія абазначаюць розныя эмоцыі і пачуцці.

З дапамогай якіх сродкаў у інтэрнэт-паведамленнях выражаюцца адносіны іх стваральнікаў да зместу выказвання? Галоўным чынам, праз выкарыстанне адпаведных знакаў прыпынку: клічніка,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

клічніка і пытальніка, шматкроп'я. Вышэйшым пілатажам, аднак, з'яўляецца запіс пры дапамозе знакаў прыпынку цэлых выказванняў.

Смайлікі — гэта спалучэнні графічных сімвалаў, што ўтвараюць псеўдатварыкі для адлюстравання разнастайных эмоцый і пачуццяў. Смайлікі ў вялікай колькасці выкарыстоўваюцца ў электронных лістах. Напрыклад, спалучэнне двукроп'я і закрывальнай дужкі можа абазначаць усмешку... (*Паводле С. Важніка*).

- Растлумачце паходжанне слова ***смайлік***. (*Ад англійскага* smile *'ўсмешка'*.)
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Запішыце тэкст, каменціруючы пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

У кішэні Мірона заспяваў мабільнік. Хуценька выхапіўшы тэлефон, хлопец адразу ж адчуў расчараванне. Гэта была не Васіліна. Тэлефанаваў Стас, стараста групы. Што яму спатрэбілася ў такі позні час?

— Што здарылася? — спытаў Мірон.

— Заліку заўтра не будзе! — пачулася ў тэлефоне.

— Чаму не будзе? — зусім не ўзрадаваўся Мірон.

— Выкладчык кудысьці ад'язджае тэрмінова. Сёння ўсім аўтаматам залік паставіў. Ну, як навіна?

— Цудоўная! — змрочна буркнуў Мірон (*Паводле Г. Аўласенкі*).

- Ахарактарызуйце моўныя асаблівасці дыялогу.
- Запішыце ў транскрыпцыі наступныя словы: ***адчуў***, ***расчараванне***, ***не будзе***, ***выкладчык***, ***ад'язджае***.

## Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Сэнсавая цэласнасць і тэматычнае адзінства тэксту, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі, пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Восьмы клас. Ужо крыху цеснаватыя парты. Над імі схіліліся трыццаць юнакоў і дзяўчат. Яны пішуць сачыненне на тэму «Маё найпершае жаданне».

Сяргей Бярозка, прызнаны ў школе паэт і рэдактар насценгазеты, сядзіць каля акна, праз якое відаць маладыя ліпы, пасаджаныя самімі вучнямі, калгаснае поле, атуленыя садамі хаты роднай вёскі. Ласкава свеціць сонца, у блакіце неба жаўрукі спяваюць веснавую песню. Сяргей час ад часу паглядае ў акно, потым схіляецца над сшыткам.

Ёсць у Сяргея жаданне, пра якое ён ніколі не гаварыў нават сваім найлепшым сябрам. Міне яшчэ два гады, ён атрымае атэстат сталасці і тады абавязкова паступіць ва ўніверсітэт, скончыць яго і будзе працаваць у газеце, пісаць і друкаваць вершы. Як радасна будзе бачыць табой напісаныя радкі, адчуваць, што іх чытаюць сотні, тысячы людзей! (*Паводле У. Шахаўца*).

- Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.
- Падкрэсліце ключавыя словы ў трэцім абзацы.
- Да якога тыпу маўлення адносіцца тэкст?

### ◆ *Каменціраваны дыктант*

Запішыце тэкст, каменціруючы правапіс слоў, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных гукаў.

Радаўніца — дзень, калі вясковыя могілкі становяцца люднымі і святочнымі. Сюды прыязджаюць гараджане, прыходзяць і тыя, хто назаўсёды звязаў свой лёс з роднай вёскай. Прыязджаюць і прыходзяць, каб пакласці на дарагія магілы кветкі, упрыгожыць помнік ці драўляны крыж вяночкам і ўспомніць родных людзей.

У гэты дзень у душы пасяляецца нейкае невыказнае пачуццё. Дарэмна шукаць словы, каб вызначыць яго. Можа, гэта смутак, але не той, што прымушае напаўняцца слязьмі вочы, а іншы, узнёслы і ўрачысты. Гэта таксама і боль, толькі не дакучлівы, а шчымлівы. Смутак, боль і шкадаванне па блізкіх, якія спачылі пад шумлівымі бярозамі і таполямі. З-за гэтых пачуццяў мяняешся, дабрэеш сэрцам, хочаш, каб і астатнія зразумелі твой душэўны стан і пранікліся такім жа адчуваннем (*Паводле В. Кадзетавай*).

- Дайце загаловак тэксту, каб перадаць яго асноўную думку.
- Падкрэсліце словы, якія з’яўляюцца сродкамі сувязі сказаў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Навуковы стыль маўлення: сфера выкарыстання, мэта выказвання, стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі, жанравыя разнавіднасці

◆ *Папераджальны зрокавы дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс выдзеленых слоў, пастаноўку дужак.

Сукупнасць усіх праграм для апрацоўкі інфармацыі, якія захоўваюцца ў памяці *камп'ютара*, называюць праграмным *забеспячэннем*. Паводле свайго прызначэння праграмы можна падзяліць на тры класы: *сістэмныя*, прыкладны́я і *інструментальныя*.

Сістэмныя праграмы дазваляюць чалавеку кіраваць камп'ютарам. Да іх адносяцца аперацыйныя сістэмы (кіруюць устройствамі камп'ютара), файлавыя *менеджары* (дазваляюць працаваць з файламі) і сеткавыя праграмы (кіруюць работай камп'ютара ў сетцы).

Прыкладны́я праграмы дазваляюць карыстальніку апрацоўваць розную інфармацыю. Да гэтага класа адносяцца *рэдактары* (тэкставыя, графічныя, музычныя, таблічныя), навучальныя праграмы, праграмы спецыяльнага прызначэння (*інжынерныя*, *бухгалтарскія*, *медыцынскія* і інш.), *праграмы-плэеры* (для *прайгравання* музыкі і прагляду *відэафільмаў*), камп'ютарныя гульні.

Інструментальныя праграмы прызначаны для стварэння іншых праграм. Да гэтага класа адносяцца сістэмы праграмавання (*Паводле А. Пупцава, А. Лапо*).

- Дайце тэксту загаловак, які перадаваў бы яго тэму.
- Якія лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці навуковага стылю маўлення праяўляюцца ў гэтым тэксце?

◆ *Выбарачны зрокавы дыктант*

Выпішыце з тэксту тэрміны. Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, вусна растлумачце іх лексічныя значэнні.

**Лінгвагеаграфія**

Лінгвагеаграфія — раздзел мовазнаўства, прадметам даследавання якога з'яўляюцца тэрытарыяльныя формы бытавання моўных з'яў. Лінгвагеаграфія заснавана на трох галоўных сродках выяўлення і адлюстравання мясцовых гаворак: сетцы апорных населеных пунктаў, праграме даследавання і лінгвістычнай карце.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Сеткай апорных населеных пунктаў лінгвагеаграфічнага даследавання з'яўляюцца абраныя для яго правядзення населеныя пункты на пэўнай моўнай тэрыторыі. Праграма даследавання — гэта яго мэта і канкрэтная тэматыка, якая знаходзіць сваё адлюстраванне ў лінгвагеаграфічным апытальніку. Навуковае ўпарадкаванне і апрацоўка атрыманых звестак праводзяцца шляхам стварэння лінгвістычных карт і іх збораў — лінгвістычных (дыялекталагічных) атласаў (*Паводле А. Крывіцкага*).

- Абгрунтуйце пастаноўку працяжнікаў і двукроп'я ў сказах тэксту.

## Афіцыйны стыль маўлення: сфера выкарыстання, мэта выказвання, стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі, жанравыя разнавіднасці

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце словы і словазлучэнні па-беларуску.

Кодекс, служебная записка, монография, приказ, очерк, фельетон, доверенность, диссертация, официальная автобиография, расписка, реферат, повесть, справка, характеристика, рассказ, объявление, аннотация, протокол, инструкция, научная статья, устав, заметка, рецензия, интервью, личный дневник, научный доклад, заявление, соглашение, договор, репортаж.

- Падкрэсліце назвы жанраў афіцыйнага стылю маўлення.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі і адасобленымі членамі.

**Правы і абавязкі карыстальнікаў бібліятэк**

Карыстальнікі дзяржаўных бібліятэк маюць права бясплатна атрымліваць поўную інфармацыю аб складзе фондаў бібліятэкі, кансультацыйную дапамогу ў пошуку крыніц інфармацыі, дакументы з фондаў бібліятэкі для часовага карыстання.

Асобы з аслабленым зрокам і асобы, пазбаўленыя зроку, маюць права на бібліятэчнае, інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і атрыманне дакументаў на спецыяльных носьбітах інфармацыі ў публічных бібліятэках і спецыяльных дзяржаўных бібліятэках.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Карыстальнікі бібліятэк абавязаны выконваць правілы карыстання бібліятэкай, беражліва адносіцца да бібліятэчных фондаў, у вызначаныя бібліятэкай тэрміны вяртаць дакументы, атрыманыя з гэтых фондаў (*Паводле Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь»*).

- З дапамогай якіх моўных сродкаў перадаецца прадпісальны характар тэксту?
- Сфармулюйце правіла, якому адпавядае напісанне наступных слоў: ***бібліятэка***, ***бібліятэчны***, ***спецыяльны***.

## Публіцыстычны стыль маўлення: сфера выкарыстання, мэта выказвання, стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі, жанравыя разнавіднасці

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а***, напісанне канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з устаўной канструкцыяй.

**«Сілічы»**

Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы» адкрыўся 29 студзеня 2005 года і невыпадкова лічыцца гонарам беларускай індустрыі спорту і турызму.

Трасы «Сілічаў» унікальныя. Перапад вышыні на іх дасягае больш за сто метраў, а агульная працягласць перавышае два з паловай кіламетры. Да вяршынь гор пракладзена канатная дарога, таму праблемы, звязаныя з пад'ёмам, не ўзнікаюць.

Для пачаткоўцаў цэнтр прапануе адзіны ў Беларусі трэнажор-сімулятар гарналыжнага схілу, які дазваляе авалодаць навыкамі гарналыжнай тэхнікі, не выходзячы з будынка.

Працягам здаровага і прыемнага адпачынку можа стаць наведванне лазні (іх у цэнтры тры). Парылка на камянях, басейн, пакой адпачынку гарантуюць масу прыемных уражанняў (*Паводле інтэрнэт-рэсурсаў*).

- Да якога стылю маўлення адносіцца тэкст? Абгрунтуйце сваю думку.
- Вызначце тэму і асноўную думку тэксту.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Тлумачальны зрокавы дыктант*

Растлумачце правапіс выдзеленых слоў, пастаноўку працяжніка ў першым сказе тэксту.

**Крыніца паэзіі**

Паэзія — гэта невычэрпная крыніца духоўнага *хараства* нашага народа. Яна прамаўляе на ўвесь свет нашы запаветныя мары і надзеі, вучыць высокай праўдзе і чалавечнасці, падымае душу народа і ўсё *грамадства* над *будзённа-павярхоўным* і дробязным.

Паэтычны набытак беларусаў кандэнсуе ў сваіх скарбонках перажытае народам за доўгую гісторыю існавання, *сацыяльнага* і *нацыянальнага* адраджэння, пераломных гістарычных момантаў, мірнай працы і *крывавага* змагання ў часы *ваеннага* ліхалецця.

Вятры часу могуць *пакрышыць* сцены гмахаў[1], высушыць рачулку ці занесці пяском возера. А крыніца паэзіі *бессмяротная*, бо бруіць яна з чалавечай душы, выцякае ў свет з *сэрца* народа, яго гісторыі, яго будучыні (*Паводле В. Коўтун*).

- Назавіце моўныя сродкі, характэрныя для стылю гэтага тэксту.
- Падбярыце сінонімы да наступных слоў: ***запаветныя***, ***кандэнсуе***, ***бруіць***.

## Мастацкі стыль маўлення: сфера выкарыстання, мэта выказвання, стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі, жанравыя разнавіднасці

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс ***не***, ***ні***.

Які густы пах стаіць у агародзе! Пахне сырая зямля, пахнуць бульбоўнік, гарбузнік, сланечнік, цыбуля, часнок. А наймацней пахне, заглушаючы ўсе астатнія пахі, кроп.

Чаго толькі не насаджана на градах клапатлівымі матчынымі рукамі! Бручка, морква, капуста, буракі, агуркі, памідоры, рэдзька, пятрушка. Няма нідзе голага, нічым не засеянага лапіка. Усюды зелянее, буяе, ірве зямлю агароднiна. Выпаўз на баразну, наліваецца цудадзейнымі сокамі тугі кавун. Сушыць на сонцы свае косы кукуруза. Паўнеюць, лопаюцца стручкі гароху, бобу.

---

[1] Гмах, -у, *м*. Прадмет, збудаванне вялізных памераў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

У якім бы настроі ні ішоў, не можаш не залюбавацца (*Паводле Б. Сачанкі*).

- Падкрэсліце эпітэты, метафары. Абгрунтуйце мэтазгоднасць іх ужывання ў тэксце.
- Знайдзіце ў тэксце клічныя сказы, растлумачце іх сэнсава-стылістычную ролю.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

Дзед Агей развязаў палатняную торбачку і выняў ладны кавалак сала. Адрэзаў два тонкія скрылі[1], потым пакорпаўся ў торбачцы і дастаў акраец хлеба.

— Бяры ражон[2], — сказаў дзед і працягнуў Кастусю дубчык і скрыль сала. — Ражон з сырой галіны лепшы, чым з сухой. Сырая галіна не гарыць, а сала на ёй паспявае.

Кастусь узяў ражон, уторкнуў на яго сала і ўткнуў у полымя. І вось у агні нешта запішчала, засіпела. Сала пацямнела і пачало слязіцца.

— Кладзі хутчэй на хлеб, а то ўцячэ ўсё! — закрычаў дзед на Кастуся, убачыўшы, што ў таго ўвесь тлушч з сала збягае ў агонь (*Паводле А. Кудраўца*).

- Абгрунтуйце прыналежнасць тэксту да мастацкага стылю маўлення.
- Знайдзіце ў тэксце дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні, растлумачце іх сэнс.
- Падбярыце сінонімы да наступных слоў: ***ладны***, ***пакорпаўся***, ***акраец***.

## Гутарковы стыль маўлення: сфера выкарыстання, мэта выказвання, стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі, жанравыя разнавіднасці

◆ *Выбарачны дыктант*

Запішыце словы, якія могуць ужывацца толькі ў гутарковым стылі маўлення.

---

[1] Скрыль, -я, *м.* Плоскі адрэзаны кавалак хлеба, гарбуза, дыні, кавуна, сыру і інш.

[2] Ражóн, -жна, *м.* Тут: прут, на якім смажаць мяса, сала над агнём.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Спатрэбіцца — прыспічыць, калымага — павозка, надакучаць — дапякаць, штуковіна — рэч, прычындалы — прылада, расквітацца — адпомсціць, нязручна — ніякавата, калашмаціць — рваць, маячыць — віднецца, зашыцца — схавацца, памагчы — падсабіць, апранаха — адзенне, правініцца — праштрафіцца, гамана — шум, клянчыць — прасіць, звычай — завядзёнка, здрэйфіць — спалохацца, растлумачыць — разжаваць, чыгунка — жалезка, злавіць — сцапаць.

- Як называюцца такія пары слоў?
- Падкрэсліце словы, напісанне якіх заснавана на марфалагічным прынцыпе арфаграфіі. Растлумачце іх правапіс.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

Дзед расказваў:

— Было, людцы мае, так. Я па чаравіках мог даведацца, які характар у дзяўчыны. Гаворым у час сватання, жартуем, а я на чаравікі дзяўчыны паглядаю. Потым прашу зняць пра́вы і паказаць мне. Я шавецтвам займаўся, раблю выгляд, быццам цікаўлюся фасонам. Кручу чаравік у руках, хвалю работу, а сам гляджу, што больш зношана: падэшва ці абцасікі. Калі ў чаравіку зношваецца падэшва, то гэта значыць, што дзяўчына пакорлівая. Такую можна сватаць самаму натурыстаму хлопцу. Будзе хадзіць перад мужам на дыбачках. Зношваюцца абцасікі — гэта жонка для ціхоні. Яна будзе ў сям'і верхаводзіць. Калі ж зношваюцца падэшва і абцасікі, такую можна сватаць любому. Характар у яе памяркоўны. Яна зможа і за сябе пастаяць, і ўступіць, калі трэба (*Паводле А. Пальчэўскага*).

- Дайце тэксту загаловак, які перадаваў бы яго тэму.
- Знайдзіце ў тэксце моўныя сродкі, характэрныя для гутарковага стылю.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

# Слова ў тэксце

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Гукавая абалонка слова. Стылістычныя магчымасці фанетыкі

◆ *Выбарачна-размеркавальны зрокавы дыктант*

Выпішыце з тэксту па два-тры прыклады слоў, у якіх адбываецца: а) аглушэнне звонкіх зычных; б) асіміляцыя па мяккасці; в) асіміляцыя свісцячых зычных да шыпячых.

**Конка**

10 мая 1892 года ў Мінску панавала ажыўленне. Усе спяшаліся на адкрыццё конна-чыгуначнай дарогі. Ад ахвотнікаў стаць першымі яе пасажырамі не было адбою. За першыя дні конка перавезла прыкладна пятую частку гарадскога насельніцтва.

Рух экіпажаў конкі ў размешчаным на ўзгорках Мінску дзе-нідзе ўскладняўся. Напрыклад, каб падняцца на Саборную плошчу, на Гандлёвай вуліцы ўпрагаліся дадатковыя коні. Калі і гэта не дапамагала, то пасажыры на хаду саскоквалі на брук і, самастойна адолеўшы пад'ём, зноў займалі свае месцы. Вагоны часам з'язджалі з рэек, асабліва пры паводках і пасля ліўняў, калі палатно пакрывала вада.

Конка рухалася з шумам. Фурман няспынна біў у звон, воклічамі засцерагаў прахожых, спуджаных вяскоўцаў, якія конкі ніколі не бачылі (*Паводле З. Шыбекі*).

- Растлумачце правапіс наступных слоў: ***конна-чыгуначны***, ***гарадскі***, ***дзе-нідзе***, ***Саборная плошча***, ***на хаду***, ***з'язджаць***.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах другога абзаца.

◆ *Творчы слоўнікавы дыктант*

Да наступных слоў падбярыце аднакаранёвыя словы або формы слова, каб адбывалася падаўжэнне зычных гукаў. Запішыце словы з падоўжанымі зычнымі.

Корань, медзь, памяць, колас, дзевяць, сват, ноч, багаты, Прыпяць, Карпаты, жыць, веліч, гусь, бервяно, пытаць, адчуваць, кахаць,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

маўчаць, мазь, замужам, сталь, адкрыць, ламаць, навакольны, сувязь, судзіць, збажына, падарожнічаць, мыш, натхніць, зямля, год, цішыня, бераг, лес.

- Зрабіце фанетычны разбор двух слоў з падоўжанымі зычнымі.

## Лексічнае значэнне слова. Стылістычныя магчымасці лексікі і фразеалогіі

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Запішыце пары слоў у тры слупкі: а) сінонімы; б) антонімы; в) паронімы.

Вуглаваты — вуглавы, гармонія — дысгармонія, змарыцца — адпачыць, сумны — бязрадасны, забраць — аддаць, разлад — дэзарганізацыя, расплакацца — праслязіцца, вынаходлівасць — вынаходства, чыгуначны — чыгунны, досвітак — адвячорак, заможны — бязбедны, лабаранцкі — лабараторны, бязвольны — бесхарактарны, спакойны — устрывожаны, сустрэча — расставанне, нявеста — нявестка, папярэджваць — папярэднічаць, вернасць — адданасць.

- Пракаменціруйце правапіс прыставак у словах.

◆ *Дыктант «Правяраю сябе»*

**Цешчын язык**

Пушчанскія дарогі маюць крутыя павароты, якія ў народзе называюць цешчынымі языкамі. На адной з дарог на працягу трох кіламетраў нехта налічыў аж дваццаць восем паваротаў.

Згодна з легендай, пракладваючы дарогу, рабочыя стараліся абыходзіць магутныя пушчанскія дрэвы, каб не сячы іх. Калі ў пушчу прыехаў кароль, майстар, што адказваў за будаўніцтва, спалохаўся не на жарт. Акрамя паваротаў, на дарозе сустракаліся ямы ды ўхабы.

Кароль прывёз з сабою дзвюх паненак-прыгажунь. Ехаў ён, седзячы паміж імі, і на кожным павароце караля прыціскала то да адной паненкі, то да другой. Прыгажунь гэта вельмі весяліла. На прыпынку кароль паклікаў да сябе майстра. Трасучыся ад страху ў чаканні кары, той падышоў да карэты. А кароль узнагародзіў яго падарункам, пры гэтым паўшчуваў яшчэ, што паваротаў было малавата (*Паводле В. Семакова*).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

- Падбярыце сінонімы да наступных слоў: ***дарога***, ***спалохаўся***, ***ухабы***, ***прыгажуня***, ***весяліла***, ***паўшчуваў***.
- Знайдзіце ў тэксце фразеалагізмы, растлумачце іх сэнс. (*Цешчын язык ʻкруты і небяспечны паварот на дарозеʼ; не на жарт ʻвельмі моцна* (*палохацца, трывожыцца, непакоіцца*)ʼ.)
- У трэцім абзацы знайдзіце назоўнік, змена націску ў якім прывядзе да змены лексічнага значэння. (*Ка́ра — кара́*.) Як называюцца такія словы? (*Амографы*.)
- Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі.

## Марфемная будова слова, утварэнне слоў. Стылістычныя магчымасці словаўтварэння

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Запішыце словы ў два слупкі: а) словы, якія маюць канчатак (у тым ліку нулявы); б) словы, якія не маюць канчатка.

Аддзячылі, паднос, бязлітасна, безгалосы, падкормка, празмерна, зблізку, узлесак, узрушыць, абрывіста, счышчаць, падслухваюць, зразаючы, расслаблены, расклеіць, абхапіўшы, надрэз, бязветрана, разгрузка, расчынены, расчыніўшы, узлёт, раздаць, бясцэнны, адшукаю, сшыты, бесцырымонна, рассядланы, ускраіна, ззаду, здзівілася, ссекчы, расшумеліся, узноўлены, сплесці, абсохнуць.

- Растлумачце правапіс прыставак.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце ў час напісання тэксту пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі.

Уваход у круглую замкавую вежу, шапку якой вянчалі невялічкія разны́я байніцы[1], знаходзіўся ў двары. Лесвіца, нібы вужака, вілася ўгору. Краявід, які адкрыўся з сямідзесяціметровай вышыні, сапраўды зачароўваў. Вячэрні горад нечым нагадваў вялікае вогнішча. Чорныя шапкі нізкіх дамоў, быццам пагаслыя вуглі, танулі ў яркіх промнях неонавых агнёў, што бясконцымі струменямі разбягаліся ад вежы. Ад ліхтароў, бы люстэрка, свяцілася рака,

[1] Байні́ца, -ы, *ж.* Адтуліна ў сцяне абароннага збудавання для стральбы; амбразура.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

якая тонкім звілістым шнурком перасякала горад. Былі выразна відаць нават шыльды магазінаў, яркія, рознакаляровыя (*Паводле А. Аляшкевіча*).

• Зрабіце словаўтваральны разбор наступных слоў: ***увахад***, ***краявід***, ***вогнішча***, ***пагаслы***, ***бясконцы***, ***разбягацца***, ***рознакаляровы***.

## Назоўнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце тэкст па-беларуску. Растлумачце правапіс падоўжаных зычных, вялікай літары.

**«Коммунарка»**

Фабрика *«Коммунарка»* является одним из крупнейших производителей кондитерских изделий в Республике Беларусь. Ежегодно на *предприятии* выпускается до 25 тысяч тонн сладкой продукции. Широкий ассортимент фабрики насчитывает более 300 наименований.

При производстве конфет, *шоколада*, карамели, драже на предприятии используют только натуральное, экологически чистое сырьё.

*Качество* кондитерских изделий под маркой «Коммунарка» ценят не только в Беларуси, но и за её пределами. Предприятие поставляет продукцию в Россию, США, Израиль, Грузию, Казахстан, Туркменистан, Монголию, Германию, Чехию, Кипр, Арабские Эмираты.

«Коммунарка» ежегодно достойно заявляет о себе на национальных и международных выставках продуктов *питания* и кондитерских изделий.

*Миссия* «Коммунарки» — приносить радость и удовольствие людям, сохраняя и приумножая богатые традиции кондитерского *искусства* (*По интернет-ресурсам*).

• Вусна дайце лексіка-граматычную характарыстыку выдзеленым назоўнікам (агульны ці ўласны, адушаўлёны ці неадушаўлёны, канкрэтны ці абстрактны, зборны, рэчыўны).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

**Нумізматыка**

Навука, якая вывучае гісторыю грошай, называецца нумізматыкай. Трымаючы ў руках старадаўнюю манету, мы быццам пераносімся на многія стагоддзі ў глыбіню гісторыі. Па грошах можна прасачыць, як змяняліся князі і цары, як звужаліся або пашыраліся межы дзяржаў. Можна ўявіць, як па далёкіх і небяспечных дарогах ішлі купецкія караваны, якія перашкоды яны сустракалі на сваім шляху. Таму заўсёды прыемна і цікава сустракацца з людзьмі, што збіраюць манеты. Для іх захапленне нумізматыкай — гэта не толькі гісторыя, але і сённяшні дзень, успаміны пра далёкія і блізкія вандроўкі, пра тыя краіны, дзе яны пабывалі... (*Паводле С. Тарасава*).

- Выпішыце з тэксту назоўнікі, якія: а) маюць форму толькі адзіночнага ліку; б) маюць форму толькі множнага ліку; в) утвараюць форму множнага ліку ад іншай асновы.
- У апошнім сказе тэксту падкрэсліце назоўнікі як члены сказа.

## Прыметнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Узноўлены дыктант*

Выпішыце з тэксту прыметнікі разам з назоўнікамі, да якіх яны адносяцца. Карыстаючыся выпісанымі словазлучэннямі як апорнымі, запішыце тэкст па памяці.

**Лясныя званочкі**

Вам цікава паслухаць, як звоняць у зімовым лесе званочкі? Спыніцеся і ўслухайцеся. Па вострых верхавінах хвой праплыве невялічкі ветрык, і да вашага слыху даляціць мілагучнае дзінькание. Вы пачняце ўзірацца ў густую зеляніну, аглядаць дзівосную выстаўку снежнага мастацтва і спачатку можаце нічога не заўважыць. Потым, калі яшчэ раз наведаецца лёгкі ветрык і зноў задзінькаюць таямнічыя званочкі, ваш слых ужо больш навострыцца. Тады можа паказацца, што на серабрыстай галінцы сядзяць маленькія вавёркі і варушаць пушыстымі хвастамі. Але не верце сваім вачам, падыдзіце бліжэй. Гэта не вавёркі, а вымытае снегам і загартаванае марозам лісце ма-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ладога дубка. Яно вісіць на тонкіх, але моцных нітачках і пры кожным дотыку ветру звоніць (*Паводле А. Кулакоўскага*).

• Ад трох прыметнікаў утварыце ўсе магчымыя формы ступеней параўнання. Якія прыметнікі з тэксту маюць толькі складаныя формы ступеней параўнання? Ад якіх прыметнікаў нельга ўтварыць ступені параўнання?

◆ *Творчы слоўнікавы дыктант*

Ад назоўнікаў утварыце і запішыце адносныя прыметнікі.

Настаўнік, лімон, студэнт, ліпень, аспірант, ткач, сусед, красавік, камень, таварыш, горад, салдат, матрос, чытач, парламент, раён, брат, рыбак, адвакат, таджык, снежань, Вільнюс, Адэса, Брэст, Івацэвічы, Нясвіж, Любань, Калінкавічы, Астрахань, Каўказ, Гамбург, Парыж, Нью-Ёрк, Санкт-Пецярбург, Рыга.

• Пракаменціруйце правапіс суфіксаў прыметнікаў.

## Лічэбнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Запішыце словазлучэнні ў тры слупкі: а) словазлучэнні з простымі лічэбнікамі; б) словазлучэнні са складанымі лічэбнікамі; в) словазлучэнні з састаўнымі лічэбнікамі.

Сорак пяць дыскаў, чатырохсоты кіламетр, шэсцьдзясят працэнтаў, дзве тысячы адзінаццаты год, дзесяць кропель, восемдзесят радкоў, двое генералаў, сямнаццатае стагоддзе, дзвесце трынаццаць старонак, трыста выпускнікоў, абедзве рукі, дваццаць адзін дакумент, шасцёра спецыялістаў, пяцідзясяты будынак, тры дзясятыя вострава.

• Назавіце лічэбнікі, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***».

• Падкрэсліце зборныя лічэбнікі.

◆ *Выбарачны дыктант*

Выпішыце з тэксту словазлучэнні з лічэбнікамі. Лічэбнікі запішыце словамі.

### БелАЗ

Беларускі аўтамабільны завод заснаваны ў 1948 годзе ў горадзе Жодзіне. Асноўнай прадукцыяй прадпрыемства з'яўляюцца



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

кар'ерныя самазвалы, пагрузчыкі і бульдозеры, аэрадромныя цягачы для буксіроўкі самалётаў, спецыяльныя транспартныя сродкі для падземных работ.

На БелАЗе працуюць амаль 10 тысяч чалавек. За ўсю гісторыю прадпрыемства распрацавана больш за 500 мадыфікацый кар'ерных самазвалаў грузапад'ёмнасцю ад 27 да 360 тон. Выпушчана больш за 130 тысяч адзінак кар'ерных самазвалаў, якія працуюць у 70 краінах свету. Цяпер канструктары БелАЗа распрацоўваюць звышцяжкі кар'ерны самазвал грузапад'ёмнасцю 450 тон.

Беларускі аўтамабільны завод займае 1/3 сусветнага рынку кар'ерных самазвалаў і ўваходзіць у сямёрку вядучых сусветных канцэрнаў[1] па вытворчасці кар'ернай тэхнікі (*Паводле інтэрнэт-рэсурсаў*).

- Вызначце разрады лічэбнікаў паводле значэння і будовы.
- Вызначце сінтаксічную ролю лічэбнікаў, ужытых у другім абзацы тэксту.
- Назавіце віды асіміляцыі зычных у наступных словах: ***прадпрыемства***, ***з'яўляцца***, ***пагрузчык***, ***сусветны***, ***вытворчасць***.

## Займеннік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Вольны дыктант*

Праслухайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы. Запішыце тэкст па абзацах.

Ванда з дачкою пайшлі да крыніцы, калі сонца хілілася на захад. Навязалася ў іх кампанію і суседская дзяўчынка, дзесяцігадовая Ганька. Яна ўсю дарогу шчабятала пра свае дзіцячыя радасці і праблемы, захаплялася прыгажосцю красак, збіраючы іх у букет, які пад канец падарожжа ператварыўся ў сапраўдную клумбу.

Ля крыніцы Ганька піла крыштальна чыстую ледзяную ваду, чэрпаючы яе сваімі маленькімі далонькамі, і казала, што бабуля распавядала, быццам крыніца не мае дна.

Ванда ўспомніла, як сама ў дзяцінстве сядзела на камені і глядзела на струменьчыкі вады, што вырываліся з зямлі, лёгенька штурхалі

[1] Канцэ́рн, -а, *м.* Аб'яднанне вялікай колькасці гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў пад агульным фінансавым кіраўніцтвам.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

жоўценькія пясчынкі, утвараючы маленькія сонейкі пасярод зарослага водарасцямі балотца. Адно сонейка ўтварылася ля каменя, і яно здавалася Вандзе самым прыгожым і смелым. У такія хвіліны дзяўчынка адчувала сябе часцінкаю чагосьці бязмежнага, таямнічага, добрага... (*Паводле З. Калкоўскай*).

- Падкрэсліце займеннікі як члены сказа. Вызначце разрады займеннікаў.

### ◆ *Пісьмо па памяці*

Запішыце верш па памяці.

Не сорамна любіць да слёз,
Лічыць твой боль і ўзлёт сваімі
І дзякаваць табе, мой лёс,
Што даў спазнаць цябе, Радзіма.

*А. Лойка.*

- Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку пры зваротках.
- Вызначце разрады ўжытых у вершы займеннікаў.
- Растлумачце ўжыванне формаў займеннікаў ***табе***, ***цябе***.

### ◆ *Творчы зрокавы дыктант*

Запішыце тэкст, устаўляючы замест шматкроп'яў займеннікі, разрады якіх указаны ў дужках, у патрэбнай склонавай форме.

**«Ноч музеяў»**

Міжнародны дзень музеяў адзначаецца 18 мая. У ... (*указальны*) дзень музеі бясплатна прапануюць наведаць ... (*прыналежны*) экспазіцыі і выставы. Святочны дзень перацякае ў начныя гулянні. Упершыню дзейства пад назвай «Ноч музеяў» распачалі супрацоўнікі парыжскага Луўра ў канцы мінулага стагоддзя. Мінск далучыўся да ... (*указальны*) акцыі ў 2005 годзе.

У апошнія гады свята набыло сапраўдны размах. Немагчыма перадаць ... (*азначальны*) панарамы і багацця тэатралізаваных гульняў, канцэртаў, спектакляў, ... (*адносны*) праводзяцца ў музеях. ... (*асабовы*) гасцінна адчыняюць ... (*прыналежны*) дзверы тысячам людзей, сярод ... (*адносны*) пераважае моладзь. Заўсёды цікава сустракацца ў ... (*указальны*) месцах, дзе паказваецца высокае мастацтва (*Паводле Н. Гальпяровіча, Н. Ванінай, В. Чаропкі, Т. Сівец*).

- Растлумачце правапіс спалучэнняў зычных на стыку марфем (кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Дзеяслоў (дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе): агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Папераджальны зрокавы дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс выдзеленых слоў, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

**Скачок з парашутам**

Пілот даў сігнал падрыхтавацца. Мікалай скочыў спакойна, выконваючы ўсе правілы, якім вучылі яго ў час практычных заняткаў. Самалёт зрабіў над ім круг, развітальна міргнуў сігнальнымі агнямі і, набіраючы вышыню, паляцеў назад.

Зямля была чорная і *няўтульная. На момант* зрабілася страшна апускацца ў гэтую чарнату. Мікалай *адчуў*, што хвалюецца.

Прызямліўся ён на невялічкую лясную паляну. Праўда, парашут зачапіўся за голле, і Мікалая стукнула аб сасну, але гэта *змякчыла* ўдар аб зямлю. *Не* марудзячы *ні* хвіліны, ён абрэзаў стропы[1] і *адскочыў убок*. Навокал было ціха, толькі шумелі дрэвы, нібы шапталіся тысячы людзей, і шэпт гэты зліваўся ў аднастайны шум. Мікалай зразумеў, што знаходзіцца ў вялікім хваёвым бары (*Паводле І. Шамякіна*).

- Выпішыце з тэксту па два прыклады: а) дзеясловаў у неазначальнай форме; б) асабовых дзеясловаў; в) дзеепрыслоўяў; г) зваротных дзеясловаў. Вызначце іх трыванне.
- Знайдзіце ў тэксце асабовы дзеяслоў, ужыты ў безасабовым значэнні.

◆ *Творчы зрокавы дыктант*

Запішыце тэкст, утвараючы ад дзеясловаў, што ў дужках, дзеепрыметнікі і ўжываючы іх у патрэбнай форме.

Немаўлят медсястра прыносіла ў палату па двое. Адно дзіця ляжала на правай руцэ, другое — на левай. Малыя былі акуратна (*спавіць*). Дзіўна было глядзець на іх і думаць, як пяцідзесяці сантыметраў росту хапала на ўсё цельца: і на галоўку, і на маленькія ручкі і ножкі. Усё (*схаваць*) у пялёнках. Відаць адны толькі тварыкі,

---

[1] Строп, -а, *мн.* -ы, -аў, *м. Спец.* Прыстасаванне для захопу і падвешвання грузу да крука, скабы; чалавека, грузу да купала парашута; гандолы да дырыжабля, аэрастата.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

смуглявыя ці беленькія, спакойныя ці (*пачырванець*) ад плачу, з маленькімі носікамі, бяззубымі роцікамі. Вочкі задуменныя ці сонныя, (*затуманіць*) і (*заклапаціць*) толькі тым, каб хутчэй паесці і спакойна заснуць. Жывая істота, маленькі цуд (*Паводле Т. Мушынскай*).

- Падкрэсліце дзеепрыметнікі як члены сказа.
- Растлумачце пастаноўку працяжніка і двукроп'я ў сказах тэксту.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

**Радасная сустрэча**

Першы заўважыў Лабановіча сабака Шукай. Сарваўшыся з месца і пачаўшы сваё сабачае прывітанне моцным гаўканнем, якое звычайна накіроўваецца на незнаёмага чалавека, ён раптам прыпыніўся на момант, завіляў хвастом і з радасным піскам кінуўся сустракаць госця. Спатканне з аднаго і з другога боку было самае шчырае. Шукай вішчаў, круціўся, скакаў, клаў свае лапы на грудзі Лабановіча, стараючыся лізнуць у губы. Нарэшце, гэта яму ўдалося, што яшчэ больш павялічыла яго сабачую радасць (*Паводле Я. Коласа*).

- Выпішыце з тэксту па тры дзеясловы незакончанага і закончанага трывання, утварыце ад іх дзеепрыслоўі.

## Прыслоўе: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс прыслоўяў, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі.

Сардэчнаму пачуццю не хапала пільнасці і асцярожнасці. І калі двое маладых людзей блукалі ўвечары між хат і двароў, з зорнай вышыні іх убачыў бог кахання Амур. Ні Ядзя, ні яе кавалер не заўважылі, як над імі закружыўся крылаты хлопчык з лукам у руках. І два сэрцы, не прыкрытыя ахоўным панцырам, умомант былі працяты вострымі стрэламі.

Пасланец неба вокамгненна знік, ледзь толькі начную цемру прашылі пікі маланак. Хмара, засланіўшы вышчарблены месяц, насоўвалася так імкліва, што ўцячы ад яе не было шанцу. Навокал



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

шалела першая красавіцкая навальніца. Чужаземны Амур і славянскі Пярун, дамовіўшыся на нябёсах, мабыць, вырашылі канчаткова даканаць закаханых. Хмара нібы знарок завісла над імі, глуха бубніў гром, раз-пораз мігцелі бліскавіцы, вада лілася суцэльным патокам (*Паводле В. Гардзея*).

- Падкрэсліце прыслоўі як члены сказа, вызначце іх разрады.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце ў час напісання тэксту правапіс прыслоўяў, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

**Успаміны пра выкладчыка**

Наш новы выкладчык рускай літаратуры адразу звярнуў на сябе ўвагу сваёй разважлівасцю, павагай да студэнтаў, нязвыклай «акадэмічнай» бародкай. Аўдыторыя спачатку заціхла перад ім, застыла ў чаканні чагосьці цікавага, незвычайнага. А Антон Антонавіч зусім па-хатняму пачаў гаварыць пра Чэхава і Горкага, якога бачыў на свае вочы, пра карціны Рэпіна і спектаклі Маскоўскага мастацкага тэатра. Ён асабіста ведаў многіх з тых, пра каго мы падчас чыталі ў кнігах. Хадзіў на кватэру да Луначарскага і Маякоўскага, не раз прысутнічаў на рэпетыцыях Неміровіча-Данчанкі, зрэдку трапляў на прэм'еры спектакляў, пастаўленых Таіравым і Меерхольдам. Падоўгу расказваў пра Якуба Коласа, якога называў сваім любімым паэтам і сябрам (*Паводле М. Рыбакова*).

- Зрабіце марфалагічны разбор трох прыслоўяў з тэксту.
- Сфармулюйце правіла, якому адпавядае напісанне наступных слоў: ***літаратура***, ***студэнт***, ***акадэмічны***, ***аўдыторыя***, ***тэатр***, ***кватэра***, ***рэпетыцыя***.

## Прыназоўнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Выбарачны дыктант*

Выпішыце словазлучэнні з вытворнымі прыназоўнікамі.

Ехаць спераду калоны, заўважыць наперадзе, пабудавалі насупраць гасцініцы, прабірацца праз ельнік, перамог дзякуючы настойлівасці, назвалі ў гонар дзеда, вырас між градамі, спыніліся каля возера, падлічыць пры дапамозе калькулятара, выступаў на працягу гадзіны, бегчы ўслед, устанавілі пасярэдзіне праспекта, пагутарым пасля.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

- Сфармулюйце правіла, якому адпавядае напісанне наступных слоў: ***спераду***, ***гасцініца***, ***настойлівасць***, ***праспект***.
- Зрабіце сінтаксічны разбор двух словазлучэнняў.

◆ *Творчы дыктант*

Аднавіце фразеалагізмы па апорных словах, выкарыстоўваючы прыназоўнікі.

Узор: *збываць, рукі — збываць з рук.*

Прыцягнуць, вушы; прыйсці, галава; не пускаць, парог; глядзець, рот; захварэць, пан; сесці, лужына; стаяць, душа; трапіць, кручок; гладзіць, галоўка; абуць, лапці; хістаецца, вецер; абыходзіць, вярста; выйсці, пяро; зайсці, тупік; кот, пята; сабака, сена; салома, галава.

- Вусна растлумачце сэнс фразеалагізмаў.
- Падкрэсліце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс літар ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыставак».

## Злучнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення.

**Мінская ратуша**

Ратуша — сімвал гарадскога самакіравання. Спачатку ратуша ў Мінску была драўлянай, але пасля пажару ў 1640 годзе яе адбудавалі з каменю. Тут захоўваліся меры вагі і аб'ёму, прынятыя ў горадзе, пячатка і казна. З ратушнай вежы сачылі, ці не ўзнік дзесьці пажар, а яшчэ глядзелі, ці не падбіраецца да горада вораг.

У сярэдзіне XIX стагоддзя ратушу знеслі па распараджэнні імператара Мікалая Першага. Аднак у 2004 годзе гэты помнік быў адноўлены па малюнках і чарцяжах. І сёння тут адбываюцца значныя гарадскія мерапрыемствы і ўрачыстасці.

У цёплую пару года ля ратушы дзейнічае кветкавы гадзіннік (*Паводле Н. Гальпяровіча, Н. Ванінай, В. Чаропкі, Т. Сівец*).

- Дайце характарыстыку ўжытым у тэксце злучнікам паводле саставу, ужывання і значэння.
- Падкрэсліце злучнікі, якія з'яўляюцца сродкамі сувязі сказаў тэксту.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Тлумачальны зрокавы дыктант*

Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

Над возерам плыла «Зорка *Венера*» на словы Максіма Багдановіча.

Гэту песню Ванда чула ў маленстве, калі маці нахілялася над яе калыскай і замест калыханкі ліліся гукі чароўнай *мелодыі*. *Пазней* старэйшая сястра, якая вучылася ў музычнай школе, *падыгрывала* на баяне, а маленькая Ванда *спявала*. З гэтай песняй яна ездзіла на канцэрты *мастацкай* самадзейнасці школьнікаў. Але даўно ўжо Ванда не толькі сама не спявала, але і не чула гэтай песні.

І раптам загучаў голас. Не хапала слоў, каб перадаць яго шчымлівую сілу і *недасягальную* вышыню. Ванда стаяла і не разумела, што з ёю. Зыркая поўня пазірала ёй у твар, ахутвала зіхоткім вэлюмам, вада возера зіхацела мірыядамі[1] зорак. І над усім гэтым плыў голас, які, здавалася, прабіўся праз глыбы *льдоў*, праляцеў праз сотні гадоў (*Паводле З. Калкоўскай*).

• Знайдзіце ў тэксце злучнікі, якія звязваюць: а) аднародныя члены сказа; б) часткі складаных сказаў; в) асобныя сказы; г) часткі тэксту.

• Падкрэсліце злучальныя злучнікі адной лініяй, падпарадкавальныя — дзвюма.

## Часціца, выклічнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце правапіс ***не***, ***ні***.

1. Нідзе ніякага шолаху, нідзе ні гуку (*Б. Сачанка*). 2. Я любіў сядзець на гэтай яшчэ не зашклёнай верандзе, чытаць кніжку, а то і проста слухаць пошум недалёкага лесу (*У. Шахавец*). 3. Летам, куды ні кінеш вокам, зачароўвае зялёны прастор і прыгажосць (*Р. Ігнаценка*). 4. Нідзе думкі не плывуць так спакойна, шырока, павольна, нідзе ні ў якую іншую пару года не з'яўляюцца такія эпічныя сюжэты, як на той бязлюднай палявой дарозе... (*І. Шамякін*). 5. У якім бы напрамку ад Полацка мы ні паехалі, можам сустрэць шмат новага, цікавага

[1] Мірыя́ды, -яд, *мн. Кніжн.* Незлічоная колькасць, вялікае мноства, безліч.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

і малавядомага (*І. Калілоўскі*). 6. Ні пра каго з лясных жыхароў не складзена столькі казак, як пра лісіцу-хітрыцу (*У. Ягоўдзік*).

- Зрабіце марфалагічны разбор прыназоўніка, злучніка і часціцы (на выбар).

◆ *Дыктант з працягам*

Запішыце тэкст. Прадоўжыце яго, развіўшы думку, выказаную ў апошнім сказе.

У печы ўжо разагрэлася патэльня. Цяпер у ход пайшла по́дмазка — звычайны шматок свінога сала. Яна ажно шыпіць, пішчыць, але сваю справу робіць. Вось дно патэльні шчодра абмазана растопленым тлушчам. Цяпер трэба распусціць цеста тонкім і роўным слоем па ўсёй патэльні і сунуць яе ў печ. Увачавідкі цеста пачынае падымацца, і трэба толькі ўлавіць момант, калі блін ледзь заружовіцца, каб выхапіць яго з агню і перавярнуць на другі бок. Вось пшанічны круг, апякаючы кухару пальцы, злятае з распаленай да чырвані патэльні і смачна пляскаецца на талерку.

Ах, блін! Ім можна любавацца бясконца! Але печ аж гудзе, капрызна патрабуючы новай порцыі пшанічнага цеста.

Як добра мець умелыя, спрытныя рукі! (*Паводле В. Гардзея*).

- Дайце тэксту загаловак, які перадаваў бы яго тэму.
- Падкрэсліце часціцы. Якія дадатковыя адценні яны надаюць словам, словазлучэнням і сказам?
- Знайдзіце ў тэксце выклічнік. Якую сэнсава-стылістычную ролю ён выконвае?

## Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці слоў і іх формаў

◆ *Папераджальны зрокавы дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах, пазначаных зорачкамі (*).

Дзед Максім прабег пальцамі па струнах, і гуслі загаманілі*. Загаманілі так, што, здавалася, *толькі* і чакалі, каб расказаць *пра* тое, што берaглі ў сабе*. Хата *напоўнілася* гукамі. У іх было *нешта* спрадвечнае, запаветнае і *надзвычай* зямное. *То* чуўся *подых* вясновага ветру, то пошум баравін[1], то пераразвон рачулак. І раптам у той

[1] Бараві́на, -ы, *ж.* Тут: участак баравога лесу сярод іншых парод дрэў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

подых, у той пошум, у той перазвон уліваюцца журботныя ноткі, нябачным вэлюмам агортваюць душу, прымушаюць задумацца. Нібы дзед Максім усё, што жыве ў яго душы, спрабуе пераліць у тваю. І сум, і роздум, і радасць адначасова пасяляюцца ў сэрцы.

А якія лёгкія рукі ў дзеда Максіма! Пальцы, вузлаватыя ад *паўсядзённай* сялянскай працы, нястомна бегаюць па струнах, *вышукваючы* патрэбны гук* (*Паводле Я. Пархуты*).

- Да якога тыпу маўлення адносіцца тэкст? Словы якіх часцін мовы адыгрываюць у ім галоўную тэкстаўтваральную ролю?
- Укажыце, да якіх часцін мовы належаць выдзеленыя словы.

◆ *Дыктант «Правяраю сябе»*

**Танец соснаў**

Каб сустрэць хутчэй аўтобус,
Сосны выбеглі на ўзлесак
І, як людзі з караваем,
З аблачынкамі на лапках
Запрасілі ў сваю хату
На агледзіны іх казкі.
Гэта казка — танец соснаў:
Мітусяцца яны злева,
Справа робяць круг шырокі
І, як бы дзяўчаткі тыя,
Так і млеюць, так і хочуць
За спіну другіх схавацца.
А калі карэнне раптам
Пад аўтобус наш трапляе,
Сосны ўпрысядкі ірвуцца,
Як вясковыя танцоры,
А пасля ў ручай спяшаюць,
Каб абдаць вадою станы,
Разамлелыя ў танцы...

*Я. Сіпакоў.*

- Вызначце сэнсава-стылістычную ролю дзеясловаў і прыслоўяў у тэксце.
- Падкрэсліце назоўнікі з суфіксамі ацэнкі. З якой мэтай яны ўжыты ў вершы?
- Зрабіце марфалагічны разбор наступных слоў: ***хутчэй***, ***сваю***, ***мітусяцца***, ***карэнне***, ***разамлелыя***.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

• Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце.

• У якім значэнні ўжыта ў вершы слова ***агледзіны***? (*'Агляд каго-, чаго-небудзь з мэтай знаёмства'*.)

# КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Колас жартуе

Дом Якуба Коласа стаяў некалі ў Вайсковым завулку ў Мінску. Тут быў спакойны, зацішны куток, які нагадваў вясковыя мясціны. Ля дома быў невялікі двор, на якім раслі яблыні, грушы і іншыя дрэвы. Тут, на двары, можна было часта застаць Канстанціна Міхайлавіча. Найлепшым адпачынкам ад доўгіх гадзін, праведзеных за пісьмовым сталом, ён прызнаваў фізічную працу на свежым паветры. Колас падмятаў двор, зграбаў снег зімой, даглядаў дрэвы, пілаваў і сек дровы або майстраваў што-небудзь для хатняй гаспадаркі.

Аднойчы адзін карэспандэнт запытаў у Канстанціна Міхайлавіча тут жа, на двары, аб тым, над чым зараз працуе паэт. І разгубіўся, пачуўшы жартоўны адказ:

— А хіба, браток, не бачыш? Дровы сяку!

Пакуль карэспандэнт збіраўся з думкамі і разважаў, як яму падступіцца да патрэбнай тэмы, Канстанцін Міхайлавіч з самым сур'ёзным выглядам прачытаў яму цэлую лекцыю аб тым, як трэба секчы дровы. А потым рассмяяўся і зусім іншым тонам запрасіў госця пагутарыць у хату (*Паводле М. Лынькова*). (148 слоў)

## Вясенні дзень

Той вясенні дзень быў асабліва ціхі, чысты. Уранні прашумеў кароткі цёплы дождж, і цяпер усё вакол блішчала...

Салдаты вылазілі з бліндажоў[1], хадзілі па лесе, які пах дажджом. Як не хацелася ў тыя хвіліны, каб чый-небудзь стрэл разарваў гэты мірны спакой!

Я стаяў у акопе і глядзеў на другі край лугу. Каля варожай траншэі раптам падняўся немец. Вось ён скокнуў цераз бруствер[2] і спакойна выйшаў на луг. Спыніўся, прысеў, усміхнуўся. Праз хвіліну ў яго руцэ чырванеў пучок медуніц.

---

[1] Бліндáж, -а, *м.* Укрыцце ад мін, снарадаў; крыты акоп.

[2] Брýствер, -а, *м.* Земляны насып па краі акопа для прыкрыцця байцоў ад варожага агню.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

І тут я ўспомніў, што дзесьці наперадзе ляжыць снайпер Каця Махневіч. І ўпершыню за вайну я спалохаўся за жыццё немца. А той, не спяшаючыся, быццам яго асцерагала ад смерці сама вясна, улез у акоп і знік за брустверам...

У прыцемках, калі ўжо першыя зоркі заблыталіся ў спляценні бярозавых галінак і птушкі сціхлі, у бліндаж зайшла Каця. Рыжаватая, маленькая, яна паглядзела на ўсіх вінаватымі вачыма, паклала на стол букецік медуніц і замест рапарта проста па-дзявочы сказала:

— Вясна якая прыгожая! Аж галава кружыцца.

І ўсе яе зразумелі (*Паводле В. Хомчанкі*). (164 словы)

## У зімовым парку

Алесь і Майка беглі па заснежанай алеі. Майка спрытна штурхала ствалы ялінак і, выслізнуўшы з-пад іх, імкнулася далей. А за ёй з шолахам асыпаўся з галін іскрыста-сіні снежны пыл. Асыпаўся проста на галаву, плечы, твар Алеся.

Парк быў нерухомы, абыякавы да жыцця. А гэтыя двое, не зважаючы ні на што, молада, дзёрзка і нахабна парушалі зімовы сон, зрываючы са́ваны са змярцвелых дрэў.

Алесь амаль дагнаў Майку, але яна кінулася ўбок, да белай альтанкі, узбегла па прыступках і, пацягнуўшы на сябе дзверы, знікла за імі. І Алесь адчуў нясмеласць перад гэтымі снежнымі сценамі і веліччу дрэў, міжвольна прыцішыў крокі.

У альтанцы было цёмна. Бледнаватыя плямы ляжалі на сценах і на падлозе. Стоячы пасярод павільёна, Алесь азірнуўся. Майка, відаць, нікуды не адыходзіла, бо апынулася ля дзвярэй, гатовая выскачыць з альтанкі і зноў бегчы.

І раптам узляцелі яркія, як ёлачныя цацкі, малінавыя, зялёныя, сінія, жоўтыя агні. Гэта пускалі ракеты, але здавалася, што самі зоры, звар'яцеўшы ад шчасця, пусціліся ў скокі над галінамі дрэў (*Паводле У. Караткевіча*). (163 словы)

## Парк Горкага

Хто з мінчан і гасцей сталіцы не ведае гэтага ўтульнага месца! Цэнтральны дзіцячы парк імя Горкага — першае грамадскае месца адпачынку ў гісторыі нашай краіны.

Парк быў закладзены ў 1800 годзе па ініцыятыве губернатара Захара Карнеева і называўся Губернатарскім садам. На адным з паркавых слупоў было высечана на латыні: «Пасля працы — адпачынак». У той час парк займаў плошчу амаль васямнаццаць гектараў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Уздоўж маляўнічых алей стаялі лаўкі, дзе добра было адпачываць пад задуменнае шапаценне дрэў.

З Губернатарскім садам звязана зараджэнне спорту ў Беларусі. У канцы дзевятнаццатага стагоддзя тут з'явіліся стадыён з велатрэкам, пляцоўкі для тэніса, кракета.

У 1936 годзе парк перайменавалі. Пасля вайны тут зрабілі разнастайныя зоны адпачынку для дзяцей і дарослых, атракцыёны, пабудавалі летні кінатэатр. На стадыёне праходзілі футбольныя матчы, а зімою ён ператвараўся ў лядовую пляцоўку.

Пазней на ўзвышшы былі пабудаваны планетарый, абсерваторыя і метэаралагічная станцыя. На месцы спартыўнага павільёна ўзнік крыты каток. З'явіліся трэнажоры для аматараў ролікавых канькоў.

У парку Горкага можна адпачыць ад мітусні вялікага горада, прайсціся па набярэжнай Свіслачы, згадаць разам з ракою мінулыя часы (*Паводле У. Мароза*). (170 слоў)

# Словазлучэнне і сказ у тэксце

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Словазлучэнне; віды, спосабы і сродкі сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні. Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці словазлучэнняў у разгортванні тэмы, афармленні звязнага выказвання. Сінаніміка словазлучэнняў, яе роля ў стварэнні тэкстаў рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс ***не*** і ***ні***, пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

Хто не любіць адпачынку на зялёным лузе, асабліва калі пякуць мазалі пасля пераходу і жывот ціха сумуе па кашы з салам, шклянцы чаю з салдацкім хлебам. Адпачынак быў, але не было ні кашы, ні сала, і толькі чай булькаў у кацялках.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Усе смяяліся з Ваські Шкетава, які ўжо дзве гадзіны варыў жыта з сырымі ababкамі[1]. Ён часта бегаў да рэчкі мяняць ваду ў кацялку, бо жыта не хацела станавіцца мяккім. Ніяк не ўдавалася варыва Ваську, не паддавалася жыта яго кулінарнаму майстэрству, хоць даўно павыкідваў ён з кацялка ababкі, насыпаў у жыта сушаных чарніц і ўсё варыў да дзясятага поту. Не дварыўшы, панюхаў і выліў страву з усімі прысмакамі пад лазовы куст, спаласнуў кацялок і, узяўшы кубак чаю, падступіў да кампаніі (*Паводле М. Лынькова*).

- Выпішыце з тэксту словазлучэнні, якія адлюстроўваюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове ў параўнанні з рускай.
- Знайдзіце ў тэксце фразеалагічнае словазлучэнне, растлумачце яго сэнс. (*Да дзясятага поту ʻда поўнай знямогі, стомы (рабіць, працаваць і пад.)ʼ*.)
- Зрабіце сінтаксічны разбор наступных словазлучэнняў: ***кулінарнаму майстэрству***, ***выліў страву***, ***даўно павыкідваў***.

◆ *Творчы дыктант*

Падбярыце і запішыце да прыведзеных словазлучэнняў сінанімічныя.

Узор: *бібліятэка ўніверсітэта — універсітэцкая бібліятэка.*

Кашуля з лёну, дзённік вучня, фразеалагічны слоўнік, варэнне з малін, паэма Купалы, прахадная завода, зямная кара́, трава з расою, вуліцы горада, паліца для кніг, рамонкавы адвар, сок лімона, гняздо ластаўкі, тралейбусны маршрут, фуражка салдата, гадзіннікавыя стрэлкі, цырульня для жанчын.

- Растлумачце правапіс зычных на стыку кораня і суфікса.

## Сутнасць сказа як цэласнай сінтаксічнай адзінкі. Асноўныя функцыі сказа

◆ *Узноўлены дыктант*

Выпішыце граматычныя асновы сказаў. Карыстаючыся выпісанымі словамі як апорнымі, запішыце тэкст па памяці.

**Сімвал кахання**

Узоры тканых і вышываных вырабаў — зашыфраванае апавяданне пра жыццё людзей. Як вядома, у народзе голуб і галубка сім-

[1] Аба́бак, -а, *м.* Ядомы грыб з буравата-шэрай губчастай шапкай, падбярозавік, бабка.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

валізуюць каханне. Гэтыя матывы часта сустракаюцца ў арнаменце ручнікоў.

Голуб ідзе за галубкай. Такі ўзор адлюстроўвае знаёмства хлопца з дзяўчынай. Іх каханне толькі пачынаецца.

Дзве птушкі павернуты галоўкамі адна да адной, паміж імі — букет. Тут каханне знаходзіцца ў самым росквіце.

Калі ж вышываныя птушкі глядзяць у розныя бакі, то гэта каханне без узаемнасці (*Паводле М. Кацара*).

- Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у тэксце.
- Пазначце зорачкамі (*) сказы, якім адпавядае наступная характарыстыка: сказ просты, апавядальны, няклічны, сцвярджальны, поўны, двухсастаўны, развіты, няўскладнены.

## ◆ *Дыктант з працягам*

Запішыце тэкст. Прадоўжыце яго, развіўшы думку, выказаную ў апошнім сказе.

**Траецкае прадмесце**

Кожны стары горад імкнецца мець куточак, дзе даўніну можна ўбачыць на свае вочы. Ёсць такое месца і ў Мінску. Траецкае прадмесце — узор таго, якім быў Мінск сто і болей гадоў назад.

Пасля рэканструкцыі ў васьмідзясятыя гады дваццатага стагоддзя рознакаляровыя дамкі здаваліся лялечнымі. Але час прытушыў фарбы, дамы абжыліся, і цяпер ужо без Траецкага прадмесця Мінск уявіць немагчыма.

Адрэстаўрыраваны квартал — гэта частка прадмесця, якое атрымала назву ад Траецкай гары. Жылі тут рабочыя і сяляне, рамеснікі і гандляры, чыноўнікі і ваенныя.

Сёння ў адноўленых дамах месцяцца шматлікія ўстановы, крамы, кавярні. У некаторых, як і раней, жывуць людзі. Мінчане і госці сталіцы могуць наведаць размешчаныя ў Траецкім прадмесці літаратурныя музеі (*Паводле У. Мароза*).

- Якія літаратурныя музеі знаходзяцца ў Траецкім прадмесці? (*Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Гасцёўня Уладзіслава Галубка, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры.*)
- Зрабіце сінтаксічны разбор ужытых у тэксце простых сказаў.
- Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм, растлумачце яго значэнне. (*На свае вочы (убачыць) ‘непасрэдна самому’.*)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Сінтаксічныя прыметы двухсастаўных і аднасастаўных сказаў, няпоўных сказаў

### *Папераджальны зрокавы дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс выдзеленых слоў, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі. Дайце тэксту загаловак, які перадаваў бы яго тэму.

Гукі даносіліся з пакоя маці. Ігралі на яе *фартэпіяна*. Музыка была надзвычай плаўная, ціхая, самотная*. Заслухаўшыся, хлопец наблізіўся да *расчыненых* дзвярэй. На бліскучым чорным фартэпіяна іграла госця. Пышныя валасы дзяўчыны *рассыпаліся* па плячах. Рукі, лёгкія, тонкія, трапяткія, амаль *няўлоўна* дакраналіся да клавіш.

*Адчуўшы* цёплае дыханне за спінай, дзяўчына павярнула галаву. Засяроджанасць на яе твары змянілася ценем разгубленасці.

— Гэта *паланэз* Агінскага «Журба па Радзіме», — прамовіла госця. — Ён лічыцца польскім кампазітарам, хоць нарадзіўся ў нас, у Беларусі.

Тонкія рукі дзяўчыны зноў апусціліся на чорна-белае поле клавіш. Паплыла музыка, ціхая, чароўная, самотная* (*Паводле А. Аляшкевіча*).

- Вызначце тыпы выказнікаў у сказах, пазначаных зорачкамі (*).
- Знайдзіце ў тэксце аднасастаўныя сказы, вызначце іх віды.
- Абгрунтуйце прыналежнасць тэксту да мастацкага стылю маўлення.

### *Дыктант з працягам*

Запішыце тэкст. Прадоўжыце яго, развіўшы думку, выказаную ў апошнім сказе.

**Славутыя людзі нарачанскага краю**

У Мядзельскай раённай бібліятэцы ёсць стэнд «Нашы землякі». Там размешчаны партрэты славутых людзей, якіх даў свету нарачанскі край. Хочацца назваць некаторыя імёны.

Адам Гурыновіч — беларускі паэт-дэмакрат. Родам з Кавалькоў.

Паўліна Мядзёлка — заслужаная дзеячка культуры БССР, першая выканаўца ролі купалаўскай Паўлінкі. Родам з Будслава.

Міхась Чарняўскі — гісторык, археолаг, мастацтвазнавец і пісьменнік. Нарадзіўся ў Круцы.

Марыя Захарэвіч — беларуская актрыса, народная артыстка БССР. Нарадзілася ў Навасёлках.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

А хто з беларусаў не ведае імя Максіма Танка! (*Паводле Я. Пархуты*).

- Растлумачце ўжыванне вялікай і малой літар у словах, пастаноўку працяжнікаў у сказах тэксту.
- Знайдзіце ў тэксце няпоўныя сказы. Якія члены сказа ў іх апушчаны?
- Зрабіце сінтаксічны разбор трэцяга сказа тэксту.

## Сінтаксічныя прыметы сказаў з аднароднымі членамі, знакі прыпынку

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

На вяселлі іграў сямейны ансамбль: дзве сястры, брат і муж адной з сясцёр. Чатыры музыканты на чатыры інструменты: скрыпку, акардэон, віяланчэль і бубен. Больш за ўсіх кідалася ў вочы скрыпа́чка, апранутая ў чорную сукенку, невысокая і зграбная, з вялікімі цёмнымі вачыма на белым твары і чорнымі пышнымі валасамі. У другой жанчыны таксама былі вялікія вочы і яркая белазубая ўсмешка, як і ў старэйшай сястры. Яна туліла да грудзей бліскучы ад перламутру акардэон. Брат жанчын, барабаншчык, быў яшчэ зусім малады, невысокі і шчуплы, а той, што іграў на віяланчэлі, быў здаравенны мужчына з густымі рыжымі валасамі. Сваю віяланчэль ён трымаў так жа лёгка, як яго жонка скрыпку (*Паводле У. Дамашэвіча*).

- Назавіце ўмовы аднароднасці і неаднароднасці ўжытых у тэксце азначэнняў.
- Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм, растлумачце яго сэнс. (*Кідацца ў вочы ‘прыцягваць увагу, быць асабліва прыметным’.*)
- Вызначце тып тэксту.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце тэкст па-беларуску. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

**Где работают лингвисты**

За несколько последних десятилетий лингвистика превратилась в одну из самых перспективных областей знания. Человечество входит в эпоху информации. Поэтому нужны люди, знающие принципы устройства знаковых систем, умеющие собирать, систе-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

матизировать и обрабатывать информацию. Появились новые прикладные лингвистические специальности: составление баз данных, машинный перевод.

Новые направления науки на стыке лингвистики и психологии помогают людям избавиться от страхов, противостоять стрессам и депрессиям, найти выход из сложной жизненной ситуации.

Люди с филологическим образованием обучают детей, составляют словари, издают книги, переводят с иностранных языков, работают в музеях и архивах (*По Л. Петрановской*).

- Падкрэсліце ў тэксце перакладу словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс падоўжаных зычных».

## Сінтаксічныя прыметы сказаў з адасобленымі членамі, знакі прыпынку

◆ *Дыктант «Правяраю сябе»*

Была росная раніца, прыгожая, сонечная. Уначы грукацеў гром, паласавалі неба маланкі, і паветра зрабілася чыстае і, як бярозавік, пахучае. Каця ішла з дзедам у ягады. Дзед, у саламяным брылі, закасаных па калена штанах, ступаў, як бусел, высока падымаючы ногі. І сапраўды, дзед, высокі, хударлявы, быў падобны да бусла. Каця бегла па высокай траве, уся мокрая і радасная. Прыгнуўшыся, дзед спрабаваў злавіць унучку. Яна ж адскоквала, пляскала ў ладкі і, шчаслівая, рагатала... (*Паводле В. Хомчанкі*).

- Растлумачце ўмовы адасаблення азначэнняў і акалічнасцей.

◆ *Каменціраваны дыктант*

У час напісання тэксту пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з адасобленымі азначэннямі.

Што гэта была за дзяўчына! Стройная, у белай сукенцы, якая аблягала тонкі дзявочы стан, з блакітнай стужкай у валасах, яна кружылася ў танцы, няўлоўная і хуткая, як матылёк. Андрэй убачыў яе і ледзь не аслупянеў. Ён быў упэўнены, што такой дзяўчыны няма больш нідзе. Калі Каця падышла да яго, расчырванелая і вясёлая, з прыветнай усмешкай на вуснах, Андрэй ледзь не самлеў ад шчасця. У вачах яе, як і ва ўсёй постаці, адчувалася нешта няўлоўнае, але такое блізкае, мілае і дарагое, што Андрэй адчуў: ён павінен гэта злавіць і ніколі не страціць... (*Паводле А. Чарнышэвіча*).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

- Да якога тыпу маўлення адносіцца тэкст?
- Перадайце праз транскрыпцыю вымаўленне наступных слоў: ***ледзь**, **расчырванелая**, **усмешкай**, **адчувалася**, **блізкае**, **не страціць***.

## Сінтаксічныя прыметы сказаў з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, знакі прыпынку

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі, правапіс вялікай літары.

**Агоўскія куфры**

Аднойчы журналісцкія дарогі прывялі мяне ў вёску Агова Іванаўскага раёна, дзе калісьці рабілі знакамітыя на ўсё Палессе куфры. Размаляваныя куфры — своеасаблівая з'ява ў беларускім народным мастацтве. Куфар, несумненна, з'яўляўся неад'емнай рэччу ў сялянскім побыце. Ён стаяў на ганаровым месцы ў хаце.

Калісьці ў Агове рабілі і размалёўвалі куфры амаль у кожнай хаце. Па іх прыязджалі людзі здалёк. Цяпер, аднак, куфраў ужо ніхто не робіць. Але агоўскую размалёўку, як сцвярджаюць мастацтвазнаўцы, можна ўбачыць на маленькіх сувенірных куфэрках. Іх выпускае філіял Брэсцкай фабрыкі сувеніраў.

У наш тэхнічна-машынны век мы павінны асабліва далікатна ставіцца да народнага мастацтва, да чарадзейнага ўмельства працавітых чалавечых рук (*Паводле У. Ягоўдзіка*).

- Сфармулюйце правіла, якому адпавядае напісанне наступных слоў: ***журналісцкія**, (**у**) **мастацтве**, **Брэсцкай***.
- Знайдзіце ў тэксце аднасастаўныя сказы, вызначце іх віды.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце тэкст па-беларуску. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі.

**Как учатся на лингвиста**

Филологические вузы и факультеты разнообразны. Изучать можно родной язык или иностранный. Образование может быть теоретическим (готовить к научной деятельности), педагогическим (для будущих учителей) и прикладным (например, для переводчиков).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Филологическое образование требует от человека большой работоспособности. Студентам приходится прочитывать сотни томов специальной и художественной литературы. Библиотека становится для студентов буквально вторым домом. Зато никакая другая специальность не позволяет, читая, например, роман Вальтера Скотта или Александра Дюма, готовиться тем самым к экзаменам. Особенно интересно студентам-филологам на фольклорно-диалектологической практике: они ездят по маленьким деревням в поисках сохранившихся в памяти и языке их жителей ценных для науки фактов (*По Л. Петрановской*).

- Падкрэсліце ў тэксце перакладу словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах».

## Сінтаксічныя прыметы сказаў са звароткамі, знакі прыпынку

### ◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах са звароткамі.

1. Бяры, сват, скварку (*М. Стральцоў*). 2. А ты добра спяваеш, Ірына (*Л. Левановіч*). 3. Жадаю, таварыш яфрэйтар, шчаслівага адпачынку! (*А. Жук*). 4. Што з табой, хлопчык, супакойся, міленькі... (*А. Чарнышэвіч*). 5. Давай, Стась, выйдзем на двор (*Г. Далідовіч*). 6. Вы, пане купец, павінны паставіць свечку за тое, што так лёгка абышлося (*У. Караткевіч*). 7. Ну, Лёнік, я прынёс табе яблык (*Я. Брыль*). 8. Цяжка табе будзе жыць, браце (*У. Шахавец*). 9. Будзь жа і ты, неба, заўсёды такое высокае і чыстае, як сёння! (*Б. Сачанка*). 10. О мой родны край! Хмурна пазіраеш ты з сіняга туману, што лёг па краях палёў... (*Я. Колас*).

- Падкрэсліце звароткі, выражаныя назоўнікамі ў форме былога клічнага склону.
- Зрабіце сінтаксічны разбор пятага і сёмага сказаў.

### ◆ *Каменціраваны дыктант*

Запішыце тэкст, каменціруючы пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах са звароткамі.

Дзе ты, зорка мая прамяністая,
За якія ты хмары скацілася?



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Дзе ты, радасць мая залацістая,
На якой ты сцяжынцы згубілася?
Дзе ты, зорка мая непагасная,
За якімі ты скрыта аблокамі?
Узыдзі, засвяці, зорка ясная,
Шчасцем сэрцу майму адзінокаму.

*А. Русак.*

• Назавіце віды ўжытых у вершы зваротkаў паводле будовы (неразвітыя ці развітыя).

• Падкрэсліце словы, у якіх адбываецца асіміляцыя зычных па мяккасці.

## Сінтаксічныя прыметы складаназлучаных сказаў, знакі прыпынку

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах і сказе з простай мовай.

На стале з'яўляецца вялікая эмаліраваная міска з белай гарачай бульбай. Жэня нясе на стол гарлач з малаком, а Валодзя старанна наразае мяккі хлеб. Малы Сярожка, седзячы на ложку, цэдзіць малако з вялікага фарфоравага кубка. Маці шэпча малодшаму сыну:

— Баравічкі на стол не паставілі. Збегай, сынуля.

Сярожка зрываецца з ложка і бяжыць на кухню. Там ён ляскае посудам, шамаціць паперай і неўзабаве аберуч валачэ на стол літровы слоік. Маці нажом здзірае са слоіка прысохлую на́крыўку, адклейвае ад верхніх грыбоў залітую алеем марлю, і першыя баравічкі, малюпасенькія, крамяна-жоўтыя, плывуць са слоіка ў Сярожкаву талерку. Да пахаў сырадою, свежай бульбы, жытняга хлеба далучаюцца пахі лаўровага ліста, гваздзікі, перцу (*Паводле В. Карамазава*).

• Зрабіце сінтаксічны разбор складаназлучаных сказаў.

• Растлумачце лексічныя значэнні наступных слоў: ***неўзабаве*** (*'у хуткім часе'*), ***аберуч*** (*'абедзвюма рукамі (узяць, абхапіць і пад.)'*), ***на́крыўка*** (*'тое, чым накрываюць што-небудзь зверху'*).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Творчы дыктант*

Утварыце з простых сказаў складаназлучаныя, злучыўшы часткі з дапамогай патрэбных злучнікаў.

1. Правыя дзверцы адчыніліся. З машыны вылезла Вера, сярэдняя Сцяпанава сястра (*В. Карамазаў*). 2. Мама з татам паехалі ў горад разам. Увечары мама вярнулася адна (*Я. Брыль*). 3. За бярэзнікам было поле. У канцы яго, ля другога ўзлеска, падзеленая папалам рачулкай, стаяла вёска (*В. Хомчанка*). 4. Дзяўчаты дабрылі да скрыжавання і пачалі развітвацца. Тут іх абагнала вялікая гурба хлопцаў (*Л. Кебіч*). 5. За ракой узляцелі ў вышыню ракеты, рассыпаліся. Святло іх не дасягнула гэтага берага (*І. Шамякін*). 6. Алесь штурхнуў дзверы. Яны нечакана падаліся (*У. Караткевіч*). 7. Даўно Віктар не спаў на такой мяккай пасцелі, на такіх пышных падушках. Сон адразу ж адолеў яго (*А. Пальчэўскі*).

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах.
- Разбярыце па саставе наступныя словы: ***адчыніліся***, ***увечары***, ***падзеленая***, ***абагнала***, ***рассыпаліся***.

## Сінтаксічныя прыметы складаназалежных сказаў, знакі прыпынку

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах.

**«Недасяжная»**

Дзякуючы свайму таленту і працы малады мастак стаў вядомым. Тэмпераментныя, па-майстэрску напісаныя карціны мастака ўпрыгожылі многія музеі. Некалькі работ ён падарыў музею таго горада, дзе нарадзіўся і дзе прайшла маладосць.

Асабліва захапляе наведвальнікаў карціна «Недасяжная». На фоне рамонкаў намалявана дзяўчына незвычайнага хараства. Яе погляд, думкі і летуценні скіраваны ў будучыню, якая і вабіць, і цягне да сябе, і разам з тым трывожыць, палохае.

Ля гэтай карціны заўсёды тоўпяцца людзі. Сярод іх можна ўбачыць немаладую жанчыну, рысы твару якой нечым нагадваюць дзяўчыну-летуценніцу. Жанчына, у якую калісьці быў закаханы мастак, глядзіць на сябе і круціць галавою, быццам хоча пра-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

гнаць успаміны пра тое, што было даўно і чаго не вернеш (*Паводле Б. Сачанкі*).

- Пабудуйце схемы складаназалежных сказаў з некалькімі дададзенымі часткамі, вызначце від падпарадкавання.
- Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.

◆ *Дыктант «Правяраю сябе»*

**Цудадзейныя ўласцівасці дрэў**

Нашы далёкія продкі верылі ў тое, што дрэвы, паваленыя ветрам, і дрэвы, у якія стукнула маланка, шкодзяць чалавеку*. Калі з такога дрэва паставіць хату, то яна згарыць альбо гаспадары яе неўзабаве памруць. Таму нават на пабудовы для жывёлы ці для захавання збожжа або сена такое дрэва не выкарыстоўвалася.

Паводле народных вераванняў, падчас навальніцы нельга стаяць пад дубам, бо ў ім хаваецца чорт, у якога імкнецца патрапіць маланка*. Затое таго, хто спіць на дубовых дошках, будуць абыходзіць хваробы.

Продкі верылі, што калі ля хаты пасадзіць бярозу альбо клён, то яны абавязкова прынясуць гаспадарам шчасце*. Зламаеш або ссячэш рабіну — у хату прыйдзе гора (*Паводле А. Бадака*).

- Зрабіце сінтаксічны разбор сказаў, пазначаных зорачкамі (*).

## Сінтаксічныя прыметы бяззлучнікавых складаных сказаў, знакі прыпынку

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Ларыса расчыніла акно — лагодны ветрык уварваўся ў пакой. Дыханне паветра адчуў і Валодзя.

Разам з паветрам, пругкім і чыстым, аднекуль плылі гукі гармоніка. Хтосьці ўмела іграў, жаночыя і мужчынскія галасы вялі песню. Мелодыя была знаёмай: так пяюць у вёсках на радзінах. Песня то ўзлятала, то апускалася, быццам людзі, што яе спявалі, гайдаліся на арэлях.

Валодзя адчуў, што ён сам гайдаецца над светам, ляціць сярод мора гарадскіх агнёў і бачыць маленькі агеньчык сваёй вёсачкі. Гэты агеньчык то знікае ў тумане, то нечакана ўсплывае над ім, і тады светлым становіцца Валодзеў палёт.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Ларыса стаяла ля акна, падставіўшы ветру твар, і была падобна да жанчыны, якая хацела на лёгкай яхце пераплысці вялікі акіян жыцця (*Паводле У. Саламахі*).

- Растлумачце лексічнае значэнне слова ***радзіны***. (*'Сямейнае святкаванне, звязанае з нараджэннем дзіцяці'.*)
- Пабудуйце схему складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі, вызначце від падпарадкавання.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах, сказе з простай мовай.

Васіліна жыла ў апошняй хаце выцягнутай у ланцужок вёскі. А такія людзі вельмі адрозніваюцца ад іншых вяскоўцаў: яны больш маўклівыя, засяроджаныя, рэдка звяртаюцца з якой-небудзь патрэбай да суседзяў. Выйдзеш з панадворка — побач не суседская мяжа, а шырачэзнае поле.

Васіліна была чалавекам асаблівым: яна магла на світанку гадзіну стаяць на двары як укопаная ды назіраць за марудлівым узыходам з-за лесу чырвонага як рак сонца. Тады жанчына шаптала сабе пад нос: «Божачка, як прыгожа!» (*Паводле С. Рублеўскага*).

- Растлумачце адсутнасць коскі перад ***як*** у першым сказе другога абзаца.
- Зрабіце сінтаксічны разбор бяззлучнікавых складаных сказаў.

## Сінтаксічныя прыметы сказаў з рознымі відамі сувязі, знакі прыпынку

◆ *Графічны дыктант*

Пабудуйце гарызантальныя схемы сказаў.

1. У цемені я няўдала сунуўся на кучу сушняку, ён затрашчаў, а Сярожка, бліскаючы белай галавою наперадзе, азірнуўся і зашыпеў на мяне вужакай (*В. Карамазаў*). 2. І вось на двары каля дома пачулася гаворка, і Насцечка праз акно ўбачыла, як мама яе і дзед увайшлі ў сенцы (*К. Чорны*). 3. Там, дзе канчаўся лес, гойдалася палаcа сіняватага туману, яшчэ вышэй кіпела снежная, сапраўды зімовая завіруха, а далей ззяла вечная бель альпійскіх вяршынь з пухлымі аблокамі над імі (*В. Хомчанка*). 4. Плашч мала ратаваў



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ад дажджу, і я, пастаяўшы, пакаціў памаленьку веласіпед да вёскі, што відаць была кіламетры за тры ад лесу (*Б. Сачанка*). 5. Млеюць ад гарачыні палі, цячэ, снуецца ў сонечных промнях рака, далёка на ўзмор'і тужаць аб свежым ветры караблі, і вось-вось скаланецца сонная сінь, павее вецер і пагоніць караблі ў краіну добрых сустрэч (*М. Стральцоў*).

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

◆ *Выбарачны зрокавы дыктант*

Выпішыце з верша складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак.

**Адшумела лета**

*Адшумела* лета
Роснымі лугамі,
Апусцела поле,
Нівы *адцвілі*.
Праплываюць хмары
Нізка над стагамі,
І ляцяць у вырай
З крыкам жураўлі.
Не сціхае вецер
Над *асеннім* полем,
За ракой
*Рыбацкі* аганёк патух,
І ляціць паволі
Ад старой таполі,
Кружыць над дарогай
*Белы-белы* пух.
На рабіне скачуць
Шустрыя сініцы,
Пад дажджом намоклі
Клёны і дубы,
Наліліся сокам
Спелыя брусніцы,
І каля дарогі
Выраслі грыбы...

*С. Грахоўскі.*

- Зрабіце сінтаксічны разбор выпісаных сказаў.
- Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці простых і складаных сказаў рознай будовы і прызначэння. Сінтаксічная сінаніміка

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце напісанне слоў праз злучок, пастаноўку працяжнікаў.

Царква ў Мілым была храмам-крэпасцю. Іншых тут і не будавалі чатырыста — пяцьсот гадоў назад. Вялізны прамавугольнік з тоўстымі мурамі і круглымі вежамі на кожным рагу. Вокны-байніцы ў тры ярусы, прызначаныя для ніжняга, сярэдняга і верхняга бою. Крутыя стрэхі са свінцовай чарапіцы. Нізкія дзверы, акаваныя жалезам, з кра́тамі[1], што падаюць са скляпення[2] на каменную падлогу. Вакол — роў (*Паводле У. Караткевіча*).

- Да якога тыпу маўлення адносіцца тэкст?
- Знайдзіце ў тэксце назыўныя сказы (часткі складаных сказаў), ахарактарызуйце іх сэнсава-стылістычную ролю.

◆ *Творчы папераджальны дыктант*

Праслухайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

**Пакінуты бусел**

У дзяцінстве мы назіралі адлёт буслоў у вырай. Птушкі выстраіліся ў рад, нібы школьнікі на лінейцы. Важак прайшоўся некалькі разоў перад строем, аглядаючы то адным, то другім вокам кожнага. Раптам ён спыніўся, выцягнуў шыю, узяў дзюбай аднаго бусла за пер’е і вывеў са строю.

У нас аж дух заняло: што будзе далей? Усе птушкі следам за важаком падняліся ўгору. А бусел, выведзены са строю, застаўся на зямлі. Пакуль не зніклі буслы за даляглядам, ён усё пазіраў у той бок. Потым падняўся і паляцеў на бліжэйшае гняздо.

Дома я расказаў пра пакінутага бусла. Бацька растлумачыў, што птушку прынеслі ў ахвяру, каб іншым пашчасціла ў дарозе.

Праз шмат гадоў я спытаў пра пакінутага бусла ў прафесара біялогіі. Ён сказаў, што важак пакінуў слабага бусла, каб той не замаруджваў палёту (*Паводле А. Пальчэўскага*).

---

[1] Кра́ты, крат і -аў, *мн.* Металічная рашотка на вокнах, на дзвярах.

[2] Скляпе́нне, -я, *н.* Выпуклая дугападобная столь, а таксама памяшканне пад такой столлю.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

- Замяніце сінанімічнымі сінтаксічнымі канструкцыямі:

а) дзеепрыслоўны зварот — аднародным выказнікам: Важак прайшоўся некалькі разоў перад строем, аглядаючы то адным, то другім вокам кожнага. (*Важак прайшоўся некалькі разоў перад строем, агледзеў то адным, то другім вокам кожнага.*);

б) дзеепрыметнікавы зварот — даданай азначальнай часткай: А бусел, выведзены са строю, застаўся на зямлі. (*А бусел, якога важак вывеў са строю, застаўся на зямлі.*);

в) складаназалежны сказ — сказам з простай мовай: Бацька растлумачыў, што птушку прынеслі ў ахвяру, каб іншым пашчасціла ў дарозе. (*Бацька растлумачыў: «Птушку прынеслі ў ахвяру, каб іншым пашчасціла ў дарозе».*)

- Запішыце тэкст пад дыктоўку, ужываючы сінанімічныя сінтаксічныя канструкцыі.

- Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

- Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм, растлумачце яго сэнс. (*Дух заняло ʼстала цяжка дыхаць (ад хвалявання, перажывання і пад.)ʼ.*)

# КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

## На кірмашы

Ганну захапіў кірмаш. Вось дзед стаіць, абапёршыся на воз. На плячах старога вісяць лазовыя лапці. Здаецца, не прадаў ніводнага. Немаладая жанчына трымае ў руках кашулю. Хлопчык, бялявы, з насцярожанымі вачыма, прадае шапку-кубанку.

Яўхім штурхаўся, задзірыста пакрыкваючы, каб расчысціць дарогу, спыняўся, разглядаў тавар, быццам прыцэньваўся. Усё было перамешана: каля вазоў з бочкамі драмалі каровы, наравістыя бараны і неспакойныя свінні варушыліся між вазоў з лазовымі кашамі. Усё, што можна было, сцягнулі людзі сюды, каб прадаць ці памяняць на нешта.

У краме, куды яны зайшлі, таксама ціснулася багата народу. Яўхім акінуў вачыма палічкі, на якіх было раскладзена і развешана мноства ўсякіх рэчаў. Ганна заўважыла, што яму хочацца зрабіць ёй падарунак. Яўхім накінуў Ганне на плечы хустку, падвёў да люстра, прыбітага да сцяны. Калі Ганна зірнула ў люстра, твар яе заяснеў. Якая квяцістая, якая вогненная хустка! Жанчыны, што стаялі за Ганнай, глядзелі з зайздрасцю, гаманілі, хвалілі. Ганна ж, ашчасліўленая,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

замілаваная, не магла вішнёвых вачэй сваіх адарваць ад люстра. Яўхім, зачараваны, задаволены, пайшоў да прадаўца (*Паводле І. Мележа*). (162 словы)

**Дом-замак**

Белы як снег дом-замак адкрыўся перад Сцяпанам і Ілонкай адразу за гаем. З высокімі калонамі, вежамі на вуглах, цёмнымі нішамі, у якіх стылі на холадзе мармуровыя статуі. Сцяпан ступіў на прыступкі ганка, за ім падалася і Ілонка. У бліскучым мармуры яны ўбачылі сябе, нібы ў люстэрку. Хлопец пацягнуў за бронзавую ручку дзвярэй, і яны, вялікія, цяжкія, адчыніліся. Доўгі, з высокай столлю калідор дыхнуў пахам расплаўленага воску, парфумы і паточанага шашалем дрэва.

У прасторнай зале ў вялікіх акварыумах, што стаялі ўздоўж сцен, кіпела жывое срэбра і золата, мігцелі ярка-чырвоныя агеньчыкі. Столь у зале была шкляная, і сонечныя промні зверху прашывалі наскрозь гэтыя акварыумы, рассейваліся, трапяталі. На дне, засыпаным жвірам, расла зялёная траўка, стаялі складзеныя з каменьчыкаў і ракавінак вежы, домікі.

Трапіць сюды, у гэта казачнае царства, для Ілонкі было запаветнай марай. Дзяўчына апусціла ў акварыум руку і паспрабавала злавіць чырвонага мечаносца. А потым крыкнула працягла, як у лесе, абхапіла Сцяпана за шыю і пацалавала ў шчаку. У падзяку за тое, што ён расчыніў перад Ілонкай непрыступныя дзверы гэтага палаца (*Паводле В. Хомчанкі*). (169 слоў)

**На вуліцах Каіра**

Ці былі вы калі-небудзь у лазні? Ці дыхалі гарачым паветрам, ад якога, здаецца, займае дух? Такое адчуванне было ў турыстаў, калі яны трапілі ў Каір.

Сонца пякло так, быццам сабрала ўсю сваю гарачыню і спусцілася бліжэй да зямлі. Хоць бы воблачка яго прыкрыла, хоць бы ветрык падзьмуў! Вогненны шар над галавой і распалены асфальт пад нагамі.

Аўтобус імчаў па вуліцах Каіра. Сярод суцэльнага патоку чорнабелых машын рухалася каляска на двух вялікіх колах. На калясцы ляжала агародніна і сядзеў хлопчык. Цягнуў яе маленькі ішак з пацеркамі на шыі.

Раптам усе машыны спыніліся: дарогу павольна пераходзіў вярблюд. На яго гарбе было прымацавана сядло, пакрытае яркімі



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

посцілкамі. На самым версе сядзеў чалавек і горда глядзеў уніз, на людзей і машыны. Не спяшаючыся, вярблюд зайшоў за дамы, і паток машын сарваўся з месца.

Ля тратуараўраслі пальмы. А на тратуарах, нізка схіліўшы да зямлі галовы, стаялі на каленях мужчыны. Быў час малітвы.

Потым аўтобус паехаў уздоўж Ніла, берагі якога былі ўзяты ў граніт. Па рацэ плылі лодкі, гружаныя цюкамі з бавоўнай (*Паводле Г. Васілеўскай*). (170 слоў)

**Прызнанне ў каханні**

Студэнты разыходзіліся з клуба ўначы, абуджаючы сонную цішыню гарадскіх вуліц. Алёшка праводзіў Рэню, нёс самавар. Гэты неад'емны атрыбут старога сямейнага дабрабыту патрэбны быў па ходу п'есы, і яго прынесла Рэня. Пракляты самавар займаў абедзве рукі, замінаў хадзьбе і размове. А сказаць Алёшка збіраўся нешта важнае, сур'ёзнае, пра што гавораць звычайна адзін раз у жыцці. Рэня прыглядалася да няскладнай фігуры хлопца, да ўчэпістых рук з самаварам, і ў куточках яе вуснаў хавалася ледзь прыкметная ўсмешка. Алёшка спачатку расказваў пра захаванне энергіі, потым перайшоў да каменнага вугалю...

Спыніліся ля дома, дзе жыла Рэня. Алёшка замяўся, потым, паглядзеўшы проста ў яе вочы і пачырванеўшы, прашаптаў:

— Я цябе кахаю.

Ярка ўспыхнулі вочы дзяўчыны, нібы сінь расплылася ў пяшчотнай цеплыні. Рэня раптам абняла Алёшку, пацалункам апаліла яго вусны, выхапіла з рук самавар і хутка знікла за дзвярыма.

Алёшка стаяў ашаломлены, шчаслівы. Усміхнуўся, заўважыўшы свае рукі. Як трымалі яны самавар, так і засталіся сагнутымі, нібы акамянелі. Хлопцу здалося, што ўсё ўсміхаецца яму: і ранішняе сонца, і ветлівыя клёны, і птушкі ў язмінавых зарасніках (*Паводле М. Лынькова*). (170 слоў)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

# 11 КЛАС

# Культура вуснага і пісьмовага маўлення

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Возьмите чашу терпения, влейте туда полное сердце любви, бросьте две пригоршни щедрости, посыпьте добротой и добавьте как можно больше веры и всё это хорошо перемешайте. Потом намажьте на кусок отпущенной вам жизни и предлагайте всем, кого встретите на своём пути (*В. Большаков*).

- Абгрунтуйце напісанне дзеясловаў загаднага ладу.
- Падрыхтуйце віншаванне са святам, выкарыстоўваючы ключавыя словы з тэксту.

# Правільнасць маўлення

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Арфаэпічныя нормы. Акцэнталагічныя нормы. Лагічны націск

◆ *Лічбавы зрокавы дыктант*

Запішыце парадкавы нумар слова з прапанаванай пары (1 ці 2), якое адпавядае правілам беларускага вымаўлення.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Падно[сч]ык — падно[шч]ык, тка[чст]ва — тка[цт]ва, углядае[шс'а] — углядае[с'с'а], бязлю[дз'дз'э] — бязлю[ддз'э], Брэ[стч]ына — Брэ[шч]ына, ру[шн']ік — ру[чн']ік, [ацц]адзіць — [адц]адзіць, рафіна[д] — рафіна[т], [с'в']ітанне — [св']ітанне, кантра[стн]ы — кантра[сн]ы, жані[дз']ба — жані[ц']ба, до[шч] — до[ждж], нясві[жс]кі — нясві[с]кі, у лы[сц]ы — у лы[жц]ы, [сч]арсцвець — [шч]арсцвець, перакла[чч]ык — перакла[дч]ык, яе[шн]я — яе[чн]я, абе[дз'в'э] — абе[дзв'э], [зг']інуць — [з'г']інуць.

- Назавіце словы, якія адрозніваюцца вымаўленнем у рускай і беларускай мовах.

### ◆ *Пісьмо па памяці*

Вывучыце і запішыце па памяці верш.

Не трэба жыць, як набяжыць.
Так жыць на свеце трэба,
Каб да апошніх дзён любіць
Людзей, зямлю і неба.
Не падаць у сляпы адчай,
Як *затрашчаць* надпоркі,
Знаць, што жыццёвы каравай
Бывае часам горкі...
Пад знакам шчасця і бяды
Так жыць на свеце трэба,
Нічым каб не зняславіў ты
Людзей, зямлю і неба.

*А. Грачанікаў.*

- Раскажыце пра асаблівасці вымаўлення беларускіх гукаў і іх спалучэнняў.
- Падкрэсліце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае. Зрабіце фанетычны разбор выдзеленага слова. Растлумачце правапіс.

### ◆ *Каменціраваны зрокавы дыктант*

Зрабіце арфаграфічны запіс слоў.

Узор: *бара[дз']ба — барацьба.*

Заплю[шч]ыць вочы, [жж]аліцца над прыродай, а[ў]ганская аўчарка, поўнае бязво[дз'дз'э], [шч]аслівы білет, бе[сс]ардэчны чалавек, летні а[т]пачынак, [жж]аць жыта, у бацькавай ло[цц]ы, калмы[ц]-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

кія песні, родная Лагой[шч]ына, маладая [з'м'э]на, сустракае[с'с'а] з ім, ра[шш]піліць гузік, [дз'в'э]сце рублёў, пя[шч]аны бераг, сустракаць з рада[с'ц'у], ра[с'п']іліць дошку, вёска Зале[с'с'э], мокрае лі[с'ц'э], францу[с]кія духі, ма[чч]ына песня.

◆ *Выбарачны зрокавы дыктант*

1. Выпішыце словы, у якіх націск падае на першы склад.

Арахіс, атлет, прыяцель, эксперт, лопух, фартух, вадзяны, ласавацца, слабы, заінець, шэсцьдзясят, статут, цяжар, каменны, хабар, пяцьдзясят, адзінаццаць, бульбяны, валавы, мысленне, удалы, крапіва, наспех, малы, пасланец, беларусы, атлас (тканіна), індустрыя, кабура, садавіна, існуе, выпадак.

- Растлумачце правапіс запісаных слоў. З трыма выпісанымі словамі складзіце словазлучэнні.
- Зрабіце фанетычны разбор слова ***заінець***.

2. Выпішыце словы, у якіх правільна пастаўлены націскі.

Перагні́сці, ві́давы, алфа́віт, інструме́нт, пра́дзедаўскі, наві́на, мы́сленне, дзеячы́, дыспа́нсер, грамадзя́нін, Скары́на, амуле́т, вусы́, набы́ты, ква́ртал, разы́граны, палуза́ць, паўфу́нта.

- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***прадзедаўскі***. Абгрунтуйце напісанне.

◆ *Слоўнікавы зрокавы дыктант*

Запішыце словы. Пастаўце націскі.

Вестэрн, феномен, дагавор, арахіс, чатырнаццаць, жалюзі, квартал, нібы, расхіснуты, імя, сантыметр, пажылы, еўразійскі, хаос, упрыкуску, дакумент, рабрына, магазін, гнісці, каўчук, лопух, стары, статуя, тоўсты, жыхар, нікуды, кіламетр, алкаголь, балавацца, форзац, прынята, дапрызыўнік, цэмент, жаўна, загавор, ліфты, спіна, хрысціянін.

- Назавіце арфаграмы, якія адпавядаюць фанетычнаму прынцыпу напісання. З двума словамі складзіце сказы.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

# Арфаграфічныя нормы

## *Напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе*

### Правапіс галосных *о, э, а*

◆ *Выбарачны дыктант*

Выпішыце словы, у якіх пішацца літара **э**.

Рэстаўратар, тунэль, Сіднэй, прэзідэнт, рэцэнзія, маэстра, дэфект, чэмпіён, почырк, Герцэн, канцылярыя, аранжарэя, прэтэндэнт, рэмень, жылет, інтэрнат, рызіна, інтэлігенцыя, дрыvotня, шніцаль, дывізія, Шэкспір, інтэрнэт, акампанемент, камюніке, вестыбюль, брызент, раменьчык.

- Абгрунтуйце напісанне арфаграм.

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Запішыце словы, размеркаваўшы іх па групах у залежнасці ад напісання **э** ці **а** не пад націскам.

Чачэрск, камп'ютар, Эйнштэйн, лідар, рэферэндум, дырэктар, Шчадрын, шчабятуха, куфар, вэнджаны, Юпітэр (планета), дрэсіроўшчык, хрэстаматыя, падчарыца, Драгічын, Рэнуар, малодшанькі, асэнсоўваць, ордар, рэзідэнцыя, шарэнга, Чачня, жэлацін, разынка, пэйджар, рэклама, гардэроб.

- Абгрунтуйце напісанне арфаграм. З трыма словамі складзіце словазлучэнні.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Перад запісам сказаў пракаменціруйце напісанне слоў з арфаграмай «Правапіс **о**, **э**, **а**».

1. А кучаравыя снапочкі, над ім злучыўшы каласочкі, стаяць спакойна і маўкліва (*Я. Колас*). 2. Дзе ні глянеш — бары цёмнарусыя — беларускай адзнака красы (*А. Гурло*). 3. У глыбінях чалавечай існасці слоў няма (*А. Разанаў*). 4. Там, дзе гулі пшаніцы і жыты, стаяць снапы, як рыжыя браты (*П. Панчанка*). 5. З гадамі трэба не толькі старэць. З гадамі трэба мудрэць (*Г. Бураўкін*). 6. Мы скванна цягнемся к старым паэтам, каб хоць душой у прошлым патануць (*М. Багдановіч*). 7. Людзі трымаюць ордар так, як трымаюць ордэн



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

(*А. Вярцінскі*). 8. Культура нацыі без культуры роднай мовы — нонсэнс, бяссэнсіца (*Н. Гілевіч*).

- Растлумачце лексічнае значэнне наступных слоў: ***існасць***, ***нонсэнс***.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў другім сказе.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Идея Скорины сделать книги Священного писания общедоступными для простых людей на то время была очень смелой. В то время церковь считала толкование текстов Ветхого и Нового Завета только делом священнослужителей.

Скорина способствовал перелому в сознании и характере мышления своих соотечественников. Он открыл перед ними возможность богословствовать и философствовать независимо от авторитетов церкви (*По изданию «Я — гражданин Республики Беларусь»*).

- Абгрунтуйце напісанне арфаграмы «Правапіс ***а***, ***о***, ***э***».
- Назавіце словы, якія адрозніваюцца націскам у рускай і беларускай мовах.

## Правапіс галосных *е*, *ё*, *я*

◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Аметыст, метал, Мендзялееў, памяць, медуніца, Нясвіж, пояс, велічэзны, сертыфікат, цяслярскі, Яўфрат, цяжкавата, каляндар, меліса, сяржанцкі, севяране, выменяць, песняры, дробязь, Палесціна, замець, менталітэт, Бесядзь, каменціраваць, сектант, вяшчунства, ярына, бісектрыса, цецераня, повязь, колер, беркуцяня, абанемент, святкаванне, без радасці, аповед, метровы, выверцець.

- Растлумачце напісанне арфаграмы «Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***».
- Зрабіце фанетычны разбор слова ***Нясвіж***.

◆ *Выбарачны слоўнікавы дыктант*

Выпішыце словы, у якіх не пад націскам пішацца ***я***.

Пярсцёнак, галерэя, Герадот, цімафееўка, Яраслаў, летаргічны, язычніцкі, сеяць, велізарны, Вялікабрытанія, кефір, сямнаццаць, перасяленец, гледачы, повязь, колер, лебедзяня, егерскі, Прыпяць,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

святкаванне, квецень, няўпэўненасць, яфрэйтар, габелен, Яўгеньева, віцязь, рокерскі.

- Растлумачце напісанне літары **я** ў словах.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***язычніцкі***.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам сказаў растлумачце правапіс **е**, **ё**, **я** ў словах.

1. Клапотна шчэбеты нясуцца і моўкнуць позна вечарамі (*Я. Колас*). 2. Чуваць, калі матыль сцяблінкі траў калыша, як слізкі вуж паўзе і крыецца ў змрок (*А. Міцкевіч*). 3. Пароль неўміручасці — родная мова (*П. Макаль*). 4. У цішы так хораша і ясна. Не шкада, што кружыцца дачасна зелянцовы лісцік нада мной (*Я. Янішчыц*). 5. Добра ў садзе хадзіць, сустракаючы сонечны ранак, чулым сэрцам лавіць звонкі голас дзявочых вяснянак (*П. Панчанка*). 6. Мама спіць, і з ёй заснулі казкі, пераказаныя тысячу разоў (*Ю. Свірка*). 7. Хай рунее ў сэрцы поле — поле сённяшніх трывог, поле памяці і болю, поле мудрых засцярог (*В. Гардзей*).

- Падкрэсліце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс звонкіх і глухіх зычных».
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне слоў, у якіх праяўляецца аканне і яканне.

Біблія — крыніца еўрапейскай культуры. Асобныя часткі Бібліі створаны раней за паэмы славутага Гамера. Гэта самая галоўная кніга, якая даносіць да нас праз тысячагоддзі мудрасць жыцця. Але стаўленне да Бібліі не было аднолькавым. Адны лічылі яе вялікім адкрыццём, Словам Божым, святлом хрысціянскай веры. Другія думалі, што яе тэксты з'яўляюцца падманам, атрутай для народа. Трэція глядзелі на тэксты прагматычна. У міфах, паданнях, прапаведзях шукалі супярэчнасці, недакладнасці, крытыкавалі. Для большасці ж культурных людзей Біблія — шэдэўр сусветнай культуры, кніга, якая натхняла і натхняе славутых паэтаў, мастакоў, кампазітараў на стварэнне сваіх твораў (*Паводле С. Несцяровіча*).

- Абгрунтуйце напісанне ўласных назваў.
- Падкрэсліце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў галосных».



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Правапіс галосных у складаных словах

◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Чарнавочка, фотатэлеграма, матацыкл, рэдкалессе, фотакопія, стагалосы, кантрамарка, крывасосны, політэхнічны, санцапёк, заканадаўчы, фотаздымак, полівітаміны, мовазнаўства, шклопакет, кіламетр, Новалукомль, чорнавалосы, восемсот, гарнарудны, шырокаэкранны, многаатамны, таўстасценны, малочнакіслы, процілеглы, рознашэрсны, высокаідэйны, доўгажыхар, тарфарэз, вострасюжэтны, чарнаплодны, штогадовы, манаграфія.

- Растлумачце напісанне арфаграм у складаных словах.
- Зрабіце марфемны разбор слова ***шырокаэкранны***.

◆ *Творчы дыктант*

Утварыце на аснове прапанаваных словазлучэнняў складаныя словы.

Узор: *шэрыя вочы — шэравокі.*

Усю ноч, шэсць соцень, светлыя валасы, нарыхтоўка збожжа, падобны на змяю, устойлівы да агню, склад зерня, перавозка грузаў, поўная ўлада, нарыхтоўка збожжа, казка па радыё, зорка кіно, шэсць знакаў, форма слова, ролік па відэа, устойлівы да марозу, даваць рэкламу, спартыўная зала, браніраваны поезд, насіць мёд, чорныя бровы, секчы дровы, тысяча гадоў.

- Растлумачце напісанне арфаграм у складаных словах.
- З трыма запісанымі словамі складзіце словазлучэнні.

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Выпішыце ў асобныя групы словы, у якіх пішацца ***я*** і ***е*** не пад націскам.

Заходнеславянскі, жыццядайны, вербалоз, краявід, Святаслаў, кінематограф, святлацень, маятнікападобны, легкаплаўны, старажытнаегіпецкі, жыццесцвярджальны, тэлефестываль, сямібальны, секундамер, зеленавокі, колерамузыка, шэсцьдзясят, сінякрылы, штомесячны, сямібор’е, усеславянскі.

- Абгрунтуйце напісанне арфаграм у складаных словах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем сказаў растлумачце правапіс галосных у складаных словах.

1. Навокал рэчкі спакой ляны. На даляглядзе цвітуць ляны (*Д. Бічэль*). 2. Першая бель — прывітанне доўгачаканай гасцюхі-зімы (*М. Зарэцкі*). 3. О, якія белалозы каля Прыпяці сівой! Акрапілі іх марозы срэбразорнаю расой (*А. Вярцінскі*). 4. Снежная пустэча. Бель у вочы коле... І адна бяроза — вартаўніца поля. Легкадумны вецер між галін смяецца, хоча запалоніць белакосай сэрца (*Д. Бічэль*). 5. Трапезная мечаносцаў размяшчалася якраз пад пакоем, у якім жыў гросмайстар (*Л. Дайнека*).

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне складаных слоў.

Беларускі народ па праве можа ганарыцца сваёй багатай спадчынай, дзе ярка адлюстраваліся высакародныя ідэалы, прага да плённай працы, маральная чысціня душы, здольнасць да глыбокіх пачуццяў, практычная і філасофская мудрасць, жыццесцвярджальнасць, любоў да роднага краю. Асабліва гэта мае дачыненне да народнай песні. Поўныя непаўторнасці, хараства і словатворчасці, беларускія песні — гэта велізарная найкаштоўнейшая энцыклапедыя жыцця нашага народа. Багатыя векавечныя традыцыі і высокапаэтычная вартасць беларускай народнай песні забяспечылі ёй неўміручасць. Яна жыве і сёння, застаючыся духоўнай повяззю пакаленняў, жыццядайнай крыніцай радасці, творчага натхнення, сродкам далучэння да сапраўдных каштоўнасцей (*Паводле І. Казаковай*).

- Падкрэсліце словы з падаўжэннем і падваеннем зычных. Абгрунтуйце напісанне арфаграм.
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе.

## Правапіс спалучэнняў галосных

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Патриарх, социолог, киоскёр, Иордан, акционер, гладиолус, гениальный, ионный, иезуит, океан, проектор, абитуриент, Майя, фойе, чемпион, йога, кардиограмма, ориентир, гиацинт, Миоры, аккордеонист, киоск, миллион, фейерверк, фиалка, майонез, диетический,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

фортепиано, йогурт, аксиома, энтузиазм, рационализатор, йодистый, Нью-Йорк.

- Абгрунтуйце напісанне арфаграмы «Правапіс спалучэнняў галосных».

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне спалучэнняў галосных у словах.

Аптымізм у нацыянальным характары беларусаў тлумачыцца перш за ўсё адпаведнай расстаноўкай прыярытэтаў: беларус найчасцей аддае перавагу духоўнаму. Ён практычны і кансерватыўны, задаволены рэальным, атрыманым. Ён упэўнены ў сабе, кемлівы і вынаходлівы. У падмурку аптымізму беларуса такія рысы нацыянальнага характару, як жыццястойкасць, практычнасць, працавітасць, схільнасць да ўнутранага псіхалагічнага аналізу. Песімізм жа беларусаў таксама не беспадстаўны, а тлумачыцца шматгадовым сацыяльна-палітычным прыгнётам, сацыяльнай няроўнасцю, марнасцю цяжкай і паднявольнай працы (*Паводле А. Садоўскай*).

- Падкрэсліце арфаграмы, правапіс якіх адпавядае правілу напісання ***е***, ***ё***, ***я***.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.

## Правапіс літар *і*, *ы*, *й* пасля прыставак

◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Памкнуцца, безыдэйны, абыграць, звышідэальны, лайнер, праіранскі, прыіск, праінфармаваць, праіснаваць, безыніцыятыўны, падысці, пераінструментоўка, звышімпульсны, заінелы, палітінфармацыя, заіскрыцца, прыйдзецца, адысці, падыграць, медінструменты, выйсці, дэзынфекцыя, перайманьніцтва, санінструктар, контрідэя, тэрмаізаляцыя, перайначыць, прымаць.

- Растлумачце значэнне слова ***пераінструментоўка***.
- З трыма словамі складзіце сказы.

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Выпішыце ў асобныя групы словы, у якіх пішацца ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыстаўкі і ў складанаскарочаных словах.

Безыменны, міжінстытуцкі, аўтаінспекцыя, выйсце, пройгрыш, разысціся, зымправізаваць, дэзынфекцыя, пайменна, безыдэй-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ны, прайгравальнік, спортінвентар, заінтрыгаваны, звышінфляцыя, контрідэя, праілюстраваць, праінструктаваны, дэзынтэграцыя, падыспад, пераймаць, падыграць, перадыспытны, зыначаны, контрігра, суперінтэлект, медінструменты, спецінструктаж, экс-імператар, перадынфарктны, дэзынфармацыя.

- Абгрунтуйце напісанне арфаграмы «Правапіс літар ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыставак».
- З трыма словамі складзіце словазлучэнні.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Запішыце сказы пад дыктоўку, каменціруючы напісанне ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыстаўкі.

1. Так патрабуе ўжо ў калысцы дагляду мудрага дзіця, каб у жыцці аратым выйсці, а не нахлебнікам жыцця (*Н. Гілевіч*). 2. Зноў маладая кроў узыгралася, бы мора (*А. Мілюць*). 3. Як сляпыя ўначы — хто куды два чужыя пайшлі чалавекі (*М. Шабовіч*). 4. А снег не сышоў яшчэ, і ў калюжынах раніцай лядок пад нагамі ламаўся... (*В. Іпатава*). 5. І ніколі не ўзыдзе зерне, што ўпала ў бясплодны пясок (*В. Вітка*).

- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***нахлебнік***.
- Зрабіце пунктуацыйны разбор пятага сказа.

◆ *Пісьмо па памяці*

Вывучыце радкі С. Грахоўскага і запішыце па памяці.

Жыццё пражыць —
Не поле перайсці,
А трэба і жыццё
Прайсці, як поле,
І хоць адным зярняткам узысці,
А бур'яном не зарасці ніколі.

- Растлумачце напісанне ***і***, ***ы***, ***й*** пасля прыставак.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Правапіс прыстаўных галосных, прыстаўных і ўстаўных зычных

◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Водсвет, гарбуз, вупраж, гэтакі, вохра, павойкаць, Навумовіч, за акном, пад Оршай, гісторыя, іронія, вустрыца, Осла, Чарнавус, ніводзін, завочны, педвучылішча, дагэтуль, вокіс, навушнікі, унцыя, воцат, опера, Лявоненка, навастрыць, аканіцы.

- Растлумачце значэнне слова ***унцыя***. Зрабіце яго фанетычны разбор.
- Складзіце сказы са словамі ***вупраж***, ***вохра***, ***воцат***.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Мгла, опыт, надо лбом, Тадеуш, урна, мгновение, иронично, Науменко, улица, мчаться, научный, история, заржаветь, огненный, на окне, уэльсский, Родион, ольха, озёрный, Анна, окать, заржать, ушко, уценка, Узда, в пасти льва, обыск.

- Растлумачце напісанне арфаграм у словах.
- З трыма словамі складзіце сказы.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам тэксту растлумачце напісанне прыстаўных галосных, прыстаўных і ўстаўных зычных.

Галоўная вартасць вохравага колеру заключаецца ў цёплай, светлай і мяккай аўры. Ніводзін колер не сграе гэткай ласкавай сонечнай цеплынёй. Вохра атаясамліваецца з зямлёй, пяском, іржышчам, з народнымі вырабамі з прыродных матэрыялаў. Гэты колер блізкі да ладу жыцця на зямлі. Дагэтуль сярод ідэальных паняццяў, звязаных з вохрай, ужываюцца вызначэнні «жыццё» і «ўрадлівасць» (*Паводле Г. Горавай*).

- Растлумачце напісанне арфаграмы «Правапіс **у** і **ў**».
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры дзеепрыметнікавым звароце.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне прыстаўных галосных, прыстаўных і ўстаўных зычных.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

1. Дарэмна зыкі ловіць вуха: вакол балюча і маркотна і лес застыў, глядзіць гаротна... (*Я. Колас*). 2. У поклічы, у родным слове гэтым я чую вас, паўночныя ільды (*Л. Дранько-Майсюк*). 3. Ты не тужы — мінецца восень, імгла рассеецца, як дым (*Я. Колас*). 4. А суд гісторыі цяжкі!.. (*Я. Купала*). 5. І тады Хрыстос моцным ударам нагі скінуў уніз адну фігурку святога, вялікі вулей з доўбленай ліпы (*У. Караткевіч*). 6. Я люблю гэты вобраз краіны, дзе відаць на абшары кругом курганы, і пустыя раўніны, і балоты, зарослыя мхом (*Ц. Гартны*). 7. Бог — чалавек, распяты на паперы ўсіх ілжэвучэнняў пра яго (*Т. Бондар*).

- Зрабіце лексічны разбор слова ***абшар***.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў шостым сказе.

## Правапіс *у* і *ў*

### ◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Ручка-ўказка, соус, аўдыторыя, фаўна, Люблінская унія, лінолеум, каўчук, акіянаўт, ва ўніверсаме, траўма, джоўль, пажоўклы, коннікі-ўланы, вёска Ушаўка, радыус, на ўкраінскай зямлі, Ландау, дачушка-ўцеха, возера Усомля, трыумф, рака Ушача, натарыус, лаўровы, проціўгонны, Еўропа, аўдыторыя, рака Уса, прэзідыум, вучоны-ўтапіст, шоу, індывідуум, іглаўкалванне.

- Растлумачце значэнне наступных слоў: ***натарыус***, ***іглаўкалванне***.
- Складзіце сказы з трыма словамі.

### ◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Выпішыце асобна словы ці спалучэнні слоў, у якіх пішацца **у** і **ў**.

Аўтапрабег, паў-Урала, сукенка ультрамодная, перпетуум-мобіле, цыноўка, заходнеўкраінскі, аліўкі, рэстаўрацыя, Паўлінка, інаўгурацыя, укос, вучоны-ўфолаг, аўгіевы стайні, Сеул, аўтаномны, міжусобіцы, Кіева-Пячэрская лаўра, адна унцыя, новая ўніформа, бібліятэка ўніверсітэта, свята «Ураджай-2012», Штраус, пазаўрочны час, фарба ультрамарын, рабочы-ўдарнік, Брэсцкая унія, старажытны дыярыуш, сямейства ўдававых, падалі ўльтыматум, аўдыякасета, боўлінг.

- Растлумачце напісанне арфаграмы «Правапіс **у** і **ў**».
- Зрабіце фанетычны разбор наступных слоў: ***дыярыуш***, ***аўдыякасета***.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам тэксту растлумачце правапіс **у** і **ў**.

Самыя шчырыя ўзаемаадносіны паміж бацькамі і дзецьмі змалку і назаўсёды «праграмуюцца» тым універсальным кодам, які выпрацаваны моваю продкаў.

Кожная мова — гэта ўніверсальная знакавая сістэма. Адзін гук у ёй мяняе сэнс адразу некалькіх слоў, а шматзначнае слова набывае змест толькі ў пэўным кантэксце.

Непаўторнасць матчынага Слова!

Якім шматфарбным і паэтычным убачыў і пазнаў гэты зямны свет дзякуючы табе, да якіх цудоўных скарбаў свайго народа змог прычасціцца ў натхненні!

Чаму ж так няўдзячна атрымліваецца, што, патраціўшы на ўсведамленне і засваенне матчынай мовы гэтулькі сіл душы, асобныя з нас потым надта ж лёгка забываюць цану той навукі? (*Паводле А. Лісіцкага*).

- Зрабіце лексічны разбор слова ***натхненне***.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне **у** і **ў**.

Сёння вельмі сур'ёзна трэба ставіцца да сітуацыі страты фізічнага і псіхічнага здароўя дзіцяці ўжо ў раннім узросце пад уплывам розных адмоўных фактараў. У апошнія часы ў сучаснай арт-тэрапіі прымяняецца ўнікальны інтэрактыўны метад, калі для самаразвіцця чалавека ці дасягнення канкрэтных тэрапеўтычных мэт выкарыстоўваюцца розныя віды мастацтва, элементы шоу. У гэтым сэнсе фальклорная спадчына — невычэрпная крыніца натхнення асобы, універсальны сродак творчага і гарманічнага развіцця, станоўчай арыентацыі ў грамадстве і сусвеце.

Увогуле, у фальклоры закадзіравана такая мадэль сацыялізацыі асобы, якая ў сучасных умовах можа аказаць пазітыўны ўплыў на ўсе бакі грамадскага жыцця і масавую свядомасць, асабліва пры фарміраванні гарманічнага чалавека, ідэйна-патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі (*Паводле І. Казаковай*).

- Падкрэсліце словы з арфаграмамі, правапіс якіх адпавядае правілу напісання спалучэнняў галосных.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Правапіс *д* і *дз*, *т* і *ц*

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

I. Валокордин, техноконтроль, дефицит, командир, увертюра, академия, проектировка, пластилин, блондин, десертный, карантин, дискобол, пастила, тираж, темперамент, индеец, дистиллированный, штепсель, иммунитет, демисезонный, диплом, бижутерия, дюна, четверг, директива, тюльпан, бифштекс, термос.

- Растлумачце напісанне слоў з арфаграмамі «Правапіс **д** і **дз**, **т** і **ц**».
- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***праекціроўка***.

II. Демократическое государство — это государство, построенное на признании принципов народовластия, свободы и равноправиявграждан. На землях Беларуси развитие государственного строительства было закреплено в сводах законов — статутах. Статут Великого Княжества Литовского являлся практически конституцией государства «о правах, вольностях и свободе» народов, проживающих на его территории. Он оказал большое влияние на дальнейшее развитие законодательных актов на территории Беларуси (*По изданию «Я — гражданин Республики Беларусь»*).

- Растлумачце напісанне слоў з арфаграмамі «Правапіс **д** і **дз**, **т** і **ц**».
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў першым сказе.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне **д** і **дз**, **т** і **ц**.

У любых абставінах свайго існавання беларусы вызначаліся жыццёвым прагматызмам і непераадольным аптымізмам. Спецыфіка жыцця і гаспадарання прымушала беларуса быць чалавекам-прагматыкам, які імкнецца дасягнуць сваіх мэт, задаволіць свае інтарэсы найперш практычнымі дзеяннямі, а не нейкімі абстрактнымі разважаннямі, дэмагогіяй. Менавіта ў канкрэтных учынках на карысць родных, блізкіх і сябе самога беларус бачыць глыбінны сэнс свайго жыцця. Гэты аптымізм дае яму дадатковыя сілы выжыць, умацаваць сваю сілу волі, загартаваць характар (*Паводле Э. Дубянецкага*).

- Назавіце словы з арфаграмамі, правапіс якіх адпавядае правілу напісання падоўжаных зычных.
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназалежным сказе.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Правапіс падоўжаных зычных

◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Працэс, насенне, Кірыл, прызванне, расольнік, баласт, выхаванасць, Ніца, прыгнечанне, сціпласцю, інкасатар, саванна, група, Сюзанна, сенажаццю, Ілья, ажыццяўляцца, каштоўнасцю, ка́са, гуманнасцю, дзевятнаццаццю, выратаванне, вылью, разводдзе, субота, ванна, будызм, палескі, мадонна, прафесія, Жанна, Ефрасіння, ранішнік, Ала, беларуска.

- Растлумачце напісанне або адсутнасць у словах падоўжаных і падвоеных зычных.
- Зрабіце марфемны разбор слова ***ажыццяўляцца***.

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Выпішыце са словазлучэнняў асобна словы з падаўжэннем, падваеннем зычных і тыя, у якіх гэтых з'яў не назіраецца.

Смачная манна, Інэса Аляксееўна, раззлаваць суседа, трэцяе тысячагоддзе, прагрэсіўны напрамак, сястра Ганна, панна Марыля, бессэнсоўны адказ, раздолле лугоў, бязветраны дзень, святая Мекка, аддаць сшытак, зялёны масіў, вёска Залессе, аббегчы ваколіцу, бяздоннае неба, стойкі імунітэт, маладая расада, суседка Таццяна, эпоха Адраджэння, бяззлучнікавы сказ, дванаццаць апосталаў, рассаднік хваробы, гучна рассмяяцца.

- Растлумачце напісанне арфаграмы «Правапіс падоўжаных і падвоеных зычных».
- Зрабіце фанетычны разбор слова ***рассмяяцца***. Складзіце з ім сказ.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Растлумачце ў час напісання правапіс падоўжаных зычных.

1. Снег пушысты, бадзёры, крамяны ціхай беллю празрыстаю лёг... (*П. Пестрак*). 2. Белыя паляны, белыя гаі... Пчолы ледзяныя кружацца ў галлі (*Т. Кляшторная*). 3. Ды йдзе жыццё. У яго свае законы. То сонейка абніме, то мароз (*Я. Янішчыц*). 4. Над Белай Руссю — белы снег, нібыта *чыстае* сумленне, нібыта светлае збавенне за самы патаемны грэх (*А. Грачанікаў*). 5. А ўсё ж вінаваты і я: суладдзе ў прыродзе парушана, паменшала птушак сям'я, і рыба бяздумна *патручана* (*Ю. Свірка*). 6. З мітуснёю былою расстанне. Дабраты



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

і пяшчоты зліццё. Белы снег. Залацістае ранне. І — жыццё (*В. Гардзей*). 7. Калматае вецце ў сутонні калыша дзівосныя сны, ссівелі ад шэрані скроні на ўзлессі ў кожнай сасны (*С. Грахоўскі*).

- Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.
- Складзіце схему апошняга сказа.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Важнейшие достижения в развитии белорусской культуры отмечены в период Великого Княжества Литовского. Это относится к формированию гуманистических и демократических идеалов общественной жизни. Гуманистический идеал наиболее полно в своём творчестве отразил Николай Гусовский. Его произведение «Песнь о зубре» отличается глубоким философским и социальным звучанием. Николай Гусовский близок современному читателю своими идеями народовластия, мира, дружбы и единения народов (*По изданию «Я — гражданин Республики Беларусь»*).

- Растлумачце напісанне ўласных назваў.
- Абгрунтуйце напісанне слоў з падоўжанымі зычнымі.

## Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Безвыездно, компостный, капустный, агентство, голландский, целостный, хрустнуть, почта, Барановичский, ненавистный, рентген, областной, казахский, Кронштадт, выездной, пропагандистский, Рембрандт, контрастный, поздно, человечество, Брестчина, постный, Шмидт, крещёный.

- Абгрунтуйце напісанне арфаграм.
- Складзіце з двума запісанымі па-беларуску словамі сказы.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем сказаў растлумачце правапіс спалучэнняў зычных.

1. Бясспынна, глуха, процьма часу глытае хараство і моц (*У. Жылка*). 2. Жыццё на ўсё знаходзіць лек, яно не любіць, каб няш-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

часным на свеце чуўся чалавек (*Н. Гілевіч*). 3. Жыццё не трэба смерцю страшыць, за хуткаплыннасць дакараць, бо на такой зямлі, як наша, не боязна і паміраць (*С. Законнікаў*). 4. Ад здрадлівага — сэрцам адыдзі, ад цыніка — свой смутак уратоўвай, зайздрослівага шчодра не віні, — жыві праўдзіва — усяго і толькі (*В. Аколава*). 5. З дробнага вялікае, дробнае з вялікага — вось ён, існавання пакручасты ход! (*А. Звонак*). 6. Калі ты камусьці хоць трошкі патрэбен, дык хочацца шчодра і радасна жыць (*С. Грахоўскі*). 7. Чым жыць і гінуць век у кайданах, лепш вольным пасці (*М. Танк*).

- Зрабіце марфемны разбор слова ***хуткаплыннасць***.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў чацвёртым сказе.

◆ *Творчы дыктант*

Ад прапанаваных слоў утварыце прыметнікі.

Помста, без радасці, кантракт, фарпост, хуткасць, пост, вобласць, стандарт, літасць, колькасць, кантраст, жаласць, націск, якасць, выезд, праезд, кампост.

- Абгрунтуйце напісанне спалучэнняў зычных.
- З пяццю запісанымі словамі складзіце словазлучэнні.

## Правапіс приставак на з і с

◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Дысгармонія, безжыццёвы, рашчыніць (паставіць цеста), ушчуванне, разжаліць, дыспрапорцыя, сарганізаваць, сэканоміць, дызасацыяцыя, зламаць, схапіць, зжыцца, дыскваліфікаваць, нішчымніца, сыграць, зымправізаваць, расхвалявацца, безвыніковы, зыначыць, беспаспяховы, расчэсваць, счысціць, дыскамфорт, счапіць, сшытак, сшарэлы.

- Растлумачце напісанне арфаграмы «Правапіс прыставак на **з** і **с**».

◆ *Слоўнікавы выбарачны дыктант*

Выпішыце словы з прыстаўкай на **с**-.

Счарсцвець, расшчодрыцца, бясплатны, зрадніцца, безжыццёвы, расчулены, звечарэць, шчыльней, расшпілены, зрашчэнне, шчыры, сцякаць, пяшчотны, расчоска, звязацца, расшнураваць, ашчад-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ны, бясправе, шчаслівы, счытваць, схіл, расшчабятацца, счэпшчык, зраўняцца.

• Растлумачце правапіс арфаграм, напісанне якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу.

• Зрабіце марфемны разбор слова ***безжыццёвы***.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем сказаў растлумачце правапіс прыставак на **з** і **с**.

1. Ходкая лодка ў чароце, свой распачаўшы разгон, цешылася адзіноце прыпяцкіх ветраных дзён (*Л. Дранько-Майсюк*). 2. Калі я разгадаў свой лёс, усім астаткам сіл я ўзняў далоні да нябёс і знаку папрасіў (*Г. Бураўкін*). 3. Ці бульбу з прысаку луплю, ці слухаю буслiны клёкат, чаму таго найбольш люблю, хто мне спраўляе *большы* клопат (*Д. Бічэль*). 4. На ранку дзеці шпаковы песцяцца, *збіваюць* з галінак ліповы пылок (*К. Камейша*). 5. Ён пільна летапіс чацвёрты піша год і спісвае ўсё ад слова і да слова з даўнейшых граматак пра долю Магілёва (*М. Багдановіч*). 6. Мне ногі змываюць крыштальныя росы (*Я. Колас*).

• Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.

• Пабудуйце схему першага сказа. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

### ***Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе***

## Правапіс звонкіх і глухіх, шыпячых і свісцячых, спалучэнняў зычных на стыку кораня і суфікса, прыстаўкі і кораня

◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Аббегчы, падзяка, надкосніца, адвучыцца, аббіць, падхапіць, адкрыты, аддзяленне, раскласіфікаваць, абшыць, падстрэшак, адгараваць, надкусіць, бяззорны, адсырэлы, ссадзіць, абсмяяць, Наддзвінне, падстрахаваць, падсумаваць, адшчапенец, паддзець, транссібірскі, адпачынак, узрыўны, адквітнець, рассмяяцца, адзвінець, адчынены, разлавацца.

• Растлумачце правапіс арфаграм, напісанне якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.

• Зрабіце лексічны разбор слова ***транссібірскі***.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## ◆ *Творчы дыктант*

Ад прапанаваных слоў утварыце асабовыя назоўнікі з суфіксамі ***-чык*** ці ***-шчык***.

Заказваць, абліцоўваць, перавозіць, перабегчы, настроіць, пераплятаць, наводзіць, збіраць, наладзіць, разведаць, загадваць, перапісваць, адпраўляць, падносіць, набіраць, наглядаць.

- Растлумачце напісанне арфаграм у запісаных словах.
- З трыма назоўнікамі складзіце сказы.

## ◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам сказаў растлумачце арфаграмы, правапіс якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу напісання.

1. Абсыхаюць у садзе дарожкі, а маленькія яблынак рожкі нібы рвуцца да сонца лучоў (*Н. Арсеннева*). 2. А вось маёй адсталасці прычына — прыёмны мой пакой, мая дзяржава — кухня, дзе пры цяпельцы ў дзежцы цеста пухне (*Д. Бічэль*). 3. Хто шнур зжуе няроўным плехам — Антось яго ўжо дойме смехам, задзене проста за жывое, хоць сэрца ў дзядзькі і не злое (*Я. Колас*). 4. Памылкі прывядуць цябе ў адчай — чужога выхаду не пазычай (*Д. Бічэль*). 5. Дзве дарожкі, дзве сцяжынкі, дзве сцяжынкі, як істужкі, да каханае дзяўчынкі ўюцца дужкай (*А. Мілюць*). 6. Якія цёплыя ў надзеі промні! Якія лёгкія ў чакання крылы! (*Д. Бічэль*). 7. Ты адбі мне тэлеграму, што ў нашай старане, у ціхай вёсцы Белы Камень выпаў белы-белы снег (*А. Пісьмянкоў*).

- Зрабіце фанетычны разбор наступных слоў: ***уюцца***, ***дзядзькі***.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

## ◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне арфаграм, заснаваных на марфалагічным прынцыпе.

Шэсць з паловаю стагоддзяў меч быў асноўнай зброяй вершніка і пехацінца, прызначаўся для блізкага бою. Асабліва трывалыя, багата ўпрыгожаныя мячы перадаваліся ад бацькі сыну. На полі бітвы мячы, як і іншую зброю, збіралі пераможцы. У асобных выпадках адважнага ваяра ці князя і хавалі разам з мячом.

З цягам часу мячы саступілі сваё месца лёгкім шаблям, шпагам, палашам. Аднак вобраз мяча як сімвал мужнасці і трываласці ў ба-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

рацьбе за волю застаўся ў гістарычных дакументальных і мастацкіх творах (*С. Тарасаў*).

- Падкрэсліце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***».
- Абгрунтуйце напісанне канчаткаў назоўнікаў.

## *Правапіс мяккага знака і апострафа*

### ◆ *Слоўнікавы дыктант*

Запішыце пад дыктоўку.

Канферансье, чатырох’ярусны, зап’ю, налью, ледзьве, барацьбіт, менш, п’яўка, мадзьяр, сядзьце, жнівеньскі, цьмяны, шчаўе, возьмеш, узмор’е, чыйсьці, разьбяр, більярд, ад’ютант, зменшыць, аб’інелы, фельетон, кампаньён, свіцязьскі, інтэр’ер, В’етнам, рэжце, малакроўе, восеньскі, льгота, раз’юшаны, няньчыць, прысядзьце, Салаўёва, чамусьці, нюанс, раўнапраўе, Лаўрэнцьева, выкіньце, п’едэстал, мядзведжы, тэр’ер.

- Растлумачце напісанне змякчальнага мяккага знака, раздзяляльнага мяккага знака і апострафа.
- Зрабіце фанетычны разбор слова ***прысядзьце***. Складзіце з ім сказ.

### ◆ *Выбарачны дыктант*

Выпішыце словы, у якіх пішацца апостраф.

Перадз’ездаўскі, каньён, аб’ём, дзьмухавец, падрэжце, Лук’янава, песенька, Дзяменцьеў, калісьці, транс’еўрапейскі, выцвілы, пад’езд, абедзве, разалью, між’ядзерны, праменьчык, альвеола, ін’екцыя, на здароўе, кар’ерыст, не забудзьце, вынянчыць, восеньскі, аб’яднаць.

- Растлумачце напісанне апострафа.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***перадз’ездаўскі***.

### ◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Выпішыце ў тры асобныя групы словы, у якіх: а) пішацца апостраф, б) раздзяляльны мяккі знак, в) не пішацца ні апострафа, ні мяккага знака.

Студзеньскі, вішанька, двух’ярусны, шчаўевы, сем’янін, праверце, павільён, салаўіны, Бярэсце, вазьміце, Рэйк’явік, паштальён, сямімільны, Іўе, перад’юбілейны, пакіньце, пад’ёмнік, здранцве-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

лы, Валяр'янаў, італьянскі, саўюць, раздум'е, чамусьці, ласьён, над'едзены.

- Растлумачце напісанне арфаграм.
- З трыма словамі складзіце сказы.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце словы па-беларуску.

Жеребьёвка, двухъярусный, бильярд, Прокофьев, Червенский (район), затмение, пятьдесят, Мольер, няньчить, пиявка, отъезд, тайваньский, Полесье, компьютер, многоточие, астраханский, царь, бросьте, павильон, конский, узаконивать, верфь, конъюнктура, созвездие, терьер, курьер, Заславль, предместье, Юрьев, полушарие, вишенка, здоровье, поместье, библиотекарь, щавель, поголовье, развенчать, Леонтьев.

- Растлумачце напісанне арфаграм.

## *Правапіс вялікай і малой літар*

◆ *Каменціраваны дыктант*

Запішыце пад дыктоўку, каменціруючы напісанне вялікай і малой літар.

Дзень радыё, Сусветная Асамблея моладзі, Палац спорту, коласаўскі радок, будучыя Купалы, Дом урада, заслужаны дзеяч мастацтва, часопіс «Полымя», Вялікае Княства Літоўскае, ордэн Дружбы народаў, ахілесава пята, плошча Перамогі, Нобелеўская прэмія, возера Пятровіцкае, Сафійскі сабор, паўночнае ззянне, Тэатр юнага гледача, Мележаў раман, беларускае барока, гасцініца «Беларусь».

- Падкрэсліце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***».
- З трыма словазлучэннямі складзіце сказы.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне вялікай і малой літар.

1. Усе знаходзяцца на аднолькавай адлегласці ад Бога, але на рознай да Бога (*А. Разанаў*). 2. Мы тройчы дзеці ў вечным крузе: мы — дзеці роднае сям'і, і — дзеці Маці-Беларусі, і — дзеці Матухны-Зямлі (*Н. Гілевіч*). 3. Мной не спазнаная яшчэ, паўз надпісы «Лянок» і «Мода», да плошчы Коласа цячэ евангельская прахалода



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

(*Л. Дранько-Майсюк*). 4. Каб зразумець Белавежскую пушчу, трэба стаць яе часткай, яе працягам (*Я. Рагін*). 5. Сэрцы братнім народам і праўду сваю раздалі — Клімукі, Кавалёнкі, Караткевічы, Мележы, Пысіны (*П. Панчанка*). 6. Дзіця нараджаецца, і Сварог запальвае зорку; чалавек памірае, і бог Зніч яго зорку гасіць (*А. Петрашкевіч*). 7. А мы былі гасцямі Саюза пісьменнікаў і мелі шырачэзны прастор для знаёмства з калегамі (*І. Шамякін*). 8. Шырока вядомыя літаграфіі М. Басалыгі «Бітва з татарамі», «Мірскі замак», «Рагнеда»... (*А. Шычко*).

- Падкрэсліце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў трэцім сказе.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Парламентом Республики Беларусь является Национальное собрание — представительный и законодательный орган. Национальное собрание имеет две палаты — Палату представителей и Совет Республики. Каждая из палат Парламента обладает самостоятельными полномочиями.

Правительство Республики Беларусь — коллегиальный центральный орган государственного управления. В Республике Беларусь правительство имеет название — Совет Министров. Работой правительства руководит Премьер-министр (*По изданию «Я — гражданин Республики Беларусь»*).

- Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

## *Правілы напісання слоў разам, праз злучок і асобна*

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце падчас запісу напісанне слоў разам, асобна і праз злучок.

Контр-адмірал, дзверы не зачынены, такі зрабіў, пакуль што, зусім незнаёмы чалавек, стоп-кран, паўяблыка, гросмайстар, ночка-цыганка, на жаль, пароўну, лейб-медык, узвей-вецер, цёмнавалосы, тэлефанаваць штодня, абы-што гаварыць, трымаць напагатове, усё-такі спазніўся, пакуль што чытаю, зняверыцца зусім, прыйсці якраз



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

у час, крыж-накрыж, пароўну, калі-небудзь, вагонарамонтны, у абхват, беларуска-рускі, кілават-гадзіна, не прачытаная вучнем кніга, ні кроку назад, карціна не намалявана, незмаўкальны гоман, не даглядзець фільм, ні з месца.

- Падкрэсліце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***».

◆ *Папераджальны зрокавы дыктант*

Перад запісам растлумачце напісанне слоў разам, асобна ці праз злучок.

Пачуць (у)першыню, (кафэ)сталовая, (ранне)спелы плод, (паў)месяц, (чыста)прыбраны пакой, працаваць (у)волю, (Дунін) Марцінкевіч, (без)канца разважаць, (паў)аркуша, (анты)народны, (глыбока)паважаны, (рэдка)пасаджаны, (кілават)гадзіна, (Заходне) Сібірская раўніна, (чыста)шарсцяны жакет, вядомы (раман)хроніка, гарадская (метэа)служба, (па)добраму размаўляць, (аднатонна)шэрыя стрэхі, (віцэ)прэзідэнт, (па)іншаму, (сусветна)вядомы, (хто)небудзь, (у)глыб лесу, гульня (у)адкрытую, (паў)кватэры, (па)кітайску, (бліц)турнір, спектакль (не)цікавы.

- Зрабіце лексічны разбор слова ***спектакль***.
- З двума словазлучэннямі складзіце сказы.

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Запішыце словы і спалучэнні слоў у тры слупкі, кіруючыся напісаннем разам, асобна ці праз злучок.

Крутагор’е, член-карэспандэнт, папараць-кветка, лётчык-касманаўт, цэнтральнаеўрапейскі, Жан-Жак Русо, Аўстра-Венгрыя, стоп-сігнал, норд-ост, лён-даўгунец, кілават-гадзіна, трохкола-вы, пакацігарошак, перакаці-поле, водазаборны, Давыд-Гарадок, Франкфурт-на-Майне, працадзень, нацыянал-патрыёт, міні-матч, вэб-старонка, слабасалёны, яскрава вызначаны, чыста беларускі, Сент-Экзюперы, усенародна абраны, матэрыяльна зацікаўлены, Людвіг ван Бетховен, індаеўрапейскі, сарвігалава, Верхнядзвінск, дон Хуан, ваенна-спартыўны, мастацтвазнаўства, прэс-сакратар, Стары Свержань.

- Растлумачце напісанне слоў разам, асобна, праз злучок.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***крутагор’е***.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Каменціраваны дыктант*

Растлумачце ў час напісання прыказак і прымавак правапіс ***не*** (***ня***), ***ні*** з рознымі часцінамі мовы.

1. Не кручан — не рэмень, не вучан — не чалавек. 2. Што торба — то не мех, што праўда — то не грэх. 3. Няпраўдай увесь свет пройдзеш, а назад не вернешся. 4. Не чапай чужога і не бойся нікога. 5. Непастаянны, як асенняе сонейка. 6. Бойся не нажа, а языка. 7. Не заўсёды там шчасце, дзе дастатак і багацце. 8. Не той харош, хто з твару прыгож, а той харош, хто на справу гож. 9. Ніколі не адмаўляйся ад сяброўскай рукі. 10. Як не бачыш страху, то і не страшна. 11. Ніхто, як сам сябе, не пакарае. 12. Дарога ніколі не адпачывае — ні ўдзень, ні ўночы. 13. Не паспытаўшы дрэннага, не ацэніш добрага.

- Растлумачце значэнні прыказак.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс ***не***, ***ня***, ***ні*** з рознымі часцінамі мовы.

Імгненні... Няўлоўныя, яны наслойваюцца адно на адно, утвараючы непераадольную запруду часу. Яна ўстае паміж толькі што бачным і далёкім недасяжным, што ўжо наблізілася да цябе.

Толькі душа можа паспрачацца з часам. Паспрачацца і перамагчы. І тады няўмольнасць часу абарочваецца шляхам, які не толькі абганяе жыццё, а і расквечвае нязнаны, невядомы свет будучыні. А то нечакана імкне назад у памяць, вяртаючы самыя незабыўныя малюнкі.

Імгненні... Ніхто не вымярае імі шлях, хоць менавіта яны вызначаюць усе павароты няўмольнага лёсу. Ды і сам лёс нярэдка! (*Паводле Т. Бондар*).

- Падкрэсліце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс прыставак на зычны». Абгрунтуйце напісанне.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Растлумачце ў час напісання тэксту правапіс арфаграм, заснаваных на фанетычным прынцыпе.

Гукі — гэта самыя першыя ўражанні, што глыбока западаюць у пачуцці немаўляці. Перш чым зразумець слова, дзіця авалодвае мовай гукаў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Калі дзіця з першых дзён не жыло ў свеце хараства гукаў, не чула вашых лепшых песень, цяжка яму будзе самому набыць гэтыя душэўныя багацці.

Ніякія спецыялісты не паставяць голасу, калі ў чалавека змалку, з пялёнак не пастаўлены слых!

Нашы маці праз вопыт многіх пакаленняў добра ведалі, што першаасновы душэўнага хараства чалавека пачынаюцца з калыскі. З той самай простай, але геніяльнай у сваёй мудрасці і паэтычнасці песні, якая называецца калыханкай.

Як жа крыўдна, што сучасныя маці так рэдка спяваюць калыханкі сваім дзецям, што многія з іх самі не чулі калыханак, створаных і сагрэтых матчынымі сэрцамі.

Нашы маладыя маці збядняюць душы сваіх дзяцей, калі думаюць, што калыханку можна замяніць любой бяздумнай песенькай.

Ад свайго нараджэння чалавек павінен адчуваць, што ўсё самае прыгожае ў жыцці створана дзеля яго шчасця (*Паводле В. Віткі*).

- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.
- Складзіце схему сказа другога абзаца.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце арфаграмы, правапіс якіх адпавядае фанетычнаму і марфалагічнаму прынцыпам напісання.

**Пераможам экзаменацыйны стрэс!**

Што ж такое стрэс, і наколькі ён шкодны для арганізма? Стрэс — агульная рэакцыя арганізма на любыя ўздзеянні, якія парушаюць яго звыклы стан. У дзясятку падзей, што выклікаюць самы моцны стрэс, знаходзяцца раптоўная хвароба сваяка, выйгрыш у латарэю, вяселле і пераезд у іншы горад. Важна, наколькі моцна арганізму трэба змяніцца, каб адаптавацца. У сувязі з гэтым спецыялісты апісваюць дзве формы стрэсу. Першы з'яўляецца нямоцным, мабілізуе арганізм. Другі — негатыўны тып стрэсу, з якім арганізм не спраўляецца. Якраз такі стрэс руйнуе здароўе чалавека і можа прывесці да цяжкіх захворванняў.

Звычайна здача іспытаў асацыюецца з негатыўнымі эмоцыямі, але гэта зусім не абавязкова! Пры правільна арганізаваным працэсе іспыты служаць сродкам самасцвярджэння і павышэння самаацэнкі. І вы можаце зрабіць так, каб экзаменацыйны стрэс стаў станоўчым



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

штуршком да новых спазнанняў і здзяйсненняў. Для гэтага трэба ўсяго толькі змяніць стаўленне да іспытаў (*Паводле В. Войт*).

- Абгрунтуйце напісанне канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення.
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

## Марфалагічныя нормы

### *Нормы ўжывання назоўнікаў*

### Адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Запішыце ў асобныя слупкі адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі.

Лясун, чарвяк, ферзь, нябожчык, шчупак (страва), мікроб, парастак, вядзьмак, маладзік, марыянетка, труп, кароль (шахматная фігура), вірус, бактэрыя, інфузорыя, сцізорык, лічынка, дуброва, гном, кукалка, вадзянік, ліпа, кенгуру, вяз, лялька, туз, будаўнік, сабака, алібі, народ, тапелец, прафесар, вавёрачка (цацка), гай, валошка, абітурыент, мурашнік.

- Падкрэсліце асабовыя назоўнікі мужчынскага роду, растлумачце асаблівасці іх выкарыстання ў мове.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***парастак***. Растлумачце яго правапіс.

### Род і лік назоўнікаў

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Запішыце словы ў чатыры слупкі: назоўнікі мужчынскага роду, назоўнікі жаночага роду, назоўнікі ніякага роду і тыя, якія не маюць роду.

Цюль, вермішэль, Егіпет, флеш, тэрапеўт, вогнішча, нявестка, валяр’ян, гусяціна, грошы, Баранавічы, авакада, кастрыца, донкіхот, духі, пажарышча, дынама, псіхолаг, драпіраванне, камода, таталітарызм, хвасцішча, асвета, прэм’ер, даспехі, яблык, Акіянія, цялушка, каласішча, какава.

- Растлумачце напісанне назоўнікаў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

### ◆ *Творчы дыктант*

Падбярыце прыметнікі да прапанаваных назоўнікаў. Словазлучэнні запішыце.

Лох-Нэс, какаду, Батумі, мецца, жалюзі, Жуліа, грызлі, Осла, куцюр'е, Сочы, ГУЛАГ, сулугуні, ашчадкаса, ватэрпола, ЛіМ, фламінга, івасі, круп'е, НАН, бістро, Перу, Чад (возера), каратэ, БелАЗ, камікадзэ, міліцыянер Петрусёва, тарнада, РУУС, клішэ, калібры, Кіліманджара, БРСМ, манпансье, Элен, Белофістэхніка, пані, леча, камроты, Чыкага, фрау, Антарыа (правінцыя).

- Вызначце род назоўнікаў. Растлумачце іх правапіс.

### ◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Яркий какаду, известный биолог Петрова, тонкое кружево, дорожная пыль, лечебное алоэ, красные чернила, бордовый пион, хорошее поведение, перепись населения, и бровью не повёл, металлическая дверь, голодная собака, красная гвоздика, пользоваться аэрозолем, болезненная мозоль, белый лебедь, перловая крупа, засохла валерьяна, мелкие макароны, спелая земляника, пачка муки.

- У запісаных словазлучэннях вызначце род і лік назоўнікаў. Абгрунтуйце напісанне.

## Скланенне назоўнікаў

### ◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Размяркуйце назоўнікі па групах у залежнасці ад тыпу скланення.

Манрэаль, выбары, канцлер, ляўша (Вера), казуля, какава, бюлетэнь, бярэмя, цёзка (Мірон), кужаль, задзіра (Рыгор), шыр, сані, Еўропа, бусляня, багаслоў, дажынкі, вогнішча, гусь, полымя, вольнасць, племя, кіцель, Сапега, друкарня, Івацэвічы, накіп, туляга (Генадзь), вартавы, дзядзька, ардынатарская, гусяціна, моль, плісэ, фальш, Быхаў (горад), Сцяпан Петрыкаў, жырандоля.

- Зрабіце лексічны разбор слова ***кужаль***.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Правапіс канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення

◆ *Выбарачны дыктант*

Выпішыце з тэксту назоўнікі 1-га скланення.

Рэчка павярнула і цяпер ціха плыла ўздоўж чыгункі. Паміж цягніком і рэчкай — шырокі луг, а бераг кусцісты, быццам карункавы. У кустах затаіліся рыбакі з вудамі, чакаюць, калі клюне рыбка. Над імі лятаюць белыя чайкі. І раптам з берага, раздольна ўзмахваючы бела-чорнымі крыламі, павольна падымаецца бусел.

А вунь і буслянка на адзінокім дрэве, верхавіну якога зрэзала маланка. Дрэва без кары, голае, быццам спецыяльна ўкапанае ў зямлю, каб на ім буслянку зрабіць.

Далёка відаць буслянка, і Віталь паварочвае галаву, каб даўжэй бачыць яе (*Паводле Г. Васілеўскай*).

- Запішыце выпісаныя назоўнікі ў форме меснага склону. Растлумачце правапіс канчаткаў.

◆ *Тлумачальны зрокавы дыктант*

Прачытайце, раскрываючы дужкі. Запішыце адказы. Растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення. Звярніце ўвагу на варыянтныя канчаткі.

1. Народ наш у вяках трымаўся на (сям'я) (*Н. Гілевіч*). 2. Няпростая, як свет, людская годнасць па (рысачка) складаецца адной (*Л. Тарасюк*). 3. Зернейку трэба загінуць у чорнай (ралля), каб выжыць (*Н. Мацяш*). 4. На хісткай (кладка) ты не пахісніся, калі прайсці патрэбна напрасткі (*Т. Сівец*). 5. У будучыню дзверы не ў часе, а ў (душа) (*А. Разанаў*). 6. У кожнай (кветка) дух жыве ахвярны (*Л. Дранько-Майсюк*). 7. Калі раб у (вера), дык у чым жа вольны? (*Н. Мацяш*). 8. І даражу я кожнаю (расінка) жыцця (*П. Панчанка*). 9. І ад шчаслівай гінулі (развязка), і гора ўздымае да вяршынь (*А. Грачанікаў*).

- Зрабіце фанетычны разбор слова ***пахісніся***.
- Зрабіце сінтаксічны разбор апошняга сказа.

## Правапіс канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам сказаў растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення ў родным склоне.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

1. З дзяцінства ўрэзаўся ў памяць пах матчынага хлеба — сакавіты, духмяны, любы (*Б. Сачанка*). 2. Вялікага дуба не бывае з карэннем малым (*К. Кірэенка*). 3. На панурых фартах, узарваных пудамі толу, вырас ядловец (*Ю. Голуб*). 4. Колькі прывідаў войнаў і міру паўстае з рукапісных папер! (*А. Хадановіч*). 5. Як прысак, ля Сожа пяскі жаўцеюць на полі (*А. Пысін*). 6. Нічога не было на гэтай плыні: ні ветразя, ні чарады качак (*У. Караткевіч*). 7. Быць не можа ў братэрства нічыйных палос, між людзей быць не можа старонняга болю (*Н. Мацяш*). 8. Як пасівелыя лірнікі гэтага краю, збіраюцца пецъ камяні. Я стаю і чакаю (*М. Танк*).

- Зрабіце лексічны разбор слова ***прывід***.
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў трэцім сказе.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення.

Дзед носіць пруткі вербалозу роўнымі снапкамі недзе каля тыдня. Потым надвячоркам у сваім двары пляце кошыкі. Яны ў дзеда Васіля атрымліваюцца лёгкія, зручныя. Ніхто не адмовіцца ад такога кошыка. Плату за іх ён вызначыў даўно. Кожны павінен прынесці столькі бульбы, колькі ў кошыку ўмесціцца. Як толькі пачынаецца копка бульбы, у двары дзеда Васіля вырастае ладная куча. Нясуць бульбу, насыпаную з верхам (*Паводле В. Гапеева*).

- Падкрэсліце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.

◆ *Каменціраваны зрокавы дыктант*

Пракаменціруйце напісанне канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення ў месным склоне.

У горкім палын..., у цёмным тунэл..., пры ўважлівым бухгалтар..., па Юр'евым дн..., пры малым сын..., працаваць у Верхнядзвінск..., пабываць у Чарнобыл..., па чужым маёнтк..., пры прэм'ер-міністр..., ісці па двар..., збіраць на канвеер..., у Вечным агн..., па невыразным цен..., пры незнаёмым вадзіцел..., на экзатычным веер..., у бяздонным калодзеж..., пры ваяўнічым егіпцянін..., у кароткім запіс..., на школьным бал... .

- Падкрэсліце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***».



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне канчаткаў назоўнікаў у месным склоне.

1. Ці са шчытом, ці на шчыце ў краіну нашу зноў мы прыйдзем (*А. Дудар*). 2. Зіма ўжо на дварэ, за позваю шле позву (*В. Вітка*). 3. На досвітку запахне снег малінава-празрыстым сокам (*А. Грачанікаў*). 4. Беляць у садзе вясновым камлі — галіны самі пабеляцца неўзабаве (*А. Разанаў*). 5. Не ўсё мы так зрабілі, як маглі. Ішлі, кульгаючы на кожным кроку (*Г. Бураўкін*). 6. На паляне ў светлым пералеску расцвілі налітыя расой сінія падснежныя пралескі пад аховай урачыстых хвой (*П. Панчанка*). 7. Зялёны блакіт успыхваў імгненна, на страху настоены і чысціні (*Л. Дранько-Майсюк*).

- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе.

## Канчаткі назоўнікаў 3-га скланення

◆ *Творчы слоўнікавы дыктант*

Запішыце назоўнікі ў творным склоне адзіночнага ліку.

Свядомасць, аэразоль, Нарач, суш, лань, пыл, вуаль, боль, шыр, Svіцязь, роспач, палын, спіраль, шэрань, Сібір, безліч, упэўненасць, шампунь, кужаль, педаль, шаль.

- Растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў.
- З трыма словамі складзіце сказы.

◆ *Папераджальны зрокавы дыктант*

Прачытайце, раскрываючы дужкі. Перад запісам сказаў растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення.

1. Без (чалавечнасць) не будзе (вечнасць) (*П. Панчанка*). 2. Ведаем, жывём занадта мала, каб напрыканцы не шкадаваць, што не ўсё, чым доля нас вітала, з (годнасць) мы ўмелі адвітаць (*Н. Мацяш*). 3. *Славяцца* людзі (гуманнасць) спраў. Не сілай, а (веліч) сэрца (*Л. Геніюш*). 4. Да (споведзь) прыходзіць кожны з нас, грахоўны больш ці менш сваёй істотай (*В. Аколава*). 5. Гадае той аб (прышласць) далёкай, хто верыць у сучаснае душой (*П. Глебка*). 6. Добра жыць з (памяць) пакут (*Н. Гілевіч*). 7. Жыццё — дар Божы. Апраўдаеш дар — будзеш абраны (вечнасць) (*У. Ліпскі*).

- Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленага слова.
- Падкрэсліце ў словах арфаграмы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс **а**, **о**, **э**».



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Особенности мышления, мировосприятия и поведения, наследуемые от прошлых поколений, называются ментальностью.

Характер белорусов характеризуется их глубокой приверженностью идеалам социального равенства и справедливости. Ещё Ефросинья Полоцкая учила людей душевной чистоте и искренней любви, непокорённости духа, преданности вере (*По изданию «Я — гражданин Республики Беларусь»*).

• Назавіце словы, якія адрозніваюцца націскам у беларускай і рускай мовах.

• Падкрэсліце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў галосных».

## Канчаткі назоўнікаў у множным ліку

◆ *Каменціраваны зрокавы дыктант*

Прачытайце, ужываючы словы, што ў дужках, у патрэбнай форме. Запішыце пад дыктоўку, каменціруючы напісанне назоўнікаў у множным ліку. Звярніце ўвагу на варыянтныя канчаткі.

Купіць пяць (апельсін), з суседніх (княства), гарадскіх (клумба), прынесці пяць (кілаграм), многа (недакладнасць), прагрэсіўных (рэформа), сарваць некалькі (памідор), каля (дзверцы) машыны, некалькі (аршын) шоўку, расколатых (крыга), рагу з (баклажан), пяць пар (нажніцы), каля бабуліных (граблі), нацыянальных (меншасць), выехаць з (Радашковічы), не пасушыць (вясло).

• Назавіце арфаграмы ў словах, правапіс якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу напісання.

◆ *Папераджальны зрокавы дыктант*

Прачытайце, ужываючы словы, што ў дужках, у неабходнай форме. Перад запісам сказаў растлумачце правапіс канчаткаў назоўнікаў у множным ліку. Засяродзьце ўвагу на ўжыванні варыянтных канчаткаў.

1. Зноў па цячэнні ракі з (краскі) плывуць вяночкі (*М. Шабовіч*). 2. Я доўга біўся над мовай (дрэвы), пакуль не зразумеў, што яна таксама беларуская... (*М. Шабовіч*). 3. Хаваецца між дамоў зіхатлівая поўня — цыганка (нябёсы) (*А. Разанаў*). 4. (Вочы) ты глядзеў на-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

перад, але душой заўжды назад (*Л. Дранько-Майсюк*). 5. Не, цудаў на свеце не бывае, ніхто з тых, аб кім думалася, не стукне ў акно і не прачыніць (дзверы) (*М. Лынькоў*). 6. Быў я панам (сотні) сёлаў, меў я слуг адборных світу (*А. Міцкевіч*). 7. А зямля абмытая дыміцца, дыхаючы поўнымі (грудзі) (*П. Панчанка*). 8. Колькі ўжо часу аб вас я ламаю гусіныя (пёры) і крытычныя коп'і (*А. Хадасевіч*).

- Зрабіце лексічны аналіз слова ***поўня***.
- Пабудуйце схему другога сказа.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне канчаткаў назоўнікаў у множным ліку.

На думку старажытных падарожнікаў, там, дзе прадстаўнікі іншых народаў апусцілі б рукі, беларус будзе змагацца да апошняга з усялякімі наваламі і няшчасцямі. Яскравым пацвярджэннем гэтай жыццястойкасці, нескаронасці беларусаў могуць лічыцца шматлікія прыклады досыць хуткага аднаўлення палеткаў, сядзіб, усяго традыцыйнага ўкладу жыцця пасля страшэнных войнаў і спусташэнняў (*Паводле Э. Дубянецкага*).

- Вызначце, у якой форме ўжываюцца назоўнікі 3-га скланення ў тэксце. Растлумачце правапіс.
- Абгрунтуйце напісанне ***не*** з назоўнікамі.

## Канчаткі рознаскланяльных і ўласных назоўнікаў

◆ *Выбарачны дыктант*

Выпішыце з тэксту рознаскланяльныя назоўнікі ў пачатковай форме.

Паводле легенды, да цара Саламона прыйшлі дзве жанчыны з просьбай вырашыць спрэчку, хто з іх з'яўляецца сапраўднай маці дзіцяці. Саламон загадаў рассекчы немаўля і аддаць па палавіне кожнай жанчыне. Адна з іх пачала ўпрошваць не забіваць дзіця. Яна была згодна аддаць яго іншай. Тады Саламон сказаў, што гэта жанчына і ёсць сапраўдная маці, бо не хоча смерці свайго дзіцяці. І цар загадаў аддаць ёй немаўля. Выраз *саламонава рашэнне* азначае рашэнне складанага пытання (*Паводле выдання «Чаму мы так гаворым»*).

- Пастаўце выпісаныя назоўнікі ў родным, вінавальным, творным і месным склонах, складзіце з імі словазлучэнні.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Каменціраваны зрокавы дыктант*

Прачытайце, ужываючы словы, што ў дужках, у патрэбнай форме. Запішыце пад дыктоўку, каменціруючы напісанне назоўнікаў.

Палёт (беркуцяня), на добрасумленным (суддзя), за (заіка) Піліпам, вядомымі (імя), пры таленавітым (прамоўца), сустрэцца пад (Лоеў), моцны ўдар па (цемя), каля здаровага (немаўля), пры (майстра) Страдывары, напісанае (Бетховен), старажытным (племя), з маленькім (дзіця), са зручнымі (стрэмя), са (старшына) Бялевічам, створанае (Тарасаў), падараваць (сірата) Алегу.

- Раскажыце пра асаблівасці змянення назоўнікаў мужчынскага і агульнага роду на ***-а***, ***-я***.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***добрасумленным***.

## *Нормы ўжывання прыметнікаў*

### Поўныя і кароткія формы прыметнікаў. Ступені параўнання прыметнікаў

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце напісанне поўных і кароткіх прыметнікаў.

1. Ганна смутна і маркотна, усё думае аб ім (*Я. Колас*). 2. Сказаць нялёгка мне, што шчасце — незваротна. Трывожыць і мяне мінулага лістота (*М. Шабовіч*). 3. Пэўна, горкі, пэўна, кепскі быў бы лёс мой, каб не вы... кветкі мамінай нявесткі. Сімвал святасці жывы (*Н. Гілевіч*). 4. Наводдаль дзеўчына ў кужэльных шатах маю дарогу шчасцем вышыць выйшла (*У. Дубоўка*). 5. Мая з ёй думка след у след, — то рвецца ў даль, то зноў баіцца: і міл, і страшан думцы свет (*Я. Купала*). 6. Шуміць базар, кіпіць базар сталічны, а на прылаўках дыхае зямля (*Я. Янішчыц*). 7. Будзь здарова, радня па крыві, будзь бяссмертна, радня па духу! (*Н. Мацяш*). 8. Калі ўсё добра — то патрэбна шмат, калі ўсё кепска — то нішто не міла (*Е. Лось*).

- Падкрэсліце прыметнікі. Зрабіце іх марфалагічны разбор.
- Пабудуйце схему шостага сказа.

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Выпішыце асобна прыметнікі, ад якіх могуць утварацца ўсе магчымыя формы ступеней параўнання; ад якіх могуць утварацца толькі складаныя формы і ад якіх нельга ўтварыць ніякіх формаў ступеней параўнання.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Звонкі смех, чарнабровая дзяўчына, клейкія лісточкі, чорнае золата, адважны чалавек, светлы дзень, гарыстая мясцовасць, пярэстая карова, сімвалічны знак, ружовая півоня, блізкае возера, лысы сусед, беланогі конь, плаксівы хлопчык, працавітая дзяўчына, старшы сяржант, васільковая сукенка, камяністая дарога, голыя дрэвы, цёмна-зялёная фарба.

- З трыма словазлучэннямі складзіце сказы.

◆ *Творчы зрокавы дыктант*

Ад слоў у дужках утварыце складаную форму найвышэйшай ступені параўнання.

Лю́бая Радзіма! Твае палі — (хлебадайны), твае лугі — (духмяны), твае аблокі — (высокі), твае вятры — (ласкавы), твае крыніцы — (чысты), твае лясы — (прыгожы), твае людзі — (добры) (*Паводле Я. Сіпакова*).

- Якія прыметнікі могуць мець усе формы ступеней параўнання, а ад якіх утвараецца толькі складаная форма вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання?

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце сказы па-беларуску.

1. Нет ничего более изобретательного, чем природа (*Цицерон*). 2. Нет ничего красивее хорошо возделанного поля (*Цицерон*). 3. Счастливее всех тот, кто зависит только от себя (*Цицерон*). 4. Чем кто умнее, тем он скромнее (*Цицерон*). 5. Чужим милее наше, а чужое — нам (*Публилий Сир*). 6. Притворный друг гораздо хуже злейшего врага (*Публилий Сир*). 7. Много прощая, сильный становится ещё сильнее (*Публилий Сир*) (*По изданию «Энциклопедия афоризмов»*).

- Раскажыце пра асаблівасці ўтварэння формаў ступеней параўнання прыметнікаў у беларускай мове.

## Прыналежныя прыметнікі

◆ *Творчы дыктант*

Ад выдзеленых назоўнікаў утварыце прыналежныя прыметнікі. Словазлучэнні запішыце.

Творы *Дубоўкі*, сляды *лісіцы*, канспект *Алеся*, спеў *жаваранка*, дзяцінства *Марынкі*, танец *Лявоніхі*, рукі *Мікіты*, гняздо *кры-*



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

*жадзюба*, праца *краўчыхі*, хатка *бабра*, успаміны *Коласа*, талент *баяніста*.

- Раскажыце, як утварыліся запісаныя прыметнікі. Абгрунтуйце напісанне.
- З утворанымі словазлучэннямі на выбар складзіце два сказы.

◆ *Папераджальны зрокавы дыктант*

Перад запісам словазлучэнняў растлумачце правапіс канчаткаў прыметнікаў.

Убачыў дзедав... хату, каля Антосев... матацыкла, адчуў чалавеч... спагаду, па скрыпуч... снезе, спяваю бардав... песню, у еўрапейск... мастацтве, пакарміў сябрав... папугая, апранула бабулін... сукенку, вучу Андрэев... сына, сустрэў суседав... брата, прывезлі сестрын... дзіця, разбіў мамін... кашпо.

◆ *Тлумачальны зрокавы дыктант*

Прачытайце, раскрываючы дужкі. Запішыце пад дыктоўку. Растлумачце правапіс канчаткаў прыметнікаў. Звярніце ўвагу на варыянтныя канчаткі.

1. Уплыў на развіццё (Купалаў) таленту зрабіла, побач з літаратурамі рускай і ўкраінскай, літаратура польская (*Я. Брыль*). 2. Хай п'е ваду (крынічны) нябога! (*А. Куляшоў*). 3. Аддаўшы лета (бабін) жар кюветам, а нябёсам — павуціны, бярозы голыя чакаюць хмар, гатовыя зарыцца ў іх пярыны... (*А. Куляшоў*). 4. У кляновую замець, у сіні прастор зноў паклікала восень на (матчын) поле (*С. Грахоўскі*). 5. Калі людзі пакрыўдзяць цябе, калі хочацца плакаць, маліцца, — ты ідзі (вузкі) сцежкай у лес, там так лёгка на крыўду забыцца (*Н. Арсеннева*). 6. І куды б ні пайшоў — застаюся пад (буслiны) крылом Беларусі (*С. Законнікаў*). 7. А гэты луг расой (світальны) здалёку будзе мне свяціць (*Я. Янішчыц*).

## Правапіс суфіксаў прыметнікаў

◆ *Творчы дыктант*

Ад прапанаваных назоўнікаў утварыце прыметнікі.

Палессе, казах, шавец, Данбас, мастак, Каўказ, чэх, Чэрвень, грамадства, Латарынгія, Нью-Ёрк, студэнт, Бангкок, фашыст, Нясвіж, Пухавічы, Смалявічы, Добруш, Рыга, славак, студзень, Таганрог,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Брэст, швед, Любань, француз, калмык, узбек, восень, Слаўгарад, рыбак, Добруш, Мядзель, дэпутат, конь, Канада.

- Растлумачце напісанне прыметнікаў. З двума складзіце сказы.

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Выпішыце асобна прыметнікі, у якіх пішацца ***-н-*** і ***-нн-***.

Абедзенны перапынак, сярэбраны кулон, пчаліны ўкус, здаравенны слуп, вогненны шар, хрышчонае дзіця, бетонная падлога, мочаныя яблыкі, аўсянае пячэнне, смажаная рыба, каменны выступ, страшэнны выбух, кухонны камбайн, сыравяленая каўбаса, палымяная прамова, шкляныя пацеркі, алавяныя салдацікі, скураная сумка, гліняныя вырабы, белакачанная капуста, юны тэхнік, драўляная лыжка, неацэнны ўклад.

- Вызначце ў запісаных прыметніках суфіксы. Абгрунтуйце напісанне.
- Зрабіце фанетычны разбор слова ***сцюдзёная***. Растлумачце напісанне.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце напісанне суфіксаў прыметнікаў.

Наша зямля аплоднена нашымі песнямі. У нас ёсць купальскія, куставыя, калядныя, масленічныя, радзінныя, вясельныя песні. У іх расказваецца пра наш побыт, чуецца водгулле далёкіх язычніцкіх свят. Акрамя таго, ёсць чумацкія, паўстанцкія, бурлацкія, казацкія, рэкруцкія, салдацкія, партызанскія песні (*Паводле Я. Сіпакова*).

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.
- Абгрунтуйце напісанне змякчальнага і раздзяляльнага мяккага знака ў словах.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс прыметнікаў.

**Румянка — эмблема паэта**

Будучы ў Горы-Горках, Янка Купала пабываў у сельскагаспадарчым інстытуце, мясцовым батанічным садзе. Там яго віталі дэлегаты настаўніцкай раённай канферэнцыі і вучні мясцовых школ.

Дзяўчынкі ў нацыянальных строях паднеслі Янку Купалу румянкі. Абвясцілі, што менавіта гэтыя кветкі з’яўляюцца эмблемай творчасці паэта. Што ж за яны, тыя краскі?



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

У свеце больш за пяцьдзясят відаў румянкаў. У Беларусі растуць толькі дзікія. Яны з'яўляюцца лекавымі, алейнымі, фарбавальнымі, медадайнымі і крыху атрутнымі. Растуць каля дарог, на незасеяных палетках, на сухіх гарыстых схілах. У гэтых раслін простае лісце, а кветкі ярка-сіне-фіялетавага колеру. Румянкі маюць няправільную форму, пакрыты густымі завіткамі, падобнымі на шырокія гронкі.

Такую эмблему прыдумалі горацкія настаўнікі і вучні народнаму паэту Беларусі (*Паводле У. Ліпскага*).

- Абгрунтуйце напісанне прыметнікаў.
- Растлумачце напісанне слоў з арфаграмай «Правапіс **у** і **ў**».

### *Нормы ўжывання лічэбнікаў*

### Скланенне лічэбнікаў. Спалучальнасць зборных лічэбнікаў

◆ *Выбарачна-размеркавальны дыктант*

Размяркуйце лічэбнікі з тэксту ў адпаведнасці з разрадамі паводле значэння.

На заканчэнне дваццатага стагоддзя ў Беларусі паводле перапісу тысяча дзевяцьсот дзевяноста дзявятага года налічвалася восем мільёнаў сто пяцьдзясят дзевяць тысяч беларусаў, што складае восемдзесят адну цэлую дзве дзясятыя працэнта ад усяго насельніцтва краіны.

А каля чатырох мільёнаў беларусаў жывуць за межамі нашай краіны. У Расіі, да прыкладу, беларусаў больш за мільён, у Польшчы — больш за дзвесце тысяч, ва Украіне — сто тысяч, у Літве — каля шасцідзесяці тысяч. Пяцьсот тысяч беларусаў у ЗША, сто тысяч — у Канадзе, дзясяткі тысяч — у Аргенціне, Аўстраліі, Бразіліі, Францыі, Бельгіі, Германіі і іншых краінах (*Паводле Я. Сіпакова*).

- Растлумачце правапіс лічэбнікаў.

◆ *Каменціраваны зрокавы дыктант*

Падчас запісу тэксту пад дыктоўку пракаменціруйце напісанне лічэбнікаў. Запішыце лікі словамі.

Валяр'ян лекавы — шматгадовая травяністая расліна вышынёй да 1,5 м, з кароткім карэнішчам, ад якога адыходзяць шматлікія тонкія доўгія карані. Сцябло прамастойкае. Лісты з 5—11 парамі



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ліcцікаў даўжынёй 7—25 см і шырынёй 3—10 см. Кветкі дробныя, ружовыя ці лілова-ружовыя, духмяныя, сабраныя ў шчыткападобныя суквецці. Плод 2—3,8 мм даўжынёй і да 1,7 мм шырынёй. Валяр'ян цвіце ў чэрвені — жніўні (*Я. П. Шмярко, І. П. Мазан. «Лекавыя расліны ў комплексным лячэнні»*).

- Вызначце, у якой форме ўжываюцца назоўнікі пры лічэбніках, якія абазначаюць цэлыя лікі, і дробавых лічэбніках.
- Растлумачце напісанне складаных прыметнікаў.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс лічэбнікаў.

ЮНЕСКА — сусветная міжнародная арганізацыя па пытаннях адукацыі, навукі і культуры. Гэта ўстанова Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Яна створана ў тысяча дзевяцьсот сорак пятым годзе. У ЮНЕСКА ўваходзяць амаль дзвесце краін. Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам гэтай аўтарытэтнай арганізацыі амаль шэсцьдзясят гадоў — з тысяча дзевяцьсот пяцьдзясят чацвёртага года. Штаб-кватэра ЮНЕСКА знаходзіцца ў Парыжы. Яе праграмы скіраваны на падтрыманне сусветнай культуры, развіцця чалавека, яго правоў і свабод. У спадчыну нашай планеты занесена пяцьдзясят пяць помнікаў-шэдэўраў культуры са ста дванаццаці краін. Ад Беларусі ўключаны два нашы цуды — Белавежская пушча і Мірскі замак. ЮНЕСКА першай адгукнулася на чарнобыльскую трагедыю ў тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостым годзе і пачала дапамагаць Беларусі пераадольваць наступствы аварыі. У Беларусі дзейнічае асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА, якая працуе па чатырнаццаці праектах і праграмах гэтай сусветнай арганізацыі (*Паводле У. Ліпскага*).

- Абгрунтуйце напісанне ўласных назваў.
- Растлумачце напісанне слоў, правапіс якіх адпавядае правілу «Напісанне слоў разам, асобна, праз злучок».

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне лічэбнікаў.

Касцёл Святых Сымона і Алены — найвыдатнейшы помнік манументальнай архітэктуры пачатку дваццатага стагоддзя ў Мінску. Храм быў пабудаваны ў перыяд з тысяча дзевяцьсот пятага па тысяча дзевяцьсот дзясяты гады. Фундатарамі і ініцыятарамі будаўніцтва касцёла былі муж і жонка Вайніловічы. Яны ахвяравалі сродкі



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

і паставілі храм у памяць пра сваіх памерлых дзяцей. Святыню пабудавалі з чырвонай цэглы, таму яна атрымала другую назву — Чырвоны касцёл. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ён быў перабудаваны пад кінастудыю. З тысяча дзевяцьсот семдзесят пятага года гэты будынак — Дом кіно. У тысяча дзевяцьсот дзевяностым годзе храм вярнулі каталікам (*Паводле Л. Рублеўскай*).

- Вызначце род, лік, склон парадкавых лічэбнікаў.
- Зрабіце фанетычны разбор слова ***стагоддзя***. Абгрунтуйце правапіс.
- Растлумачце напісанне ўласных назваў.

### ◆ *Дыктант-пераклад*

Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Лікі запішыце словамі.

В мире сегодня разговаривают примерно на 5000 разных языков. Самое большое разнообразие языков наблюдается в странах 3 мира. Например, только в Индии существует 800 различных языков. 16 из них являются официальными.

Больше всего людей в Европе говорят на русском языке. Это родной язык для 130 миллионов русских. Кроме того, на нём разговаривают около 50 миллионов белорусов и украинцев. Немецкий язык является родным для 100 миллионов европейцев (*По книге «1000 “детских” вопросов и ответов»*).

- Вызначце разрады лічэбнікаў. Растлумачце іх правапіс.

### ◆ *Каменціраваны зрокавы дыктант*

Прачытайце, устаўляючы замест пропускаў лічэбнікі ***двое***, ***абодва***, ***абедзве***, ***абое***. Пракаменціруйце выбар і напісанне лічэбнікаў.

1. Лазня лазню ганіць, а ... у гразі стаяць (*Прыказка*). 2. Жораў ты, а я — сініца, нас ... бура б’е (*Я. Янішчыц*). 3. У кія два канцы і ... б’юць (*Прыказка*). 4. А ліхтары гулялі ў нашы цені, і гэты вечар быў для нас ... (*І. Багдановіч*). 5. Дзе ... б’юцца, там трэці карыстае (*Прыказка*). 6. Чалавека шкада і шкада мураша: ... душыць праграэс (*Г. Чарказян*). 7. Па арэшніку звонкі смех. Едзем ... у лес зімовы (*Я. Янішчыц*).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## *Нормы ўжывання займеннікаў*

### Некаторыя марфалагічныя асаблівасці займеннікаў

◆ *Пісьмо па памяці*

Вывучыце і запішыце па памяці тэкст.

Сусветны холад панаваў у цемры і акаляў бязмежную прастору. Ён быў Нішто, як безжыццёвасць пусткі, і Усё, як сутнасць вечнага быцця. Ды нейкі рух — жаданне ці памкненне, скрануў той неруш, дзе дасюль яшчэ не нараджалася нічога.

У цішыню ўслухоўваўся Усявышні, у цемрадзь беспрасветную ўзіраўся і зразумеў раптоўна, што іначшым ён прагне адчуваць абсяг. Здзівіўся гэтай думцы нечаканай: «А што магу змяніць? Была веквечна даспадобы мне гармонія сутоння і бязмоўя. Ці варта раўнавагу разбураць?» (*З. Дудзюк*).

- Падкрэсліце займеннікі, вызначце іх разрад, абгрунтуйце напісанне.
- Раскажыце пра асаблівасці афармлення простай мовы на пісьме.

◆ *Творчы зрокавы дыктант*

Запішыце сказы, устаўляючы замест кропак займеннікі ***сябе*** ці ***сам*** у неабходнай форме.

1. Ад ... не схавацца, ад ... не ўцячэш (*П. Панчанка*). 2. Не аддавай ... самоце, заўчасна ёй не саступай (*Н. Мацяш*). 3. Ды на зямлі ўсё ж ёсць адна істота, ад якой усе непамыслоты: сам на ... палюе чалавек (*Я. Сіпакоў*). 4. Найцяжэй судзіць сябе ..., чым у другога плямінку знайсці (*С. Грахоўскі*). 5. Старайся іншых зразумець, тады сябе ..., можа, зразумееш (*Р. Барадулін*). 6. Не выклікай да ... шкадавання, лепш выклікай на ... агонь!.. (*К. Кірэенка*). 7. Прытомлены жыццёваю дарогай, сам у ... заглядвай з асцярогай: а раптам раб там? (*Р. Барадулін*). 8. Суд наш рашаючы і незваротны, суд наш апошні — ... над сабой (*Я. Янішчыц*). 9. Чалавек мае найвялікшую здольнасць — смяяцца з ... сябе (*Я. Скрыган*).

- Растлумачце значэнне слова ***непамыслоты***.
- Абгрунтуйце напісанне займеннікаў.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце напісанне займеннікаў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Адкуль ты ведаеш, дружа, што ты не здатны да таго, каб ісці першым? Чаму загадзя згаджаешся, што месца тваё не наперадзе? *Проста* дагэтуль нават ты сам не ведаў сіл, схаваных у табе, не бачыў жадання прынесці ўсё сваёй грамадзе, свайму народу, свайму чалавецтву штосьці вялікае, непаўторнае (*У. Караткевіч*).

- Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае слова.
- Вызначце разрады займеннікаў. Дайце ім марфалагічную характарыстыку, растлумачце, якімі членамі сказа з'яўляюцца.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Характерная для поведения белорусов черта — их терпимое отношение к другим этническим и конфессиональным группам и общностям. Это означает, что белорусам не свойственны чувства национальной исключительности, своего особого превосходства над другими народами. Белорусские земли всегда были пристанищем для всех преследуемых в других странах (*По изданию «Я — гражданин Республики Беларусь»*).

- Растлумачце напісанне займеннікаў.

## *Нормы ўжывання дзеясловаў*

◆ *Каменціраваны дыктант*

Замяніце формы дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага ліку формамі 2-й асобы множнага ліку. Пракаменціруйце напісанне канчаткаў дзеясловаў.

1. Калі не любіш работу, то карысці ад яе мала. 2. Што раскалолася, таго ўжо не склеіш. 3. На адно крэсла не ляжаш, на два кані не сядзеш. 4. Летам не пасееш — восенню не збярэш. 5. Не паспытаеш дрэннага — не ацэніш добрага. 6. Сонца далонню не закрыеш. 7. Пазнаеш пеўня па грабеньчыку, а парасятка — па лычыку. 8. Што ўмееш, тое за плячыма не носіш. 9. Чалавек не арэх: адразу яго не раскусіш.

- Растлумачце напісанне ***не*** з рознымі часцінамі мовы.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс дзеясловаў цяперашняга і прошлага часу.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Выраз «канферэнцыя круглага стала» звязваецца з расказамі пра легендарнага англійскага караля Артура і яго рыцараў. Круглы стол Артур атрымаў у падарунак ад свайго сябра і заступніка чарадзея Мерліка. Ён хацеў, каб рыцары караля, збіраючыся разам, не спрачаліся з-за больш ганаровага месца за сталом. А за круглым сталом яны былі ўсе роўныя. Канферэнцыяй круглага стала называюць нараду, усе ўдзельнікі якой маюць роўныя правы (*Паводле выдання «Чаму мы так гаворым»*).

- Назавіце арфаграмы ў слове ***збіраючыся***. Пракаменціруйце напісанне.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Семечко рожкового дерева весит точно один карат. Семена этого дерева называют «каратами». Все они имеют один и тот же вес. Раньше их использовали в качестве гирек на весах для взвешивания золота и драгоценных камней. Но и сегодня вес благородных металлов и драгоценных камней указывают в каратах. Один карат соответствует 0,2 грамма (*По изданию «1000 "детских" вопросов и ответов»*).

- Растлумачце напісанне канчаткаў дзеясловаў цяперашняга часу.
- Раскажыце пра асаблівасці спалучэння дробавых лічэбнікаў з назоўнікамі.

◆ *Зрокавы дыктант з граматычным заданнем*

Прачытайце тэкст. Замест слоў у дужках выкарыстоўвайце простую форму дзеясловаў будучага часу.

Гадзіннікі бываюць розныя. Але ж самы маляўнічы прыдуманы шведскім вучоным у васямнаццатым стагоддзі. Гэты гадзіннік — кветкавы. Справа ў тым, што кожная кветка толькі ў пэўны час расхінае свае пялёсткі.

Жоўты казлабарод (разгарнуць) свае кветкі ў тры гадзіны раніцы. За ім (прачнуцца) блакітная цыкорыя, (запунсавець) мак, (зажаўцець) дзьмухаўцы. У шэсць гадзін (парадаваць) вока льняное поле, (закалыхацца) кветкі бульбоўніку, (загарэцца) палявыя гваздзікі. У восем гадзін (раскрыцца) вадзяная лілія.

Пасля паўдня кветкі (пачаць) засынаць. Першым (згарнуцца) ранні казлабарод, за ім — дзьмухавец, кветкі льну. Але да самага заходу будуць цешыць вока кветкі шыпшыны (*Паводле А. Жука*).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

• Як утвараецца складаная форма дзеясловаў будучага часу?

• Назавіце ў словах арфаграмы, напісанне якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу.

◆ *Пісьмо па памяці*

Вывучыце верш і запішыце па памяці.

Любіце травы, дрэвы, рэкі,
Прастор палёў, блакіт нябёс,
Цаніце Працу, Чалавека, —
І Бог вам *дасць* спагадны лёс.
А каб *цанілі* вас у свеце, —
(Я лепшых слоў не *падбяру*), —
Шануйце дзіва на планеце —
Святую нашу Беларусь.
І мову Коласа, Купалы
Беражыце з роду ў род,
Каб наша воля не прапала,
Каб не загінуў наш народ.

*А. Ставер.*

• Растлумачце, як утварыліся дзеясловы загаднага ладу. Ад асноў цяперашняга ці будучага простага часу выдзеленых дзеясловаў утварыце ўсе магчымыя формы загаднага ладу.

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Овладевать умениями, обклеивать комнату, показывать спектакль, постукивать по столу, проповедывать христианство, пощипывать траву, заболевать ангиной, подпрыгивать выше, проветривать помещение, выслушивать замечания, переворачивать больного, заучивать лучше друга.

• Раскажыце пра асаблівасці кіравання ў беларускай мове, выкарыстоўваючы прыклады перакладзеных словазлучэнняў.

• Растлумачце правапіс суфіксаў дзеясловаў. З двума словазлучэннямі складзіце сказы.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце правапіс галосных у суфіксах дзеепрыметнікаў.

1. Ва ўсім тварэнні Боскім на зямлі закладз...ны свой цуд нерасчыт...ны (*І. Багдановіч*). 2. Такому краю — век стаяць: ён так тры-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

вала скро...ны (*М. Рудкоўскі*). 3. І ў сцюжу нечай ласкай ты сагр...-ты, і ў спёку пекане цябе зіма (*П. Панчанка*). 4. Дрэву перасадж...-наму гола ў чужой маркоце й цішыні... (*Р. Барадулін*). 5. Я да ско-ну заруч...ны з той стараною, дзе мама да скону стаіць нада мною (*Р. Барадулін*). 6. У кожнага з нас ёсць сасуд любові. Калі ён не напоўн...ны ў дзяцінстве, дык усё жыццё будзеш пакутаваць ад смагі і неспатоленасці (*С. Алексіевіч*).

- Пазначце суфіксы дзеепрыметнікаў. Падкрэсліце кароткія дзее-прыметнікі адной рыскай, а поўныя дзвюма.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

### ◆ *Творчы зрокавы дыктант*

Прачытайце. Ад дзеясловаў, што ў дужках, утварыце дзеепрыслоўі. Сказы запішыце пад дыктоўку.

1. Без веры і надзеі ў свеце ўсё пастыла, бо, (згубіць) сэрца крэ-пасць, чалавек — магіла (*Я. Колас*). 2. Верай і праўдай надзеі служы, (помніць) вечна, што ёсць і табе вымярэнне — кропля аддадзенай справе Айчыны крыві (*С. Законнікаў*). 3. Жыву, (не траціць) надзей, бо веру ў дабро людзей (*С. Грахоўскі*). 4. Толькі (страціць) Радзіму, будзеш, як камень, сляпы і глухі (*М. Танк*). 5. Усе шляхі вядуць да-хаты, выток (шанаваць) спрадвек (*У. Мазго*). 6. Я схілю галаву на калені твае і, (не піць) віна, захмялею (*М. Башлакоў*). 7. А, (пажыць) у заморскай далечы, (паглядзець) рэкламны рай, зразумеў я, дамоў (прылятаць), як мне дораг мой родны край (*Г. Бураўкін*).

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.
- Зрабіце марфалагічны разбор аднаго дзеепрыслоўя.

### ◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце правапіс дзеясловаў загаднага ладу і дзеепрыслоўяў.

**Асцярожна! Тонкі лёд!**

Калі вы праваліліся пад лёд на рацэ ці возеры, не панікуйце. Спачатку шырока раскіньце рукі па беражках лёду і спрабуйце ўтрымацца ад апускання пад ваду з галавой. Дзейнічайце рашуча і не бойцеся!

Не абломвайце беражок, выбірайцеся без рэзкіх рухаў, напаў-заючы на лёд грудзьмі і па чарзе выцягваючы на паверхню лёду ногі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Калі на вашых вачах праваліўся пад лёд чалавек, адразу крыкніце яму, што ідзяце на дапамогу. Набліжацца да палонкі можна толькі паўзком, шырока раскінуўшы рукі. Будзе лепш, калі вы пакладзяце пад сябе лыжы ці што-небудзь іншае, каб павялічыць плошчу апоры.

Трэба помніць адзін з законаў школы выжывання: кожны прадмет можа быць прыладай выратавання. Падаўшы пацярпеламу падручны сродак выратавання, трэба выцягнуць яго на лёд і паўзком выбрацца з небяспечнай зоны. Затым пацярпелага трэба ўкрыць ад ветру, як мага хутчэй даставіць у цёплае месца, расцерці, пераапрануць у сухое і напаіць гарбатай (*Паводле паведамлення Цэнтральнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях г. Мінска*).

- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры дзеепрыслоўных зваротах.

### *Нормы ўжывання прыслоўяў*

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

1. Чем честнее человек, тем менее он подозревает других в бесчестности (*Цицерон*). 2. Легче находятся такие люди, которые добровольно идут на смерть, чем такие, которые терпеливо переносят боль (*Юлий Цезарь*). 3. Чем глубже скрыт недуг, тем злее он и опасней (*Вергилий*). 4. Часто лучше не замечать обиду, чем мстить за неё (*Публилий Сир*). 5. Счастье легче найти, чем сохранить (*Публилий Сир*). 6. Обидеть легче, чем обиду вытерпеть (*Публилий Сир*). 7. Легче переносить терпеливо то, что нам не дано исправить (*Гораций*) (*По изданию «Энциклопедия афоризмов»*).

- Растлумачце напісанне формаў ступеней параўнання прыслоўяў.
- Зрабіце марфалагічны разбор аднаго прыслоўя.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам тэксту растлумачце правапіс канчаткаў розных часцін мовы.

**Каляды**

Кажуць, Каляды вянчаюць задуменны вечар года і даюць пачатак ночы глыбокай. Кажуць, стаяць яны на мяжы сонцавароту, пад аховай старажытнага бостава Каляды. Можа, таму і завуцца Калядамі



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

завейныя дні зімовага сонцастаяння, што кола спрадвечнае жыццёвае ад іх коціцца ў неўміручасць.

Едзе Каляда ў чырвоным вазочку па заснежаным бальшаку. Тупае пад вокнамі. Дыхае ля агню шапоткага. Хто яна? Прыдумка прапрадзеда неразумнага? Ці мудрасць сусвету вечнага?

Не, Каляда не пачатак няспыннага шляху па крузе быцця. Каляда — прадвесце зачыну, насенне, што тоіць у сабе выбух нараджэння. У гэту ноч на шалях часу знаходзяцца спакой і зладжанасць аж да самага веснавога раўнадзенства. Потым вясну загукаюць. І завязь памкне да Вялікадня, да купальскай раскошы плоднасці. Затым да поўнага зямным набыткам Багача і ціхамернай гаворкі з продкамі на Дзяды ўвечары.

А пакуль што ў хатах сялянскіх Каляду сустракаць збіраюцца. Чакаюць, калі першая зорка запаліцца ў небе вечаровым. Задуменна глядзяць святыя з абразоў, беражліва агорнутых вышыванымі ручнікамі. Княжыць гармонія прыроды, чалавека і Космасу (*Паводле Х. Лялько*).

- Які парадак слоў назіраецца ў сказах апошняга абзаца?
- Назавіце ў словах арфаграмы, напісанне якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу.

◆ *Дыктант «Правяраю сябе»*

**Незабыўнае**

Як усё-такі адарваны мы ў горадзе ад прыроды!.. Сядзім у гэтым аднастайна-шэрым, каменным палоне і не бачым ні сонца, ні неба, ні зор. Усё міма нас: і п'янкая квецень садоў, і срэбразвонны гоман крыніц, і чысты спеў птушак.

Ды што там казаць! Снегу і таго як след не бачым. Ледзь выпадзе ён, як адразу ж зграбаюць яго, вывозяць хутчэй, каб не перашкодзіў гарадскому руху.

Гляджу іншы раз я на гэты стаптаны, брудна-рыжы, перамешаны з пяском снег, і шкада мне яго робіцца. Лішні, непатрэбны ён сярод царства машын і асфальту. А як жа чакаюць, як радуюцца яму ў вёсцы! Там ён — і чароўны ўбор, і вясёлая забава, і незаменны работнік, што клапатліва ўкрывае палі ад лютых маразоў, разгортвае бясконцыя палотны лёгкіх, іскрыстых дарог.

Чаму я так часта — і думкамі, і сэрцам — вяртаюся ў вёску? Напэўна, таму, што там — мае карані, там — свет маіх казак, здзейсненых і нязздзейсненых мар. І яшчэ, напэўна, таму, што назаўсёды



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

жывуць у маёй душы, як малітва, саборная цішыня бароў, шэпт спелай збажыны, пах свежага сена, смак глытка крынічнай вады ў спякотлівы дзень. Гэтага нельга зразумець, адчуць кароткімі наездамі, аднадзённымі наскокамі на прыроду. Сярод гэтага трэба жыць! (*Паводле З. Прыгодзіча*).

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

**Древнее пчеловодство**

В глухих местах Беловежской пущи можно встретить деревья со следами древнего пчеловодства — бортничества.

Дерево, выбранное для борти, всегда возвышалось над лесом, находилось возле поляны или водоёма. Это был хороший ориентир для пчёл. К одному из сучьев подвешивали тяжёлую колоду. Это приспособление спасало борть от разорения медведем. Чтобы добраться до борти, зверь должен был оттолкнуть колоду. Однако она с силой возвращалась обратно. Это раздражало зверя, он толкал ещё сильнее. И колода сбивала его с дерева.

На какие только ухищрения не шёл древний человек, чтобы раздобыть мёд и воск (*По Ф. Кочко*).

◆ *Вольны дыктант*

Запішыце тэкст па частках.

**Прырода — наш дом**

1. На Каўказе мы часта сустракалі сляды, пакінутыя падарожнікамі на ўлонні прыроды. Гэта незлічоныя маладыя дрэўцы, ссечаныя на калкі́ для палатак і рагаткі для вогнішчаў, захламленыя пляцоўкі, горы ржавых бляшанак.

2. Яшчэ больш прыкра бачыць, калі свядома нявечацца ўнікальныя помнікі прыроды. Квадратныя метры сцен, скал, аўтобусных прыпынкаў усыпаны безліччу імён, назваў гарадоў. Яны выглядаюць, як стэнды, дзе дэманструецца чалавечая пыхлівасць.

3. Я чуў, што ў некаторых кантонах Швейцарыі каля помнікаў прыроды спецыяльна для аматараў такой формы самасцвярджэння ставяць вялікую пліту. Калі паверхня яе будзе поўнасцю зрэзана і спісана, пліту прыбіраюць і замяняюць новай.

4. Аднак думаецца, што не ініцыялаадводы, а мэтанакіраваная растлумачальная работа павінна дапамагчы нам захаваць аб’екты прыроды (*Паводле С. Лукашэвіча*).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

• Вызначце, да якога стылю адносіцца тэкст. Якія моўныя сродкі характэрны для гэтага стылю? Якія сродкі сувязі сказаў пераважаюць у частках тэксту?

• Пры дапамозе тлумачальнага слоўніка растлумачце значэнне наступных слоў: ***кантон***, ***пыхлівасць***, ***ініцыялаадвод***.

• Запішыце тэкст пад дыктоўку.

## Сінтаксічныя нормы

### *Правілы дапасавання і кіравання*

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Отрекаться от родной земли, заведующий магазином, согласно постановлению родительского комитета, жениться на соседке, отвечать лучше друга, думать о матери, пойти в лес за грибами, отчёт о проделанной работе, пролог к книге, издеваться над животными, две пятых задания, отказаться от наследства в пользу сестры, лиса хитрее волка, прислать по адресу, писать в надежде на ответ, поехать за товаром, неуверенность в успехе, договориться о сроке сдачи сочинения, дедушка мудрее внука, смеяться над собой.

• Раскажыце пра асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

### *Асаблівасці пабудовы сказаў з аднароднымі і адасобленымі членамі. Парадак слоў у сказе*

◆ *Творчы дыктант*

Дапішыце ў сказах патрэбныя па сэнсе аднародныя члены.

1. Белая вясновая замець пялёсткаў ляжала ўсюды: на маладзенькай траўцы, ..., ..., ... . 2. Лес, і ..., і ... радаваліся надыходу цёплых вясенніх дзянькоў. 3. З выраю прыляцелі шпакі, ..., ... . 4. Казуркі і ..., ... і ... — усе сустракалі вясну.

• Пабудуйце схемы запісаных вамі сказаў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Пісьмо па памяці*

Вывучыце ўрывак з верша М. Танка «Хата з краю» і запішыце па памяці.

Мая хата — з краю.
І ў таго, хто жыве ў ёй,
Усе дні — клапатлівыя,
Усе ночы — бяссонныя,
Усе лавы — занятыя.
І ніколі не гуляюць,
Ні хвіліны не святкуюць
Ні печ, ні качарэжнік,
Ні міскі, ні лыжкі,
Ні конаўкі, ні цымбалы.

- Назавіце сказ з адваротным парадкам слоў. Абазначце ў ім паўзы, лагічны націск.
- Растлумачце напісанне ***не***, ***ні*** з рознымі часцінамі мовы.

◆ *Графічны дыктант*

Запішыце схемы сказаў, графічна абазначыўшы члены сказа.

Думкі мае... Снуюць у галаве маёй сонна, лянiва. Наляціць жыццёвы ветрык, ускалыхне іх. Заварушацца яны хутчэй.

Раптам ад мацнейшага парыву падымуцца ўсе. Закруцяцца яны хутка-хутка. У галаве цесна ім. Хочуць думкі на волю. З шалёнай сілай б'юцца аб сценкі галавы і прычыняюць боль.

Сціхніце, думкі мае. Дайце спачыць... (*Паводле З. Верас*).

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных і адасобленых членах сказа.

Круглы год жывуць у лесе крыжадзюбы — незвычайныя птушкі, сваімі паводзінамі і афарбоўкай падобныя на папугаяў. Дзюба птушкі, выгнутая ў розныя бакі, дазваляе спрытна лушчыць яловыя шышкі, выцягваючы з-пад лускавінак смачнае насенне.

Дзівосна тое, што крыжадзюбы выводзяць птушанят, калі на зямлі, і на дрэвах, і на краі гнязда ляжыць снег. Як гэтым маленькім камячкам, голым і сляпым, не шкодзяць халады? Справа ў тым, што



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

крыжадзюбы будуюць гнёзды пад аховай ствала ці бліжэй да канцоў галінак, у лапах елак. Верхнія пушыстыя лапы, навісаючы над гняздом, укрываюць яго ад снегападу і моцных вятроў. Гнёзды птушкі ўюць вялікія, з тоўстымі сценкамі. Для каркаса выкарыстоўваюць пруцікі, лішайнікі, імхі, сухую траву і пер’е. Так што марозу і холаду ніяк не прабіцца ў гняздо (*Паводле Я. Галубовіча*).

- Абгрунтуйце напісанне канчаткаў назоўнікаў.
- Назавіце сказы з адваротным парадкам слоў. З якой мэтай яны выкарыстоўваюцца ў тэксце?

### *Сувязь дзейніка і выказніка ў сказе*

◆ *Зрокавы дыктант з граматычным заданнем*

Запішыце сказы, ужываючы дзеясловы ў дужках у неабходнай форме.

1. Беларусу і ў Парыжы (сніцца) белізна бяроз і сосен медзь (*П. Панчанка*). 2. Шмат шчасліўцаў за ёй (паляваць) па няходжаных сцежках ласёў (*А. Куляшоў*). 3. Не хачу дажыць часоў, калі плечы ад гадоў сагнуцца і з усіх маіх былых сяброў толькі дзве далоні (застацца) (*М. Танк*). 4. У кожнай душы немінуча (сядзець) — Чалавек і журба (*Н. Мацяш*). 5. Да споведзі (прыходзіць) кожны з нас, грахоўны больш ці менш сваёй істотай (*В. Аколава*). 6. Як помнік старыны, (стаяць) дзве рослыя сасны ля заводскай сцяны (*А. Александровіч*). 7. Нібыта з мудрай свахаю свой дзелячы сакрэт, я з вёскай *Гаравахаю* (ісці) у вялікі свет (*Я. Янішчыц*).

- Раскажыце пра адметнасць сувязі дзейніка і выказніка ў сказе.
- Назавіце ў словах арфаграмы, правапіс якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.

### *Правілы ўжывання дзеепрыслоўных зваротаў*

◆ *Творчы дыктант*

Дапішыце сказы.

1. Сабраўшыся каля кастра, ... 2. Наведаўшы хворага таварыша, ... 3. Паведамляючы пра здарэнне, ... 4. Чытаючы аповесць, ... 5. Станцаваўшы «Беларускую польку», ... 6. ... і, зачарпнуўшы вады, ... 7. Убачыўшы жаўну, ... 8. ..., але, сустрэўшыся з ёй вачыма, ...



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

• Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры дзеепрыслоўных зваротах.

• Раскажыце пра асаблівасці спалучэння дзеепрыслоўя і выказніка ў сказе.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры дзеепрыслоўных зваротах.

Над лугам паволі ўставала сонца. Яно, падымаючыся з травы, увачавідкі большала. Нарэшце, нібы выслізнуўшы з нечых учэпістых рук, якія моцна трымалі яго за небасхілам, адскочыла ад зямлі і вольна загайдалася над лугам. Зараз, узняўшыся над травою, сонца было зусім чыстае ад расы.

Раса была нечапанаю толькі тут. А там, дзе пасвіўся табун, трава была павыскубленая і падратаваная. Там, знайшоўшы густыя купкі яшчэ не стаптанай за ноч травы і ўсунуўшы ў росную зеляніну мокрыя пысы, задаволена фыркалі коні, спяшаючыся наскубціся на цэлы дзень. Падняўшы высока галовы, задумліва жавалі жуйку сытыя ўжо каровы. Яны, не варушачыся, глядзелі на дарогу, нібы спрабуючы ўявіць, ці дужа цяжкім для іх будзе сённяшні пераход (*Паводле Я. Сіпакова*).

• Абгрунтуйце напісанне дзеясловаў, дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў.

## *Асаблівасці пабудовы складаных сказаў*

◆ *Графічны дыктант*

Пабудуйце схемы складаных сказаў. Адзначце тып даданай часткі.

1. А найлепшая тая дарога, што вядзе на бацькоўскі парог (*А. Бялевіч*). 2. Людское сэрца адчуваць, каб зрухі самыя танчэйшыя сваёй душой расшыфраваць (*Ю. Свірка*). 3. А хопіць і куточка Беларусі, каб цэлы век свой да яе ісці (*Н. Мацяш*). 4. Нам край належыць, пакуль ззяюць зоры (*А. Александровіч*). 5. Нам тыя вяртаюцца кветкі, што самі сабе ўзгадавалі (*Е. Лось*).

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Была пара, калі ў прыродзе ўсё аднаўляецца і квітнее.

У такую пару чалавек па-свойму ўспрымае ўсё навокал. У гэты час з падлеткамі робіцца тое, што ва ўсе часы рабілася з людзьмі ў гэтым узросце: абуджаюцца пачуцці і да многіх прыходзіць першае каханне.

Такою парою Васілю як ніколі хацелася быць сярод прыроды. Яго вабіў лес. І ён пайшоў туды, дзе ўсё зачароўвала, дзе на палянах па-стральцоўску блакітны вецер, сінія далі. Здаецца, ніколі не бачыў такога святла. Здаецца, ніколі не замілоўвалі так, як зараз, сасонкі, верас, трава, ландышы.

Было адчуванне, нібы гэтай вясной ён упершыню бачыць пачатак лета і заканчэнне вясны.

І Васіль глядзеў на ўсё навокал зачаравана. Ён прагна ўбіраў усё ў сваё ўяўленне, нібы баяўся, што гэту прыгажосць нехта можа ў яго адабраць. Хлопец разумеў, што стан прыроды адпавядае стану чалавека. Ведаў, што прырода жыве сваімі сумам і радасцю, што ў яе свая задуменнасць і адвечная мудрасць (*Паводле У. Саламахі*).

- Назавіце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу.
- Складзіце схемы складаных сказаў.

### ◆ *Дыктант «Правяраю сябе»*

Буслы сёлета не данеслі вясну на крылах — згубілі недзе па дарозе. А Радзіма сустрэла птушак непагаддзю і мяцеліцай. Яны невядома куды пахаваліся, калі за снегавой завесай свету белага не было відаць.

Уздыхалі людзі, гледзячы на апусцелыя, прыкрытыя белымі сурвэткамі снегу гнёзды, дзе яшчэ пазаўчора клекаталі ад радасці, што вярнуліся дахаты, сімвалы вясны і новага жыцця. Людзі баяліся, што буслы, сустрэўшы ў родных мясцінах такі негасцінны прыём, зляцелі кудысьці на Палессе ці ў Польшчу. І не будзе больш белачорных крылаў у блакітнай высі дзесьці зусім блізка ля сонца, не будзе гарэзлівага віску маладых буслянят.

Ад думкі, што ўсяго гэтага больш можа не быць, станавілася яшчэ халадней і няўтульней у гэтым і без таго няўтульным і халодным свеце.

Аднак, як толькі выглянула сонца, злізала апошні снег і падсушыла сталічныя тратуары, мамін вясёлы голас абвясціў у тэлефоннай трубцы: «Алёнка, буслы вярнуліся! Бачыла сёння на гняздзе. Худыя, жоўтыя нейкія, але адзін ужо клекатаў...».



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Зваліўся з сэрца камень. Яны не маглі не вярнуцца. У іх жа ўсё як у людзей. Радзіма — суровая, заснежаная, галодная, застаецца радзімай. Туды і толькі туды нясуць з усіх дарог стомленыя крылы (*Паводле А. Ляўковіч*).

## Пунктуацыйныя нормы

### *Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі*

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.

1. К чужой не прымяраўся мерцы, не ездзіў на чужым кані. Сяброў я выбіраў па сэрцы, па іх душэўнай цеплыні (*А. Астрэйка*). 2. Сяброў бяда не дзеліць, а зbліжае (*Н. Гілевіч*). 3. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць (*К. Чорны*). 4. Усё жыццё складаецца то з мімалётных радасных сустрэч, то з нечаканых і цяжкіх расстанняў з блізкімі тваімі, з хлебам, з сонцам (*М. Танк*). 5. Пакланюся простым рэчам: слову шчыраму, працы людской, хлебу вечнаму з кожнай печы, ці вясковай, ці гарадской (*В. Ярац*). 6. Нехта дужы, і смелы, і горды расчасаў па загонах чупрыны (*А. Мілюць*). 7. Сухі бруснічнік, мяккі мох, чубкі салодкіх траў, ядлоўцу лапкі — усё, што мог, між дрэў ён выбіраў (*К. Кірэенка*).

- Назавіце сказ з некалькімі радамі аднародных членаў. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку.
- У адпаведнасці з якімі правіламі напісаны арфаграмы ў слове ***расчасаў***?

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа.

Сустракаючыся з Уладзімірам Мікалаевічам Дубоўкам, я заўсёды дзівіўся, які прыгожы чалавек! Якія ясныя, разумныя і шчырыя вочы ў гэтага барадатага казачніка! Яны, здаецца, бачаць усё навылёт і праменяцца святлом шчодрай душы.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Дубоўка быў цудоўным чалавекам, нястомным працаўнікам, выдатным паэтам, перакладчыкам, казачнікам, знаўцам фальклору і сусветнай літаратуры, батанікі і пчалярства, чалавечых характараў і сакрэтаў будаўніцтва. Ён дасканала ведаў Беларусь і Закаўказзе, Сібір і Крым, Поўнач і Далёкі Усход. Слухаць яго можна было гадзінамі і бясконца чэрпаць новае і невядомае з гэтай жывой і шчодрай энцыклапедыі. Такі ён быў у жыцці, такі і ў творчасці. Стрыманасць, мудрасць, шчырасць і мяккасць — адзнакі яго паэтычнага і чалавечага таленту (*С. Грахоўскі*).

- Вызначце сэнсава-стылістычную ролю сказаў з аднароднымі членамі, абгрунтуйце мэтазгоднасць іх ужывання.
- Пабудуйце схему першага сказа другога абзаца.

## *Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі*

### Знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях і прыдатках

◆ *Каменціраваны дыктант*

Растлумачце ў час напісання пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных і адасобленых азначэннях.

1. Слугуе, жыве ён, адкрыты вятрам, мой край белакоры, язычніцкі храм (*М. Мятліцкі*). 2. Груша падобная да высознай елкі — зграбная, святочная, з вострым голлем (*Л. Дранько-Майсюк*). 3. На пагорку, сцішаны, стаяў і вясну адхукваў у далонях — кветку-сон, дзіўнейшую з праяў, што з блакітным жаўранкам гамоніць (*В. Зуёнак*). 4. Нідзе няма такіх бяроз, як на маёй Радзіме. Такіх русявых доўгіх кос, такіх азімін (*Н. Загорская*). 5. Хваляваннем душа напоўніцца, і, самотны, увесь на віду, ціхім голасам, родным Полацкам я да ліку твайго прыпаду (*Н. Гальпяровіч*).

- Зрабіце лексічны разбор слова **лік**.
- Пабудуйце схему першага сказа.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем кожнага сказа растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых прыдатках.

1. Гляджу ў заплаканыя вочы старых жабрачак — родных хат, дзе па-над стрэхаю рагоча, мяне спаткаўшы, вецер-хват (*М. Ча-*



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

*рот*). 2. Ціха таньчым у краіне для дваіх, навакол ахова — бэзу вежы (*І. Багдановіч*). 3. Шчасце любога з нас, смяротных, у тым, што мы можам мысліць (*Л. Дайнека*). 4. Жыццё не пачалося з казкі. Як не хапае ім, малым, бацькоўскіх рук, бацькоўскай ласкі (*Ю. Свірка*). 5. Рака наша слаўная, Нёман, чысцейшая чэрвеньскіх рос... (*А. Астрэйка*). 6. Пакінь адну пасаду — быць чалавекам (*С. Грахоўскі*). 7. Ты з хаты выйшла — лёгкая касынка, кавалачак паднебнага блакіту (*М. Мятліцкі*). 8. Асіліць не магу на тройку з мінусам адзін прадмет — Жыццё (*М. Танк*). 9. Вы не хварэйце толькі на зазнайства — страшнейшую хваробу ўсіх вякоў (*Ю. Свірка*). 10. Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы росквітам Княства Літоўскага, нашага краю, і называюць той век залатым (*М. Гусоўскі*).

- Назавіце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.
- Зрабіце словаўтваральны разбор слова ***росквіт***.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа, адасобленых азначэннях і прыдатках.

Незвычайнай, нейкай новай з выгляду паўставала перад ім Беларусь.

Магутныя рэкі з мноствам прытокаў здаваліся своеасаблівымі жывымі галінкамі, што атулілі аблюбаваную імі зямлю. Нядрэнна прыдумана ўсё гэта пачатковымі сіламі светабудовы. Проста і шчодра, з пяшчотай зроблена.

Майстры-дэкаратары падумалі і пра тое, каб не было сумнай аднастайнасці. Чаму серабрыцца павінны толькі адны галінкі-рэчышчы? А хіба шматлікія ўпадзіны, сведкі грукату вулканаў і скрыгату ледавікоў, не варты таго, каб бліскаць рознафігурнымі пацеркамі?! І вось тысячы азёраў, быццам крыштальныя расінкі, абтрэсеныя з галінак, парассыпаліся тут і там. Сціплыя, задуменныя, яны лагодна зіхцяць на сонцы.

Цікава, прывабліва. Асабліва калі бачыш усё разам: і гэтыя галінкі з расінкамі, і тое шырачэзнае ўлонне, якое іх трымае і гушкае (*Паводле М. Ткачова*).

- Абгрунтуйце напісанне прыметнікаў і дзеепрыметнікаў.
- Зрабіце марфемны разбор складаных слоў.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях, дапаўненнях і ўдакладняльных членах сказа

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам сказаў растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых акалічнасцях, дапаўненнях, удакладняльных членах сказа.

1. Жыву, не трацячы надзей, бо веру ў дабро людзей (*С. Грахоўскі*). 2. Шчасце! Нешта не чуў я, каб хто яго стрэў на чужыне, нават самай прыгожай (*М. Танк*). 3. Старасць — час, калі не маеш права, апроч сну, адпачынку, спакою, ні на адзін дзень адкласці свае справы (*М. Танк*). 4. Усе шляхі вядуць *дахаты*, выток шануючы спрадвек (*У. Мазго*). 5. Толькі страціўшы Радзіму, будзеш, як камень, сляпы і глухі (*М. Танк*). 6. Усе радасці жыцця кароткія, усе хутка мінаюць, акрамя адной — радасці працы (*І. Шамякін*). 7. Замест свечкі, лепей быць гранатай (*М. Танк*). 8. Чалавек жа, нават і акамянелы, не бывае без сэрца (*К. Чорны*).

- Пабудуйце схему першага сказа.
- Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленага слова.

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку пры ўдакладняльных членах сказа.

**Дзе шукаць цябе, Беларусь?**

Калі глобус у вас пад рукою, паволі пакруціце яго па гадзіннікавай стрэлцы, знайдзіце нулявы мерыдыян. Зусім побач, крыху лявей ад яго, паміж дваццаць другім і трыццаць чацвёртым градусамі ўсходняй даўгаты, паміж пяцідзясятым і шасцідзясятым градусамі паўночнай шыраты (гэта вышэй за экватар) вы лёгка заўважыце зялёную, нават смарагдавую выяву. Яна сваімі абрысамі нагадвае вытанчаны кляновы лісток.

Гэта і ёсць Беларусь, наша старажытная зямля.

Бачыце, вось там, зверху, навісае над намі падобны на мядзведзя Скандынаўскі паўвостраў, а ўнізе, пад намі, ніжэй за Балгарыю і Турцыю, ніжэй за Чорнае мора, праліў Дарданелы і Міжземнае мора — Афрыка (*Паводле Я. Сіпакова*).

- Назавіце сказ з прыдаткам. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з устаўной канструкцыяй.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## *Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі*

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

1. Як завіруха белая, як белая сцяна, нявеста пасівелая прымоўкла ля акна (*Я. Янішчыц*). 2. Па прызванні быццам дворнік, а рыхтуе вершаў зборнік (*К. Крапіва*). 3. Печ прыгорне нас, як матка, добра там, дзе я здароў (*Я. Колас*). 4. Нібыта бацька, гадаваў ты змену і за сабою маладзейшых вёў (*Ю. Свірка*). 5. Жыві, шукай, усё рабі як след, каб на Радзіме твой свяціўся след (*С. Грахоўскі*). 6. На свеце няма даражэйшых дарог, як гэта — дарога да роднага дома (*С. Басуматрава*). 7. Прадчувала цябе як адну з найлепшых загадак (*І. Багдановіч*). 8. Язык як смык, і знай, дзе ўдарыць (*В. Зуёнак*).

- Вызначце, у якой форме ўжыты дзеясловы ў сказах.
- Зрабіце фанетычны разбор слова ***пасівелая***.

◆ *Дыктант па памяці*

Вывучыце і запішыце па памяці верш Н. Гальпяровіча.

Захавай маю мову, чарговы наш век;
Захавай, як лясы, сенажаці, азёры;
Як світанне ў расе, як сцяжынку ў траве,
Як у жніўнай расе адзінокія зоры...
Захавай маю мову для родных маіх;
Захавай не як памяць, як кветку жывую,
Захавай маю мову, як зрок і як слых,
Як мелодыю свету, якую я чую.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры канструкцыях з ***як***.

## *Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі*

◆ *Графічны лічбавы дыктант*

Запішыце нумары сказаў з пабочнымі словамі.

1. Зямля — мая калыска, табе адной відаць, што немагчыма нізка ні падаць, ні лятаць (*Я. Янішчыц* ). 2. Відаць, цяжэй за ўсё вырвацца з турмы, якую чалавек пабудуе сам сабе (*М. Танк*). 3. Гэты свет — вялікая гаспода, і ў гасподзе мусім жыць людзьмі (*Р. Барадулін*).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

4. Даў бог яму талент, ды на розум, відаць, паскупіўся (*М. Танк*). 5. Еднасці лепшай не знойдзецца, мусіць, — слова з мелодыяй, як спарышы (*С. Законнікаў*). 6. Не прыпыняйся, не жахайся, слова!.. Хай адвячорак доўгім ценем лёг — магчыма немагчымая размова датуль, пакуль магчымы маналог (*А. Куляшоў*). 7. Забылі пра самую небяспечную хваробу — пра слепату ад славы ці ўлады. Можа таму, што яна амаль не паддаецца лячэнню (*М. Танк*). 8. Мая мова — як шчасце на вуснах, хвалявання гарачы прыбой, можа быць, на чужой засмяюся, усё ж заплачу з тугі на сваёй (*Л. Геніюш*).

◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку пры ўстаўных канструкцыях.

1. Да ўсяго — нават разумення табліцы множання — трэба даходзіць самому (*М. Танк*). 2. Ёй [мове] — самароднай, самай роднай — ні крыўдай нізкай, ні апіскай не здраджу (*А. Вольскі*). 3. У зеніце лета — ліпені — на душы гаркаваты асадак (*Г. Марчук*). 4. А жыццё (хоць памры!) не пачнецца спачатку (*В. Аколава*). 5. Калі б ды *кожны* з маленства думаў, які — ці светлы, ці прыгожы — пакіне ў памяці ён след (*Н. Гілевіч*). 6. Стагоддзі будуць, бы кіты, плысці, пакуль — у муках — зможа наш нашчадак да сутнасці нябеснае дайсці (*М. Рудкоўскі*).

- Назавіце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу.
- Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленага слова.

◆ *Пісьмо па памяці*

Вывучыце і запішыце па памяці ўрыўкі з вершаў Ніла Гілевіча.

Пашкадуем, і моцна яшчэ пашкадуем,
Як да розуму прыйдзем (а прыйдзем, відаць),
Што, пра будучнасць дбаючы, гэтак бяздумна
Завіхаліся памяць сваю абкрадаць.

Адну надзею толькі ў сэрцы маю
(Пра гэта скажа нехта, як пра грэх),
Што родны край і праз вякі пазнаю
Па песні матчынай... Я — за прагрэс.

- Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.
- Вызначце, у якой форме ўжыты дзеясловы ў тэкстах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## *Знакі прыпынку ў сказах са зваротkамі*

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам выслоўяў Я. Коласа растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры зваротках.

1. Не будзе сэнсу з цябе, хлопча: у гразь жыццё цябе затопча. 2. Ой, саколю, непрымецен, ды вялік жаночы труд! 3. Браце! Адна ёсць дарога табе: шлях той у працы і ў барацьбе. 4. Ну, што ж, Антось, здароў будзь, браце! Няхай дае бог лад у хаце... 5. Дружа! Кінь на неба вока — колькі зорак, колькі зор! 6. — Здалёк мы, пане-гаспадару: чатыры мілі за Нясвіжам (Міхал лічыў Нясвіж Парыжам). 7. Дык вось як, саколю, бывала даўней, ці блага, ці добра — вам збоку відней. 8. Дай, божа, добрую прыгоду, каб больш налета было мёду.

- Знайдзіце ў сказах клічную форму назоўнікаў. Раскажыце пра адметнасць яе выкарыстання.
- Пабудуйце схему апошняга сказа.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах са зваротkамі.

1. О таямніца кніг, скажы, з якіх людскіх глыбінь ты цуды здабывала? (*А. Куляшоў*). 2. Дзе згубіліся Вы, мой нязбытны каханы? Мяккі шэпат травы, пералескі, курганы... (*Я. Янішчыц*). 3. Круціцеся, колы, *сціраючы* гуму (*Л. Дранько-Майсюк*). 4. Народ мой, *дзякую* табе, што і на міг мне не дазволіў, каб я кагосьці абязволіў, жыў у кагосьці на гарбе (*Г. Бураўкін*). 5. О, боязь за *другога* чалавека!.. Адна ты робіш чалавека з нас (*Н. Мацяш*). 6. Ласка і гнеў, ціша і бура! Я вітаю вас, калі вы прыходзіце ў сваім часе (*Я. Колас*).

- Зрабіце сінтаксічны разбор чацвёртага сказа.
- Вызначце, якімі часцінамі мовы з′яўляюцца выдзеленыя словы.

## *Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах*

◆ *Тлумачальны дыктант*

Запішыце прыказкі і прымаўкі пад дыктоўку. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах.

1. На год сем прыгод, а на вяку — без лі́ку. 2. Добрая песня, ды спявак дрэнны. 3. Іржа есць жалеза, а зайздрасць — сэрца чалавека. 4. Куюць каня, а авечка нагу падстаўляе. 5. Хіцер Зміцер, але і Саўка



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

не дурань. 6. За сем работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца. 7. Сякерай раз рубане — і рубель у карма́не. 8. У паляўнічага дым густы, ды абед пусты. 9. Ёсць што гаварыць, але няма чаго слухаць. 10. Тыя ж штаны, толькі вузлом назад. 11. Прыбяры пень — і пень будзе прыгожы.

- Растлумачце сэнс алегарычных прыказак.
- Назавіце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.

## *Знакі прыпынку ў складаназалежных сказах*

### ◆ *Каменціраваны дыктант*

Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах.

1. Хоць не забылі б сейбітавы дзеці, што сіла ў сіле роднае зямлі (*С. Грахоўскі*). 2. Таму і смутак нам патрэбен, каб радасць большаю была (*Я. Сіпакоў*). 3. Калі ж спакойна на душы, парожнім словам не грашы (*С. Грахоўскі*). 4. Хто не хвалюецца, тым можна ўсёй душой паспагадаць (*Я. Сіпакоў*). 5. Калі сумленна ты пражыў свой дзень, сумленным, дружа, будзе і твой вечар (*А. Грачанікаў*). 6. Калі ты камень, то трымайся дна (*К. Чорны*). 7. Мы помнім выразна і свежа, што спее ў Турцыі ў садах, а казку дзіўнай Белавежы ледзь разбіраем па складах (*М. Рудкоўскі*).

- Зрабіце сінтаксічны разбор сказаў.
- Зрабіце марфемны разбор слова ***хвалюецца***.

### ◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі дадзенымі часткамі.

1. Жывеш, пакуль жывыя, хто нарадзіў цябе (*В. Зуёнак*). 2. Каб вольна было думцы, трэба, каб вольна было словам, каб лёгка ліліся яны з душы... (*Т. Бондар*). 3. Дзе Нёман прытуліўся да Гаўі, дзе драздамі *перапоўнены* гаі, навыперадкі з воблачкавым *ценем*, як ластаўка, маленства праляцела (*Д. Бічэль*). 4. Тут, дзе далонямі сцеплена глеба, дзе па-над дахамі вязы-званіцы, самае зорнае, мройнае неба, самыя чыстыя ў травах крыніцы (*М. Мятліцкі*). 5. Верым, што *лепшая* частка жыцця — тая, якую пражыць мы збіраемся



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

(*Р. Барадулін*). 6. Шчасце, калі доўга яго чакаеш і калі яно ў нейкі дзень прыходзіць, здаецца неспадзяваным (*М. Танк*).

- Складзіце схемы сказаў.
- Зрабіце марфалагічны разбор выдзеленых слоў.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

Пасля вайны я пабываў у Ляўках. Попел. Галавешкі. Знявечаныя адхоны над Дняпром, якія любіў Купала і якія, дзякуючы гэтаму, прымусілі мяне яшчэ больш, часам амаль нясцерпна любіць маю сціплую прыдняпроўскую зямлю.

Купалы ўжо не было. І на месцы яго дома быў попел.

Я не разумеў тады, што некаторыя легенды — гэта само жыццё. Я не ведаў, што ў легендзе пра Фенікса больш праўды, чым нават у жыцці.

Зразумеў потым, калі ўдваіх з сябрам адправіліся пешшу ў Вязынку і ўбачылі простую сялянскую хату, якая стала нашай Меккай. Там я зразумеў: ён жывы (*Паводле У. Караткевіча*).

- Вызначце ў тэксце назыўныя сказы. Падкрэсліце ў іх галоўныя члены.
- Назавіце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс ***е***, ***я***, ***ё***».

## *Знакі прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах*

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых сказах.

1. Не ведаю: ці доўгі, ці кароткі застаўся мне прамежак для быцця (*С. Законнікаў*). 2. Паспеў і болей таго спазнаці, верш апусціўшы ў сонечны шоўк: дзяўчына, жанчына, жонка і маці — таксама гранатавы ланцужок (*Л. Дранько-Майсюк*). 3. Пачынаю і я дакараць маладых — нудная старасць (*М. Танк*). 4. Бойся спазніцца са словам харошым: тонка прадзецца жыццёвая ніць (*Н. Мацяш*). 5. Шляхі не купляюць за пяць капеек — бяруць іх жыццём сваім (*В. Зуёнак*). 6. Родны край ніхто не выбірае, выбірае родны край цябе (*Р. Барадулін*). 7. Вясной наранку грэла сонца ярка, сустрэўся чараўнік тутэйшы



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Янка (*Д. Бічэль-Загнетава*). 8. Гусіныя крокі ў асеннім полі: заўтра зіма (*А. Разанаў*).

- Пабудуйце схемы сказаў.
- Падкрэсліце арфаграмы, напісанне якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу.

### *Знакі прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак*

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з рознымі відамі сувязі частак.

1. Ён паслухаў — ціха ўсюды, нібы вымерла карчма (*Я. Колас*). 2. Няма яго, ды ўсё ж яго прысутнасць ва ўсім ляўкоўскім, што тут ні кажы (*Ю. Свірка*). 3. Зямлі не дагледзіш — адпомсціць табе, а потым напоіш — адмерыць без меры, а шчыра палюбіш — палюбіць цябе (*М. Танк*). 4. Сумленню з подласцю ў суполцы ганебна мераць шлях стары: сумленне рвецца ўвысь, да сонца, а подласць шчэрыцца ў нары (*Н. Гілевіч*). 5. Астудзім так яго [сэрца], і ўжо не сэрца будзе, а торбачка крыві, што ні сабе ні людзям (*М. Лужанін*). 6. Не мяняй свой куток на прастору чужую, у прасторы чужой птушка гнёзды не ўе, пі ваду са свайго вадазбору і тую, што цячэ дамавіта са студні твае (*Р. Барадулін*).

- Абгрунтуйце напісанне слоў з арфаграмай «Правапіс **у** і **ў**».
- Зрабіце сінтаксічны разбор першага сказа.

### *Знакі прыпынку ў канструкцыях з простай мовай*

◆ *Каменціраваны дыктант*

Запішыце пад дыктоўку, каменціруючы пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

1. «Як макаў цвет!» — хвала красе высокай. Вачмі вітала вуліца дзяўчат (*М. Мятліцкі*). 2. Чужое неба сэрцу не дагодзіць, душы не загадае: «Не балі...» (*Е. Лось*). 3. «Нашто трымацца так за памяць продкаў!» — скрывіўся крытык, прачытаўшы вершы (*Н. Гілевіч*). 4. У любімай мове, роднай, наскай, ах, якія словы: «Калі ласка!..» (*П. Броўка*). 5. Я спытаў чалавека, які прайшоў праз агонь, і ваду,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

і медныя трубы: «Што самае цяжкае на гэтым свеце?» І ён адказаў: «Прайсці праз вернасць» (*М. Танк*). 6. Кажуць: «Смерць вянчае славай». Пачакаю? (*М. Танк*).

- Абгрунтуйце напісанне канчаткаў назоўнікаў.
- Складзіце схемы сказаў.

◆ *Выбарачны зрокавы дыктант*

Выпішыце з тэксту сказ з простай мовай.

Наватарскія адкрыцці — важная асаблівасць таленту Васіля Віткі. У сваіх творах пісьменнік выступае сапраўдным чараўніком, які шчодра дорыць дзецям весялосць і радасць першаадкрыцця паэзіі і прыгажосці навакольнага свету. «Мне больш за ўсё, — прызнаецца паэт, — хацелася паказаць дзіцяці багацце і музыку народнага слова». І гэта ў яго атрымалася. Аўтар стварыў яркі шматгучны і шматфарбны свет, сатканы пры дапамозе слоўных вобразаў, напоўнены рэаліямі беларускага жыцця (*Паводле В. Несцяровіч*).

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры простай мове.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад запісам тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры простай мове.

Былі ў Коласа любімыя мясціны ў лесе, якія ён часта наведваў. Такім сталым прытулкам стаў Вусцянскі груд. Навокал былі выдатныя грыбныя мясціны, дзе раслі адметныя баравікі. Канстанцін Міхайлавіч не любіў хадзіць у грыбы вялікай кампаніяй. Ад сілы браў з сабой трох-чатырох чалавек. І кожнаму даваў пэўны ўчастак:

— Ты вось, браток, кіруйся на тую сухаверхую хвойку. Але лявей не бярыся ні на крок. Там мой сектар...

Калі ж часам каму-небудзь выпадкова траплялася ўзяць на які баравік болей, Канстанцін Міхайлавіч з яўным дакорам адзначаў:

— Перахітрыў ты, брат, мяне... Няйначай да маіх запаветных мясцін дапяў...

Аднак перахітрыць Якуба Коласа ў гэтай справе было амаль што немагчыма (*Паводле М. Лужаніна*).

- Назавіце словы з арфаграмамі, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс ***е***, ***ё***, ***я***».



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

Нас, малодшых, Янка Купала вабіў сваім прыхільным стаўленнем да ўсяго маладога, новага.

«Бачыце, жыццё яно такое, — неяк адзначыў ён. — Кожная эпоха прыносіць сваё новае ва ўсіх галінах. Кожнае старое варожа ставіцца да яго». Трохі памаўчаўшы, Іван Дамінікавіч дадаў: «Скажу шчыра, што мне самому часам не ўсё новае падабаецца ў мастацтве. Але ж я добра разумею, што без шуканняў не можа быць поступу наперад. Таму я і вітаю гэта новае, маладое. Многа з яго адамрэ, але многа і застанецца». Янка Купала паглядзеў на мяне і доказна працягнуў: «Вось як у лесе: падымаецца маладняк — не прадзярэшся праз яго. А пачакай, пройдзе гадоў дзесяць — застануцца гонкія, прыгожыя сасонкі, а рэшта — пазасыхала, спынілася... Змаганне, хлопцы!» (*Паводле У. Дубоўкі*).

- Назавіце словы з арфаграмамі, правапіс якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу напісання.
- Складзіце схемы сказаў з простай мовай.

◆ *Папераджальны дыктант*

Перад напісаннем тэксту растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

Палессе — своеасаблівы край. Своеасаблівасць яго праяўляецца не толькі ў самой прыродзе, ландшафце, у мове, побыце і характары людзей, а і ў творчасці. Палескія казкі і легенды часта нагадваюць звычайныя бытавыя апавяданні, дзе праглядваецца жыццё людзей, асобныя чалавечыя лёсы. У прыказках, прымаўках закладзена правераная вякамі мудрасць, сказаная так, што, аднойчы пачуўшы, ужо ніколі не забудзеш. Вось толькі некаторыя з іх: «Не ўвесь той свет, што ў акне», «Ціхая вада берагі рве», «Высокія парогі не на нашы ногі» (*Паводле Б. Сачанкі*).

- Растлумачце значэнні прыказак. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры запісе прыказак і прымавак.
- Назавіце словы з арфаграмамі, правапіс якіх адпавядае марфалагічнаму прынцыпу напісання.

◆ *Дыктант «Правяраю сябе»*

**Гуканне вясны**

Першыя вясновыя дні. Яшчэ можа быць і холадна, і снежна, але душы і сэрцу ўжо неспакойна і радасна. Калісьці ў першы веснавы дзень на Беларусі пачыналі гукаць вясну.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Задавала тон у гуканні вясны няўрымслівая, вясёлая моладзь, асабліва дзяўчаты. Яны збіраліся на самым узвышаным месцы ў вёсцы, каля гумнаў. Рассцілалі там салому і, пасеўшы на яе ў рады, спявалі да позняй ночы веснавыя песні. Часам спявалі па чарзе: у адным месцы пачнуць і спыняцца, а ў другім працягваюць. Кожны дзень гучаў гімн вясне, сонцу, маладосці, каханню.

Гаспадыні, сталыя жанчыны выпякалі з цеста фігуркі птушак, мяркуючы, што такім чынам паспрыяюць іх хутчэйшаму прылёту. Дзяўчаты часта бралі гэтых птушак з цеста і, выконваючы вяснянкі, падкідвалі іх угору і прыгаворвалі: «Жавароначкі, прыляціце, вясну красную прынясіце».

Хлопцы, як больш практычныя, раскладвалі вогнішча, на якім спальвалі розную старызну, рэчы, што сапсаваліся за доўгую зіму. Да дзяўчат яны далучаліся толькі вечарам, калі пачыналі разам вадзіць карагоды (*Паводле Т. Кухаронак*).

# КАНТРОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Арфаграфічныя нормы

### Дажынкі

Дажынкі ў свядомасці і побыце сялян былі вельмі значнай вяхой сельскагаспадарчага календара і ўрачыстым святам у жыцці вёскі. Суправаджаліся дажынкі ланцужком паслядоўных абрадаў і рытуалаў, што пачыналіся ўжо на апошняй нязжатай лапінцы жытняй нівы. Гэта была самая ўрадлівая густая мясціна, якую называлі «барада». Жняя зразала яе адным узмахам сярпа. «Бараду» разам з апошнім снапом неслі ў вёску і ўрачыста ўручалі гаспадару ці гаспадыні. У «барадзе» пакідалі тры калівы жыта, якія намотвалі на акраец хлеба і потым разам з жытам закопвалі ў зямлю. Лічылі, што гэты рытуал закладваў ураджай наступнага года.

Рытуал качання жанчын па жыце быў накіраваны на магічны зварот сілы, затрачанай жняёй у час працы. Спяванне песень-заклінанняў узмацняла магію.

На завяршэнне дажынак дзяўчаты звівалі рытуальны вянок з васількоў, рамонкаў і каласоў-спарышоў[1]. Такі вянок сімвалізаваў

[1] Спары́ш, -а, *м.* Два спараныя прадметы (каласы, плады, арэхі).



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

заканчэнне жніва, вяртанне ў хату магіі ўрадлівасці, магіі хлеба як сімвала дастатку ў гаспадарцы.

Урачысты і ўзнёслы тон дажынкавых песень адпавядаў настрою хлебаробаў, якія па-сапраўднаму маглі адчуваць і разумець урачыстасць і значнасць свята заканчэння жніва.

У цэлым высокапаэтычная паэзія жніва прасякнута гуманістычнымі і высокамаральнымі поглядамі народа на жыццё, чалавека працы, яго прызначэнне на зямлі (*Паводле А. Гурскага*). (180 слоў)

### Скарбонка духоўнасці

Для кожнага жыхара Беларусі першая нядзеля верасня асаблівая, святочная. У шумлівыя спантанныя размовы школьнікаў уключаецца важкае, выверанае стагоддзямі роднае слова.

На Беларусі заўсёды шанавалі друкаванае слова. Беларускае кнігавыданне мае больш чым пяцісотгадовую гісторыю. Кожны беларус павінен ведаць, што ў тысяча пяцьсот сямнаццатым годзе ў Празе Францыск Скарына надрукаваў кнігу «Псалтыр». Традыцыі нашага першадрукара плённа прадоўжылі Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец, браты Мамонічы, Спірыдон Собаль і многія іншыя. Дзе б мы ні знаходзіліся, павінны ганарыцца гэтым, ганарыцца поўным мудрасці і стваральнай энергіі родным словам!

Важная з’ява ў жыцці краіны, якой можа ганарыцца кожны яе грамадзянін, — адкрыццё Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Нацыянальная бібліятэка заклікана быць не толькі скарбніцай ведаў, але і важным адукацыйным, інфармацыйным і культурным цэнтрам.

Істотную ролю выконваюць у нашай краіне сродкі масавай інфармацыі. Цяпер у Беларусі зарэгістравана вялікая колькасць перыядычных выданняў, выходзіць шмат тэлевізійных і радыёпраграм. Як бачым, наша імкненне да асветы, духоўнага ўзвышэння спрадвечнае.

Таму невыпадкова, што Дзень беларускага пісьменства стаў сапраўдным народным святам, святам кожнага, хто шануе родную мову, культуру і традыцыі. Няхай множыцца скарбонка нашай духоўнасці (*Паводле А. Штура*). (174 словы)

### Ручнік у вясельных абрадах

Сярод ільняных вырабаў традыцыйнага беларускага ткацтва варты ўвагі ручнік.

Цікавасць да гэтай рэчы выклікана не толькі функцыяй ручніка ва ўпрыгожанні інтэр’ера хаты, але і яго роляй у беларускіх абрадах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Шырока выкарыстоўваўся ручнік у вясельных абрадах. Падрыхтаваныя ў якасці падарункаў ручнікі мелі прэстыжнае значэнне, бо яны з'яўляліся лепшым доказам здольнасці нявесты ткаць і апранаць сям'ю. Ручнікі дарылі не ўсім родзічам маладога, а пераважна мужчынам: маладому, яго бацьку, свату і іншым вясельным чынам.

Ручнікам карысталіся ў час абраду звязвання нявесты і жаніха на вянчанні, што сімвалізавала адзінства маладых.

Тыповым было ўжыванне ручніка ў якасці падножніка, на які станавіліся маладыя ў час вянчання. Адыходзячы, нявеста старалася цягнуць за сабой і ручнік. Гэта было прыметай таго, што сяброўкі пацягнуцца за ёю — будуць выходзіць замуж.

Выкарыстоўваўся ручнік і для абраду абгортвання рук. Маладых урачыста абводзілі ручнікам вакол стала, заводзілі за стол.

Кульмінацыйны момант вяселля — прыезд павянчаных да хаты маладога. Прыезд суправаджаўся своеасаблівай выстаўкай пасагу нявесты. З ручнікоў, абрусаў, пасцілак ствараўся яркі святочны інтэр'ер. Прысутныя прыдзірліва ацэньвалі колькасць і якасць рэчаў, багацце ўзораў (*Паводле В. Фадзеевай*). (171 слова)

**Восень**

Вельмі люблю восень, залатую стракатую пару.

Асабліва той час, калі пасля першых начных прымаразкаў ад галін пачынае адрывацца зжоўклае лісце і ападаць нячутна долу.

Проста дзіўна, якая тады стаіць незвычайная цішыня. І толькі лісце, чапляючыся гучна за галіны, парушае яе нязвыклым звонам. Калі ж я чую, як яно чапляецца за апошнюю надзею ўтрымацца, то шчымлівым болем заходзіцца маё сэрца. Нячутнай хваляй падкочваецца няясная туга па нечым светлым, шчаслівым, але нязбыўным.

І тады я кідаю ўсё і спяшаюся на спатканне з лесам. Там я чуйна слухаю, як коціцца стракатым колам па зямлі шчымлівы лістапад. Як у промнях зыркага сонца пераліваецца жаўталісце. У нейкі момант я не вытрымліваю і ад прыліву шчымлівага пачуцця падаю на лісцяную пярыну. Ляжу доўга, не варушуся, баючыся парушыць душэўнае суладдзе. Хочацца, каб лісцяны дождж абрынуўся на мяне і зацерусіў усяго-ўсяго. Каб нада мною вырас агромністы жоўты стог і схаваў ад клопатаў і трывог.

Я ляжу, раскінуўшы рукі і ногі. Нада мною крона магутнага дуба. У густым спляценні яго карункаў я бачу рассечанае на мільёны асколачкаў сонца. Не магу глядзець на яго, зажмурваюся. Мне зда-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ецца, што лячу ў бязважкасці, а насустрач мне ляцяць зоркі, якімі ўсыпана неба.

Восень, восень... (*Паводле А. Бароўскага*). (192 словы)

## Пунктуацыйныя нормы

### Дарога ў жыццё

У кожнага чалавека свае жыццёвыя сцяжынкі, сцежкі, дарогі. Адзін пачынае іх ад ложка да стала, другі ад стала да парога. Да чаго ж яна доўгая, тая першая сцяжынка! Пакуль асіліш яе, пакуль дойдзеш да канца, натомішся-натомішся ды і павалішся не раз. А ў хаце старэйшыя падахвочваюць: «Адзін, адзін наш хлопчык ідзе». І ты горда сам, без чужой дапамогі, пракладаеш самастойную сцяжынку ў свет, абмежаваны пакуль чатырма сценамі хаты. Дойдзеш да працягнутых табе рук — і радасці тваёй няма межаў.

Потым табе дазволяць хадзіць па двары, а ты ўсё роўна хоць на крок, хоць на хвілінку выйдзеш за вароты пацікавіцца забароненым. А як трошкі падрасцеш, разам са старэйшымі пойдзеш на поле, на луг, у лес, а то і ў суседнюю вёску або на іншую вуліцу, плошчу свайго любімага горада. Гэта ўжо залежыць ад таго, дзе хто нарадзіўся.

І чым далей ты будзеш адыходзіць ад той першай сцяжынкі, тым больш і больш будзе іх перад табой у блізкі і далёкі свет: вузкіх і шырокіх, кароткіх і доўгіх, пакручастых і роўных, крутых і гладкіх. Выбірай сам, якою ісці. Ад таго, якую выбераш, будзе многае залежаць потым у жыцці (*А. Пальчэўскі*). (187 слоў)

### «Лучынкі» дзіўнае святло

У пасляваенныя зімовыя вечары ў нашу хату часта збіраліся на вячоркі суседзі. На камінку гарэла лучына. Нашчапаная са смаляных карчоў, яна патрэсквала, дыміла, раскідваючы палахлівыя водбліскі па кутах.

Пад гоман дзядзькоў ды шум самапрадак спасцігаў і я таямніцы буквара. Прыпальваў лучынку за лучынкай і ніколі нават не мог падумаць, што была калісьці ў беларускіх дзяцей «Лучынка», якая ўмела гаварыць з імі пра ўсё на свеце матчынай мовай.

Запаліла гэту «Лучынку» вядомая паэтка Алаіза Пашкевіч — Цётка. Святло «Лучынкі» заўважыла ўся Беларусь. У яе знайшлося шмат сяброў сярод прызнаных пісьменнікаў, вучоных і краязнаўцаў. Менавіта ў ёй упершыню ўбачылі свет вершы Янкі Купалы,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

апавяданні Якуба Коласа, творы самой Цёткі, Змітрака Бядулі і іншых беларускіх пісьменнікаў.

Цётка ў кожным нумары часопіса нагадвала: каб дамагчыся лепшай долі, светлай будучыні для роднай старонкі, трэба шмат вучыцца і працаваць. Паэтка заклікала моладзь не баяцца цяжкасцей, засвойваць гісторыю і культуру Беларусі, спасцігаць таямніцы розных прыродных з'яў, цікавіцца, як жывуць людзі ў розных краінах свету.

Шмат гадоў мінула з таго часу, як упершыню засвяцілася «Лучынка». Але праменьчыкі яе святла дайшлі да нашых дзён, каб нагадаць: любіце Беларусь, шануйце яе мову і спадчыну, дбайце пра лепшую будучыню Бацькаўшчыны, як умелі гэта рабіць нашы продкі (*Паводле М. Чарняўскага*). (197 слоў)

**Яднанне**

Той вясной неяк асабліва рана расцвілі ландышы. Яшчэ не паспела з'явіцца клейкая маладая лістота на дрэвах, а бабулі ўжо прадавалі далікатныя букецікі.

Якраз той парой адкрылася ў Палацы мастацтваў выстаўка. Добра памятаю гэта, бо ўпершыню зайшла туды з духмяным белым букецікам. Я часта туліла яго да твару, адчуваючы незвычайна тонкі водар кветак. Віктар глядзеў на мяне радаснымі вачыма, раз-пораз нахіляўся і шэптам пытаў: «Падабаецца?»

Мне ў той дзень падабалася ўсё: і цнатліва-чыстыя кветкі, і вясновы сонечны дзень, і ўзбуджаныя твары людзей навокал. То была мая першая сустрэча з сапраўдным майстрам. Не важна, што перад тым былі ўжо ў жыцці Эрмітаж і Траццякоўка. Не важна, што з Віктарам мы штомесяц хадзілі ў наш Мастацкі музей шукаць натхнення. Усё гэта было не тое. Тут найперш было яднанне тваёй душы з тым светам, у які цябе нязмушана, але настойліва вёў мастак. І было такое надзвычай дзіўнае адчуванне, што ты калісьці ўжо жыў у гэтым свеце. Але здарылася нейкая непапраўная бяда з тваёй душой, з тваёй памяццю, і ты надоўга забыў гэта ўсё. Ты жыў мітуслівым жыццём, думаючы, што гэта і ёсць тое тваё прызначэнне, дзеля якога ты і народжаны на белы свет (*Паводле Х. Лялько*). (190 слоў)

**Прыгажуня рабіна**

У самым пачатку чэрвеня зацвіла прыгажуня рабіна. Колькі добрых слоў, шчырых і замілаваных, сказаў пра яе народ у песнях, вершах і былінах. Вякамі рабіна лячыла і карміла чалавека. Нездарма людзі вырошчваюць гэта дрэва каля свайго жытла. Першыя звесткі



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

пра рабіну адносяцца да пачатку шаснаццатага стагоддзя. У той час плады рабіны шырока выкарыстоўвалі ў ежу. Яе дабаўлялі да цеста, з якога пяклі смачныя караваі, варылі варэнне і павідла. Яе таксама нарыхтоўвалі на зіму для свойскіх жывёл і птушак.

Драўніна некаторых відаў рабіны па цвёрдасці не ўступае цукроваму клёну, міндальнаму дрэву, амерыканскаму ясеню, баярышніку. З яе выраблялі паркет, мэблю і іншыя рэчы. Асаблівым попытам у сялян карыстаўся посуд з рабіны, у якім магло доўга захоўвацца малако і масла.

З насення рабіны выціскалі масла, якое прымянялі ў парфумернай і медыцынскай прамысловасці. Настой кары служыў сродкам для дублення скур, а з лістоў рабілі трывалую карычнева-чорную фарбу.

Шырокае прымяненне мае рабіна і цяпер. Яе плады, багатыя на вітаміны, арганічныя кіслоты, выкарыстоўваюцца ў харчовай прамысловасці, медыцыне, з'яўляюцца лепшым кормам для многіх птушак.

Плады рабіны спажываюцца свежыя і ў выглядзе джэмаў, кісялёў і настояў (*Паводле Я. Галубовіча*). (179 слоў)

# Дакладнасць і лагічнасць маўлення. Чысціня маўлення. Багацце і выразнасць маўлення. Дарэчнасць маўлення

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

◆ *Творчы зрокавы дыктант*

Перад запісам сказаў выпраўце памылкі ва ўжыванні слоў і выразаў.

1. Прыйшлося дзейнічаць па акалічнасцях. 2. З мэтай прапаганды здаровага вобразу жыцця праведзены легкаатлетычны прабег. 3. У футбол пачыналі іграць раніцай, а заканчвалі, калі ўжо было цёмна. 4. Вынікі выпрабавання пацвердзілі лячэбныя ўласцівасці новых прадуктаў. 5. Тэрыторыя вакол возера Меляўня ўбрана. 6. Многія жанчыны раёна вырасцілі, выхавалі трое, чацвёра, пяцёра і болей дзяцей.

- Што стала прычынай парушэння дакладнасці маўлення?



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце напісанне слоў з арфаграмамі, правапіс якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу.

Каля Мінска яшчэ да вайны пачуў слова шайморы[1]. У першую ваенную вясну людзі хадзілі па калгасным бульбянішчы і збіралі шайморы. Іх мылі і перапалосквалі не ў адной вадзе. Затым абіралі тоненькую і празрыстую скурку, нібы яна з поліэтылену-павуцінкі. Пяклі з шаймораў аладкі ці блінцы, рабілі клёцкі, гатавалі зацірку (*Паводле Ф. Янкоўскага*).

- Якое слова парушае чысціню маўлення? Да якога разраду лексікі яно адносіцца? З якой мэтай аўтар выкарыстоўвае яго ў тэксце?

◆ *Творчы зрокавы дыктант*

Адрэдагуйце тэкст так, каб на яго аснове можна было гаварыць пра багацце маўлення.

Даўно адгучаў арган і разышліся слухачы. А Марыя ўсё чула акорды прэлюдый. Лес гукаў акружаў яе. Твар Марыі свяціўся насустрач вечаровай вуліцы. Душа дзяўчыны толькі прачыналася і для смутку, і для радасці. І гэтыя першыя водгукі душы нагадвалі першыя ўздыхі маладога лісцейка пасля зімовага сну.

- Якія лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя сродкі вы выкарысталі ў тэксце?

◆ *Каменціраваны дыктант*

Запішыце пад дыктоўку, каменціруючы пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне арфаграм.

Нёман! З дзіцячых гадоў ты мне родны і любімы, як маці, як бацька, як мой народ. Нельга забыць, як пад промнямі ранішняга сонца на тваім беразе па-святочнаму выглядаюць чаромхі ў белым убранні, бы дзяўчаты прыбраліся на фэст, а навокал разліваецца музыка ад мноства птушыных галасоў. У засені тваіх дрэў раскрываюцца ўсмешкі набухлых пупышак і маладых лісточкаў. І заўсёды над табою вясновы ранак, спакойны і ўдумліва-натхняльны. Калі над табою спускаецца вечар, я люблю назіраць цікаўныя ўсплескі баброў ля лазоў і камарыную куццю над празрыстай плынню. А крыкі кнігавак чуюцца яшчэ доўга-доўга (*Паводле Я. Крамко*).

- Вызначце стыль і тып маўлення. Назавіце сродкі выразнасці маўлення.

---

[1] Шаймо́ры, -аў, *мн.* Бульба, што праляжала на зямлі ці ў зямлі ўсю зіму і перамерзла.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

◆ *Дыктант-пераклад*

Запішыце па-беларуску.

Приучайте себя к сдержанности и терпению, научитесь делать чёрную работу в науке. Изучайте, сопоставляйте, собирайте факты! (*Из обращения И. Павлова к молодёжи*).

• Пракаменціруйце напісанне арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

• У якой сітуацыі будзе дарэчным такое выказванне? Ці адпавядаюць выкарыстаныя ў тэксце сродкі стылю і жанру маўлення? Абгрунтуйце сваю думку.

• Падрыхтуйце прывітальнае слова да ўдзельнікаў вучнёўскай навуковай канферэнцыі.

◆ *Тлумачальны дыктант*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку і напісанне арфаграм у словах.

Што рабіць, калі цябе пакрыўдзілі? Калі крыўда малая, то з ёй ты справішся сам. Можна папрасіць заступіцца за цябе бацькоў, настаўнікаў, добра вядомых табе суседзяў, родзічаў ці сяброў.

Але ж бываюць крыўды вялікія, якія глыбока закранаюць тваю чалавечую годнасць, твае грамадзянскія правы, пагражаюць тваймy здароўю і нават жыццю. У такім выпадку патрэбен прафесійны абаронца — адвакат.

Адвакат — гэта чалавек, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю. Ён ведае ўсе законы, што дзейнічаюць у Беларусі і ў іншых краінах свету. Адвакат умее падказаць, што рабіць, як сябе паводзіць у складаных жыццёвых сітуацыях.

У законе «Аб правах дзіцяці» сказана, што дзіця ва ўзросце чатырнаццаці гадоў і старэйшым можа самастойна звяртацца па дапамогу да адваката і іншых законных прадстаўнікоў улады. Юрыдычная дапамога дзецям аказваецца бясплатна (*Паводле У. Ліпскага*).

• У якой сітуацыі маўлення будзе дарэчным такое выказванне? Якія моўныя сродкі выкарыстоўвае аўтар, каб маўленне было лагічным і дакладным?

• Назавіце словы з арфаграмамі, правапіс якіх адпавядае фанетычнаму прынцыпу напісання.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

# Навучальныя і кантрольныя пераказы

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

# 10 КЛАС

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

### Падрабязны пераказ

**Каложская царква**

Сапраўднымі дыяментамі ззяюць на нашай зямлі даўнія храмы, якія ўвасобілі ў сваёй архітэктуры спрадвечныя памкненні беларусаў да дасканаласці. Адным з такіх несмяротных свяцілішчаў з'яўляецца Каложская царква ў Гродне, або проста Каложа. Гэта ўнікальны помнік праваслаўнага дойлідства XII стагоддзя.

Адкуль узнікла назва Каложа? У 1405 годзе князь Вітаўт хадзіў паходам на Пскоў. Там узяў у палон 11 тысяч жыхароў прыгарада Каложы і пасяліў іх у Гародні, паблізу царквы Барыса і Глеба. Перасяленцы назвалі месца новага побыту Каложай, а пазней і царкву сталі называць Каложскай.

Царква зведала разбуральную сілу войнаў. Хуткаплынны Нёман таксама нарабіў шкоды: яго бурлівыя хвалі падтачылі бераг, і ў ваду абрынуліся паўднёвая і ўсходняя сцены, скляпенні. Аднак у канцы XIX стагоддзя святыня была адноўлена.

Мураваныя сцены храма ўгары маюць адзіныя на сённяшні дзень у Беларусі галаснікі́. Гэтыя керамічныя ўстаўкі нагадваюць высокія збаны з доўгай шыяй, умураваныя ў сцены горлам унутр храма, што спрыяе акустыцы будынка.

Калі над васільковай Беларуссю раннім досвіткам прахопліваецца клапатлівае сонейка, яно найперш кідае свой ласкавы погляд на Каложу. Дзіўным жыватворным ззяннем успыхваюць яе каляровыя камяні ў сценах, жыццёвай сілай свецяцца крыжы. І тады здаецца, што гэты шэдэўр беларускага дойлідства, які горда ўзвышаецца на магутных далонях бацькі Нёмана, не толькі сам праменіцца годнасцю, але насычае ёю душы вернікаў, гоіць душэўны неспакой, узвялічвае справы людзей (*Паводле А. Бутэвіча*). (210 слоў)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

1. Дакажыце, што перад вамі тэкст, для якога характэрны сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, звязнасць, разгорнутасць, паслядоўнасць і завершанасць.

2. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту? Ці ёсць у тэксце ўступ? Пра што гаворыцца ў ім?

3. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы, назавіце падтэмы. Вызначце, пра што гаворыцца ў кожнай з падтэм. Афарміце падтэмы ў выглядзе плана.

4. Вызначце стыль тэксту, назавіце яго адрасата і мэтанакіраванасць. Ахарактарызуйце ўжыванне моўных сродкаў, характэрных для гэтага стылю.

5. Устанавіце значэнне слова ***жыватворны***. Растлумачце правапіс наступных слоў: ***ззяюць***, ***дыяменты***, ***шэдэўр***, ***гэта ўнікальны***, ***дойлідства***, правапіс вялікай літары, абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

## Хітры воўк

Пра ваўкоў расказваюць рознае. Звычайна ў такіх расказах усе яны дурні. Ачэпяць паляўнічыя чырвонымі сцяжкамі месца аблавы — ваўкі мітусяцца ў аблозе як апантаныя, пакуль не трапяць пад кулі. Здагадацца, што шпагаціна са сцяжком нават для мышы не перашкода, яны не могуць.

Але, відаць, не ўсе ваўкі — дурні. Ёсць і разумныя. Аднаго такога я бачыў на свае вочы.

Давялося мне аднойчы пасвіць авечак. Дзень быў цёплы, сонечны, авечкі пасвіліся спакойна, а я плёў кош з лазы. Усё ішло як мае быць.

Адвячоркам чарада падышла да лесу. Раптам бачу: авечкі шуганулі ад лесу, збіліся ў кучу. Гляджу: аж там воўк. Я так і самлеў ад страху.

Тым часам воўк павярнуўся і паскакаў, як авечка, у бок лесу. Скокне разы два-тры, азірнецца і зноў пайшоў далей. Авечкі асмялелі, адна замэкала прызыўна і пабегла да лесу, за ёю другая, трэцяя. А воўк усё скача, падахвочваючы авечак. Калі ж авечкі падбеглі бліжэй да лесу, ён сігануў да чарады і схапіў самую першую авечку. Чарада зноў шарахнулася назад. Цяпер, відаць, авечкі разабраліся, хто іх вабіў бліжэй да лесу.

Увечары бацька спачатку насварыўся на мяне: як гэта я, разявака, загледзеўся на воўчыя хітрыкі і не прагнаў яго з поля! А по-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

тым, як адышла злосць, расказаў, што такімі хітрыкамі ваўкі не раз спрабавалі ашукаць авечак і раней. Ваўкі ведаюць, што авечкі не баяцца таго звера, які ўцякае ад іх. Калі ж яшчэ гэты воўк танцуе перад імі, як свая родная сястра, дык уцякаць ад яго тым больш няма патрэбы. А можа, яны проста бягуць за ваўком, каб лепш разгледзець, хто іх напужаў.

Даўно гэта было, а я і цяпер часта ўспамінаю той выпадак, калі чытаю або слухаю апавяданні і казкі пра ваўкоў-дурняў (*Паводле А. Якімовіча*). (276 слоў)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Карыстаючыся словамі з тэксту, падбярыце свой загаловак, які перадаваў бы асноўную думку тэксту.

2. Вызначце ролю ў тэксце ўводнай часткі і канцоўкі.

3. Ахарактарызуйце сродкі выразнасці, выкарыстаныя аўтарам у асноўнай частцы.

4. Абгрунтуйце прыналежнасць тэксту да мастацкага стылю, назавіце характэрныя для гэтага стылю моўныя сродкі.

5. Растлумачце правапіс літар ***й***, ***ы*** пасля прыставак (***падышла***, ***пайшоў***, ***адышла***), абгрунтуйце пастаноўку працяжнікаў і двукроп'яў у сказах.

### Бабуліны апавяданні

З надыходам ночы ў бабулінай памяці абуджаліся карціны мінулага ці казачныя пада́нні, якія ўнук, па-дзіцячы верачы ў цуд, лічыў за праўду.

Найбольш яго ўразіла апавяданне бабулі пра возера каля Ігумена, якое затапіла стары горад. І калі ў сонечны дзень плыць па возеры на лодцы, дык у глыбінях можна ўбачыць старыя дамы, касцёл, рынак і гарадскія брамы[1]. Унуку тады снілася, што людзі ходзяць пад вадой у касцёл, на рынак, сабачкі бегаюць па вуліцах, а ў садах выспяваюць жоўтыя слівы.

Магчыма, бабуля пераказвала яму гісторыі, якія сама чула ў дзяцінстве ад сваёй бабулі ці ад цёткі. Паўтарэнне гэтых гісторый пераносіла яе ў кола сваякоў, што даўно зніклі. Адно з гэтых апавяданняў унук запомніў слова ў слова.

У аднаго пана была малпа, якую ён надта любіў. Аднойчы пан захварэў на ангіну. Дактары не маглі даць рады, пан ледзь дыхаў.

---

[1] Бра́ма, -ы, *ж.* Шчыльныя, на дзве палавіны, крытыя зверху вароты, якія закрываюць галоўны ўваход на тэрыторыю горада, завода, двара і інш.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Бачачы блізкую смерць гаспадара, слугі пачалі заходзіць у пакой да смяротна хворага. Кожны браў з шафы, шуфляд, куфраў тое, што яму падабалася. Малпа назірала гэты чалавечы рух і, натхнёная прыкладам слуг, пачала аглядацца, што б знесці ёй. Але было ўжо ўсё вынесена. Тады малпа выцягнула з-пад панскага ложка начны посуд і рушыла да дзвярэй. Тут пан не вытрываў, зарагатаў — гнайнікі палопаліся, ён уздыхнуў на поўныя грудзі і ачуняў. Перапужаныя злодзеі вярнулі нарабаванае, малпа таксама паставіла на ранейшае месца гаршчок. Зразумела, пан прагнаў з двара ўсю сваю непрыстойную прыслугу. Малпа ж, якая выратавала жыццё гаспадару, набыла ў хаце правы́ каралевы. Яе апраналі ў паркалёвыя сукенкі, і спецыяльна заказаны майстру саламяны капялюшык з букецікам кветак аздабляў яе галаву.

Праз шмат гадоў унуку давялося пабываць у Ігумене. Ходзячы па вуліцах, стоячы каля старых дрэў, дзе некалі мог стаяць панскі дом, уяўляў ён падобную да паненкі малпу ў сукенцы (*Паводле К. Тарасава*). (283 словы)

1. Абгрунтуйце загаловак да тэксту. Якія з апавяданняў найбольш запомніліся ўнуку?

2. Вызначце падтэмы, з дапамогай якіх раскрываецца тэма тэксту. Назавіце спосаб і сродкі сувязі сказаў у тэксце.

3. Знайдзіце ў тэксце апавяданне, якое адпавядае яго тыповай схеме: пачатак дзеяння, развіццё дзеяння і яго заканчэнне. Раскажыце, як разгортваліся падзеі, захоўваючы кампазіцыйную схему апавядання як тыпу маўлення.

4. Вызначце стыль тэксту, даўшы яму наступную характарыстыку: сфера ўжывання, задача выказвання, асноўныя стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі.

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: ***надыход***, ***абуджаліся***, (***на***) ***лодцы***, (***па***) ***вуліцах***, ***перапужаныя***, ***нарабаванае***, ***гаршчок***, ***саламяны***, ***аздабляць***. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах, сказах з пабочнымі словамі.

## Ён узышоў на Алімп

Шлях слыннага барца вольнага стылю Аляксандра Васільевіча Мядзведзя ў вялікі спорт, як і шмат у каго з яго славутых аднагодкаў, пачынаўся ў дзяцінстве, якое выпала на цяжкі пасляваенны час. Не было ў ім ні прыгожых цацак, ні разумных замежных камп'ютараў, але ў кожным з хлапчукоў жыло неадольнае жаданне зведаць свет і выпрабаваць у ім сябе.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Выпрабаванні Аляксандра Мядзведзя праходзілі на спартыўных арэнах. Не адразу ён прыйшоў у барацьбу, але поспехі на барцоўскім дыване прыйшлі адразу. Ужо ў дваццаць гадоў на чэмпіянаце Узброеных Сіл стаў пераможцам спаборніцтваў па самба і вольнай барацьбе і заняў трэцяе месца ў барацьбе класічнай. Гэтыя поспехі заўважылі трэнеры Грыгор'еў і Рыбалка, узялі хлопца пад сваю апеку. З іх дапамогаю і пачаўся ўзлёт будучага трохкратнага алімпійскага чэмпіёна.

У 1959 годзе Аляксандр Мядзведзь упершыню ўзняўся на п'едэстал гонару Спартакіяды народаў СССР, заваяваўшы бронзавы медаль. Прычым змагаўся, маючы траўму ключыцы. Пасля гэтага маладога атлета ўключылі ў зборную Савецкага Саюза, але ў асноўны склад каманды, накіраванай на Алімпійскія гульні ў Рыме, ён не трапіў: занадта жорсткай была тады канкурэнцыя.

Мядзведзь і цяпер упэўнены, што мог бы ў італьянскай сталіцы выйграць залаты медаль. Зорны ж час яго прабіў на Алімпійскіх гульнях у Токіа, дзе ён заваяваў для зборнай Савецкага Саюза яшчэ адзін залаты медаль. Для мінчаніна Мядзведзя той алімпійскі поспех стаў упэўненым крокам яшчэ да дзвюх найвышэйшых прыступак алімпійскага п'едэстала гонару на летніх гульнях у Мехіка і Мюнхене.

Воля да перамогі, неймавернае працалюбства, упэўненасць у сваёй сіле — вось што вяло атлета шляхам перамог. Але ўсе, хто сустракаецца з Аляксандрам Васільевічам, адзначаюць яшчэ адну рысу ў яго характары — гатоўнасць у самую цяжкую хвіліну падставіць плячо.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, ганаровы грамадзянін Мінска, Аляксандр Мядзведзь прызнаны найлепшым барцом вольнага стылю дваццатага стагоддзя.

Калі ён ідзе па вуліцы, заходзіць у бібліятэку ці ўніверсітэт, дзе ўзначальвае кафедру спартыўнага ўдасканалення, яго адразу пазнаюць, радасна ўсміхаюцца, вітаюцца. І вочы ў яго ззяюць, нібыта вярнулася маладосць (*Паводле А. Крыгі*). (311 слоў)

1. Чаму тэкст мае такі загаловак? Абгрунтуйце назву.

2. Раскажыце пра этапы спартыўнага станаўлення Аляксандра Мядзведзя.

3. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Якая сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках? Падбярыце да кожнай часткі назву, выпішыце апорныя словы ці словазлучэнні.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

4. Вызначце стыль тэксту, назавіце яго задачу, асноўныя стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі.

5. Растлумачце правапіс вялікай літары ў тэксце.

### Баявое раненне

Аднойчы пад вечар зайшлі да нас у хату сяржант і двое радавых, папрасіліся на начлег.

— Начуйце, людзі добрыя, — дазволіла бабка. — Начуйце. Толькі цесна ў нас. І пухавікоў няма.

Мы з Санькам вачэй не можам адарваць ад сяржанта. Сам высокі, бялявы, а на падбародку і шчацэ скура чырвоная-чырвоная і бліскучая. Такі твар і такія рукі ў аднаго нашага падлюбскага дзядзькі. Па-вясковаму завуць таго дзядзьку Гарэлым. Калісьці, яшчэ ў маладосці, ён на пажары людское дабро ратаваў. А каб зразумець, дзе гарэў сяржант, доўга гадаць не трэба: у яго на пагонах маленькія танкі.

Калі вайскоўцы паставілі ў куток карабіны і знялі шынялі, мы з Санькам пераглянуліся. У сяржанта на ўсе грудзі медалёў. Так і звіняць, калі ён ходзіць па хаце. На гімнасцёрцы ў яго некалькі чырвоных нашывак. Мы ўпершыню такія бачым. Мабыць, гэта за падбітыя танкі. Колькі танкаў падбіў, столькі нашывак.

— Не, хлопцы, — пакруціў сяржант галавой, — не ўгадалі. Гэта за раненні.

Мы з Санькам вачамі пералічылі тыя нашыўкі і паглядзелі адзін на аднаго. Шэсць штук. Ну і народ у нас! Жывучы. Месца на ім жывога няма, і хоць бы што.

Мне закарцела даведацца: ці гэта толькі вайскоўцам даюць такія нашыўкі, ці могуць і Саньку даць?

Сяржант недаверліва паглядзеў на майго прыяцеля.

Санька з ахвотай задраў кашулю, і салдаты з павагай паглядзелі на яго худую спіну, на якой сінявата-белая скура распісана агністымі рубцамі.

— Гэта ў яго пісталет на спіне, — растлумачыла салдатам бабка, але тыя нічога не зразумелі, і давялося ўмяшацца мне.

— Ніякага пісталета ў Санькі на спіне няма. Гэта немцы яго так білі. Мы хацелі ісці ў партызаны, знайшлі тры гранаты, а пісталетаў нідзе знайсці не маглі. Тады Санька ўкраў адзін у афіцэра, які жыў у іхняй хаце. А яго злавілі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

— Адным словам, нарабіў бяды і сабе, і матцы, — перабіла мяне бабка. — Тая аж пасівела, бедная. Партызаны знайшліся!

Але, нягледзячы на бабульчыну зняважлівую заўвагу наконт нашай партызанскай вартасці, Санькаў аўтарытэт вырас на вачах. Яшчэ раз паглядзеўшы на голую спіну, сяржант сур'ёзна сказаў:

— А нашыўку могуць даць... Баявыя раны.

І, крыху падумаўшы, загадаў аднаму з салдат пашукаць чырвонай тканіны. Той пачаў корпацца ў сваім рэчавым мяшку, перакладваючы з месца на месца мыла, дратву, новую пару ануч... Знайшоўся там і шматок чырвонай матэрыі. Салдат сам адрэзаў ад яго кавалак і на нашых вачах зрабіў нашыўку, як у сяржанта.

Хутка на рукаве ў Санькі красавалася чырвоная нашыўка, якая сведчыла пра яго баявое раненне (*Паводле І. Сяркова*). (388 слоў)

1. За якое баявое раненне Санька атрымаў чырвоную нашыўку?

2. Дакажыце, што змест у тэксце раскрываецца паслядоўна. Як называецца такі спосаб сувязі? Назавіце сродкі гэтай сувязі.

3. Вызначце, колькі падтэм аўтар выкарыстаў для раскрыцця тэмы. Назавіце ключавыя словы (сказы) у кожнай падтэме. Дайце загалоўкі кожнай падтэме, якія перадавалі б асноўную думку. Складзіце план тэксту.

4. Вызначце стыль тэксту, адказаўшы на наступныя пытанні:

- Ці адпавядае тэкст задачы «вобразна і маляўніча апісаць словамі які-небудзь прадмет ці з'яву, паведаміць пра пэўныя факты, выказаўшы пры гэтым свае адносіны да прадметаў, з'яў, падзей ці фактаў, што апісваюцца»?
- Ці з'яўляюцца асноўнымі ў тэксце наступныя стылявыя рысы: канкрэтнасць, вобразнасць, маляўнічасць? Ці выражаны адносіны аўтара да падзей і з'яў?
- Ці характэрны для тэксту наступныя асаблівасці стылю: словы з пераносным значэннем, эмацыянальна-ацэначныя словы, тропы (эпітэты, метафары, параўнанні), сказы, розныя па мэце выказвання і будове, і г. д.?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: ***сяржант***, ***медаль*** (***медалі***), ***аўтарытэт***, ***афіцэр***, ***расчырванеўся***, ***аднекваца***, ***матцы***, ***усё ж такі***.

## Высокая сталіца

Сённяшні Навагрудак меў старажытную назву Наваградак. А яшчэ — Ноўгарад, Ноўгарадок, Новагарадок, Наваград.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Вучоныя-археолагі маюць доказы, што людское паселішча тут узнікла ў канцы дзясятага стагоддзя. Але чаму яго назвалі новым горадам? У параўнанні з якім ён новы? А мо на тым месцы даўным-даўно, яшчэ да нашай эры, ужо стаяў горад? Мо ён быў спалены ці разбураны ворагамі, а на яго месцы ўзнік новы — Наваградак?

Так ці не, але вядома, што сённяшні Навагрудак стаіць на гары, якая ўзнімаецца над узроўнем мора на 323 метры. Гэта самае высокае месца ў Беларусі. І з якога б боку ні ехаў сюды, адчуваеш, што ўздымаешся ўвысь, туды, дзе векавыя руіны вежаў былога замка, дзе цэрквы і касцёлы, сівыя камяніцы. Даўнейшыя брукаваныя, а цяпер ужо асфальтаваныя вуліцы з васьмі бакоў выводзяць на былую Кірмашовую плошчу.

З гары Замкавай узіраўся ў далячынь сваёй дзяржавы стваральнік Вялікага Княства Літоўскага кароль Міндоўг. Ён заклаў падмурак нашай дзяржавы.

Да скалечаных муроў замка прыходзіў паэт Адам Міцкевіч. Навакольныя краявіды натхнялі навагрудца на паэзію, якая вывела яго ў геніі.

З высокага Навагрудка, здаецца, бачны ўвесь раён: і задумлівы бацька Нёман, і зялёны дыван Налібоцкай пушчы, і ўраджайныя палеткі, і ўсе сельскія населеныя пункты, і гарадскі пасёлак.

Нашы продкі былі б ашаломлены нашым жыццём: дарогамі і машынамі, камп'ютарамі і мабільнымі тэлефонамі, дамамі і катэджамі, аграгарадкамі і школамі, бібліятэкамі і клубамі, музеямі і паркамі. У раёне адкрыты дзесяць радовішчаў цагельнай сыравіны, тры радовішчы мелу. Створаны і плённа працуюць васямнаццаць калгасаў, два саўгасы. На змену рамеснікам-кустарам прыйшлі сучасныя прадпрыемствы харчовай, лёгкай, металаапрацоўчай прамысловасці.

Старажытны горад Наваградак нанова перажывае сваю маладосць. І яго па праву можна перайменаваць у Нованаваград (*У. Лінскі*). (262 словы)

1. Абгрунтуйце загаловак да тэксту. Ці можна растлумачыць, чаму ў назве горада ёсць слова ***новы***? Чаму аўтар прапануе перайменаваць Навагрудак у Нованавагрaд?

2. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Ці могуць яны супадаць з падтэмамі тэксту? Назавіце ключавыя словы ў кожнай падтэме. Складзіце план тэксту.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

3. Вызначце стыль тэксту, назавіце яго задачу і асноўныя стылявыя рысы. Ахарактарызуйце моўныя сродкі, уласцівыя гэтаму стылю.

4. Растлумачце ўтварэнне і правапіс наступных слоў: ***Наваградак, Ноўгарад, Ноўгарадок, Новагарадок, Наваград, Нованаваград***.

## Каменная ружа

Рэчка Ружанка — тонкі блакітны паясок на карце Брэстчыны. Яе вадзіца няспешная і роўная. Людзі расказваюць, што ў старадаўнія часы Ружанка, як змейка-вужык, абвівала ўзвышша. На ім стаяў мураваны палац, вакол якога месціліся драўляныя хаткі. Тутэйшы гаспадар даў паселішчу імёны лю́бых дачок — Ружы і Ганны. Дзяўчынкі былі блізняткамі, падобнымі, бы кропелькі расы. Таму іх імёны і злучыліся ў адной назве — Ружаны. Ружанскі палац з птушынага палёту нагадваў вялікую каменную ружу, а на гербе горада можна пабачыць чырвоныя ружы.

Войны каціліся па зямлі хвалямі. Каб зберагчы свае Ружаны, гаспадар загадаў пабудаваць навокал грозныя муры, а ружанцаў навучыў трымаць зброю. Нездарма кажуць: усякая ружа мае калючкі, каб бараніць сваю прыгажосць.

Ружаны папакутавалі ад чужынскай зброі. Здавалася, назаўсёды загіне Ружанскі палац — каменная ружа. Аднак напрыканцы васямнаццатага стагоддзя мястэчка чакала казачнае адраджэнне. На Берасцейшчыну прыехаў цудоўны дойлід Ян Бекер. Тут майстра будаваў храмы, манастыры, палацы. Здавалася, што ў ягоных руках цяплеў нават камень. У Ружанах з'явіліся бібліятэка, манеж, тэатр, карцінная галерэя. Неаднойчы гасцявалі ў мястэчку каралі́ і вялікія князі. У паляваннях, на шыкоўных ба́лях бавіла свой час заможная шляхта...

Пра гэта да нашых дзён захаваўся толькі ўспамін. Дзе колішняя прыгажосць? Скрадзена захопнікамі, вынішчана чужынцамі. Даруйнавалі і данішчылі людзі тое, што было народжана ад моцнай любові і захаплення майстра-стваральніка (*Паводле А. Бензерука*). (206 слоў)

1. Абгрунтуйце загаловак да тэксту. Як у тэксце тлумачыцца назва ***Ружаны***? Раскажыце пра гісторыю Ружан. З кім звязваецца казачнае адраджэнне Ружан? Чаму пра мінулае Ружан сёння захаваўся толькі ўспамін?

2. Вызначце падтэмы, у якіх раскрываецца тэма тэксту.

3. Ці могуць быць словы з тэксту пунктамі плана? Раскрыйце іх змест:



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

1) Ружанскі палац — каменная кветка.
2) Усякая ружа павінна мець калючкі.
3) Васямнаццатае стагоддзе — казачнае адраджэнне Ружан.
4) Дзе колішняя прыгажосць?

4. Назавіце і ахарактарызуйце сродкі выразнасці, якія выкарыстаў аўтар у тэксце.

5. Растлумачце правапіс наступных слоў і спалучэнняў слоў: ***змейка-вужык***, ***васямнаццатае стагоддзе***, ***адраджэнне***, ***дойлід Ян Бекер***, ***майстар-стваральнік***.

## Канал Агінскага

Міхал Казімір Агінскі паходзіў з роду магнатаў, вельмі багатых людзей. Пражыў семдзесят гадоў (1730—1800). Служыў пісарам, ваяводам, гетманам Вялікага Княства Літоўскага. А ў душы — паэт, кампазітар, мастак, музыкант. Іграў на кларнеце, скрыпцы, арфе.

Найбольш праявіў сябе Агінскі ў Слоніме, дзе валодаў старостам, горадам і ўсёй яго акругай. Тут, у сваім палацы, ён наладзіў друкарню, у якой выпускаў патрэбныя кніжкі. Заснаваў у горадзе фабрыкі, на якіх вырабляліся шаўковыя тканіны, персідскія дываны. Былі суконныя мануфактуры.

Асаблівым гонарам Міхала Казіміра Агінскага быў яго тэатр у Слоніме. Ён дзейнічаў дваццаць гадоў. Агінскаму ўдалося запрасіць на сваю сцэну найлепшых спевакоў з Італіі, Германіі, Польшчы. З прыгонных стварыў хор і балет. Існавалі музычная і балетная школы, у якіх вучыліся таленавітыя дзеці прыгонных сялян. Акрамя Дома оперы, кажуць, быў «плывучы тэатр». Некаторыя сцэны спектакляў праходзілі на лодках, пад шум фантанаў і святло бенгальскіх агнёў. Усе гэтыя дзеі адбываліся на канале Агінскага.

Пра гэты водны шлях трэба сказаць асобна. Ён будаваўся на сродкі Агінскага. Задума была грандыёзная: злучыць раку Ясельду, прыток Прыпяці, з ракой Шчарай, прытокам Нёмана. А гэта азначала, што адкрываўся прамы шлях з Балтыйскага мора ў Чорнае. Працу закончылі ў 1804 годзе. Канал стаў суднаходным.

Мецэнат Міхал Казімір Агінскі не проста збудаваў водны канал, а праклаў духоўны, творчы шлях у нашы дні. У райцэнтры плённа працуе вось ужо шэсцьдзесят гадоў Слонімскі беларускі драматычны тэатр. Тут ёсць народная кінастудыя, аркестр народных інструментаў, ансамблі «Грымата», «Рабіначка», тэатр моды, фальклорны калектыў «Чараўніцы-каравайніцы», узорны тэатр эстрадна-спартыўнага тан-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ца «Каскад». Слонімшчына — радзіма вядомых у Беларусі вучоных, пісьменнікаў, скульптараў, военачальнікаў, трэнераў, настаўнікаў, урачоў. А працоўныя подзвігі рабочых і сялян у мірныя дні, воінаў, партызан і падпольшчыкаў у гады ліхалецця — гэта павучальная кніга раёна (*У. Ліпскі*). (272 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Абгрунтуйце свой адказ.

2. Вызначце адрасата і мэтанакіраванасць тэксту, яго асноўныя стылявыя рысы і характэрныя моўныя сродкі. Зрабіце вывад пра стыль маўлення.

3. Назавіце падтэмы, з дапамогай якіх раскрываецца тэма тэксту, дайце ім загалоўкі.

4. Назавіце ключавыя словы (сказы) у кожнай падтэме. Складзіце план.

5. Растлумачце правапіс вялікай літары, напісанне наступных слоў: ***мецэнат***, ***сцэна***, ***драматычны***, ***спартыўны***, ***шэсцьдзясят***, ***трэнер***, ***пісьменнік***, ***партызан***, ***подзвіг***, ***ліхалецце*** і інш.

**«Сілічы»**

Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр «Сілічы» знаходзіцца за 32 кіламетры ад Мінска, у маляўнічым кутку Лагойскага раёна, дзе сама прырода стварыла спрыяльныя ўмовы для адпачынку і аздараўлення. Чыстае паветра, прыгожы ўзгоркавы рэльеф, лясныя масівы з векавых дубоў і елак, багатая флора, шырокі выбар забаў, а цяпер яшчэ і комплекс медыцынскіх аздараўляльных працэдур — усё гэта можна знайсці ў «Сілічах».

Гарналыжная база ўключае ў сябе гасцінічны гарадок, дзе канцэнтруецца асноўны спектр паслуг. Гарадок складаецца з гасцініцы на 104 месцы, двух рэстаранаў з заламі рознай напаўняльнасці, домікаў для гасцей і комплекснага пункта абслугоўвання, дзе размяшчаюцца пункт пракату гарналыжнага начыння, касы, кафэ, медпункт, міні-маркет, службова-бытавыя і гаспадарчыя памяшканні.

У пачатку студзеня 2007 года ў Рэспубліканскім гарналыжным цэнтры «Сілічы» адкрылася спартыўная зала, якая зімой выкарыстоўваецца як крыты каток. Тут можна пад прыемную музыку пакатацца на каньках або пасядзець ва ўтульным кафэ на другім паверсе, назіраючы з вышыні за катком.

«Сілічы» не забыліся і пра аматараў актыўнага летняга адпачынку. Навінкай для наведвальнікаў сталі адкрытыя тэнісныя корты з універсальным еўрапейскім пакрыццём, дзе можна пагуляць не



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

толькі ў вялікі тэніс, але і ў футбол, баскетбол, стрытбол, валейбол. Шырокі спектр паслуг спартыўнага абсталявання ўключае ў сябе: ролікавыя канькі, лыжаролеры, спартыўныя веласіпеды, квадрацыклы, міні-багі, настольны тэніс, бадмінтон, пейнтбол і шмат што іншае.

Новы атракцыён «Зорб» не пакіне раўнадушнымі паклоннікаў экстрэмальнага адпачынку. Пачаў сваю працу картынг-клуб. Для тых, хто жадае пакатацца з вецярком, ёсць 18 новых нямецкіх картаў, сістэма ўліку часу з раздрукоўкай вынікаў заезду, дзве адкрытыя трасы працягласцю 400 і 100 метраў.

Адпачынак у «Сілічах» — гэта не толькі крыштальна чыстае паветра, нечапаная прырода, камфортнае размяшчэнне ў гасцініцы, якаснае абслугоўванне ў рэстаранах і ветлівы персанал, але і комплекс спецыяльна распрацаваных медыцынскіх праграм.

Аздараўляльныя працэдуры ў цэнтры «Сілічы» — гэта сродак барацьбы са стомленасцю і стрэсам, паляпшэння агульнага стану арганізма, карэкцыі фігуры. Комплекс працэдур садзейнічае лячэнню і прафілактыцы многіх захворванняў, дапамагае пры парушэнні абмену рэчываў, пры эмацыянальных зрывах, дэпрэсіях, стымулюе імунную сістэму. Цэнтр прапаноўвае аздараўляльныя праграмы на 7—12 дзён на выбар: «Грацыя», «Дыхай лёгка», «Антыстрэс», «Тонус», «Сіндром хранічнай стамляльнасці» (*Паводле інтэрнэт-рэсурсаў*). (327 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту, яго адрасата і мэтанакіраванасць.

2. Вызначце падтэмы, якія раскрываюць тэму тэксту, дайце ім загалоўкі.

3. Назавіце ключавыя словы, сказы ў кожнай падтэме.

4. Назавіце моўныя сродкі (лексічныя, граматычныя), з дапамогай якіх раскрываецца тэма тэксту.

5. Растлумачце правапіс наступных слоў і спалучэнняў слоў: ***ролікавыя канькі***, ***лыжаролеры***, ***спартыўныя веласіпеды***, ***квадрацыклы***, ***міні-багі***, ***настольны тэніс***, ***бадмінтон***, ***пейнтбол***, ***картынг-клуб***, ***нямецкія карты*** і інш. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

### Мірскі замак

Мірскі замак — помнік, узведзены ўмелымі рукамі беларусаў. Ім валодалі багатыя князі — Ільінічы, Радзівілы, герой вайны з туркамі князь Святаполк-Мірскі. За іх грошы будавалі, рамантавалі, аднаўлялі замак.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

А стваралі тую казачную забудову ўмелыя рукі мясцовых і прывазных майстроў. Яны рабілі вежы, гарматныя байніцы, дубовыя вароты, пад'ёмныя масты, узводзілі вінтавыя лесвіцы, клалі керамічную падлогу, тынкавалі і бялілі сцены, выштукоўвалі ўзорны арнамент.

Замак у Міры — удзельнік усіх войнаў, якія зведала наша пакутная беларуская зямля. Яго разбуралі, палілі, бралі штурмам рускія, французскія, шведскія, нямецкія войскі. У Другую сусветную вайну фашысты стварылі ў разбураным замку лагер для ваеннапалонных і для яўрэяў. А пры адступленні спалілі ў замку ўсё, што гарэла.

Маладая Беларусь залячыла раны мінулай вайны. Знайшліся сродкі і для аднаўлення велічнага Мірскага замка. Тут цяпер праходзяць Дні пісьменства, канцэрты вядомых спевакоў, кампазітараў. Старажытныя вежы, сцены, вокны байніц, брукаваная падлога прымушаюць задумацца і блізкага, і замежнага вандроўніка пра наша агульнае мінулае.

У час наведвання гэтай архітэктурнай жамчужыны нельга не захапляцца ўмельствам рук нашых майстроў. Гэта іх залатыя рукі зрабілі такі цуд свету. Прозвішча аднаго мясцовага муляра можна вычытаць у даўнейшых дакументах. Гэта быў Ян Пушкарскі. Хутчэй за ўсё, раней, чым стаць мулярам, ён быў воінам-пушкаром. Можа, ён са сваёй гарматай абараняў і Мірскі замак, сваю карэліцкую зямлю? Хто ты быў, Ян Пушкарскі? Як жыў і ваяваў?

Старажытныя сцены як іконы нашых продкаў. Перад імі хочацца думаць пра мінулае, цяперашняе і вечнае жыццё (*У. Ліпскі*). (229 слоў)

1. Вызначце задачу, якую вырашае аўтар тэксту. Ці супадае яна з тэмай тэксту? Карыстаючыся словамі з тэксту, дайце загаловак, які перадаваў бы асноўную думку тэксту.

2. Назавіце падтэмы, з дапамогай якіх раскрываецца тэма тэксту. Пра што гаворыцца ў кожнай з іх? Дайце ім загалоўкі. Складзіце план тэксту.

3. Вызначце спосаб сувязі сказаў у кожнай падтэме тэксту. Назавіце сродкі гэтай сувязі.

4. Вызначце стыль тэксту. Назавіце стылявыя рысы тэксту і моўныя сродкі, характэрныя для гэтага стылю.

5. Растлумачце правапіс слоў з вялікай літары, абгрунтуйце пастаноўку працяжнікаў у сказах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Сціслы пераказ

### Кім быць?

Набліжалася вясна. Чакаў яе Пятро з хваляваннем, бо гэтая вясна будзе для яго не такой, як усе іншыя, ранейшыя. Гэта будзе яго апошняя школьная вясна. Здасць ён экзамены, развітаецца са школьнымі сябрукамі і сяброўкамі на выпускным вечары — і адкрыюцца перад ім дарогі ў вялікі свет.

Толькі па якой пайсці, якая з гэтых дарог яго?

Усё часцей і часцей прыходзілі да Пятра апошнім часам думкі пра гэта.

Неяк раней, прыгадваў, маці казала яму, што добра быць музы́кам:

— А чаму б табе, сынок, не быць музы́кам? Гэта ж няблага — весяліць людзей.

Пятро тады быццам і пагаджаўся з маці: вядома, добра быць музыкам. Асабліва не проста музы́кам, што на вечарынках ды на вяселлях іграе, а такім, што са сцэны выступае, якому людзі ў ладкі плешчуць.

Так маці казала тады, як гармонік сыну купілі. Пазней жа пачала гаварыць яму іншае.

— Хацела б я, сынок, каб ты на інжынера вывучыўся, — аднойчы сказала яму маці. — От каб ты дамы высокія, як у горадзе, будаваў. Цябе ж во ўжо і сякера слухаецца, і гэблік, і долата, і іншае начынне...

Пятро і на той раз пагадзіўся з маці. Інжынер — гэта, вядома, добра. Скажам, інжынер-будаўнік. Такая прафесія патрэбна і ў горадзе, і ў вёсцы — усюды, дзе жывуць людзі.

Думаў ён так, успамінаў матчыны словы, а сам марыў пра... неба.

Неба вабіла да сябе. Дзённае — сваёй блакітнай бязмежнасцю. Так і карцела падняцца высока-высока і самому праверыць, на свае вочы пераканацца ў бязмежнасці яго. А начное неба трывожыла яго душу таямнічасцю. Уначы на ім загараліся мільёны зорак. А кожная малюпасенькая, ледзь прыкметная з зямлі зорачка — гэта ж сонца! І зусім верагодна, што вакол якога-небудзь з гэтых сонцаў кружыцца планета, падобная да нашай Зямлі, і, можа быць, на ёй, на той невядомай планеце, жывуць людзі, і такой жа ноччу таксама ўзіраюцца ў неба, бачаць нашу зорачку-сонца і думаюць пра тое ж.

Пятро ўсё часцей і часцей думаў пра тое, каб пасля школы падацца ў лётнае вучылішча.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Ён ніколі нічога не хаваў ад маці і бацькі. Таму шчыра прызнаўся ім у гэтым сваім жаданні, дадаўшы, што не будзе чакаць, пакуль яму падыдзе чарга ісці ў армію, а пасля школы будзе паступаць у ваеннае вучылішча лётчыкаў.

Маці, напэўна, адчула, што сын цвёрда наважыўся стаць лётчыкам, таму не вельмі пярэчыла, а толькі папрасіла:

— Мо передумаеш, сынок?

— Не, мама, не перадумаю, — адказаў сын. — Я ўжо не маленькі і адчуваю: неба — мой лёс. Хачу лятаць, мама! Высока і далёка!

Гэтая гаворка з маці і бацькам адбывалася напярэдадні выпускнога школьнага вечара. А праз некалькі месяцаў паштальён прынёс у хату пісьмо. Маці сэрцам адчула, што пісьмо тое ад Пеці. У канверце разам з лістом была фотакартка. На ёй Пётр Ільіч Клімук быў у форме курсанта ваеннага авіяцыйнага вучылішча (*Паводле М. Гіля*). (443 словы)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Абгрунтуйце свой адказ. У чым заключаецца асноўная думка тэксту? Якім сказам з тэксту можна яе перадаць?

2. Чаму Пятро чакаў вясну з хваляваннем? Кім хацела бачыць свайго сына маці? Як Пятро адносіўся да прапаноў маці? Пра што марыў сам Пятро? Чым прываблівала хлопца неба?

3. Вызначце стыль тэксту, адказаўшы на пытанні: З якой мэтай напісаны тэкст? Якую сферу чалавечай дзейнасці ён абслугоўвае? У якой сітуацыі будзе ўспрымацца?

4. Назавіце падтэмы, якія раскрываюць тэму тэксту. Дайце ім назвы. Вызначце галоўнае і другараднае ў кожнай частцы (падтэме) тэксту. Выявіце, якую інфармацыю ў кожнай частцы можна перадаць абагульнена, а якую можна апусціць.

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: ***інжынер***, ***вяселле***, ***экзамены***, ***прафесія***, ***мільёны***, ***напярэдадні***, ***ваенны***, ***авіяцыйны***, ***фотакартка***. Абгрунтуйце пастаноўку працяжнікаў у сказах, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах ускладненай будовы, складаных сказах.

6. Сцісла перадайце змест тэксту, карыстаючыся наступнымі прыёмамі:
- выключэнне неістотнай, другараднай інфармацыі, падрабязнасцей, дэталей;
- абагульненне з'яў і фактаў;
- пераканструяванне складаных сінтаксічных канструкцый у больш простыя.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэў»

***

Калі пачалося веснавое паляванне на цецерукоў, дзядзька Ціхон паставіў на старым такавішчы два буданы з яловых лапак і папярэдзіў мяне, каб я ў любую хвіліну быў напагатове, калі ён на досвітку пастукае ў маё акно...

І вось я сяджу ў сваім будане і чакаю першай веснавой песні чырванабровага прыгажуна. Ён ужо недзе тут. Але нічога не відаць, нічога не разабраць у змроку. Толькі ледзь прыкметна пасвятлела неба і памутнелі зоркі. Вузенькая ружовая палоска на ўсходзе паволі, але няўхільна падымалася ўгору. Недзе шумліва закігікала кнігаўка[1]. І зноў настала цішыня, халаднаватая і глухая. Вастрэй запахла смалою-жывіцай, старою травой.

— Шы-ыўш-ш... шы-ыўш-ш...

У грудзях моцна закалацілася сэрца. Ага, нарэшце абазваўся, падаў першы голас! Цяпер недзе насцярожана выцягнуў шыю і прыслухоўваецца, ці няма тут каго непатрэбнага ў такую важную і вялікую хвіліну.

Нешта запяршыла ў горле майго чырванабровага крылатага суседа. Можа, ён крышку прастыў за доўгую халодную ноч? Ужо ўсё навакол аж стагнала ад спеваў, а ён усё яшчэ настройваў свой голас: то нездаволена шыкаў, то пачынаў балбатаць нешта невыразнае і няпэўнае, нібы ў яго далікатным горле засеў нейкі вязкі камяк. Нарэшце ён выштурхнуў яго і тады, узрадаваны, што дыхаецца лёгка і вольна, пачаў з уздымам славіць прыход веснавога дня.

Ужо віднелася. Чарната ночы адыходзіла на захад. На фоне шырокай і светлай паласы ўсходу я заўважыў невыразныя яшчэ абрысы будана дзядзькі Ціхона. Ён, відаць, як і я, нецярпліва чакае, пакуль пасвятлее яшчэ больш...

Зноў тужліва закігікала на бліжнім балоце кнігаўка і высока ў небе дробненька замаркатаў бакас[2]. Ім весела абазваўся сваім пругкім посвістам кроншнэп[3]. І раптам пасля гэтага ўсё сціхла, заглухла, нібы на зямлі не засталося нічога жывога.

---

[1] Кні́гаўка, -і, *ж.* Невялікая птушка, распаўсюджаная па ўсёй тэрыторыі Беларусі, адзін з найбольш звычайных пералётных і транзітна мігруючых відаў кулікоў

[2] Бака́с, -а, *м.* Балотная з доўгай тонкай дзюбай птушка, якая, пікіруючы ўніз, ваганнем пер’я хваста ўтварае гукі, падобныя да бляяння баранчыка.

[3] Кроншнэ́п, -а, *м.* Вялікая балотная птушка роду куліковых з доўгай, моцна загнутай уніз дзюбай.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Калісьці дзядзька Ціхон растлумачыў мне, што такі перапынак, такое агульнае маўчанне бывае ў птушак вясною штораніцы. Перад усходам сонца.

Стараючыся не зварухнуцца, я пазіраў праз калматыя шчыліны будана туды, дзе хвіліны дзве таму назад заўважыў цецерука. Ён па-ранейшаму стаяў незварушна, высока падняўшы галаву, насцярожаны, маўклівы. І зусім блізка!

Нарэшце ён залопаў крыламі і зашыкаў, падскокваючы на месцы. Яшчэ праз момант галава яго прыгнулася, хвост разгарнуўся шырокім веерам. Звонка клекатнула ў яго горле...

Я прыглядаўся да ўсяго, што робіцца на такавішчы, і нецярпліва пачаў чакаць, калі ж грымне са сваёй ламанкі дзядзька Ціхон.

Ужо ўзышло сонца, а на вялікай паляне, акаймаванай маладым бярэзнікам, такавала каля дзясятка цецерукоў. Каля другога будана адбывалася сапраўдная вайна. Біліся два цецерукі. Яны, як каршуны, люта каціліся адзін на аднаго, у паветры белымі маланкамі мільгалі разгорнутыя веэры хвастоў, мне здалося, што нават лятала пер'е. Потым адзін цецярук прыгнуў галаву і рынуўся ад другога наўцёкі проста ў будан дзядзькі Ціхона... Пераможца ўзняўся ў паветра, каб зараз жа сесці на самым версе дзядзькавага збудавання. І толькі ён сабраўся ўрачыста заспяваць, як пераможаны выскачыў з другога боку будана і памчаўся ад яго як мага далей.

Няўжо дзядзька Ціхон не бачыў, не чуў, што рабілася каля яго будана, што робіцца зараз над яго галавой? Гэта ж можна ціхенька працягнуць угору руку і схапіць разбойніка жывога за ногі! Чаго дзядзька Ціхон марудзіць? Ці не здарылася што з ім? Бо як ён, здаровы, мог спакойна вытрымаць гэтае бушаванне дзічыны!..

Сонца значна паднялося над небасхілам. Такаванне канчалася. Цецерукі адзін за адным разляталіся з паляны. Адчуўшы позні час, шыбануў у лес і цецярук дзядзькі Ціхона. І тады з будана паказаўся гаспадар.

— Гэй, Пятро! — гукнуў ён мне нейкім ласкавым і шчырым голасам. — Ці не час нам падавацца на сваю базу?

— А я ўжо думаў, што вы заснулі ці захварэлі. Чаму не стралялі?

Дзядзька Ціхон хораша ўсміхнуўся сам сабе.

— Настраляўся я, брат, за свой век. А тут ніяк не мог узняць стрэльбы. Бачыў? Яны ж дурэлі і ганяліся адзін за адным, як дзеці!.. (*Паводле М. Паслядовіча*). (590 слоў)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

1. Дайце тэксту загаловак, які адпавядаў бы яго тэме. Сфармулюйце асноўную думку тэксту. Ці адлюстравана яна ў тэксце? У якім сказе яна перадаецца?

2. Вызначце стыль тэксту. Ці ёсць у тэксце апісанне? З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

3. Складзіце план і схему будовы тэксту. Параўнайце іх. Ці супадае колькасць абзацаў і частак у тэксце? Назавіце прычыны іх супадзення ці несупадзення.

4. Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаецца пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне. Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння слоў у апавяданні пра галоўнага героя? Назавіце словы, якія паказваюць на час дзеяння.

5. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***такавішча***, ***кнігаўка***, ***калматыя***. Растлумачце напісанне наступных слоў: ***напагатове***, ***на досвітку***, ***чырванабровага***, ***смалою-жывіцай***, ***штораніцы***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі.

6. Сцісла перакажыце тэкст, выявіўшы, якую інфармацыю ў ім можна перадаць абагульнена, а якую можна апусціць.

## Першы дзень у Зорным

Выехалі з Масквы познім вечарам. Пра тое, што едуць у Зорны гарадок, ім, учарашнім выпускнікам, сказалі напярэдадні, за нейкую гадзіну да ад'езду, і ў аўтобусе ўсе былі ўзбуджаныя, усхваляваныя, быццам дзеці. Зрэшты, усе яны былі маладыя, усім было па дваццаць з невялікім гакам, і яны з юначай непасрэднасцю абменьваліся ўражаннямі, думкамі, прыставалі з роспытамі да падпалкоўніка, які суправаджаў іх у Зорны.

Прыехаўшы ўначы, яны так і не пабачылі, які ён, Зорны гарадок. Адно кінулася ў вочы, што нібыта вакол — лес, а сам гарадок невялікі, недзе з дзясятак дамоў.

Больш агледзеліся раніцай, калі ішлі снедаць. Гарадок, праўда, быў невялікі, з адной-адзінай вуліцай-алеяй, выкладзенай шырокімі бетоннымі плітамі. Дамоў уздоўж гэтай вуліцы-алеі таксама было няшмат: некалькі пяціпавярховых, нейкія, няйначай службовыя, аднапавярховыя будынiны, ды злева ўзвышаўся ў неба кран —



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

будаваўся высотны дом. А вакол гарадка, куды ні паглядзіш, шумеў пад асеннім ветрам лес.

Снедалі па-маладому весела і таропка. А калі выйшлі сваёй дружнай гаманлівай купкай са сталоўкі на двор, дык тут жа і анямелі, і знерухомелі ад нечаканасці: ім насустрач ішоў імклівым крокам сам Юрый Аляксеевіч Гагарын.

Падышоў, акінуў усіх хуткім, трошачкі прыжмураным паглядам, усміхнуўся абаяльнай, пяшчотнай усмешкай і спытаўся нечакана надта ж проста і сардэчна:

— Як паснедалі, хлопцы?

Яны разгубіліся, збянтэжыліся. Ніхто не чакаў, што сам Гагарын загаворыць з імі пра гэта. Каб ён спытаўся пра космас, пра Цыялкоўскага, пра тое, як яны ляталі на імклівых «МіГах», — гэта было б зразумела, тады б яны не разгубіліся, не маўчалі б.

Юрый Аляксеевіч быццам зразумеў іхнюю збянтэжанасць і, паранейшаму ўсміхаючыся, сказаў:

— Бачу, што паснедалі добра, сытна і з апетытам, як касцы, што намахаліся з касой на лузе. Касцы пасля такога сняданку звычайна кладуцца адпачыць, каб здор завязаўся. Але ж мы, трэба думаць, яшчэ не накасіліся, таму — за работу. Так, так, сябры, за работу. Запомніце раз і назаўсёды: космас — гэта найперш работа. І пачынаецца яна не там, — Юрый Аляксеевіч зірнуў угору, на нізкія, проста над вяршынямі соснаў, шэрыя хмары, — а тут, на зямлі. На зямлі, таварышы! — паўтарыў ён.

Яны, будучыя касманаўты, і гэтыя гагарынскія словы выслухалі моўчкі. А Гагарын нечакана прапанаваў:

— А цяпер давайце знаёмімся.

Усе ажывіліся, падаліся да яго. А ён, знаёмячыся, з кожным жартаваў, па-сяброўску ціснуў руку.

Калі дайшла чарга да Пятра Клімука, Юрый Аляксеевіч, паціскаючы яму руку, перапытаў:

— Пятро, вы сказалі, вас зваць? Значыць, украінец? Ці братка беларус?

— Беларус, Юрый Аляксеевіч, — адказаў Пятро Клімук.

— То і добра, суседзі мы. Твая Беларусь і мая Смаленшчына — суседкі, значыць, і мы суседзі.

Хтосьці з хлопцаў пажартаваў:

— Шанцуе ж Клімуку!



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Юрый Аляксеевіч загаварыў з наступным кандыдатам у касманаўты, а Пятро Клімук стаяў і думаў пра тое, што яму сапраўды шанцуе, што ён, няйначай, шчаслівы чалавек. Бо хіба ж гэта не шчасце, што ён тут, у Зорным гарадку, што ён будзе рыхтавацца да палёту ў космас, што яму толькі што паціснуў руку сам Гагарын?!

Неўзабаве яны, шчыльна акружыўшы Юрыя Аляксеевіча, ішлі асфальтаванай дарожкай туды, дзе за дрэвамі бялелі вучэбныя карпусы.

У іх, будучых касманаўтаў, пачынаўся першы рабочы дзень (*Паводле М. Гіля*). (485 слоў)

1. Што перадае загаловак тэксту: тэму ці асноўную думку? Як гэта тэма раскрываецца ў тэксце? Чым запомніўся ўчарашнім курсантам (будучым касманаўтам) іх першы дзень у Зорным? Чаму Пятро Клімук адчуў сябе шчаслівым чалавекам?

2. Вызначце стыль тэксту і вядучы тып маўлення. Ці ёсць у тэксце апісанне? З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

3. Дакажыце, што змест тэксту раскрываецца з дапамогай паслядоўнай сувязі. Назавіце сродкі гэтай сувязі.

4. Растлумачце правапіс наступных слоў: ***Зорны гарадок***, ***напярэдадні***, ***ад'езд***, ***узбуджаны***, ***усхваляваны***, ***дзясятак***, ***вуліца-алея***, ***па-маладому***, ***па-ранейшаму*** і інш.

5. Падзяліце тэкст на часткі, дайце кожнай частцы загаловак. Вызначце, якую інфармацыю ў кожнай частцы можна перадаць абагульнена, а якую можна апусціць.

6. Сцісла перакажыце тэкст, замяняючы простую мову ўскоснай.

## Выбарачны пераказ

### Бібліятэка-легенда

Магнаты Храптовічы аблюбавалі навагрудскія Шчорсы яшчэ ў XV стагоддзі. Вабіла іх чароўная тутэйшая прырода: Нёман, Налібоцкая пушча, мурожныя лугі, ураджайныя палеткі. Французскія ды італьянскія архітэктары спланавалі ім палац, парк, царкву. І доўгі час гаспадары маёнтка вырашалі свае будзённыя клопаты: як атрымаць найбольшы прыбытак з палеткаў, лесу, ракі і прыгонных сялян.

З вялікага роду Храптовічаў у спіс мысліцеляў і асветнікаў Беларусі па праву занесены Іаахім Ігнацый Юзаф Літавор Храптовіч



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

(1729—1812). Ён меў чатыры імёны, і гэта азначала яго знатнасць, важнасць у радаводзе. Яго пасады і тытулы гавораць самі за сябе: міністр замежных спраў, канцлер Вялікага Княства Літоўскага, кіраўнік дэпартамента акадэміі і школ. Вось такі грамадскі, палітычны і дзяржаўны дзеяч вырас у Шчорсах. Ён любіў свой радавы тутэйшы маёнтак. Менавіта пры ім узведзены тут галоўныя мураваныя пабудовы. І гэта ён сабраў у маёнтку ўнікальную бібліятэку.

Кажуць, у бібліятэчным храме Храптовіча было каля дваццаці тысяч кніг. Ды якіх! Творы рымскіх, грэчаскіх, італьянскіх, французскіх класікаў, кнігі, рукапісы і архівы па гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы.

Бібліятэку вывезлі ў 1913 годзе ў Кіеўскі ўніверсітэт імя святога Уладзіміра. Але ўмова апошняга ўладара бібліятэкі Канстанціна Храптовіча-Буцянёва была такая: з адкрыццём універсітэта на радзіме бібліятэка павінна вярнуцца.

На жаль, нічога няма больш пастаяннага, чым часовае. І лёс шчорсаўскай бібліятэкі стаў непрадказальным. Перад Першай сусветнай вайной нашы кнігі эвакуіравалі ў Саратаў, перад Другой сусветнай вайной — ва Уфу. Тыя кнігі, што заставаліся ў Шчорсах, былі вывезены перад вайной у Маскву ці знішчаны фашыстамі. А рукапісны збор і архіў бібліятэкі пасля рэвалюцыі вывезлі ў Ленінград. Такім чынам, бібліятэку Храптовіча трэба шукаць па ўсім свеце. Аднак хочацца верыць, што надыдзе шчаслівая часіна і вернецца ў Шчорсы бібліятэка-скарб.

У свой час бібліятэкарамі ў Шчорсах працавалі Ян Чачот і Антон Глінскі. Абодва яны таленавітыя фалькларысты, збіральнікі народнай мудрасці. Відаць, мясцовыя жыхары натхнялі іх на такую творчую справу. Антон Глінскі, напрыклад, стаў аўтарам чатырох тамоў беларускіх народных казак, анекдотаў і апавяданняў, сабраных з ваколіц Шчорсаў і Нягневіч.

Сам Іаахім Ігнацый Юзаф Літавор Храптовіч пазайздросціў бы сучасным вучням, іх светлым камп'ютарызаваным класам. Ён расказаў бы сённяшнім вундэркіндам пра свайго прыгоннага Ігната Аржахоўскага са Шчорсаў, які атрымаў вышэйшую медыцынскую адукацыю ў Вільні, абараніў дысертацыю на ступень доктара медыцыны. Стаўшы папулярным лекарам у Наваградку, Аржахоўскі сабраў грошай і выкупіў з прыгону сваю сям'ю.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Храптовіч з прыемнасцю зайшоў бы ў прасторныя катэджы, у якіх жывуць цяперашнія хлебаробы. Гэта іх далёкіх продкаў Храптовіч вызваляў ад прыгону-прыгнёту, як бы прадбачыў сённяшнюю яву вольных і квітнеючых Шчорсаў (*У. Ліпскі*). (396 слоў)

1. Хто з вялікага роду Храптовічаў трапіў у спіс мысліцеляў і асветнікаў Беларусі? Пра што сведчаць яго чатыры імёны? У чым унікальнасць бібліятэкі, сабранай Храптовічам? Якім быў яе лёс?

2. Вызначце задачу, якую вырашае аўтар тэксту.

3. Назавіце падтэмы, у якіх раскрываецца тэма тэксту.

4. Вызначце стыль маўлення, абгрунтуйце свой адказ (задачы маўлення, асноўныя стылявыя рысы). Назавіце моўныя сродкі, з дапамогай якіх дасягаецца выразнасць тэксту.

5. Растлумачце правапіс вялікай літары ў тэксце.

6. Напішыце выбарачны пераказ на тэму «Бібліятэка Храптовічаў». Сачыце, каб тэкст выбарачнага пераказу захоўваў асаблівасці аўтарскага стылю і меў трохчасткавую будову (уступ, асноўная частка, заключэнне).

**Шахматы… з танцамі**

У сваім двары мы наладзілі суботнік: рамантавалі лавачкі, ускопвалі зямлю, утаптаную, як камень, рабілі клумбы, садзілі кветкі, бэз і шыпшыну.

Тут з'явіўся ўнук.

— Дзед, можна мне з табой пабыць, пакуль мама з татам будуць у тэатры?

Я ўзрадаваўся:

— Добра, зайка, што ты прыехаў. Я вельмі рады памочніку. Пакуль я капа́ю, пальеш кусцікі і дрэўцы, каб яны лепш раслі. А потым згуляем у шахматы. Даўно мы з табой не гулялі.

Калі ўсё зрабілі, аж залюбаваліся: двор папрыгажэў і, здалося, нават пасвятлеў ад пабеленых каменьчыкаў вакол клумбаў. На лаўцы, якую толькі што адрамантавалі, мы паставілі шахматную дошку, расставілі фігуры і пачалі гуляць.

Заканчвалі партыю. Да нас падышоў Сяргей Урбановіч — мой сусед, шафёр. Я саступіў месца, а сам стаў балельшчыкам, як іншыя, што абступілі нас з усіх бакоў. Ледзь не ўся мужчынская палова жыхароў нашага пад'езда — аматары шахмат, гэтай старажытнай высакароднай гульні.

— Калі пераможаш мяне, Сашка, атрымаеш прыз.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

— Прыз? Які?! — загарэліся цікаўнасцю Сашкавы вочы.

— Які ты хацеў бы мець?

— М...м... шакаладку.

— Згодзен, будзем гуляць на шакаладку.

Як бывалы шахматыст, Сашка ўзяў у рукі белую і чорную пешкі, схаваў за спінай і прапанаваў выбіраць. Яму дасталіся чорныя фігуры. Шахматысты перавярнулі дошку з расстаўленымі фігурамі і пачалі гуляць. Яшчэ ў дэбюце (самым пачатку партыі) Сяргей схаваў свайго караля за фігуры ў вугал, зрабіўшы кароткую ракіроўку. Сашка, падумаўшы, кінуў у атаку на варожага караля не толькі фігуры, але і пешкі, паспрабаваўшы адразу ўзарваць каралеўскі фланг. Чорныя ў адказ — наступ у цэнтры. Здавалася, вось-вось белы кароль будзе ў пастцы. Я перажываў за ўнука, але падказваць нельга: на прыз жа гуляюць! І тут, як быццам прачытаўшы мае думкі, палкаводзец белага войска прыняў адзінае правільнае рашэнне: зрабіў доўгую ракіроўку і вырваўся з хітрай пасткі, расстаўленай палкаводцам варожага войска. Праз некалькі хадоў у стан чорных уварваліся баявыя сланы і конніца белых. Давяршыў разгром праціўніка магутны ферзь.

— Мат! Вам, дзядзя Сярожа, мат! — вочкі Сашкі свяціліся радасцю.

— Малайчына, Сашка! — парадаваўся разам з усімі за свайго маленькага партнёра зычлівы Сяргей. — Віншую! Ты выйграў. Я табе зараз дам грошы, — Сяргей палез у кішэню, — а шакаладку купіш заўтра сам. Згодзен?

— Ды тут жа, дзядзя Сярожа, больш, — разгубіўся Сашка, трымаючы ў руцэ грошы і не ведаючы, што з імі рабіць. — У мяне здачы няма.

— А ты мне на здачу... патанцуй, — знайшоў выхад Урбановіч. — Ты ўмееш танцаваць? Напрыклад, польку, — падахвоціў Сяргей і пачаў напяваць рытмы полькі.

Спачатку бянтэжачыся, Сашка паступова расхрабрыўся і адчуваў сябе ўсё больш упэўнена. Сяргей не мог паверыць вачам: яго шахматны партнёр не проста танцаваў — ён «даваў жару», як некалі сам Сяргей.

— І вы, дзядзя Сярожа, танцуйце! — пацягнуў шафёра за руку танцор.

Ніколькі не бянтэжачыся, той пачаў кружыцца разам з Сашкам.

— Няправільна! Няправільна, дзядзя Сярожа! — спыніў партнёра Сашка. — Гэты элемент завецца «крок-падскок». Трэба вось



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

так: весела зрабіць крок, наском нагі адштурхнуцца, а другую нагу сагнуць-выпраміць... Паўтарайце за мной.

Сяргей паспрабаваў паўтарыць і, жартуючы, зачапіўся за Сашку, які, як мячык, адляцеў ад масіўнай постаці шафёра.

Сашка радасна насіўся па пляцоўцы, а Сяргей не мог за ім угнацца. Людзі, што сабраліся вакол, аж за жываты браліся ад смеху.

Нехта спытаў, ці ўмее Сашка танцаваць вальс, і тут жа заспяваў. Некалькі чалавек падхапілі — і палілася чароўная мелодыя старадаўняга вальса. Сашка закружыўся ў прыгожым танцы. Цвіў бэз. Яго духмяны водар і гэты плаўны старадаўні танец навявалі ўспаміны аб чароўным юнацтве.

Я і радаваўся за ўнука, і шкадаваў: паздзірае каленцы аб асфальт. Але не спыняў. А Сашка, радасны, разагрэты танцамі, падскокваў, прысядаў і закончыў грацыёзным, артыстычным паклонам.

— Малайчына, Сашка! Якая змена ў нас падрастае, нават я так не ўмею! Аказваецца, ты не толькі ў шахматы добра гуляеш, але і выдатна танцуеш. Ну парадаваў! (*Паводле У. Шулякоўскага*). (583 словы)

1. Што перадае загаловак тэксту: тэму ці асноўную думку? Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Прапануйце ўласны варыянт загалоўка, які адлюстроўваў бы асноўную думку.

2. Вызначце стыль тэксту і яго адметныя адзнакі на марфалагічным і сінтаксічным узроўнях. Які тып маўлення ў тэксце з'яўляецца дамінуючым? Ці адпавядае гэта тэме і асноўнай думцы тэксту? Абгрунтуйце сваю думку.

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Назавіце канцоўку ў тэксце. Які сэнс яна мае? Ці супадаюць у тэксце межы частак і абзацаў? Вызначце сувязь паміж часткамі ў тэксце і сказамі ў частках.

4. Выпішыце з кожнай часткі тэксту дзеясловы, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку.

5. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў простым ускладненым сказе.

6. Напішыце пераказ на тэму «Шахматная партыя».

### Якое дрэўца прыжываецца?

Аднойчы Марыя Якаўлеўна зайшла раніцай у клас і сказала, што сёння вучні будуць садзіць дрэўцы.

Гуртам высыпалі ў школьны двор. Хлопчыкі хуценька збегалі па рыдлёўкі, і неўзабаве ўсе, весела гамонячы, рушылі ў лясок, што пачынаўся адразу за вёскаю.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

— Марыя Якаўлеўна, а якія дрэўцы будзем выкопваць? — адразу ж пачалі пытацца дзеці. — А дубок прыжывецца? А грушу-дзічку можна пасадзіць? А можа, лепш бярозку?

Пытанні і прапановы сыпаліся з усіх бакоў, і настаўніца ледзь паспявала на іх адказваць. Яна гаварыла, што кожнае дрэва па-свойму прыгожае і карыснае, і вельмі добра, што яны не падобны адно да аднаго, бо аднастайнасць стамляе пагляд і прыгнятае душу, што будзе добра, калі яны каля школы пасадзяць самыя розныя дрэўцы: і бярозку, і ліпу, і вяз, і клён, і нават елачку, якая будзе радаваць вока сваёй зелянінай узімку.

У лесе дзеці разбегліся хто куды, адшукваючы самыя прыгожыя дрэўцы — каб і стройныя былі, і з правільнай кронай.

Дрэўцаў накапалі хутка. Дзяўчынкі неслі па адным, а хлопчыкі — па два, а хто дужэйшы, дык і па тры. Марыя Якаўлеўна таксама несла два дрэўцы — бярозку і вяз.

Хтосьці з хлопчыкаў сказаў сумнавата:

— Скончым школу, а нашы дрэўцы застануцца. Будуць расці без нас...

Марыя Якаўлеўна ўсміхнулася:

— Дык гэта ж і добра! Неяк я прачытала пісьмо Аляксея Максімавіча Горкага, якое ён пісаў свайму сыну Максіму. Яно мяне вельмі ўзрушыла. Там былі прыкладна такія словы: ты паехаў, а кветкі, пасаджаныя табою, растуць і цешаць пагляд і сэрцы іншых людзей. Як добра было б, каб кожны чалавек на зямлі пакідаў пасля сябе нешта, што цешыла б пагляд і сэрца іншага чалавека...

Пеця маўчаў і па дарозе ў лес, і калі ішлі назад да школы. Пада́ў ён голас на школьным двары, калі настаўніца нечакана спыталася, ці ведае хто-небудзь з вучняў, як трэба садзіць дрэвы.

Тут Пеця і сказаў, што яны з бацькам ажно сорак пяць дрэў у сваім садзе пасадзілі.

Ён узяў рыдлёўку і хутка выкапаў ямку.

— Ямка павінна быць такая, — пачаў тлумачыць Пеця, — каб карэньчыкі леглі вольна, не згіналіся і не курчыліся, тады яны лягчэй і хутчэй прымуцца на новым месцы. Зверху карані лепш за ўсё прысыпаць перагноем і паліць вадою. А пасля засыпаць зямлёй, шчыльненька абтаптаць, зноў паліць. Нарэшце пасаджанае дрэўца трэба абавязкова прывязаць да калочка, каб вецер яго не разгойдваў, каб яно магло спакойна прывыкаць да новага месца. А самае галоўнае,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

казаў тата, дрэва трэба садзіць з любоўю. Пасадзіш з любоўю — прыжывецца, без любві — засохне!

Некалькі дзясяткаў дрэўцаў пасадзілі вучні каля школы ў той дзень. Многія з іх прыжыліся, выраслі.

Цяпер у Камароўцы новая школа, і стаіць яна на новым месцы. А каля старой школы растуць дрэвы. Ёсць сярод іх і дрэўцы, пасаджаныя Пецем, Пятром Ільічом Клімуком. Бо прыжываецца тое дрэўца, якое пасаджана з любоўю (*Паводле М. Гіля*). (444 словы)

1. Адкажыце на пытанне, пастаўленае ў загалоўку.

2. Вызначце вядучы тып маўлення тэксту, укажыце яго тыповую кампазіцыйную схему, пацвердзіце прыкладамі з тэксту.

3. Вызначце стыль маўлення, назавіце моўныя сродкі з тэксту, характэрныя для гэтага стылю.

4. Растлумачце правапіс наступных слоў: ***карэньчыкі***, ***лягчэй***, ***хутчэй***, ***шчыльненька***, ***пасаджанае***, (***з***) ***любоўю***.

5. Напішыце выбарачны пераказ на тэму «Як трэба садзіць дрэвы», захаваўшы асноўную думку ўсяго тэксту. Абгрунтуйце пастаноўку працяжнікаў у сказе ***«Пасадзіш з любоўю — прыжывецца, без любві — засохне!»***

## Пераказ з дадатковым заданнем

### Спосабы знаёмства

Сяброўка, якая жыла ў Варшаве, расказала Анжэле пра некаторыя спосабы знаёмства польскай моладзі. Напрыклад, адна дзяўчына ў супермаркеце выявіла ля касы, што нехта падкінуў ёй у карзіну шакаладку. Спачатку падумала, што памылкова, але пасля на абгортцы заўважыла надпіс: «Хачу з табой пазнаёміцца». Там быў і нумар тэлефона.

А яшчэ на вуліцы, дзе бавіць час моладзь, адна дзяўчына ўбачыла сімпатычнага хлопца. Хацела зазірнуць яму ў вочы, але ў таго нізка на лоб была нацягнута шапка. Дзяўчына хацела звярнуць на сябе ўвагу, таму падскочыла і сарвала шапку з галавы хлопца. Спачатку ён зірнуў на яе злосна, бо думаў, што нехта няўдала жартуе або хоча ўкрасці яго шапку. Дзяўчына ж засмяялася і прамовіла: «Хацела толькі пазнаёміцца. А зараз ужо ад цябе залежыць, ці здабудзеш шапку і мяне». І склала губкі банцікам. А хлопец ахвотна цмокнуў у іх.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

А яшчэ быў вельмі рамантычны выпадак. Нейкі хлопец гуляў у парку і затрымаўся перад групай мексіканскіх музы́каў, якія выконвалі народныя мелодыі. Ажыўлена апладзіраваў пасля канцэрта. Раптам заўважыў, што адна дзяўчына падышла да саліста і нешта яму шапнула. Той накіраваўся да хлопца і паведаміў: «Наступная песня для цябе. Ад сеньёрыты, якая сядзіць вунь на той лаўцы». Музы́кі зайгралі выдатны твор. Хлопец падышоў да той дзяўчыны, узяў яе за руку, і яны разам слухалі цудоўны канцэрт (*Паводле А. Бутэвіча*). (210 слоў)

1. Пра якія спосабы знаёмства польскай моладзі расказала Анжэле яе сяброўка з Варшавы? Што аб'ядноўвае спосабы знаёмства ў супермаркеце, на вуліцы і ў парку?

2. Абгрунтуйце падзел тэксту на тры абзацы. Колькі частак у тэксце? Ці супадаюць яны з абзацамі?

3. Дайце часткам тэксту загалоўкі, якія адпавядалі б пунктам плана.

4. Як вы адносіцеся да апісаных у тэксце спосабаў знаёмства? Як бы вы паводзілі сябе, калі б з вамі нехта захацеў так пазнаёміцца? Пра які цікавы спосаб знаёмства вы маглі б расказаць?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: ***мексіканскі***, ***мелодыя***, ***апладзіраваць***, ***сеньёрыта***, ***канцэрт***. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

6. Зрабіце падрабязны пераказ тэксту. Напішыце яго працяг, выказаўшы свае адносіны да апісаных спосабаў знаёмства, або прапануйце свой спосаб.

## Што ў назвах?

У кожнай назве паселішча сваё паняцце. Проста так назва не з'явілася. Яна нясе пэўны сэнс, мае сваё тлумачэнне. Пра назвы населеных пунктаў Слонімшчыны можна пісаць і аповесці, і апавяданні, і казкі.

Ёсць зразумелыя назвы. Вёска Залессе некалі ўзнікла за лесам, Загор'е — за гарой, Задвор'е — за дваром, маёнткам. Вёска Кавалі, відаць, уславіла сваіх даўнейшых майстроў-кавалёў. А вось Азарычы вядомы з XVI стагоддзя. Назва паходзіць ад імя чалавека Азар, Азарыя, або Елеазар. Са стараяўрэйскай мовы яно перакладаецца як «Бог памог».

Такія ж загадкі без разгадак у вёскі Акунінава (ад імя Акуня, Акула, Акушка, Акіла), у вёскі Ганькі (ад імя Ганька, Ганько, Ананія),



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

у вёскі Грынкі (ад імя Грынко, Грын), у вёсак Ермалоўшчына, Мікалаеўшчына, Паўлава, Савічы, Сянькоўшчына.

А вось адкуль, ад чаго слонімскія Ваўчкі? З падобнай назвай звыш сямідзесяці беларускіх вёсак. Вучоныя тлумачаць, што імя Воўк старажытныя людзі давалі дзецям — як сімвал магічнай сілы. Яно, лічылі, магло абараніць ад злых духаў. Імя-мянушка перайшло ў назву вёскі, дзе жыў радавод Ваўкоў, Ваўчкоў.

Вёска Гуменікі можа быць удзячна прозвішчу яе заснавальніка Гуменіка або наглядчыку пры гумне — гуменіку. Ён ахоўваў ураджай вяскоўцаў, быў як бы галоўным над імі.

Задумайцеся, сябры, над назвай свайго паселішча. Пашукайце адгадку, раскрыйце таямніцу. І вы, веру, яшчэ больш палюбіце сваю малую радзіму (*У. Ліпскі*). (202 словы)

1. Вызначце тэму тэксту. Як можна сфармуляваць асноўную думку тэксту?

2. Як тлумачацца ў тэксце назвы вёсак ***Залессе***, ***Загор'е***, ***Кавалі***, ***Азарычы*** і інш.?

3. Вызначце ўступную і заключную часткі тэксту, ахарактарызуйце іх ролю ў стварэнні тэксту.

4. Вызначце стыль тэксту. Якія моўныя сродкі, характэрныя для гэтага стылю, выкарыстоўвае аўтар у апошнім абзацы?

5. Вызначце спосаб утварэння ўласных назоўнікаў (назваў вёсак), растлумачце іх правапіс.

6. Ці задумваліся вы над назвай свайго паселішча (вёскі, пасёлка, горада, мікрараёна)? Ці ведаеце вы яе паходжанне? Паспрабуйце апісаць, адкуль паходзіць назва вашага паселішча або бліжэйшых да вас населеных пунктаў.

### На спатканне — у месца закаханых

Наведваць мемарыял, прысвечаны воінам-афганцам, якія загінулі ў чужой вайне, канешне, трэба, ніхто не будзе з гэтым спрачацца, але не ў самы светлы дзень жыцця маладых. Шчасце і трагедыя — зусім несупастаўляльныя пачуцці. Але што мы можам прапанаваць маладым парам? Наведванне мемарыяла «Мінск — горад-герой» або Вечнага агню на плошчы Перамогі. Вось і едуць вясельныя картэжы да помнікаў, хаця гэта хутчэй не праява патрыятызму, а даніна модзе. У савецкія часы, напрыклад, існавала традыцыя ўскладаць кветкі да помніка Леніну. А сёння гэта ўжо нямодна.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Неабходна, каб у такім вялізным горадзе, як Мінск, з’явіўся, нарэшце, куточак для закаханых. Гэта месца абавязкова павінна быць у самым цэнтры горада, каб да яго лёгка было дабрацца, у зялёнай зоне. Можна, напрыклад, усталяваць там нейкі старажытны гадзіннік з прыгожым музычным боем. І маладыя змогуць прызначаць пад ім свае спатканні. Ці сімвалічную падкову для маладажонаў, якія павінны будуць прайсці пад ёй, каб умацаваць сваё сямейнае шчасце. Ажурныя лаўкі, клумба з кветкамі, якія сімвалізуюць каханне, прыгожая падсветка, музычны фантан з птушкамі, папараць-кветка — рашэнняў можа быць мноства, галоўнае, каб гэта ідэя знайшла падтрымку. У Сяміпалацінску, напрыклад, маладыя пары завязваюць на памятным дрэве рознакаляровыя стужкі — вельмі прыгожая традыцыя. Давайце і мы створым штосьці сваё. І моладзь нас падтрымае.

Невыпадкова ў нашай краіне так хутка прыжыўся Дзень святога Валянціна. Скажам, Свята бацькоў, якое адзначаецца на Захадзе, не прыжылося, а Свята закаханых стала ці не самым любімым пасля Новага года. І не толькі таму, што мы, славяне, умеем кахаць, але і таму, што ў гэтага свята ёсць прыгожая легенда і шмат вясёлых і прыгожых атрыбутаў, якія прываблiваюць моладзь (*Паводле Н. Баранавай*). (258 слоў)

1. На якой праблеме акцэнтуе ўвагу аўтар тэксту? Якія варыянты яе вырашэння прапануе?

2. Адкажыце на пытанні: З якой мэтай створаны тэкст? Якую сферу чалавечай дзейнасці ён абслугоўвае? У якой сітуацыі ён будзе ўспрымацца?

3. Як вы адносіцеся да таго, што піша аўтар? Ці падтрымліваеце яго ідэю пра стварэнне «куточка для закаханых» у Мінску? Ці патрэбны, на вашу думку, такія куточкі ў іншых гарадах і гарадках?

4. Да якога стылю належыць тэкст? Якімі сродкамі карыстаецца аўтар для дасягнення выразнасці выказвання?

5. Растлумачце правапіс вялікай літары ў тэксце.

6. Напішыце падрабязны пераказ тэксту. Прадоўжыце яго, прапанаваўшы свой варыянт свята для маладых пар.

## Гультай

У дзядзькі Антона былі надта сярдзітыя сабакі, ды затое разумныя, умелі пільна сцерагчы двор. Самы большы з іх, якога звалі Дунай, мог пусціць незнаёмага чалавека нават у хату, не гыркаў, не брахаў, але не выпускаў на вуліцу да прыходу дзядзькі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Мне вельмі спадабаліся малыя шчаняты, і я выпрасіў у дзядзькі Антона сабе лепшага шчанюка. Увесь чорны: і лапы, і хвост, і вушы, а наперадзе і пад жыватом поўсць рыжая, нібыта ён у камізэльцы. Хоць і быў ён яшчэ зусім маленькі, але поўсць на ім ужо тапырылася і кучаравілася, як у Дуная. Я пачаў яго гладзіць, і ён адразу прывязаўся да мяне: бяжыць услед, пыскай водзіць, шукае мяне.

Я паклаў яго ў прыпол, прынёс дадому. І таксама назваў Дунаем.

Мы пасябравалі з Дунаем так, што ніколі не разлучаліся. У агарод, на рэчку, у сяло — усюды я браў яго з сабою. Дунай заўсёды бег і лашчыўся да мяне, ад радасці гатоў быў, здаецца, падскочыць і лізнуць мне твар.

— Не песці яго, — казаў мне дзядзька Антон. — Сабака павінен быць сабакам, а не цацкай.

Аднак я дагледаў яго, як сам хацеў. Дунай рос, не ведаючы ніякай прывязі. Хацеў ён у хату — я адчыняў яму дзверы. Маці на мяне сварылася:

— Што ты ўсё нянькчышся з ім? Вунь куры грабуць грады... Нацкаваў бы на іх сабаку, прагнаў!

Але я гуляў з Дунаем, пакуль ён не падрос, падужэў. Брэх яго разлягаўся па ўсёй вуліцы. А аднойчы ён, гуляючы з парасятамі, відаць, незнарок кіпцюром драпануў аднаго. Той віснуў, а свіння, не доўга думаючы, схапіла сабаку за жывот. На двары ўзняўся лямант: сабака скавытаў, свіння раз'юшана рохкала, парасяты вішчалі...

Іншы раз чужыя свінні рылі бульбу на нашым агародзе. Я выбягаў з хаты і крычаў:

— Дунай! Кусі іх!

Але Дунай, згледзеўшы свіны лыч, палахліва падгінаў хвост і хаваўся куды-небудзь. І ніякай дапамогі мне ад яго не было. Толькі што лашчыўся...

— Які ён Дунай! — казаў дзядзька Антон. — Гэта Гультай, а не Дунай. Гаварыў — не песці! Вось і выгадаваў гультая і лежабоку (*Паводле І. Грамовіча*). (322 словы)

1. Чаму дзядзька Антон назваў сабаку не Дунаем, а Гультаём? Па якой прычыне Дунай вырас такім?

2. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Падзяліце тэкст на часткі, дайце ім загалоўкі. Запішыце ключавыя словы, выразы да кожнай часткі. Вусна ўзнавіце змест кожнай часткі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання?

5. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай, з адасобленымі азначэннямі і акалічнасцямі, пабочнымі словамі.

6. Напішыце пераказ тэксту ад імя 3-й асобы адзіночнага ліку. Дайце хлопчыку імя.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

## Кітабы

Калі верыць народным паданням і легендам, Беларусь ці не самая багатая ў Еўропе краіна на схаваныя ў яе нетрах скарбы. Аднак мала каму з шукальнікаў удалося адкрыць гэтыя зачараваныя сховы. Відаць, не мелі яны чароўнай папараць-кветкі ў руках, якая паказвае шлях да падземных багаццяў.

А вось іншыя скарбы пры водбліску той нябачнай кветкі нашым суродзічам адкрываліся ахвотна. Назва ім — духоўнае багацце нашых продкаў, што ў сукупнасці складае багатую беларускую культуру.

Каму з нас не даводзілася трымаць у руках кнігі, захапляцца іх мастацкім аздабленнем. Заўсёды арэолам таямнічасці былі ахінуты кнігі, напісаныя арабскай вяззю. Яны здаваліся недаступнымі і загадкавымі. Цяжка было ўявіць, што за мудрагелістым арабскім пісьмом можа хавацца звыклы беларускі тэкст, што ў гэтых хітраспляценнях чужой графікі зашыфраваны беларускія словы.

Рукапісныя кнігі, створаныя на беларускай мове арабскім пісьмом, называюцца кіта́бы. Іх аўтары — беларускія татары. Яны звязалі свой лёс з нашай зямлёй яшчэ ў XIV стагоддзі і ўжо 600 гадоў годна і дбайна шчыруюць у агульнай людской супольнасці.

З’яўленне татар на беларускіх землях звязваецца з часам княжання ў Вялікім Княстве Літоўскім Гедыміна. У 1319 годзе ў час бітвы з Тэўтонскім ордэнам татары складалі перадавое войска князя. Але асабліва спрыяльны для татар час наступіў пры Вітаўце Вялікім, які падтрымліваў перасяленне татар у Вялікае Княства Літоўскае.

Беларускія татары былі не толькі воінамі. Яны аралі зямлю, станавіліся рамеснікамі, гандлявалі, займаліся тымі справамі, што і мясцовае насельніцтва. Таму ад самага пачатку ўзнікла між беларусамі і татарамі прыязнасць і ўзаемаразуменне. Здаўна ў до-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

брай згодзе жывуць татары з прадстаўнікамі іншых народаў у Іўі, Міры, Навагрудку, Слоніме, Ляхавічах, Мядзелі.

Пасяліўшыся на беларускіх землях, татары паступова страцілі сваю мову. Але ў іх захоўваліся кнігі, выдадзеныя па-арабску. Каб далучыць да гэтай духоўнай скарбніцы моладзь, арабскія кнігі сталі перакладаць на беларускую мову. Але не беларускімі літарамі, а арабскім пісьмом і, як правіла, рукапісным спосабам. Часам беларускі пераклад рабіўся проста на старонках друкаваных арабскіх кніг.

У кітабах захаваны тлумачэнні малітваў, пастоў, апавяданні з жыцця Магамета і яго прарокаў, апісанні рэлігійных абрадаў і звычаяў. Як і ў іншых арабскіх кнігах, тэкст у кітабах напісаны і чытаецца справа налева, пачынаецца ў нізе старонкі. Тэкст не мае падзелу на словы, знакаў прыпынку, вялікай літары, прабелаў між асобнымі творамі. Гэта суцэльная арабская вязь.

Найбольш багатым на кітабы было XVI стагоддзе. З XVIII стагоддзя кітабы сталі пісаць лацінкай. Гэта былі легенды, казкі, паэмы, замовы, рэцэпты лекаў. Кнігі захоўвалі маральна-этычныя павучанні для моладзі, вучылі шанаваць бацькоў, гасцей, бедных.

Тое, што мусульманскія пісьменнікі і перапісчыкі карысталіся беларускай мовай, сведчыць пра яе вялікія магчымасці (*Паводле А. Бутэвіча*). (404 словы)

**Разумная казуля**

Машына ехала пад галлём, якое звісала над дарогай. Перад машынай успырхвалі птушкі, пераляталі з дрэва на дрэва. Спалоханая чародка цецеручкоў перабегла дарогу за сваёй маці.

Раптам з гушчарніку на дарогу выскачыла казуля, спынілася і паглядзела на машыну. Збавіўшы хуткасць, грузавік павольна пад'язджаў да стройнага рыжага звярка, які, нібы загіпнатызаваны, стаяў на месцы. Поўсць на шыі казулі ўздрыгвала, варушыліся вушы, а вочы ўважліва глядзелі на людзей у кабіне.

— Сігнальце, дзядзечка! — не вытрымаў Валодзя. — Пад колы ж пападзе!

Мікола Дубіцкі націснуў на тормаз і спыніў машыну за некалькі крокаў ад звярка, адчыніў дзверцы, каб прагнаць парушальніцу дарожнага руху. Але казуля не збіралася ўцякаць. Мікола шмат разоў сустракаў казуль на паляванні, але ніколі яны не падпускалі так блізка да сябе. Заўсёды палахлівыя, казулі ўцякалі, як толькі заўважалі чалавека. Калі Мікола замахаў рукамі, казуля павярнула-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ся ў той бок, адкуль выскачыла, зрабіла некалькі нетаропкіх крокаў, пасля лёгка пераскочыла цераз куст і знікла ў гушчары.

Грузавік рушыў з месца. Раптам Валодзя падаўся ўсім целам уперад і ўсклікнуў радасна:

— Зноў стаіць на дарозе!

Незвычайныя паводзіны ляснога звярка здзівілі бывалага паляўнічага. Дубіцкі заглушыў матор, вылез з кабіны. Казуля даверліва паглядзела на чалавека і пайшла ў кусты. Спынілася, павярнула галаву, быццам запрашала ісці за ёй. Дзядзька Мікола махнуў Валодзю рукой, каб ішоў да яго. Прайшлі метраў трыста. Казуля часта аглядалася, цяжка дыхала, неспакойна ўздрыгвала. Дубіцкаму здалося нават, што яна прыкідвала, ці можна даверыць людзям сваю тайну.

Казуля павярнула галаву ў бок кустоў і лёгкімі скачкамі наблізілася да жывога камячка, які то падскокваў на месцы, то падаў каля дрэва. Маці спынілася каля малога, лізнула некалькі разоў і адышла на крокаў пяць. З вачэй яе каціліся слёзы.

Дзядзька Мікола і Валодзя заспяшаліся да казляняці, якое трапіла ў сіло. Хлопчык адной рукой прыціснуў казляня да зямлі, а другой пагладзіў па маленькай галоўцы. Мікола аслабіў сіло і агледзеў ножку.

— Цэлая! — узрадаваўся Валодзя. — Выпускайце хутчэй, а то казуля чакае, не перастае плакаць.

Хлопчык паставіў казлянятка на ногі. Яно нясмела зрабіла пару крокаў, адчула, што ножка свабодная, падскочыла і пусцілася да маці. Казуля радасна пазірала на сваё дзіцятка. Пасля яшчэ раз глянула на Дубіцкага і Валодзю і павольна пайшла ўслед за казлянём. Ля куста спынілася і з такой удзячнасцю кіўнула галавой, што ў Міколы ў самога на вочы набеглі слёзы (*Паводле В. Гурскага*). (367 слоў)

**Выдрын гасцінец**

На лузе грузілі сена. Толькі чуваць быў гул матораў і гоман людзей. Раптам пачуўся ўсхваляваны крык:

— Выдра пабегла ў Нёман!

Дзядзька Мікола ўбачыў звярка, які то хаваўся ў глыбокім снезе, то з'яўляўся над ім, пасля скаціўся ў канаву і пабег па лёдзе. Мікола зразумеў: вада ў канаве замерзла, і звярка можна дагнаць, бо да палонкі далёка. Колькі разоў марыў сустрэцца на паляванні з выдрай, колькі разоў у думках дарыў дачушцы прыгожы пушысты каўнер!



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Мікола схапіў вілы і кінуўся напярэймы. Выдра ўцякала з усіх сіл, але і дзядзька не адставаў, хаця снег перашкаджаў бегчы, марознае паветра сціскала грудзі. Пасярод лугу канава рабіла паварот у бок крыніцы, да якой заставалася некалькі дзясяткаў метраў. Мікола зрэзаў вугал і скокнуў у канаву перад самай выдрай. Яна ад нечаканасці замерла на месцы. Да выдры даносіўся знаёмы пах вады, дзе лёгка схавацца, але на дарозе сядзеў чалавек і пранізваў яе сваім поглядам. І выдра так жаласна глянула на дзядзьку Міколу, што ў таго сціснулася сэрца.

Мікола адчуваў сваю перавагу над выдрай і бездапаможнасць звярка. Можа, каб уцякала, каб даганяў яе, то і не пашкадаваў бы. А тут глядзеў у такія гаротныя вочы, якія іскрыліся жыццём, бачыў звярка, што цяжка дыхаў і прасіў літасці. Дзядзька астудзіў свой ваяцкі настрой, памякчэў, стаў лагаднейшым, зірнуў яшчэ раз у поўныя журбы вочы выдры і цвёрда рашыў не чапаць яе. Мікола падміргнуў звярку і вылез з канавы.

Выдра не верыла свайму шчасцю: дарога свабодная! Яна са здзіўленнем зірнула на чалавека, які так настойліва даганяў яе, а цяпер адпускае. Падбегла да палонкі, радасна скокнула ў ваду, удзячна плюхнула хвастом на развітанне і знікла з вачэй. Мікола ўсміхаўся і задаволена глядзеў на кругі, якія разбягаліся па вадзе.

Пасля разводдзя быў ён на рыбалцы. Закінуў вуду, разаслаў плашч на беразе і слухае бульканне вады. Раптам у затоцы ля куста нешта плюхнула. Што там? Сцішыўся, не зводзіць вачэй з кругоў на вадзе, якія разбягаюцца ва ўсе бакі. Высунулася чорная галава. Гэта ж выдра! На паляванне выйшла, пагрэцца на сонцы захацела. «Цяпер злаўлю, — падумаў дзядзька. — Сама ў рукі прыйшла».

Асцярожна падпоўз Мікола да купіны, за якой сядзеў звярок. Выдра азірнулася, убачыла чалавека і скокнула ў ваду. Але дзядзька паспеў схапіць яе за хвост і пачаў выцягваць з вады. Спачатку паказаліся заднія ногі, затым пярэднія, а вось і галава ўжо відаць. Нарэшце выдра павярнула галаву і жаласна паглядзела ў вочы рыбалову. Разжаліўся Мікола і адпусціў звярка. Выдра плюхнула ў ваду, вынырнула ля берага і паплыла.

Глядзіць дзядзька Мікола: выдра плыве, а на беразе плотачка ляжыць. Зразумеў, што гэта была тая самая выдра, якую зімой сустракаў. Падняў Мікола плотачку, усміхнуўся і падумаў, што адчуваюць звяры чалавечую дабрату (*Паводле В. Гурскага*). (432 словы)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Акадэмік, якога баяўся цар

І па сённяшні дзень у Вялікай Бераставіцы і вёсцы Рымуцеўцы жывуць сем'і з прозвішчам Кавалеўскі. Не ўсе яны ведаюць, што з'яўляюцца аднафамільцамі, а мо і родзічамі свайго земляка, знакамітага вучонага Восіпа Міхайлавіча Кавалеўскага (1800—1878).

Прагны да ведаў бераставічанін Восіп Кавалеўскі пачаў сваю навуку ў Гродзенскай губернскай гімназіі. Працягваў вучобу ў Віленскім універсітэце. Паспяхова скончыў яго, атрымаў ступень кандыдата філасофіі і пачаў працаваць выкладчыкам у мясцовай гімназіі.

Ды раптам царскім законнікам удалося раскрыць тайнае патрыятычнае студэнцкае таварыства, якое існавала ў Віленскім універсітэце. Адным з яго стваральнікаў быў Адам Міцкевіч, а актыўным удзельнікам — Восіп Кавалеўскі.

Чаго хацелі так званыя філаматы, аматары ведаў?

Жадалі, каб моладзь рыхтавала сябе на карысць Айчыны, мела глыбокія і разнастайныя веды, развівала сваю творчасць, каб у яе абуджалася нацыянальная свядомасць. «Саюз сяброў» патрабаваў ад сваіх членаў глыбокіх гістарычных ведаў, выступаў за адмену прыгонніцтва. Члены таварыства збіралі беларускі фальклор, звычаі і абрады тутэйшых людзей. Такая вольнасць студэнтаў напалохала самога цара. Адны былі арыштаваны, асуджаны да зняволення ў крэпасці. Другіх выслалі ў глыб Расіі.

Так малады беларускі вучоны Восіп Кавалеўскі аказаўся ў Казані. Па волі злоснага лёсу пачаў вывучаць, узбагачаць, удасканальваць не родную мову і гісторыю, а татарскую, персідскую, арабскую. Пабываў у Манголіі, Кітаі і пачаў чытаць лекцыі ў Казанскім універсітэце па гісторыі і мове Манголіі. Стварыў нават кафедру мангольскай мовы, адзіную ў Еўропе.

Бераставічанін Восіп Міхайлавіч Кавалеўскі стаў аўтарам слоўнікаў, граматык, хрэстаматый мангольскай мовы. Яго навуковыя працы адзначаны высокімі прэміямі. А ў 1847 годзе Пецярбургская акадэмія навук выбрала нашага таленавітага земляка ў акадэмікі. Але цар Мікалай І выкрасліў вучонага са спіса акадэмікаў, як «палітычна ненадзейнага». Не мог «бацюшка» дараваць Кавалеўскаму віленскіх вольнасцей.

Спатрэбілася яшчэ восем гадоў напружанай працы вучонага, каб уладар зміласціваўся і даў згоду на прызначэнне Восіпа Міхайлавіча Кавалеўскага рэктарам Казанскага ўніверсітэта. На гэтай высо-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

кай пасадзе ён утрымаўся толькі пяць гадоў. Пачаліся студэнцкія хваляванні, і рэктара Кавалеўскага абвінавацілі ў тым, што ён не здолеў прадбачыць тыя хваляванні.

Апошнія гады жыцця Восіп Міхайлавіч Кавалеўскі правёў у Варшаве. Служыў прафесарам агульнай гісторыі ў Варшаўскім універсітэце. Імя слыннага земляка цяпер носіць раённая бібліятэка ў Вялікай Бераставіцы.

У адным з пісьмаў свайму сябру акадэмік пісаў: «Часта раблю справаздачу перад сваім сумленнем, каб усё падлічыць, што зрабіў на гэтай зямлі. Між іншым, ты б знайшоў мяне такім жа, якім ты мяне ведаў у маладосці».

Гэта прызнанне знакамітага вучонага, які ніколі не здраджваў сваім ідэалам, можа паслужыць урокам для сучаснікаў (*У. Ліпскі*). (390 слоў)

**Лясны аматар мёду**

У казках мядзведзя вельмі часта паказваюць непаваротлівым гультаём, але на самай справе ён зусім не такі. Мядзведзь вельмі добра бегае (да 60 кіламетраў за гадзіну), умее плаваць, лазіць па дрэвах. А ў тым, што ён разумны, лёгка пераканацца, пабываўшы ў цырку. Мядзведжыя нумары, як правіла, адны з самых цікавых і запамінальных. Праўда, на арэну мядзведзь заўсёды выходзіць у намордніку, бо паводзіны яго не можа прадбачыць ніводзін самы вопытны дрэсіроўшчык: толькі што, здавалася, ён мухі не пакрыўдзіць, а то раптам робіцца вельмі агрэсіўным.

Што найбольш здзіўляе ў паводзінах і звычках мядзведзя і выклікае ўсмешку, дык гэта ягоная любоў да мёду. Здавалася б, сам такі сур'ёзны і такі асілак, а жыць без салодкага не можа. Натрапіць на вулей — ні за што не адступіцца, пакуль мёду не паспытае, хоць часам пчолы яго могуць да паўсмерці закусаць. А яшчэ мішка не можа абыякава прайсці міма мурашніка. Не грэбуе ён і мышамі, жабамі, рыбай і многімі насякомымі. Калі мядзведзь вельмі галодны, асабліва пасля зімовай спячкі, то можа падсцерагчы і лася. У мядзведзя вельмі добра развіты нюх: рэзкія пахі ён адчувае за некалькі кіламетраў.

Дарэчы, зімовы сон касалапага самы моцны і вельмі чуйны, калі пачынаецца адліга. Тады мядзведзь можа ўвогуле прачнуцца і блукаць па лесе. У гэты час з ім лепш не сустракацца нікому.

Даўняе суседства чалавека з гэтым лясным драпежнікам парадзіла шмат народных прыкмет, звязаных з паводзінамі і характарам мядзведзя. Кажуць, напрыклад, быццам ён адрознівае муж-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

чын ад жанчын і слабая палова чалавецтва ў яго не выклікае агрэсіі. Асабліва калі не спрабаваць яго спалохаць альбо ўцякаць ад яго — тады ён можа пагнацца следам. Ніколі не чапае мядзведзь малых дзяцей, калі натрапіць на іх у лесе, а вось з паляўнічымі ў яго асаблівыя рахункі. Нават смяротна паранены ў сэрца звер кідаецца на свайго забойцу і можа гнацца за ім сотню метраў.

Калі ж мядзведзь адчуе, што яму ніхто і нішто не пагражае, калі ён сыты і нястомлены, то нават у салідным узросце часта паводзіць сябе нібыта дзіця: усё яго цікавіць, усюды ён засуне сваю пысу, усё яму хочацца памацаць. А то падымецца на заднія лапы і замрэ на некалькі імгненняў, быццам пазіруе нябачнаму фатографу (*А. Бадак*). (351 слова)

**Дарога дадому**

Камароўка...

Звычайная палеская вёска, якіх нямала на Беларусі. Ды сёння яна вядома не толькі ў вобласці, але і ў краіне, і за мяжой. І гэтую вядомасць, гэтую шырокую славу прынёс Камароўцы яе колішні басаногі хлапчук Пеця, які нарадзіўся тут 10 ліпеня 1942 года ў сям'і Ільі Фёдаравіча і Марфы Паўлаўны Клімукоў.

Да Пеці ў сям'і Клімукоў былі дзве дзяўчынкі — старэйшая Тоня і малодшая Ніна. Можа, таму бацька Ілья Фёдаравіч быў асабліва рады сыну. Пеставаў яго, з рук не спускаў. А Пеця, як на бяду, рос хваравітым. Асабліва цяжка захварэў, калі споўніўся яму год. Мала надзеі было на тое, што ачуняе. Ішла вайна, ні лекаў ніякіх не дастаць, ні ўрача не знайсці. Але акрыяў Пеця, і к лету 1944 года, калі Чырвоная Армія вызваліла Камароўку ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, хлопчык ужо спрытна бегаў па камароўскай вуліцы.

Ілья Фёдаравіч выйшаў спаткаць чырвоных байцоў-вызваліцеляў з сынам на руках. Пеця, вядома, нічога яшчэ не разумеў, усяго два гадкі мінула яму, але бацька гаварыў з ім, як з дарослым.

— Глядзі, сынок, глядзі, — казаў Ілья Фёдаравіч, — гэта ідуць не проста чырвонаармейцы — гэта наша шчасце ідзе. Хораша мы цяпер зажывём з табою, Пеця! Калгас створым, межы зруйнуем, электрыку ў хаты правядзём... Ты падрасцеш, у школу пойдзеш, трактарыстам будзеш, а можа, і лётчыкам. А што? Захочаш, сынок, дык і лётчыкам станеш, цяпер усе дарогі перад табой адкрыты...

Пеця Клімук вырас і стаў не проста лётчыкам, а лётчыкам-касманаўтам, ды бацьку не суджана было парадавацца сынавай



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

долі. Праз некалькі дзён пасля той сустрэчы з чырвонаармейцамі Ілья Фёдаравіч Клімук апрануў салдацкую гімнасцёрку і пайшоў на Захад — дабіваць фашысцкага звера. Але паваяваць яму давялося нядоўга. Загінуў ён смерцю героя літаральна праз нейкі тыдзень на польскай зямлі. А Пецю выгадаваў айчым, які стаў для яго бацькам.

Сам жа Пётр Ільіч Клімук з 1965 года жыве ў Зорным гарадку. Ёсць такі гарадок пад Масквой, дзе жывуць, вучацца і працуюць касманаўты.

Амаль кожнае лета ён прыязджае з сям'ёй у Камароўку. Калі цягніком, калі да Брэста ляціць самалётам, а найбольш любіць выправіцца ў дарогу на аўтамашыне.

Вядзе машыну Пётр Ільіч няспешна, быццам кіруючыся даўнейшай прымаўкай: цішэй едзеш — далей будзеш. Але прымаўка тут ні пры чым. Проста цікавей ехаць няспешна, узіраючыся ў краявіды, што адкрываюцца перад вачамі, любуючыся малюнкамі роднай зямлі.

Калі застаецца ззаду Брэст, сэрца ў Пятра Ільіча пачынае біцца часцей ад прадчування блізкай сустрэчы з дзяцінствам, з маці, з роднымі мясцінамі.

За дарогу пра ўсё перадумае: і пра тое, што нядаўна было, чым жыў учора, тыдзень, месяц назад, але найперш пра тое, што з Камароўкай звязана, што ў дзяцінстве ці юнацтве было. Пэўна, таму што дарога вядзе туды — у дзяцінства і юнацтва, у Камароўку, да якой усё бліжэй і бліжэй.

Там, у роднай Камароўцы, вытокі яго жыцця і вытокі яго памяці... (*Паводле М. Гіля*). (447 слоў)

## Зямля круглая

Над Байканурам свяціла зыркае марознае сонца. Серабрыстая ракета з караблём наверсе зіхацела ў сонечных промнях і, здавалася, сама рвалася ў бязмежны блакіт неба.

Яны выйшлі з аўтобуса, Пётр Клімук аддаў рапарт аб гатоўнасці да палёту. Потым яны падняліся па металічных прыступках да ліфта, у апошні раз памахалі рукамі тым, хто рыхтаваў і праводзіў іх у дарогу. Неўзабаве ліфт падняў іх наверх, да люка карабля, і яны звыкла нырнулі ў той люк і гэтак жа звыкла ўлегліся ў стартавыя крэслы.

Хваляваўся ён ці не хваляваўся? Бадай што, не. Ён верыў у свае сілы, верыў, што справіцца з цяжкасцямі і выканае палётнае заданне. Верыў ён і ў тое, што не падвядзе яго карабель, бо і карабель, як і ён сам, старанна рыхтаваўся да палёту і прайшоў самы строгі экзамен.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

І ён досыць спакойна ўспрыняў апошнія перадстартавыя каманды і спакойна, амаль па-гагарынску, сказаў сам сабе: «Паехалі!..», калі ракета, здрыгануўшыся, адарвалася ад Зямлі...

Яны ляцелі «лавіць» зоркі. Іхні «Саюз-13» быў абсталяваны сістэмай тэлескопаў, пры дапамозе якіх яны адшуквалі і фатаграфавалі зоркі. Вывучаць зоркі з Зямлі перашкаджае атмасфера. Здаецца, і празрыстая яна, а вельмі перашкаджае астраномам. Вось і вырашылі падняць тэлескопы высока над Зямлёй, туды, дзе ўжо атмасферы практычна няма.

Восем дзён яны «лавілі» ў свае тэлескопы зоркі, восем дзён фатаграфавалі іх у спецыяльных спектрах. Гэтым здымкам былі вельмі рады вучоныя, бо яны ўпершыню атрымалі магчымасць «зірнуць» на зоркі з вышыні трохсотпяцідзесяці кіламетраў.

Зоркі зрабілі на Пятра Ільіча вялікае ўражанне. У космасе яны не такія, якімі бачацца нам з Зямлі, праз тоўшчу атмасферы. Зоркі нам здаюцца жоўтымі, аранжавымі, блакітнымі, яны няспынна мільгацяць, быццам падміргваюць нам. А ў космасе зоркі на дзіва спакойныя, і колер іхні аднолькавы — белавата-жоўты. А галоўнае, там уражанне такое, быццам яны вісяць нізка, над самай галавой — іх так і хочацца пакратаць рукой.

Але больш за ўсё ўразіла Зямля. Яшчэ калі карабель толькі выходзіў на арбіту, Пётр Ільіч паспеў зірнуць у ілюмінатар і ўбачыць Зямлю. Убачыў і не мог стрымаць воклічу захаплення. Зямля, што плыла ўнізе, была надзвычай прыгожая. Уражвалі яе фарбы — ніводная геаграфічная карта не размалявана такімі шчодрымі, яркімі колерамі.

Мы ведаем усе, што Зямля круглая, мае форму шара. Аднак жа пабачыць гэта нам, людзям, амаль немагчыма. А вось з касмічнага карабля адразу можна ўбачыць палову Еўропы. У адзін ілюмінатар можна ўбачыць Атлантычнае ўзбярэжжа Амерыкі, а ў другі — Ціхаакіянскае ўзбярэжжа.

Адтуль, з арбіты, відаць не толькі гэта. Адтуль добра відаць і скрыўленасць лініі гарызонту — гэта значыць, адтуль можна на свае вочы пераканацца, што Зямля круглая.

Пётр Ільіч, убачыўшы гэта ўпершыню, радасна, крыху па-дзіцячы закрычаў:

— Бачу Зямлю! Яна, і праўда, круглая!

Ну як, скажыце, не пазайздросціць! Усё-такі гэта здорава: пабываць там, адкуль проста так, няўзброеным вокам можна пабачыць, што Зямля наша круглая! (*Паводле М. Гіля*). (442 словы)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

### «Замак на плячах гары»

Кладу руку на цёмна-чырвоную цагліну. Холадам абдало ўсё маё цела. Як бы пад маёй рукой застылая кроў, заледзянелае сэрца далёкага продка. Ён некалі здабываў тую цагліну і ўкладваў яе ў гэты замак — крэпасць на Наваградскай гары. Чаго мой продак хацеў?

Здаецца, чую яго голас: «Я, славянін, сын неба і сваёй зямлі, хацеў міру і спакою. Жадаў, каб дзеці не ведалі войнаў...» У маёй душы адгукаецца тое прызнанне. Мы ж, беларусы, ніколі-ніколі не былі заваёўнікамі. Мы не хадзілі ваеннымі паходамі ў чужыя землі. А сваю ўмелі абараняць.

Ад мужнага Наваградскага замка да нашых дзён дажылі пакалечаныя рэшткі дзвюх вежаў, кавалак абарончай сцяны, утравелая гара, глыбокі роў і высокі вал вакол яе. З трывогай, асцярожна ступаю па гэтым гістарычным лапіку зямлі. Нашы ўмельцы пачалі забудоўваць яго яшчэ тысячу гадоў назад. Спачатку тут былі драўляныя сцены, пасля — з камянёў, цэглы, вапны. Шырыня тых сцен дасягала амаль трох метраў. Змайстраваны былі ажно сем вежаў. Нядрэмнымі вачыма яны пазіралі на ўсё наваколле, сачылі, каб вораг-захопнік не падступіўся да замка.

А калі здаралася бяда, на адной з вежаў білі трывогу набатныя званы. Людзі маліліся ў Замкавай царкве. Асвяжалі сябе крынічнай вадой. І ўсе разам, каменячосы і аратыя, лесарубы і цеслі, станавіліся воінамі. У ход ішлі стрэлы, ядры ды звычайныя палявыя камяні. З вежавых байніц дзень і ноч адбівалі атакі.

Наваградскі замак зведаў нашэсце галіцка-валынскіх войскаў. На яго нападалі зграі татар. Нямецкія рыцары, якія называлі сябе крыжакамі, асаджвалі і палілі замак тры разы. Рускія войскі двойчы бралі Наваградак. А ў 1706 годзе шведы падчас Паўночнай вайны канчаткова ўзарвалі наш вольны замак-прыгажун. Ён так і не ажыў.

Цэлымі стагоддзямі ўзіраюцца ў неба чырвоныя велічныя абрубкі вежаў. На іх вяршынях выраслі дрэўцы. Зраненыя, акрываўленыя сцены пазіраюць на нас у маўклівай тузе. Яшчэ раз прыкладваю далонь да іх халоднага цела. Адчуваю, яно просіць спагады, моліць аб адным: «Не забывайце, людзі, сваёй гісторыі і тых, хто палёг за вашу волю».

Адна за адной, як чародкі цікаўных птушак, успырхваюць на Замкавую гару дэлегацыі школьнікаў. Амаль усе з мабільнымі тэлефонамі, модна апранутыя, бесклапотныя і жвавыя. Іх прывялі



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

сюды экскурсаводы і настаўнікі. І так хочацца, каб яны адчулі тут подых даўніны, каб на міг убачылі перад сабой воіна, які за гэту крэпасць змагаўся.

Навагрsucceededская цытадэль бачылася Адаму Міцкевічу «Замкам на плячах гары». Веру: калі-небудзь на гэтых плячах адновіцца велічны старажытны замак. Ён стане помнікам нашым продкам, якія паляглі тут за сённяшнюю Беларусь. Ён стане месцам нашага паломніцтва, дзе мы будзем спавядацца перад сваёй гісторыяй, перад сабой. Але хто пярэчыць гэта рабіць ужо сёння? Пакладзіце далонь на чырвоную цэглу мінулых вякоў, зірніце на чароўныя краявіды, якія адкрываюцца з Замкавай гары, і задумайцеся над простымі і вечнымі пытаннямі: хто я, чаго прыйшоў у гэты свет і што раблю для сваёй мілай Айчыны? (*У. Ліпскі*). (450 слоў)

**Жалезны кароль**

Звалі яго Міндоўг. І жыў ён восемсот гадоў назад. Задумайцеся, з якой далёкай гісторыі захавалася памяць пра гэтага чалавека.

Хочацца найперш «расшыфраваць» яго незвычайнае імя. Яно складаецца як бы з двух слоў: міна і доўг. Што такое доўг, мы ведаем. А вось слова «міна» мае некалькі значэнняў. Гэта і зброя, і выраз твару, а даўней мінай называлі манеты. Ды ўсё гэта неяк не стасуецца з чалавечым імем.

А ёсць жа старажытнае імя Міна, Мінай. У грэчаскай мове азначае месяцовы. Яго, відаць, надавалі немаўлятам у гонар маладзіка нябеснага, каб яны заўсёды былі маладымі, яснымі, прывабнымі. Увекавечыў гэта імя святцель Міна, полацкі біскуп, не без удзелу якога ўзрасла Ефрасіння Полацкая. Абое яны, духоўны настаўнік і паслухмянка-вучаніца, — святыя людзі.

Дык вось і атрымліваецца, што Міндоўг — гэта дзіця, народжанае пад высокім нябесным месяцам. І з’явілася на свет у доўг, як бы з умовай, што сваім жыццём яно апраўдае той давер, доўг, які яму выдалі бацькі.

На жаль, пра бацькоў Міндоўга мы нічога не ведаем. Можам толькі здагадвацца, што яны былі з вядомага полацкага радаводу і далі свайму сыну высокую адукацыю, скіравалі на шырокую дарогу жыцця.

Можна паверыць гісторыкам, якія сцвярджаюць, што Міндоўг ужо ў маладыя гады ўдзельнічаў у баявых паходах, валодаў ваенным майстэрствам. Адзін з сучасных аўтараў намаляваў Міндоўга ва ўсім



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

жалезным уборы: шлем, кальчуга, нарукаўнікі, фігурысты пояс, панцыр. Чым не жалезны рыцар?

Але ж Міндоўг быў не проста воінам. Ён князь, палкаводзец, стратэг, палітык. І не толькі вадзіў сваю дружыну на ворагаў, ён абараняў свой горад Наваградак, змагаўся за сваю зямлю, якая тады называлася Літвой Міндоўга. Яна знаходзілася паміж Полацкам, Менскам, Пінскам, Слонімам, Наваградкам. Зірнуўшы на карту, можна ўявіць сабе месцазнаходжанне старажытнай Літвы. Гэта зусім не тыя землі, якія займае цяперашняя краіна Літва.

Колькі паходаў здзейсніў князь Міндоўг, колькі перамог атрымаў, каб слава пра яго засталася жыць праз вякі! Ён увайшоў у гісторыю нашай Беларусі як заснавальнік Вялікага Княства Літоўскага. У 1253 годзе ён быў уганараваны каралеўскай каронай. Яе даслаў нашаму князю Папа Рымскі Інакенцій IV. І гэта велічная падзея адбылася ў Наваградку.

Слава і веліч Міндоўга парадзілі зайздроснікаў, змоўшчыкаў сярод князёў-суседзяў. Яны згуртаваліся супраць Міндоўга і падрадніцку забілі яго разам з сынамі.

Існуе паданне, што Міндоўг быў пахаваны ў Наваградку разам з залатым тронам. На месцы яго магілы навагрудцы насыпалі высокі курган. Цяпер тое месца называецца Гарой Міндоўга. Каля яе падножжа ўстаноўлены памятны знак. Ён нагадвае пра нашага героя, заснавальніка і першага вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага, першага і апошняга караля старажытнай Літвы.

Справу легендарнага Міндоўга працягнуў яго старэйшы сын Войшалк. Ён згуртаваў новыя баявыя дружыны, якія з'ядналі Навагародскую, Літоўскую, Жамойцкую землі ў адзіную дзяржаву — Вялікае Княства Літоўскае. Яно на некалькі стагоддзяў стала агульным домам для нашых продкаў (*У. Ліпскі*). (438 слоў)

### Два вялікія паэты

Купала — гэта нястрымны паток, які шукае сабе рэчышча і знаходзіць яго там, дзе дагэтуль не было ніводнага жыватворнага струменя. Гэта аратай, які нястомна арэ, час ад часу паднімаючы галаву, каб выцерці на твары пот і паглядзець на неба. Гэта чалавек, які толькі што навучыўся спяваць і, уражаны сваёй песняй і ўзрадаваны ёю, выцягвае і выцягвае ўсё новыя рулады. І маладосцю, сілаю, непасрэднасцю вее ад ягонай песні, што хавае ў сабе ўсе адценні пачуцця. Гэта, урэшце, чорнарабочы паэзіі, якому да ўсяго трэба дайсці



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

самому, і калі ў яго не ўсё часам ладзіцца, дык за яго ніхто пакуль гэтага не паправіць — усё трэба рабіць самому. Ён нястомны працаўнік, нават на сузіранне зробленага яму не стае часу. Працаваць, працаваць, працаваць. Можа, іншыя пасля зробяць лепш за яго, але сваё ён павінен зрабіць як найболей і як найлепш.

Купала падняў нацыянальную рэчаіснасць да ўзроўню мастацтва. Тыя, што былі побач з ім ці ішлі за ім, ужо добра, упэўнена адчувалі сябе мастакамі слова. Так адчуваў сябе Колас. Пра яго можна сказаць, што ён ішоў і поплеч з Купалам, і ў той жа час як бы следам за ім. Не трэба думаць, што такое вызначэнне магло насцярожыць каго-небудзь у благім сэнсе. Сказанае трэба разумець так, што Колас, улічваючы зробленае сваім вялікім сабратам па творчасці, стараўся ўжо надаваць жыццёваму матэрыялу большую мастацкую закончанасць і самастойнасць у межах самой літаратуры. У Купалы надзвычайны інстынкт мастака, а Колас не адмаўляецца, каб выверыць гармонію алгебрай. Гэтым, дарэчы, ён нагадвае Багдановіча.

Купала ўвесь у пошуках, у парыванні, у руху, а Колас больш паважны і спакойны, ён упэўнена валодае сваім матэрыялам, паступіўшыся пры гэтым, магчыма, знарок багаццем і разнастайнасцю купалаўскіх тэм. Матывамі ж сваёй творчасці ён гэтак блізкі Купалу, як той яму. Нездарма нават назвы іх першых зборнікаў пераклікаюцца паміж сабой...

Такія гэтыя два вялікія паэты. Не маючы намеру кінуць цень на Коласа, трэба ўсё ж сказаць, што ў лірыцы вялікія мастацкія адкрыцці ён ведае радзей, чым Купала. Колас моцны іншым. «Новая зямля» — вось сапраўднае дзецішча паэта, твор, які нанова як бы стварыў нацыянальную рэчаіснасць і нацыянальную свядомасць. Прычым, калі Купала, як было ўжо сказана, узняў гэтую рэчаіснасць да ўзроўню мастацтва, Колас нанова стварыў яе па законах мастацтва. Два вялікія паэты непарыўна звязаны, такім чынам, паміж сабой адзінствам творчай задачы.

Якія б здабыткі ні займела ў будучым наша літаратура, яна ніколі не абыдзе самай пільнай увагай «Новай зямлі», у якой заўсёды будзе ў самым дэмакратычным сэнсе народны чытач. І не дзіўна гэта: «Новая зямля» даўно ўжо стала настольнай кнігай беларусаў (*Паводле М. Стральцова*). (412 слоў)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

# 11 КЛАС

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

### Падрабязны пераказ

**Гаспадар таёжных маліннікаў**

Я заблудзіўся ў тайзе. Ліпнёвае сонца ледзь прабівае лясны гушчар — змрочна, парна і вусцішна. Сінявата-зялёныя хвашчы з чорнымі падпалінамі на суставах выцягнуліся ў чалавечы рост, шастае і хапае за рукавы трава-разун, на колішніх выгарах разлапушыўся і ківае ружовымі султанамі скрыпень. Мітусіцца, гудзе і дзынкае мноства сытых аваднёў. Нячутна прыліпаюць шэрыя сляпні і тупым болем працінаюць змакрэлыя плечы. Замшэлыя вываратні пазавальвалі ледзь прыкметныя лясныя сцежкі.

У такой гушчэчы апаноўвае страх. Нават самаму разважліваму чалавеку пачынаюць вярзціся[1] лесуны і страшыдлы: разгаты вываратні здаецца ўчэпістым павуком, сухая галіна — яшчарам, струхлелы пень — зеленабародым лесавіком. Тахкае, аж заходзіцца сэрца. Падыдзеш бліжэй, усміхнешся, а на цябе з таёжных завалаў ужо глядзяць новыя пачварныя прывіды.

Зноў лезу ў гушчар: няхай трохі пахвошча вецце ссечаную сляпнямі і аваднямі спіну. Перапаўзаю цераз аслізлыя, замшэлыя вываратні. Ой! Здаецца, наперадзе трошкі пасвятлела. Прадзіраюся праз калючы шыпшыннік, густы падлесак, расхінаю вецце — і спыняюся расчараваны. Над маленькім, зацягнутым слізкім жабурыннем[2] азярцом прабілася сонца, берагі абступіў густы сіняваты чарот, і, як змяіныя галоўкі, пагойдваюцца аксамітна-карычневыя таўкачыкі. У цёмную ваду плюхаюцца і крумкаюць спалоханыя рапухі. За азярцом густа сплёўся маліннік. Буйныя ягады згінаюць вецце і п'яняць салодкім духам. Тут, відаць, ніхто не сарваў ніводнае ягадзіны — пе-

---

[1] Вярзці́ся, 1-я і 2-я ас. не ўжыв., -зе́цца; вёрзся, вярзла́ся, -ло́ся; *незак. Разм.* Бязладна ўзнікаць, здавацца ва ўяўленні, блюзніцца.

[2] Жабуры́нне, -я, *н.*, *зб.* Жабіна ікра.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

распее, асунецца і датлее на вільготнай зямлі. А малін — аж чырвана. Жменямі сасмыкваю халаднаватыя замглёныя чашачкі, каб хоць трохі прагнаць смагу, адысці ад стомы і супакоіцца.

А можа, недзе побач, у гэтым малінніку, шастае іх спрадвечны гаспадар — мядзведзь? Куды тады дзецца, як ратавацца? Успамінаюцца таёжныя выпадкі і здарэнні, але нічым не магу суцешыцца. Прыгадалася, як нядаўна наша селавая бабылка цётка Дуня пайшла ў маліны, убілася ў такі ягаднік — канца-краю не відно. Набрала вядзерца, а маліны, чым далей, тым буйнейшыя і спялейшыя. Прагны чалавек на дармаўшчыну. Ну як тут пакінеш? Браць няма куды, а яна ўсё латошыць ды жменямі ў рот, у рот: дай, думае, хоць наемся ўволю. Аж чуе, нехта шамель-шамель па малінніку. Толькі падумала: «Няўжо і сюды дапялі кардонаўскія ягадніцы?» — проста на яе прэцца нешта вялізнае і калматае. Нагне лапаю куст — сасмоктвае сабе ягады. Падхапіла баба вядзерца ды ходу. Выцерабілася з гушчэчы. Куды кінуцца? Аж тут, як на тое шчасце, стаіць сагнутая бярэзіна. Шкода кідаць вядзерца, а хіба ж з ім уздзярэшся? Паставіла каля камля і спрытна, нібы каланок[1], узлезла на самую сярэдзіну. Адкуль тая і сіла ўзялася? Бярэзінка гойдаецца пад ёю, рукі дрыжаць, ледзь ліпіць цётка Дуня. А ён, крывалапы, валюхаецца з боку на бок і павольна ідзе да яе. Задраў пысу, панюхаў, чмыхнуў, глядзіць, нібы ўхмыляецца, маленькімі вочкамі, пакаціў вядзерца, лёг на траву і трушчыць сабе маліны на поўную зяпу, выграбае лапай і хрумстае. Мядзведзь аблізаўся і, не раўнуючы, як малое дзіця, пакаціў вядро, біў, біў лапаю па баках, пакуль не сплюскаў у аладку. Зірнуў на бабку і давай куляцца цераз галаву. Ляжа на спіну, перабірае лапамі, пераваліцца з боку на бок, стане на заднія лапы і «служыць», як тое шчанё. Малады яшчэ, дурэць, відаць, любіў.

Рукі ў старой дранцвеюць, а сядзіць, трымаецца. Так да змяркання пацяшаў бабку Дуню гаспадар таёжных маліннікаў. Потым устаў, атросся, пазяхнуў і падаўся ў гушчар.

Усё гэта ўспомнілася ў адну хвіліну. І я сабе нагледзеў сагнутую бярэзінку, пастаяў, прыслухаўся. Толькі шамаціць чарот над возерам ды крумкаюць жабы. Зырка смаліць сонца, соладка пахне маліннікам і настоенай на леташнім лісці вадой азярынкі.

---

[1] Калано́к, -нка, *мн.* -нкі, -нкоў, *м.* Драпежны пушны звярок сямейства куніцавых.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Але любавацца дзікай прыгажосцю няма калі: трэба некуды прабівацца, каб хоць завідна выйсці з гэтае гушчэчы (*Паводле С. Грахоўскага*). (546 слоў)

1. Чаму мядзведзь у тэксце названы ***гаспадаром таёжных маліннікаў***? Ці звязана гэта з этымалогіяй назоўніка ***мядзведзь***? Запішыце назоўнікі, якія, на вашу думку, перадаюць характар гэтага героя.

2. Якую ролю выконвае загаловак тэксту: перадае тэму ці асноўную думку? Прапануйце ўласныя варыянты назвы гэтага тэксту.

3. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Складзіце схему будовы тэксту. Суаднясіце яе з наступным планам:
   1) У тайзе змрочна, парна, вусцішна.
   2) Апаноўвае страх.
   3) Пошукі дарогі дадому.
   4) А калі раптам мядзведзь?
   5) Таёжнае здарэнне з цёткай Дуняй.
   6) Трэба прабівацца да святла.

5. Назавіце ключавыя словы ў сэнсавых частках тэксту. Запішыце з імі сказы. Ці супадаюць абзацы і часткі тэксту? Вызначце сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках.

6. Выпішыце з пятай часткі тэксту словазлучэнні з дзеясловамі, якія адлюстроўваюць паводзіны мядзведзя. У якой форме ўжываюцца гэтыя дзеясловы? Абгрунтуйце выбар аўтара.

7. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнні наступных слоў: ***скры́пень***, ***сляпень***, ***бабылка***. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных бяззлучнікавых сказах.

## Алёшка

Над зялёнымі жытнімі каласамі таўкуць мак і звіняць камары — ціненька-ціненька, як вецер увосень за акном у саломіну. Алёшка спыніўся і доўга варажыў, куды падацца: сцежачкай ці дарогай, якую скапалі снарады і здраталі гусеніцамі танкі, калі тут тыдні два назад цэлыя суткі ішоў бой.

Відаць, як заходзіць сонца, як адтуль, дзе яно хаваецца, паўзе лагчынай туман. А можа, гэта паднялі пыл танкі? Чуваць, як яны ракочуць і ляскаюць нечым. Чуваць яшчэ, як стракоча недзе блізка ў васільках ля дарогі конік.

Учора прыйшло ім першае пісьмо ад таты — маленькі трохкутнічак, складзены самалёцікам лісток са сшытка ў касую лінейку,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

які быў у Алёшкі, калі ён пайшоў у першы клас. Пісьмо тату адпісала маці, склала такі ж трохкутнічак, і ён цяпер ляжыць у Алёшкі за пазухай. І не адзін. За пазухай і татаў трохкутнічак. Ён яшчэ ўчора забраў яго з сабой і спаў нават, паклаўшы пад падушку.

Завезці пісьмо ў Крайск, дзе была пошта, не было каму. А тата зусім блізка ад дому, ля Гродна. Маці Алёшку не пусціла ні ўчора, ні сёння, сказала нікуды не хадзіць, не адыходзіцца ад хаты. Калі заўтра ніхто не паедзе ў Крайск, яна сама панясе пісьмо. Алёшка ведае, што яму «ўляціць» за самаўпраўства, але ён усё вытрывае, каб толькі тата хутчэй атрымаў пісьмо.

Алёшка ўжо мінаў лагчыну і зноў хаваўся ў жыце, як пачуў зусім побач голас. Нехта гаварыў у жыце не змаўкаючы.

— Я Зямля! Я Зямля!.. — пачуў ён нешта зусім незнаёмае і ўбачыў ля дарогі салдата, перад якім на камені стаяў у драўлянай зялёнай скрыначцы тэлефонны апарат. Салдат падпёр адной рукой тэлефонную трубку ля вуха, другой торкаў у зямлю белыя металічныя пруткі. Гэта быў і не салдат, а дзяўчына ў ваеннай форме. Алёшка здагадаўся пра гэта тады, калі яна, зняўшы пілотку, паправіла рукой свае доўгія валасы.

Цяпер яму было смялей: на дарозе ваенныя.

Зноў пачалося густое жыта, за ім былі відаць недалёкія хаты. Толькі аднекуль падкралася трывога. Пашырэла раптам дарога. Калі ён убачыў на ёй немцаў, то не спалохаўся. Абедзвюма рукамі хуценька схапіўся за пазуху, дзе былі пісьмы. Ён не помніў: пабег ці, можа, прыкарэў да зямлі, як камар да саломінкі, і не варушыўся. Калі ж ён апамятаўся, заўважыў, што ідзе паціху-паціху, ледзьве ступае.

Немцаў было сем. Усе ў пілотках, з аўтаматамі ў руках. Здалося, ад іх пахне потам і дымам. Яны заўважылі яго і спыніліся, ледзь не збіўшы з ног, але не зачапілі. Нават не гергеталі, перабеглі толькі цераз дарогу і схаваліся ў жыце.

Ён бег дарогай, пакуль не пачаў задыхацца. Пасля спыніўся: там, дзе ён толькі што бачыў немцаў, хлыснуў зусім ціхі і сухі стрэл. Алёшку здалося, што гэта далёка.

Ён бег назад, спатыкаўся і бег. Відаць, мінуў той жоўты камень і тэлефаністку. Стаў, агледзеўся: на тым самым месцы стаяла зялёная скрынка з апаратам, ля яе роўненька ляжала новенькая пілотка, гэтак жа на каленях стаяла дзяўчына ў ваеннай форме. Толькі дзяўчына неяк нізка схілілася над каменем, выпусціўшы з рук трубку. Густыя светлыя валасы ўпалі ёй на лоб і схавалі твар.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

У Алёшкі задрыжалі ногі. Ён падышоў да самага каменя і кашлянуў, спалохаўшыся сам. Ніхто не адгукнуўся. Наўкола было неяк надта ціха. Правады былі перарэзаны ля самага каменя...

Ён пабег, выціраючы кулачкамі з твару халодны пот, і раптам адчуў, як яго моцна тузанула за кашулю на грудзях; пасля здалося, што ён упаў на мяккую капу сена і напароўся на зуб ад вілак. Дзіва: не балела і не хацелася плакаць.

Ён бачыў яшчэ, як у жыце краталіся чорныя цені, пачуў, што выехала з-пад дзяжкі кашулька і выпалі пісьмы. Ён хацеў іх падняць, ён вунь як хацеў іх падняць... Але над галавой зазвінелі камары.

Пасля стала ціха-ціха (*Паводле І. Пташнікава*). (589 слоў)

1. У чым трагізм апісанай у тэксце сітуацыі? Якія пачуцці выклікае фінал тэксту?

2. Назавіце тэму тэксту. Ці сфармулявана яна ў тэксце? Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

3. Вызначце стыль тэксту і тып маўлення ў ім. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Колькі абзацаў у тэксце? Ці супадаюць абзацы і часткі тэксту? Дайце часткам тэксту загалоўкі. Растлумачце выпадкі несупадзення абзацаў і частак тэксту.

5. У сэнсавых частках выдзеліце апорныя словы. Пабудуйце з імі сказы.

6. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***трохкутнічак***, ***«уляціць»***. Растлумачце напісанне наступных слоў: ***цененька-цененька***, ***паціху-паціху***, ***ціха-ціха***. Абгрунтуйце пунктуацыйнае афармленне складаных сказаў з рознымі відамі сувязі.

## Запрашэнне да танцаў

Як бы хацелася, каб некаторых учынкаў, што мы зрабілі ў нашым жыцці, не існавала.

Я працаваў у газеце. Аднаго разу нам пераказалі, што ў тэхнікуме будзе вечар, на які запрашаюць і нас, хлопцаў з рэдакцыі.

Тэхнікум мясціўся далёка за рэчкаю. Трэба было перайсці вузкі, высланы шурпатымі дошкамі мост, высока падняты над вадою, а тады пайсці доўгаю вуліцаю, павярнуць направа на другую такую ж доўгую і вузкую, у канцы якой стаіць старажытная царква. Вечар ляжаў цёплы, мяккі, змрок гусцеў шпарка, старыя купчастыя прысады вуліцу рабілі зусім цёмнаю. Нарэшце налева весела засвяціліся вокны тэхнікума, высветліўшы і нізкі фарбаваны плоцік перад імі, і кусты бэзу, і вышарганыя дошкі тратуараў, і выслізганае круглае ка-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

менне пукатага бруку. І вось дзверы ў залу — з цёмнага надворку на яркае святло, у цяпло чалавечых галасоў, кінутых насустрач позіркаў, усмешак, хваляванняў. На дзяўчатах строі, прычоскі; у кожнай нешта сваё, самае прыгожае, шчырае, і ты ўвесь поўнішся трапяткім і шчаслівым чаканнем...

На сцэне паказвалі драматычныя абразкі, дэкламавалі вершы, ладзілі скокі, спявалі песні — і на адзін голас, і дуэтам. Усяго патроху, цяпер бы гэта назвалі самадзейнасцю. Нарэшце заслона апусцілася, на краёк сцэны ўскочыў светлавалосы хлапчына ў вышыванай кашулі навыпуск, падперазанай поясам з кутасамі, спушчанымі з левага боку, і, выставіўшы перад сабою руку, крыкнуў:

— А цяпер — танцы!

У адно імгненне лаўкі і пазвязваныя між сабою ў пляцёнкі крэслы былі ссунуты да сцен, пасярэдзіне расхінулася шырокая пляцоўка. Нехта пры сцэне паставіў блакітны зэдаль, аднекуль узяўся і сеў на ім гарманіст. Па зале прайшлася першая трывожная хваля вальса; закружыліся пары.

Я таксама нагледзеў дзяўчыну. Пры сцяне, каб не надта замінаць руху, у тых састаўленых радком крэслах, сярод другіх, што чакалі, мабыць, свайго запрашэння, сядзела і тая, што спыніла на сабе маю ўвагу. У цёмна-вішнёвай сукенцы з брыжастым каўнерыкам, з ледзь прыўзнятаю каштанаваю прычоскаю. На твары як бы нейкае здзіўленне ці стрыманая насцярожанасць. Тая прыгажосць, што асабліва падабалася мне. Яна сядзела, узлакаціўшыся на спінку пастаўленага перад сабою крэсла. Я падышоў і пашаноўна, як умеў, схіліў галаву і запрасіў на вальс.

— Я не танцую, — строга і нават, як здалося, гнеўна сказала дзяўчына.

І адмова, і тон, якім яна была зроблена, мяне вельмі пакрыўдзілі. Міжволі я падумаў: калі б падышоў хлопец рослы, ладны, красун сабою, нябось, адразу паднялася б, а мне, вось такому, не надта здатнаму і паказному, калі ласка — асадзі назад. І захацелася гэтакаю крыўдаю і адказаць ёй.

— Ранавата ж вы фанабэрыі нахапаліся, цырымонная паннachка, — сказаў я, знарок уставіўшы і грэблівую «фанабэрыю», і «цырымонную паннaчку», каб яна хоць праз гэта адчула, якое нядобрае і злое яе хараство.

Увесь вечар я стараўся сябе супакоіць, але боль крыўды не патухаў. Час ад часу, кружачыся ў танцы з другімі, цяпер ужо без душы,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

усё роўна як адбываючы павіннасць, пазіраў я на тыя крэслы, дзе сядзела дзяўчына, і помсліва радаваўся, што сядзела яна адна. «Гэтак ёй і трэба, — думаў я. — Няхай цяпер нацешыцца сваім гонарам».

І вось настаў канец вечара. Гарманіст шырока расцягнуў мяхі, зайграўшы марш. Зала заварушылася новым рухам: разагрэтыя, разрумяненыя, шчасліва патомленыя, усе пачалі кіравацца да дзвярэй, сёй-той нават не паспеў яшчэ апусціць злучаных танцамі рук. Але я і цяпер непрыязна зірнуў на дзяўчыну. Яна не спяшалася, чакаючы, пакуль выйдуць другія. І калі ў дзвярах засталося ўжо некалькі чалавек, яна адкінула правую руку за спінкі крэслаў, дастала адтуль дзве мыліцы і, падставіўшы іх чорнымі цыратовымі галоўкамі пад пахі, апошняя пайшла з залы на сваіх нежывых нагах (*Паводле Я. Скрыгана*). (548 слоў)

1. Пра якія ўчынкі, якіх хацеў бы пазбегнуць, гаворыць аўтар тэксту? Дзе і калі адбываюцца асноўныя падзеі апавядання? Чаму, на вашу думку, пачуцці героя так і засталіся па-за тэкстам?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Як бы вы назвалі тэкст?

3. Вызначце стыль тэксту. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Абгрунтуйце сваю думку.

4. Складзіце план тэксту. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце і які сэнс яна мае?

5. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання?

6. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***каструбаваты***, ***скокі***, ***га́ла***, ***брыжасты***, ***фанабэрыя***. Растлумачце напісанне наступных слоў: ***направа***, ***у канцы***, ***налева***, ***нарэшце***, ***пасярэдзіне***. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа.

## Касцы

Мужчыны касілі супольна.

Першы ішоў Павал. Ледзь паспяваючы за ім, задыхана-часта жыхаў круглы, таўставаты Вінцусь. І ўжо неяк асобна, астаўшыся далёка ззаду, няспешна клаў роўны пракос Яська.

З-за маладога алешніку ўставала сонца. Асцярожна, як баючыся парушыць цнатлівае хараство наваколля, апускаў Яська касу. Пакорліва паддаваліся, падалі ружовыя, трапяткія маланкі,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

падатліва-мякка слаўся ў пракос духмяны, у зялёных, што маладыя гуркі, стручках аер, купчаста клалася густая, як сцягнуць касою, балаціна, пахла свежаю рыбаю, рачным глеем, водарасцямі.

Яська зноў нерашуча спыняўся, зноў стаяў нерухома, глядзеў, слухаў. З'явілася ў душы неадольнае жаданне спыніцца, крыкнуць: «Чакайце, хлопцы. Пастойце. Гляньце, хараство якое!»

Было ціха і душна. Зусім побач лопнула, шаматнула крыламі птушка. Яська прыпыніўся. З-за рова пераляцела дзікая качка, апусцілася на пакосе, каля лазовага куста, пасля хуценька прабегла колькі крокаў, схавалася за купінаю. Яська сачыў за ёю краем вока, баючыся павярнуць галаву. Птушка пастаяла там, стаіўшыся, толькі раз-пораз вытыркала галоўку, цікавала за чалавекам.

Пасля, мабыць, упэўненая, што нічога не пагражае, асцярожна падала голас: «Крэ». Крыху счакаўшы, яшчэ і яшчэ. З куста, як пароль, пачулася такое ж ціхае: «Крэ-крэ». Качка яшчэ раз азірнулася і хуценька нырнула ў куст. Адтуль зараз жа данеслася радаснае, нецярпліва-маладое крэканне.

«Вывадак», — па-дзіцячы радасна падумаў Яська. І тут жа, бы тая качка, пудліва павёў галавою, азірнуўся: ці чуў яшчэ хто? Убачыў, як спыніўся, услухоўваючыся, Вінцусь, як перастаў касіць і запытальна глядзеў у бок куста Павал. Трывожнае прадчуванне прайшло па душы. Ён узняў касу, знарок звонка пачаў мянціць яе, а пасля як ні ў чым не бывала сагнуўся над пракосам. Але тут жа здрыгануўся ад гучнага шлэпання. Ззаду, чапляючыся за купіны цяжкімі, літымі гумовікамі, бег Вінцусь.

— Вы што, паглухлі, не чуеце — качкі дзікія ў кусце, — закрычаў здаля, не дабегшы.

«Сам ты дзікі», — роспачна падумаў Яська.

Вінцусь з лёту спыніўся, няўцямна лыпаў круглымі, бліскучымі вочкамі, а пасля грэбліва махнуў рукою, не зважаючы на Яську, зароў да Паўла:

— Паўлюк, сюды давай. Смажаніна будзе.

Ратуючыся ад бяды, старая качка вяла між куп'я качанят да рова. Яны смешна валюхаліся, хуценька беглі за ёю, выцягвалі ўперад доўгія, тонкія шыйкі. Адчуваючы, як цяплее ўнутры, Яська сцішана засмяяўся: «Абхітрыла ты іх, мілая. Давай, давай, хутчэй хавайся».

Вінцусь з Паўлам трыбушылі лазняк. Чуваць было, як трашчала ламачча. Вінцусь урэшце Вываліўся адтуль, скочыў на купіну, бы каршун, абмацваў вачамі куп'ё, шукаў здабычу. Ён тут жа ўбачыў, як



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

узбіраліся качаняты на бераг рова і там, за кустамі, плюхалі ў ваду. Бы сарваўшыся з навязі, Вінцусь рынуўся за імі.

Як толькі цяпер дайшоўшы да памяці, як толькі цяпер уразумеўшы штось для сябе неабходнае, Яська рэзка рвануў з твані касу, завярнуў яе за плечы і рынуўся туды, адкуль даносіўся крык і плёскат. «Я табе зараз дастану. Я цябе зараз накармлю». Лазняк чапляўся за касу, не даваў бегчы. Ён кінуў яе, ухапіў тоўсты альховы сук, пабег далей. Паляўнічыя былі недзе недалёка, ён ясна чуў іх крыкі і шматгалосае качынае крэканне.

Раптам нешта ў тым баку гулка плюхнула, зноў моцна захлюпала ў рове вада, бы варочаўся там хтось вялізны і няўклюдны, затым зрабілася так ціха, што чутно было, як звіняць камары.

За некалькі крокаў ад яго, шырока расставіўшы ногі, недарэчна растапырыўшы рукі, стаяў Вінцусь. З адзення сцякала ў шырокія халявы гумовікаў рыжая балотная вада, твар, густа залеплены ванню, быў чорны. Ён заўважыў Яську, варухнуўся насустрач, падняў такую ж, да локця, чорную руку. За ружовую лапку Вінцусь трымаў мёртвае качанё.

Яська моўчкі адвярнуўся. Праз лазняк, напрасткі пайшоў да пакосу.

Шарэла. Па лузе цёпла курэў туман. Трывожна крэкала на рове, склікала распуджаных дзяцей старая качка. Спакойна, натомлена ляжаў скошаны луг, толькі ў самым куце сіратліва цямнеў пакінуты чуб травы.

Мужчыны вярталіся дамоў кожны па сабе (*Паводле Х. Лялько*). (584 словы)

1. Хто з герояў вам блізкі па адносінах да жыцця і светаадчуванні? Што зрабілі б вы на месцы Яські?

2. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана? Абгрунтуйце сваю думку. Як бы вы назвалі тэкст?

3. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Знайдзіце ў тэксце разважанне. Растлумачце, з якой мэтай аўтар уключае яго ў тэкст.

4. Назавіце ключавыя словы ў сэнсавых частках тэксту. Пабудуйце з імі сказы. Вызначце сродкі сувязі сказаў у частках. Складзіце план тэксту.

5. Якія моўныя сродкі выкарыстоўваюцца ў тэксце для характарыстыкі герояў апавядання? Выпішыце іх для кожнага з касцоў.

6. Растлумачце напісанне наступных слоў: ***нецярпліва-маладое***, ***падатліва-мякка***, ***па-дзіцячы***. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры параўнальных зваротах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Першы след

На сходзе гаварылі аб смеласці, аб мужнасці. А больш за ўсё — аб тых людзях, што першымі паляцяць асвойваць нязведаныя міжпланетныя прасторы.

Доўга яшчэ спрачаліся аднакласнікі, але Саша нікога не слухаў. Ён моўчкі сядзеў і пазіраў у акно, за якім сыпаў і сыпаў снег.

Ажывіўся Саша толькі тады, калі Лёня Ясючэня сказаў:

— Трэба ўсім загартоўваць сілу волі, вытрымку, смеласць. А самы добры спосаб для гэтага — спорт. І таму я прапаную заўтра ж пачаць трэніроўкі на лыжах.

Раніцай Саша ўжо лёгка бег па іскрыстым снезе. Навокал было нязвыкла ціха і пуста. Дарога злівалася з неабсяжным белым полем, і толькі рэдкія жаўтавата-бурыя сцяблінкі палыну абапал паказвалі яе напрамак.

Вось і былы Корбутаў хутар. Тут кожную зіму хлопцы з іх вёскі наладжвалі спаборніцтвы на лыжах. Можна было імчаць па прамой, не адпіхваючыся палкамі, з паўкіламетра, калі не больш, і толькі ў лагчыне крыху звярнуць улева, каб не наляцець на кусты вербалозу, што раслі вакол крыніцы.

Але быў і другі спуск. Там каталіся толькі спрактыкаваныя лыжнікі. Ніхто з іхняга класа ні разу там не з'язджаў.

Яшчэ ўчора, на сходзе, Саша вырашыў даказаць усім, што ён не баязлівец, што ён першы пракладзе лыжню на небяспечным маршруце. Але толькі цяпер хлопец зразумеў, якую цяжкую і небяспечную справу ён задумаў.

Ужо стоячы на самым грэбені, Саша яшчэ раз глянуў уніз, і яму зрабілася не па сабе.

А што, калі вярнуцца? Ніхто ж не бачыў яго тут, і ён нікому не гаварыў, што збіраецца сюды, каб адолець гэтую кручу... Чаго добрага не толькі лыжы паломіш, але і шыю скруціш... І дзеля чаго?..

«Людзей, якія б ніколі і нічога не баяліся, на свеце не бывае, — прыгадаліся словы, прачытаныя нядаўна ў адной кнізе. — Галоўнае — здолець перамагчы ўласны страх і, калі трэба, смела рынуцца насустрач небяспецы...»

Саша набраў поўныя грудзі паветра, напружыў усё цела, прыгнуўся і злёгку адпіхнуўся палкамі...

«Раўнавага! Раўнавага!..» — паспеў падумаць ён і ўзляцеў.

Ногі амаль па калені зарыліся ў снег, але прызямленне прайшло ўдала. Лыжы зноў вырваліся на паверхню. На вачах у Сашы



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

накруціліся слёзы, і ён нічога не бачыў. Толькі вецер свістаў у вушах, балюча seклі ў твар сняжынкі.

Вось і канец спуску. Зараз будзе недзе пад снегам замёрзлы ручаёк. Саша крыху разагнуўся і нават асмялеў настолькі, што паспрабаваў азірнуцца назад. У той жа момант яго кінула ўбок, перад вачыма прамільгнуў край лесу, лыжа, якая раптам апынулася над галавой. Твар апякло калючым снегам...

Саша праляжаў мо з хвіліну не варушачыся. Было нават прыемна ляжаць у пухкай снегавой пасцелі.

«Даказаў! Даказаў!..» — радасна шаптаў сам сабе Саша і камячыў рукамі снег.

— Саша-а!.. Саша-а-а!.. — раптам даляцеў да яго поўны роспачы і адчаю крык.

Саша падхапіўся на ногі. Ад бяроз да яго бегла на лыжах Ліза, аднакласніца. Канцы чырвонага шаліка за яе спіной трапяталі на ветры, нібы крылы дзівоснай птушкі.

— Ты... ты... Жывы?.. Цэлы?.. — гучна, на ўвесь голас крычала яна, хоць паміж імі было ўжо не больш за пяць метраў.

Саша стаяў, праваліўшыся вышэй калена ў снег, і не мог апамятацца ад шчаслівага ўзрушэння, ад радасці толькі што атрыманай перамогі.

— А ты? Адкуль ты ўзялася? — нарэшце прамовіў ён.

Ліза падчапіла палкай яго лыжу і падала яму.

— Я ведала, што ты паедзеш сюды... Які ты смелы! Я ўсё бачыла. Ты так імчаў! Ажно... ажно снег курэў!.. І як ты не пабаяўся?!.

— Я... Я... баяўся... Я здорава баяўся... — шчасліва ўсміхнуўся Саша і глянуў на гару.

Дзве роўныя палоскі-нітачкі, перарваныя на самай сярэдзіне схілу — першы лыжны след у гэтым годзе, — збягалі з Корбутавай гары прама да іх ног. Сляды яго лыж (*Паводле С. Міхальчука*). (565 слоў)

1. Якое значэнне набывае словазлучэнне ***першы след*** у кантэксце апавядання? Як вырашыў даказаць сваю смеласць і мужнасць герой тэксту? Ці можа мужны чалавек прызнацца ў тым, што ён нечага баіцца?

2. Вызначце тэму тэксту. Ці сфармулявана яна ў апавяданні? Дзе? Як бы вы назвалі тэкст?

3. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Колькі частак у тэксце? Як яны суадносяцца з абзацнай арганізацыяй тэксту? Вызначце сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

5. Выпішыце з кожнай часткі тэксту словы, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку. Вызначце іх «марфалагічную дамінанту».

6. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне слова ***курэць***. Растлумачце правапіс вялікай літары ў наступных словазлучэннях: ***Корбутаў хутар***, ***Корбутава гара***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

**Схватка на палянцы**

Белы, з чорнымі плямамі сабака жыў у крайнім ад лесу двары вёскі. Гэта быў паджары дварняк. Усё ў ім выдавала далёкага патомка хартоў ці ганчакоў. Дварняк гатоў быў кінуцца, не раздумваючы, за кожным, хто бяжыць ці скача ў полі яго зроку.

Стары і не раз гнаны звярамі заяц добра ведаў, дзе жыве брахлівы і агрэсіўны звер, і, хаця заўсёды мог уцячы ад яго, імкнуўся без патрэбы не паказвацца яму на вочы.

Заяц начамі гойсаў па палях, а ўдзень, заблытаўшы сляды, клаўся дзе-небудзь каля купіны ў ямцы, а ў бязветранае надвор'е ціснуўся бліжэй да кустоўя і там спаў. Ноччу, як заўсёды, русак адпраўляўся на жыроўку.

Русак не дражніў шалёнага дварняка. І без яго ворагаў у зайца хапала.

Такое жыццё побач з забіякам было небяспечнае. Стары русак ужо думаў змяніць жытло, падацца куды далей ад забіякі, але любоў да родных мясцін трымала яго.

І ўсё ж развязка набліжалася. Надвячоркам заяц узняўся з лежні, пацягнуўся, напружваючы мускулы ног, паўслухоўваўся ў навакольную марозную цішыню: надышоў час здабываць корм. Каб разагнаць у жылах кроў, лёгка, падскокваючы, зрабіў вялікі паўкруг па полі, прыбег на палянку сярод кустоўя, дзе ляжаў удзень, і, чуючы сілу і спрыт у целе, гайсануў міма сядзібы, дзе жыў дварняк, хутка, падскокваючы, шэрым камячком пакаціўся па белым шарпаку[1] да калгаснага саду. Маладая гаркавая кара цяпер, у лютаўскую галадуху, здавалася дужа смачнай.

У гэты ж надвячорак вылез з будкі і дварняк, ababeг сваю тэрыторыю вакол сядзібы, натрапіў на свежы заечы след, ад якога ішоў рэзкі пах. Сабака памкнуўся па следзе, але хутка зразумеў, што зайца яму не дагнаць, вярнуўся назад, угнуўшы пысу, адшукаў дзённую заечую лежню, памітусіўся па палянцы і залёг на следзе.

---

[1] Шарпа́к, -у, *м.* Абледзянелая скарынка на паверхні снегу.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Заяц падкарміўся ў садзе, лёгка спусціўся ў лагчынку і выбіўся на свой ранейшы след. Русак не здагадваўся, што там цікуе яго плямісты дварняк.

Яны сутыкнуліся амаль пыса ў пысу: лёгкі, шэра-рыжаваты заяц і наструнены, сцяты ў камяк, шалёны дварняк. Ён умомант зваліў зайца на шарпак, і страшная выскаленая зяпа павісла над ім. З перапуду заяц ударыў па ёй заднімі лапамі з вострымі кіпцюрамі, і дварняк, не чакаючы адпору, завішчаў ад болю, адскочыў назад. Заяц узвіўся ўверх, перавярнуўся ў паветры і не паспеў стаць на лапы, як сабака зноў кінуўся на яго, вострыя зубы вырвалі касмыль поўсці на спіне. Падаючы, русак паспеў заднімі нагамі паласнуць свайго ворага па шыі, і той не змог нанесці апошні смяртэльны ўдар зубамі, з гырчаннем адскочыў убок, але тут зноў у шалёнай злосці рынуўся на звярка, які цяпер здаваўся яму лёгкай здабычай.

Заяц адчуваў, што гэта апошнія імгненні яго жыцця, яму не вырвацца ад гэтага шалёнага плямістага звера, але не хацеў паміраць і адчайным ударам моцных задніх ног скубянуў у выскаленую пысу і патрапіў якраз па носе. З вішчаннем сабака адскочыў: удар вострых кіпцюроў зайца быў такі балючы, што дварняк на імгненне страціў арыенціроўку, закруціўся на месцы.

Русак выкарыстаў разгубленасць свайго ворага, скочыў убок, у кустоўе, віхурай панёсся прэч. Сабака, ачомаўшыся, з брэхам кінуўся за ім, але дагнаць касога ў гушчары не мог, толькі чуў свежы пах крыві, ад якога яшчэ больш шалеў. Заяц, хоць моцна балела спіна, скакаў далёка наперадзе.

Дварняк, апусціўшы хвост, вярнуўся ў вёску. Заяц, якога ён заўсёды лічыў слабай, палахлівай істотай, лёгкай здабычай, раптам аказаўся моцным і смелым зверам, які можа пастаяць за сябе.

Пасля сутычкі з зайцам дварняк тыдні з два не выходзіў на паляванне: залізваў раны. А потым зноў з упартай жорсткасцю гойсаў па кустоўі, з брэхам ганяўся за ўсімі, хто набліжаўся да яго сядзібы. Але ніколі не гнаўся за невялікім рыжаватым звярком, які зрэдку асцярожна прабягаў па лузе міма сядзібы (*Паводле А. Дзятлава*). (580 слоў)

1. Сфармулюйце тэму тэксту. Прапануйце ўласныя варыянты загалоўка, які адлюстроўвае тэму тэксту, і загалоўка, які перадае яго асноўную думку.

2. Вызначце стыль тэксту і яго адметныя адзнакі на лексічным, марфалагічным і сінтаксічным узроўнях. Які тып маўлення ў тэксце з'яўляецца



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

дамінуючым? Дакажыце гэта, адзначыўшы характар адпаведнага спосабу выкладу інфармацыі.

3. Складзіце план тэксту. Колькі частак у тэксце? Дайце часткам загалоўкі. Як суадносяцца межы частак тэксту і абзацы? Растлумачце характар гэтых суадносін.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання? Якая часціна мовы з'яўляецца дамінуючай і чаму? Выпішыце словы, выразы, якія выкарыстоўвае аўтар для характарыстыкі сваіх герояў, каб пазбегнуць паўтору слоў пры апавяданні.

5. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***хорт***, ***жыроўка***, ***шарпак***, ***касмыль***, ***ачомацца***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

***

Пасля чарады халодных, з дажджамі дзён сонечны ранак радаваў цяплом. Сонца поўніла паветра вясною, жыватворным святлом.

Сяджу на ганку, у засені бэзавых кустоў. Кожная пупышка на іх раскрылася, выкінула вострыя цемнавата-зялёныя лісточкі і парасткі будучых буйных пахучых суквеццяў. Любуюся ранкам, з прыемнасцю, на поўныя грудзі, удыхаю свежае паветра.

На самым версе даху бацькавай хаты (пад шыфернымі лістамі) жывуць шпакі. Цяпер яны будуюць гняздо. Ходзяць па двары, збіраюць смецце, цягаюць яго на дах.

Адзін вырашыў адпачыць. Сеў на грушу і працягла засвістаў.

Гэта не спадабалася суседскаму Шарыку, што ляжаў, высунуўшы нос з будкі, і з цікаўнасцю бліскаў на мяне вачамі. Ён лянiва гаўкнуў.

Шпак здзіўлена пакруціў галавою, памаўчаў і раптам перадражніў: «Каў-каў».

Шарык падхапіў гульню: «Гаў-гаў!»

«Каў-каў!» — зноў адказаў шпак.

Перагукваліся яны так хвілін пяць, аж пакуль з балота на сваё гняздо не прыляцеў бусел. Прывітальны пошчак яго пранёсся па двары, высока ўзляцеў у неба.

Шпак прыслухаўся і адказаў такім жа дробным пошчакам. Цішэйшым, вядома. Дзюбка яго надта ж маленькая, каб выклікаць на размову бусла.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Сярод галінак бэзу круцілася сінічка. Адкуль яна ўзялася? З цяплом гэтыя птушкі адкачоўваюць у лясную глуш. Сінічка таропка абследавала галінкі і ціха папісквала: «Сінь-сінь».

Шпак зацікавіўся, прыслухаўся, разглядаючы птушачку. Калі ж сінічка ўзляцела на верхнюю галінку і радасна аб'явіла: «Сі-сінь, вяс-на!», ён даў згоду: «Так-так-так». І раптам перадражніў: «Сі-сінь, сінь-сінь».

Сінічка пакрыўдзілася і паляцела за хату.

Сарока наведваецца на наш падворак кожны дзень. Нешта вышуквае на сметніку, заглядвае ва ўсе куткі.

Так і сёння. Знайшла пажытак і адразу паведаміла аб гэтым усяму наваколлю: «Скрэ-ке-ке-ке-к!»

Шпак, пэўна, ведаў сароку. Таму смела ўступіў у гамонку. Ды так лоўка. Я адразу і не адрозніў па гуку, дзе крычыць сарока, а дзе — шпак. Толькі прыслухаўшыся, заўважыў, што апошні крыху не даводзіць каленца да канца. «Скрэ-ке-ке, скрэ-ке-ке, скрэ-ке-ке», — паўтарае выраз, які, пэўна, вельмі яму спадабаўся.

«Кар-р-р! — абразліва крыкнула, крутануўшыся над шпаком, шэрая варона. — Кар-р-р!» Маўляў, дарэмна стараешся: «Др-р-р-рэнна!»

Шпак нездаволена пераступіў лапкамі, аж крыламі затрапятаў ад абразы. А затым прыглушана так і няўдала адказвае: «Кр, кр-р!» Толькі праз імгненне як выдасць каленца: «Фіць-фіць, фір-р-р, цёх-цёх-цёх, фіў-фіў-ў...» Бы адхвосціў варону сваім спевам: «Каго вучыць сабралася, старая няўмека!»

Пасля ён пераскочыў на галінку вышэй і, умомант забыўшыся пра спрэчку з варонай, весела заспяваў.

Слухаў я шпака і не разумеў, якую ж і чыю песню ён выводзіць. Тут былі і майстэрскія каленцы салаўя, і вераб'інае чырыканне, і ценьканне сінічкі, і мноства іншых знаёмых і незнаёмых мне куплетаў нашага і, напэўна, заморскага птаства.

І ўсё ж я вырашыў таксама ўступіць у размову са шпаком.

Засвістаў спачатку ціха, затым гучней: «Фіць-фіць-фіў».

Той утаропіўся ў мяне. Відаць, раздумваў, што ж адказаць. Затым ускочыў на вяршалінку самай высокай грушы і гучна, нават злосна, пракрычаў: «Скрэ-ке-ке!»

«Фіў-фіў», — паддражніў я птушку.

«Чы-чы-чы-чы!», — па-вераб'інаму зачырыкала тая.

«Ці-ці-ці-ці», — яшчэ больш паддаю рызыкі шпаку.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Той аж крылцамі трапеча, нездаволена падскоквае.

Тут нашу размову перабіла шпачыха. Відаць, ёй надакучыла самой цягаць смецце для гнязда, слухаючы выбрыкі свайго «мужа». Села на верх даху, паглядзела, што ён перасмешвае чалавека, ды як кінецца ў атаку. Шпак наўцёкі. Туды-сюды па агародзе. Яна (з крыкам) — за ім.

Час ад часу, аж да вечара, спрабаваў я выклікаць таго шпака на «размову». Як толькі сядзе ён на тэлеантэну, я так і падсвістваю, дражню. А той гляне, нездаволена свісне і спяшаецца па сваіх справах або хаваецца на другі бок хаты... (*Паводле В. Жушмы*). (542 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Падбярыце і запішыце загаловак, які будзе адпавядаць тэме тэксту.

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Адзначце характэрныя для іх стылістычныя прыёмы і моўныя сродкі.

3. Складзіце план і схему будовы тэксту. Параўнайце іх. Колькі частак у тэксце? Вызначце сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках.

4. Якія моўныя сродкі, што ўжывае аўтар для дасягнення выразнасці, з'яўляюцца дамінуючымі? Наколькі ўдала яны выкарыстоўваюцца? Абгрунтуйце сваю думку.

5. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***каленца***, ***утаропіўся***, ***выбрыкі***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

## Упарты верабей

Здарылася гэта летась увесну. Маладому вераб'ю, што не меў яшчэ і года, спадабалася начаваць у ластаўчыным гняздзе. Ластаўкі былі ў выраі, і верабей адчуваў сябе поўным гаспадаром. Хутка ён зусім прывык да новага месца і, як толькі прыгрэла веснавое сонейка, вырашыў зрабіць невялічкі рамонт свайго жылля і застацца ў ім на ўсё лета.

Вырашана — зроблена. Верабей ачысціў гняздо ад бруду, смецця, нанасіў свежага пуху, наладзіў пасцель. І так яму спадабалася новая кватэра, што ён даў сабе слова нізавошта не ўступаць яе нікому.

Прайшло некалькі спакойных дзён. І вось аднае раніцы, калі верабей яшчэ спаў, вярнулася з выраю гаспадыня гнязда. Пасля вялікай дарогі ёй хацелася хутчэй зірнуць на свой прытулак і адпачыць у ім. Бо, напэўна, і птушкам, як людзям, няма большай радасці, як апынуцца пасля адлучкі пад родным дахам.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Убачыўшы няпрошанага госця ў сваім доме, ластаўка пакружылася каля гнязда і крыкнула:

— Чыві-чыві-чыві!

На чалавечай мове гэта азначала б:

— Прашу пакінуць маю хату!

Верабей прачнуўся, міргнуў некалькі разоў вачыма, высунуў з гнязда галаву і ўбачыў ластаўку. Стомленая птушка не зводзіла вачэй са свайго гнязда. Верабей зухавата пачысціў лапкай дзюбу, нахохліўся і наважыў маўчаць. Трохі счакаўшы, ластаўка ўзнялася, праляцела каля гнязда і зноў чывікнула вераб'ю, толькі коратка і больш злосна:

— Выбірайся! Чуеш?

— І не думаю, — спакойна ціўкнуў у адказ верабей і яшчэ ямчэй усеўся ў мяккай пасцелі.

Верабей не хацеў уступаць ластаўцы гнязда. Уступіць — азначала б паказаць не толькі сваю слабасць, але і праслыць на ўвесь вераб'іны род баязліўцам. А каму гэта прыемна?

Ластаўка не магла сядзець спакойна. Пераканаўшыся, што верабей па-добраму не ўступіць гнязда, яна паляцела да бліжэйшых суседзяў і расказала ім пра сваю бяду.

Неўзабаве на другой яблыні, недалёка ад вераб'ёў, сядзела ўжо цэлая чарада ластавак. Птушкі вялі сур'ёзную нараду.

Хутка адна з ластавак адлучылася ад сяброўак, абляцела вакол будынка і нечакана вынырнула з-за вугла. Верабей у гэты час сядзеў, высунуўшы галаву з гнязда. І, каб крыху падбадзёрыць сябе, ціхенька чырыкаў аднатонную песеньку. Ластаўка з размаху дзеўбанула вераб'я ў лоб. Той страсянуў галавою і гатоў быў ужо даць здачы, але ластаўку толькі і бачылі.

Ластаўкі трымалі сябе неспакойна. Яны пераляталі з галінкі на галінку, цясней збіваліся ў чараду, шчабяталі адна перад другой. І раптам, абураныя, гнеўныя, узняліся і стрымгалоў рынуліся да гнязда.

Верабей, заўважыўшы напад, падаўся ў глыб гнязда і сеў бокам да дзіркі.

Ластаўкі кружыліся вакол, але ні адна з іх не адважвалася ўсадзіць галаву ў гняздо і пачаць бойку з ворагам. Потым яны ўсе паселі на галінках і сталі пільна сачыць за гняздом. Відаць, спадзяваліся, што верабей не вытрымае і высуне галаву, каб зірнуць,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

што робіцца навокал, а яны раптоўна нападуць і расправяцца з ім, як з захопнікам.

Аднак вераб'я не так лёгка было ашукаць, хоць і быў ён малады. Прытаіўшыся, верабей і не збіраўся цікавіцца тым, што робіцца за гняздом. Хвіліны праз дзве-тры ластаўкі зашчабяталі, замітусіліся і ўсе разам, акрамя адной, шуганулі кудысьці за штыкетнік.

Праз момант яны зноў пачалі адна за другой падлятаць да гнязда і адразу вяртацца назад, за штыкетнік. Толькі цяпер стала заўважнай чорная палоска свежай гразі на леташнім гняздзе. Ластаўкі пачалі замуроўваць вераб'я.

Верабей цвёрда наважыў стаяць да канца. Ён не звяртаў ніякай увагі на старанную працу ластавак, сядзеў ціхенька і на кплівыя запытанні суседзяў-вераб'ёў: «Ты жывы, дружа?» — толькі зрэдку чырыкаў:

— Жыў, жыў.

З кожнай хвілінай адтуліна-ўваход у гняздо рабілася ўсё вузейшай, і нарэшце яе зусім не стала відаць (*Паводле А. Пальчэўскага*). (547 слоў)

1. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана? Ці праводзіцца гэта думка праз увесь тэкст? Дакажыце гэта.

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце і які сэнс яна мае?

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання? Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаюцца пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне.

5. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***вырай***, ***чарада***, ***зухавата***, ***стрымгалоў***. Растлумачце напісанне наступных слоў: ***па-добраму***, ***песеньку***, ***дзве-тры***, ***адтуліна-ўваход***, ***суседзяў-вераб'ёў***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых членах сказа.

## Горкі мёд

За акном смяялася вясна. А Петрык цярпліва перапісваў у сшытак умову задачы. Нядаўна Вольга Якаўлеўна, выстаўляючы па матэматыцы за чвэрць адзнаку, сумна заўважыла: «Петрык, не падцягнешся — можаш яшчэ на год застацца...» Вось Петрык і падцягваецца, ужо другую задачу рашае. І, мусіць, рашыў бы, ды Грыша з Алесем забеглі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

— Ты на вуліцу і носа не паказваеш, — папракнуў Грыша.

— А задачы? — паспрабаваў абараняцца Петрык.

— Ці ж у цябе ўсе дні сарокі падзяўблі? — засмяяўся Грыша. — Мы ў лес сабраліся, хадзем...

Петрык не ўстаяў перад такой спакусай, выбег услед за дружбакамі на вуліцу. А тут гразь — ні праехаць ні прайсці. Па абочынах дарогі і ў канавах растае апошні сняжок. Бурляць, пеняцца раўчукі. Каля іх бавяцца малыя, караблікі з паперы і бяросты пускаюць.

— Гайда да Проні! — гукнуў сябрам Грыша.

А Проня разлілася морам, падступіла да самых прыгуменняў. Па роўнай сцяжынцы хлапчукі збеглі да рэчкі. Каля лазні дзеда Базыля быў прывязаны човен з надтрэснутым носам. Спусціць пасудзіну на ваду — справа некалькіх імгненняў. Грыша з Алесем узяліся за вёслы, Петрык прымасціўся на карме, і човен заслізгаў па люстраной гладзі. Насустрач пасунулася сіняя сцяна лесу.

Вось ужо міма праплываюць каржакаватыя дубы, беластволыя бярозы, шызыя асіны. Над вадой праносяцца чародкі чыркоў. На ўзлеску сварацца паміж сабой мітуслівыя дразды. На стромкіх соснах вядуць перастук пярэстыя дзятлы, даносіцца меладычная песенька берасцянкі.

Дружбакі скіравалі човен у вузкую затоку. Чым глыбей у лес, тым шырэй затока. Неўпрыкметку яна ператварылася ў вялікае блакітнае возера.

— Глядзі, глядзі!.. — Алесь ажно выпусціў вясло. — Вулей!..

На ліпе, што павісла над самай вадой, прымасціўся кругляк-вулей.

— Думаеце, не ведаю, чый гэта вулей? Дзеда Базыля, — здагадаўся Петрык. — Працаваць лянуецца, усё лета ў грыбы ды ў ягады... А цяпер, бач ты, пчол прыдбаў...

— Дык мы яго раскулачым! — усхадзіўся Грыша. — Мёдам пачастуемся, а пчол — на калгасную пасеку.

Хлопцы нядоўга спрачаліся, як зняць вулей.

— Тут і думаць няма чаго. Падгонім човен пад самую ліпу і спусцім у яго калоду, — прапанаваў Грыша.

Алесь палез на дрэва. А Петрык у чоўне застаўся, задраў вяснушкаваты твар і чакае.

Ды раптам на дрэве нешта хруснула, затрашчала, і калода, нібы тая бомба, шасула ў човен. Нос пасудзіны адваліўся, а Пе-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

трык плюхнуўся ў ваду. Вопратка ўраз намокла, ногі непаслухмяна коўзаліся па сцюдзёнай твані-мякаці.

— Эх ты, няўдаліца! — ушчуваў Алесь Грышу. — Човен загубіў і Петрыка ледзь не пакалечыў...

— Ці ж я вінаваты, што сарвалася, — апраўдваўся Грыша. — Як гэта мы запалкі не ўзялі, агонь развялі б...

З вады тырчаў толькі адбіты нос чоўна. Пасудзіна дзеда Базыля патанула.

На ўзлессе выбраліся, калі ўжо змяркалася. Сонца даўно нырнула ў Проню і быццам дагасала ў ёй, кідаючы ружовыя водблескі. Пахла сырасцю і прэлым лісцем. Пакуль па расквашанай дарозе цялёпкаліся да вёскі, наваколле бы каламаззю затапіла, толькі ствалы маладых бярозак гаю свяціліся ў чарнаце.

Можа б, і засталася тая прыгода ў тайне, ды ноччу Петрык закідаўся ў гарачцы. Урач знайшоў у яго запаленне лёгкіх. Прымусіў праглынуць горкія пілюлі.

Дзед Базыль прынёс збанок мёду.

— Свавольнікі, — бубнеў ён пад самым вухам. — Гэта ж вы мой вулейчык у ваду спіхнулі: паставіў, каб калгасны рой не ўпусціць, калі пачнуць летам дзяліцца... Вулейчык быў, вядома, пусты. Але калі б у ім і надарыліся пчолы, дык які мёд у такі час. Ранняй вясной пчолы самі галадаюць, ім патрэбна падкормка. Іншая справа, калі сады ды лугі зацвітуць. Тады і сабе, і чалавеку запас зробяць. Дзеля кроплі мёду пчолка абляціць тысячу кветак, прынясе шмат ношак нектару. І лятае, пакуль крыльцы не зношваюцца...

І ўжо лагодна звяртаецца да Петрыка: «Еш, хлопец, мёд, ён ад усіх хвароб памагае».

Неахвотна аблізвае Петрык лыжку, і мёд чамусьці здаецца яму горкім-горкім, гарчэйшым за пілюлі (*Паводле І. Аношкіна*). (574 словы)

1. Сфармулюйце тэму тэксту. Якую асноўную думку тэксту перадае загаловак у ім? У якім сказе тэксту гэта думка сфармулявана?

2. Які тып маўлення ў тэксце пераважае і чаму? Знайдзіце ў тэксце элементы іншых тыпаў маўлення. Адзначце характэрныя для іх паказчыкі.

3. Назавіце ключавыя словы ў сэнсавых частках тэксту. Запішыце з імі сказы. Складзіце схему будовы тэксту. Ці супадаюць абзацы і часткі тэксту? Вызначце сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках.

4. Назавіце вобразна-выяўленчыя сродкі, пры дапамозе якіх дасягаецца выразнасць апавядання. З кожнай часткі тэксту выпішыце словы,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

словазлучэнні, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку. Якія моўныя сродкі выкарыстоўваюцца аўтарам для сувязі паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках?

5. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***прыгуменне***, ***каржакаваты***, ***чырок***, ***раскулачыць***, ***цялёпкацца***, ***каламазь***. Растлумачце напісанне наступных слоў: ***неўпрыкметку***, ***кругляк-вулей***, ***нядоўга***, ***твань-мякаць***. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

## Дзівак з Ганчарнай вуліцы

У нядзелю раніцай стаяў я на падворку і слухаў, як гудуць каля дзядзькавых вулляў пчолы.

— Дземідзёнак ідзе, — пачуліся раптам галасы.

Я азірнуўся і ўбачыў незнаёмага старога, які шыбаваў з клеткай у руцэ сярэдзінай вуліцы. Ён быў невысокага росту, згорблены, з белай бародкай і такімі ж белымі валасамі, што выбіваліся з-пад саламянага брыля. На незнаёмым была вылінялая сацінавая кашуля з манішкай, падпяразаная поясам з кутасамі, а на рубчыкавых штанах віднелася некалькі невялікіх латак. Стары хуценька перабіраў нагамі, быццам вельмі спяшаўся куды.

— Дземідзёнак!.. Дземідзёнак!.. — зноў пачуўся крык, і на вуліцу пачалі збягацца дзеці.

Але да старога яны не набліжаліся. Трымаліся крыху воддаль або ціснуліся за ім ззаду. А стары ішоў сабе ўздоўж вуліцы і, здавалася, не заўважаў іх.

«Неразумнае дзяцінства», — падумаў я.

А ўвечары, калі маці прыгнала карову з пашы, запытаў:

— Дземідзёнак... Хто гэта?..

— Прыйшоў ён сюды аднойчы вясной. Ці мала людзей пасля вайны па наваколлі без прытулку хадзіла. У кожнага сваё гора. Можа, і яго гняздо параскідала. Ну, і прытупаў чалавек на нашу Ганчарную вуліцу дажываць свой век. Ветлівы, толькі чамусьці неразгаворлівы ён. Панурыцца і маўчыць. Нібы кляймо на ім якое. Але гэта б нішто яшчэ. Ды зачасціў ён на рынак. Убачыць птушку і купляе. А некаторым нібы аднаго гэтага і не хапала. Пачалі лавіць і прадаваць птушак. Сорам аж. Ну, а ён купляе іх і выпускае недзе.

Мяне неяк цалкам захапіў гэты пануры дзівак. Што за чалавек ён?

У паводзінах Дземідзёнка мне хацелася бачыць адно звычайнае, няхай нават дзіцячае, захапленне адзінокага старога. Чамусьці не



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

верылася, што ён вось так узяў ды ўзваліў на сябе клопат, які ў астатніх выклікаў спагадлівую ўсмешку.

Пазней я даведаўся, што да вайны Дземідзёнак служыў леснікам.

Сям'і ў яго не было. Дачка жыла замужам у горадзе, і ў яе гадавалася свая дачка.

Тым часам пачалася вайна. Спачатку нішто не патрывожыла Лясныя Дачы. Але вайна дакацілася і да іх. Праз вёску пацяклі людскія натоўпы.

Сам Дземідзёнак ад рання да вечара прастойваў ля дарогі і ўсё ўглядаўся ў людскія твары, спадзеючыся сустрэць сваіх.

І яму пашанцавала, ён дачакаўся — прыйшла дачка. Яна прывяла з сабой трохгадовую дзяўчынку, якая да гэтага толькі ад маці чула, што ў яе ёсць дзедка і што ён жыве недзе на беразе ляснога возера.

Дачка Дземідзёнка пайшла далей, туды, куды ішлі ўсе, а Аленку пакінула з дзедам. Нарэшце настаў дзень, калі зрабілася ў наваколлі зусім ціха і на ўсе Лясныя Дачы засталіся толькі Дземідзёнак і яго ўнучка.

Блізілася восень. Тады і прыйшлі да яго зноў людзі. То былі партызаны. Спачатку яны жылі ў лесніковай старожцы, але з надыходам зімы, калі выпаў снег, перабраліся за Мёртвае возера.

Зіма тая выдалася лютая, снежная. Мароз лез ва ўсе шчыліны, і ў старожцы даводзілася круглыя суткі паліць у печы. Дзед з унучкай з нецярплівасцю чакалі цёплых дзён.

Але аднойчы ў старожку ўварваліся немцы.

— Партызан?

Дземідзёнак пацiснуў плячамі.

— Дзе хаваюцца партызаны?

— Не ведаю.

— Тады збірайся.

Старога пасадзілі на сані і павезлі, а Аленку замкнулі ў старожцы.

Два тыдні катавалі лесніка. І ўвесь гэты час ён мучыўся ад таго, што пакінуў дзяўчынку адну. Калі ж яго нарэшце выпусцілі на волю, то ён не знайшоў у сваёй халоднай старожцы ўнучкі. На падлозе ляжала адна скалелая сініца... Калі і як яна заляцела сюды, Дземідзёнак не ведаў.

...Дні праз два я паклікаў да сябе хлапчукоў і расказаў ім усё, што ведаў пра Дземідзёнка. Яны разышліся прыціхлыя, з апушчанымі галовамі. Мне здавалася, што гэтым самым я зрабіў нешта добрае,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

нават, калі хочаце, абараніў спакутаванага старога ад людской надакучлівасці.

Дзеці сапраўды больш не даймалі яго. Паступова перавяліся і птушкі на рынку. Неўзабаве іх ужо ніхто не прадаваў у гарадку, хоць Дземідзёнак па-ранейшаму бегаў туды са сваёй клеткай...

З таго дня я Дземідзёнка не бачыў (*Паводле І. Чыгрынава*). (598 слоў)

1. Сфармулюйце тэму тэксту. Вызначце яго асноўную думку. Якую ролю пры гэтым выконвае загаловак тэксту? Якое са значэнняў адлюстроўвае ў загалоўку слова ***дзівак***?

2. Назавіце стыль тэксту і яго характэрныя прыметы. Знайдзіце ў тэксце апісанне. Якое стылістычнае прызначэнне на яго ўскладваецца? Пярэчыць ці не гэты тып маўлення тэме і асноўнай думцы тэксту?

3. Складзіце план тэксту. Назавіце падтэмы, якія выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы і перадачы асноўнай думкі тэксту. Назавіце ключавыя словы ў сэнсавых частках тэксту. Запішыце з імі сказы. Складзіце схему будовы тэксту. Ці супадаюць абзацы і часткі тэксту? Назавіце прычыны іх супадзення ці несупадзення. Вызначце сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках.

4. Назавіце стылістычныя фігуры, з дапамогай якіх дасягаецца выразнасць апавядання. Назавіце дзеясловы, якія выкарыстоўваюцца аўтарам для перадачы пачатку дзеяння, яго развіцця і заканчэння. Выпішыце з кожнай часткі тэксту словы, якія з'яўляюцца ключавымі.

5. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***шыбаваў***, ***манішка***, ***кута́с***, ***кляймо***. Растлумачце напісанне наступных словазлучэнняў: ***Лясныя Дачы***, ***Мёртвае возера***, ***лясное возера***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі сказа.

## Сціслы пераказ

***

Пад абрывам, бліжэй да ракі, высяцца старыя, дзябёлыя алешыны, шырока і нізка аплываюць косамі вербы, страката бялеюць тры смялейшыя бярозы, цямнеецца, паблісkваючы шышкамі, адна яліна. Далей, вышэй ад вады, бяроз больш, пракідваюцца нават сухапутныя красуні-сосны. Пад дрэвамі густа, пякуча тоіцца крапіва, буяе чырванню гронак каліна, стаяць сабе па-малечы пацешныя рабінка з нясмелымі ягадамі і стромкі кусцік ядлоўцу. На самым краі высо-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

кага абрыву соснаў больш. Гаспадаром рассеўся сталы дуб. Зялёным воблакам узвышаюцца пад блакітам ліпы, звесіўшы голле, ужо без цвету, над гладкай сцежкай у траве.

Там, наверсе, — платы, садочкі з вуллямі, светлыя вокны, грады, лагодная прастора яшчэ зусім зялёнага бульбяніку, за якім дарога, у спёку пыльная, а за дарогай — лес.

Стаўшы на сцежцы плячыма да лесу, добра глядзіцца зверху, паміж дрэў, на Нёман, які, хоць недарма завецца быстрым, люструецца вельмі спакойна, нібы зусім не плыве. За ракой — лугі, за якімі, на даляглядзе, пушча. Лугі пакошаны ў пару, месяц таму назад, і ўжо добра падмалёваны атавай, на якой застылі ў спакойным чаканні стагі, што будуць перавезены адтуль на фермы зімой. Сям-там відаць цёмна-зялёныя астраўкі яшчэ няраслага дубняку і дубы-адзінцы. Каля стагоў і дрэў рака, то ў лазняку, то голая, пятляе нібы знарок так гулліва, каб зверху гэта выглядала весела.

Росна і сонечна. Над найкруцейшай, найбольш капрызнай пятлёй ракі ўздымаецца варухлівы туманец — пара не пара, дымок не дымок, — як быццам недзе там ціхенька варыцца ранняе снеданне.

Дрэвы з абрыву і бліжэйшыя дрэвы на лузе заціхлі ў заспакоена ўрачыстым сузіранні, глядзяць адны на адных і маўчаць. Моўчкі стаяць багатыя стагі. А на адным з іх, бліжэй да Нёмана, чорна-чырвона значыцца сціплы бывалец бусел. Яшчэ два стаяць на атавіста светла-зялёнай пакошы, кожны сабе. Проста стаяць ды глядзяць. Той, што на стозе, дык і крылы склаў неяк наперакос, апусціўшы іх, расслабіўшыся ў поўным адпачыне. Пасля ён не вытрымаў такой раскошы моўчкі, задзёр працавітую дзюбу і радасна заклекатаў. І тут жа яму адказалі сябры на траве — бліжэйшы, а за ім і той, што далей.

Ах, колькі радасці!..

Прыгадалася, ярка з'явіліся ў памяці, амаль праз паўвека, тыя дні, калі я толькі-толькі ўваходзіў у юнацтва.

Гэты самы Нёман, але не сонечным жнівеньскім ранкам, а насцярожана і ўрачыста белым, марозным досвіткам. Рака пад лёдам, на лёдзе тоўста снегу, дарога добра ўезджана. Коні дружна бягуць адзін за адным. Я мякка сяджу на мяху з сенам. Белае рэчышча віляе паміж кустамі, не зусім схаванымі пад снегам, дрэвы, што знізу, ад снегу, цёмна лезуць ажно пад неба над табой. Першы знак новага дня — агнявая палоска нясмелай яшчэ зары над далёкім грэбенем лесу. Так і здаецца: вось, вось яно прыйдзе — штосьці даўно чаканае, добрае! Нават і капыты так выстукваюць: вось, вось, вось!..



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Коні спакваля перайшлі на ступу: спачатку першы ці першая (чый там конь ці кабыла чыя?), а потым і ўсе, увесь маўклівы парожні абоз.

І тут за мною, ззаду і збоку, мякка і хутка пачулася рыпенне снегу пад хадакамі. Дзядзька Міхаль, сусед, які ехаў следам, дагнаў мае сані і гупнуў-сеў перада мною ў нагах. Чалавек ён маўклівы, калі не пануры, а тут яму закарцела чагосьці, як блазну да блазна, — прыбег. Пагаварыць пра што пільнае? Не, ён сядзіць і маўчыць.

Маўчаў нядоўга. Але, памаўчаўшы, не гаварыць пачаў, а раптам заспяваў. Глуха, прыцішана, можна сказаць, безгалоса. І не песня была гэта, а толькі ўрывачак яе, адзін узлёт...

Што за дзіва, чаму?

А потым зноў урачыстая цішыня і прастора. І ў вышыню, і навокал... (*Паводле Я. Брыля*). (550 слоў)

1. Запішыце варыянты загалоўкаў да тэксту, якія будуць адпавядаць яго асноўнай думцы. У якім са сказаў яна сфармулявана? Запішыце тэму тэксту.

2. Вызначце стыль тэксту. Ці ёсць у тэксце апавяданне? З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

3. Колькі частак у тэксце? Дайце часткам загалоўкі. Ці супадае колькасць абзацаў і частак у тэксце? Назавіце, пры дапамозе якой сувязі звязаны часткі ў тэксце і сказы ў гэтых частках.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання?

5. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнне наступных слоў: ***люструецца***, ***атавіста***, ***закарцела***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры ўдакладняльных членах сказа.

6. Сцісла перакажыце тэкст, максімальна захаваўшы стыль тэксту-арыгінала.

### Касмічны сын Беларусі

Пётр Ільіч Клімук разумеў, што на гэты раз едзе на радзіму не так, як раней.

Раней ён ехаў у Камароўку. Ехаў спачатку курсантам, пасля — лейтэнантам, яшчэ пасля — капітанам. Ехаў у адпачынак. Ехаў да маці, у бацькаву хату. Ехаў, каб пабачыцца з сёстрамі і братамі, са школьнымі сябрамі-таварышамі і суседзямі. Ехаў проста Пятром Клімуком, камароўцам, сынам Марфы Паўлаўны.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Цяпер жа ён ехаў Героем Савецкага Саюза, касманаўтам. Ехаў не ў адпачынак, не ў адведкі да маці. Ён, вядома, пастараецца пабыць і ў Камароўцы, пагасцяваць дзень-другі ў роднай хаце, аднак жа на гэты раз не гэта было галоўным сярод таго, што паклікала яго ў дарогу. Паклікала яго нешта куды больш важнае і вялікае.

Нечакана для сябе заўважыў, што хвалюецца. Моўчкі паўшчуваў сябе, пасміхнуўся: чаго? Не хваляваўся на трэніроўках, моцна спаў у апошнюю ноч у Байкануры, спакойны быў у час старту, а вось цяпер чагосьці расхваляваўся. І чым бліжэй падыходзіў цягнік да Мінска, тым больш неспакойна рабілася ў яго на душы.

Цягнік прыбыў у Мінск. За акном, на пероне, віравала людское мора. Паўсюль былі сцягі, кветкі, усмешкі. Ён, убачыўшы ўсё гэта праз акно, не адразу здагадаўся, што сустракаюць яго.

Потым дарога павяла яго ў Брэст. На кожным скрыжаванні, у кожнай вёсцы і гарадку яго віталі сотні і тысячы людзей.

На мяжы Брэсцкай вобласці людзей было столькі, што яму давялося выйсці з машыны. Землякі паднеслі яму хлеб-соль. І ён, ужо трохі стомлены, здарожаны, зноў да слёз расчуліўся ад тысяч радасных усмешак, ад цяпла чалавечай любові, што свяцілася ў людскіх вачах.

Але яшчэ больш расчуліўся ён у Брэсце. Тут яго сустракалі, напэўна, усе жыхары — ад старога да малога. Такога людскога мора ён яшчэ не бачыў.

Толькі на трэці дзень трапіў ён у Камароўку.

Яму было хораша, спакойна тут, у гэтай хаце, куды ён заўсёды прыязджае з ахвотаю і радасцю, сярод родных, дарагіх людзей. А ён, сорамна прызнавацца, не так і часта прыязджае да маці. Не па сваёй віне, але ўсё ж не так часта, як трэба было б. Вось нават і цяпер. Прыехаў у Брэст, а трапіць у родную Камароўку змог не адразу, як ні рваўся сюды.

Маці няйначай угадала гэтыя ягоныя думкі. Яна зірнула на Пятра і нечакана сказала:

— Ты, сынок, не думай, не крыўдую я. Ты, Пеця, цяпер не толькі мой сын... Бачыла я, як цябе сустракалі. І ў Брэсце, і тут, у Камароўцы... Усе людзі цябе сустракалі, увесь народ... Вось і выходзіць, што ты, Пеця, цяпер усёй Беларусі сын... Усёй Беларусі нашай касмічны сын...



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Касмічны сын Беларусі... За апошнія дні ён ужо не раз чуў гэтыя словы. І кожны раз, чуючы, бянтэжыўся: ці варты ён таго, каб насіць гэтае высокае званне?

А цяпер вось пачуў гэтыя ж словы тут, у роднай хаце, з вуснаў маці. Пачуў і не збянтэжыўся, здаецца. Чаго ж саромецца, чаго ж бянтэжыцца? Гэта ж гаворыць яго добрая, яго любая матуля (*Паводле М. Гіля*). (464 словы)

1. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана? Ці праводзіцца гэта думка праз увесь тэкст? Дакажыце гэта.

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Назавіце падтэмы, выкарыстаныя аўтарам для раскрыцця тэмы. Дайце ім назвы. Вызначце галоўнае і другараднае ў кожнай частцы (падтэме) тэксту. Выявіце, якую інфармацыю ў кожнай частцы можна перадаць абагульнена, а якую можна апусціць.

4. Назавіце моўныя сродкі выразнасці, характэрныя для мастацкага тэксту.

5. Растлумачце правапіс вялікай літары, пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з прыдаткамі, складаных сказах, сказах з простай мовай.

6. Сцісла перадайце змест тэксту, захаваўшы істотныя моўныя сродкі.

## Выбарачны пераказ

### Пацеркі для Веры

У свае пятнаццаць гадоў Вера была вялікая і дужая, але здавалася равесніцам нязграбна худой, чужой і адзінокай, бы тая калючая, недагледжаная дзічка за вёскай.

За нязвыклым адчуваннем дарослацці Вера часам бачыла сябе ранейшую, адчайна бесклапотную, даўганогую, з растапыранымі хвосцікамі заплеценых косак. З гэтай мамчынай дачушкай не хацелася развітвацца, хоць яна ўжо жыла ў абалонцы амаль дарослай дзяўчыны.

Было гарачае лета. Мяняліся дні, мільгалі перад вачамі ўзмахамі крылаў азёрнай чайкі, праляталі пад гарачымі стрэхамі ліпеня.

Было столькі работы, што хоць ты спаць не кладзіся. Вера цэлымі днямі цягала з балота важкія ношкі балотнай травы, палола бульбу, даіла карову. Рукі рабіліся шурпатымі і чырвонымі. Нанач мазала іх алеем, але раніцай пачыналася бясконцая ўтомная работа, і рукі зноў грубелі і чырванелі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Аднаго разу ў нядзелю вечарам Любка, Верына сяброўка, сказала ў дзявочым гурце, што ў краму прывезлі прыгожыя пацеркі. Раніцай Вера ўвайшла ў краму і, не адрываючыся, глядзела на тыя недасягальныя пацеркі. Гэта былі ярка-чырвоныя шкляныя крывінкі, што, здавалася, маглі б рассыпацца ад дотыку яе пальцаў залатым гарачым пяском. І пацеркі адразу сталі марай. Спачатку Вера забягала ў краму кожны дзень, сумна пазірала на гэты шкляны цуд, потым супакоілася. Але ж ненадоўга.

Усё вярнулася, як толькі ў вёску пачаў прыязджаць рамізнік[1] Галаваты і стаў купляць усюды сушаны аер. А гэта былі хоць малыя, але грошы. І Вера як ашалела ад жадання купіць тыя сонечныя слёзкі-пацеркі.

Вера знайшла гэтую аерную лапіну яшчэ раніцай. Знізу карані былі салатавыя ці белыя, ад зямлі адрываліся вельмі лёгка. Цвёрдая скура кораня блішчала, казытала пальцы гладкай паверхняй, але адчувалася, што ўсё як набітае старой вільготнай ватай.

«Э, не, — падумала сама сабе Вера. — Такія многа не заважаць. Колькі хочаш насушы, а грошай на пацеркі не хопіць».

Сымон Галаваты прыехаў у нядзелю. Ён ужо скрыпеў пад вокнамі старымі коламі. Вера пабегла ў сенцы, сцягнула з гарышча мех з аерам і паважыла яго ў руках. Мех быў на дзіва лёгкі.

Яна то апускала, то зноў падымала гэты нікчэмны мех, але ён зусім не цяжэў, наадварот, рабіўся ўсё лягчэйшы, быццам пры кожным дакрананні да зямлі паступова аддаваў ёй сваю вагу.

Вера ледзь не заплакала. Думалася толькі пра недасягальныя, бы нябесныя зоркі, пацеркі. Нібыта ў тым прымроеным шкляным харастве змясцілася ўсё багацце свету, уся яе дзявочая душа.

У нейкім утрапёным забыцці Верыны рукі раптам перасталі слухацца ўнутраных пратэстаў, рабілі нешта сваё, незразумелае, паганае.

«А чаго там баяцца?! А што, так усе робяць!.. А я — ніколі яшчэ...» Яна схапіла раптам вялізную цагліну, пачала, дрыжучы ад хвалявання, разварочваць жоўтыя і цвёрдыя, бы высахлыя яшчаркі, карані, глыбока засунула ў іх цагліну, зверху звязала мех вяроўчынай і павалакла яго на вуліцу.

Сымон Галаваты чапляў мех на кручок бязмена[2], доўга важыў яго. А Вера стаяла наструненая, бы нацягнутая рыбінай леска, нічога

[1] Рамі́знік, -а, *м.* Фурман наёмнага экіпажа.

[2] Бязме́н, -а, *м.* Ручная рычажная або спружынная вага.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

вакол сябе не бачыла. Чула толькі адзінае, заціснутае ў памяці: «Цагліна!»

Халадзеючы нутром, Вера чакала, што зараз Галаваты засуне руку ў мех, намацае ў аеры цагліну, і тады сорам панясе яе праз усю вёску. Праклінала сябе, не магла паварушыцца, быццам усярэдзіну насыпалі жару.

Але рамізнік спакойна кінуў мех на фурманку і разлічыўся. Сціснуўшы ў кулаку гарачыя і, здавалася, жывыя, як растрывожаныя пчолы, грошы, Вера павольна ішла дахаты. Шчыльна зачыніла за сабою дзверы, асцярожна высыпала мокрыя, ліпкія грошы на стол. Было роўна на пацеркі.

Яна ўпала на ложак, халодзячы твар падушкаю, вырываючы з сэрца сорам, але ўсё цела балела, не магло расслабіцца, як прыбітае той вялікай бруднай цаглінай. Ведала, што такое з ёю больш ніколі не паўторыцца. Ніколі ў жыцці. І адразу адчула, што купляць пацеркі яна ўжо не пойдзе (*Паводле В Коўтун*). (570 слоў)

1. Сфармулюйце тэму тэксту. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана? Вызначце, загаловак падабраны ў адпаведнасці з тэмай ці асноўнай думкай тэксту.

2. Назавіце стыль тэксту і яго адметныя адзнакі на ўсіх моўных узроўнях. Ці адпавядае тып маўлення ў тэксце характару паведамлення? Абгрунтуйце сваю думку.

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца заключнай? Які сэнс яна мае? Назавіце колькасць абзацаў у тэксце. Ці супадаюць іх межы з межамі сэнсавых частак тэксту? Дайце часткам загалоўкі. Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання? Якія сінтаксічныя канструкцыі ў тэксце з'яўляюцца дамінуючымі і чаму? З кожнай часткі тэксту выпішыце словы, словазлучэнні, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку. Вызначце іх марфалагічную прыналежнасць і сувязь з тэмай і асноўнай думкай тэксту. Назавіце вобразна-выяўленчыя сродкі, выкарыстаныя аўтарам у тэксце.

5. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых членах сказа.

6. Перакажыце тэкст, засяродзіўшы ўвагу на ўнутраным свеце гераіні, яе перажываннях і думках.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Каго выбірае космас

Пісьмо было як пісьмо, як многія з тых, што прыходзяць у Зорны гарадок на адрас таго ці іншага касманаўта. Пішуць іх звычайна хлопчыкі, вучні чацвёртых, пятых, шостых класаў. Пішуць найчасцей так: я хачу быць касманаўтам, таму падкажыце, калі ласка, што трэба рабіць, каб, як падрасту, мяне залічылі ці прынялі ў атрад касманаўтаў.

Такіх пісьмаў касманаўтам прыходзіць вельмі шмат, адказаць на кожнае проста не выпадае. Ды, па праўдзе кажучы, часам і жадання няма адказваць, бо відаць, што адрасат — чалавек несур'ёзны, напісаў ліст, а сам яшчэ не ведае, хочацца яму касманаўтам быць ці кім-небудзь іншым.

Аўтар гэтага пісьма, пяцікласнік Дзяніс, таксама пытаўся пра тое ж самае: як стаць касманаўтам? Пётр Ільіч вырашыў адказаць яму. Адчувалася, што хлопчык не так сабе напісаў ліст, што жаданне стаць даследчыкам космасу ў яго досыць сур'ёзнае: ліст быў вельмі шчыры, па-хлапечы наіўны і сарамлівы.

«Дарагі Дзяніс, — пісаў Пётр Ільіч хлопчыку, — ты просіш падказаць табе, што трэба рабіць, каб стаць касманаўтам. Наўрад ці змагу я адказаць на гэтае пытанне. Лепш напішу табе пра тое, каго выбірае космас, каго дапускае ён разгадваць свае тайны. Напішу пра тыя якасці, якімі павінен валодаць чалавек, што марыць стаць касманаўтам.

Па-першае, чалавек гэты павінен быць здаровы. І не проста здаровы, а ўсебакова фізічна развіты, трэніраваны, спецыяльна падрыхтаваны. Проста здаровы чалавек можа, бадай, злятаць у космас. А вось каб доўга жыць там і працаваць, простага здароўя мала. Для гэтага чалавек павінен рыхтаваць сябе спецыяльна. Толькі тады ён паспяхова зможа вытрымаць перагрузкі старту і спуску, выпрабаванне бязважкасцю і іншымі касмічнымі цяжкасцямі. Значыць, той, хто марыць у будучым стаць касманаўтам, павінен сябраваць з фізічнай культурай і спортам: хадзіць на лыжах і ездзіць на веласіпедзе, бегаць і плаваць, гуляць у валейбол і футбол, скакаць у даўжыню і вышыню, займацца гімнастыкай і г. д.

Другое — веды. А мо гэта нават і першае, бо ведаць касманаўт павінен надзвычай шмат. Касмічны карабель — машына вельмі складаная. Каб авалодаць ёю, трэба грунтоўна разбірацца ў фізіцы і матэматыцы, механіцы і электроніцы, а ў дадатак трэба мець сур'ёзныя веды па астраноміі, геафізіцы, касмічнай медыцыне і г. д. Для кож-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

нага касмічнага палёту распрацоўваецца спецыяльная праграма навуковых і народнагаспадарчых эксперыментаў. Выконвае гэтую праграму касманаўт. А каб яе выканаць, трэба таксама грунтоўна пазнаёміцца і вывучыць шматлікія навуковыя пытанні і тыя задачы, якія ён будзе выконваць на карысць народнай гаспадаркі.

Далей — працавітасць. Той, хто не любіць, а значыць, і не ўмее працаваць, ніколі не зможа стаць касманаўтам. Бо ўжо сама падрыхтоўка да палёту — гэта вялікая, штодзённая, старанная, да поту праца. І на борце арбітальнага карабля ці станцыі касманаўт таксама штодня працуе. Праграма палёту распісана літаральна па мінутах. Ды лайдак і не падрыхтуецца як след да палёту, і не здасць экзаменаў, якія ў касманаўтаў вельмі строгія.

Пра што яшчэ абавязкова хочацца табе сказаць, дык гэта пра такія якасці, як таварыскасць і сяброўства. Выпраўляцца ў касмічны палёт, дзе могуць быць самыя розныя нечаканасці, цяжкасці і выпрабаванні, могуць толькі сапраўдныя сябры. На караблі, на борце арбітальнай станцыі могуць працаваць толькі такія людзі, якія разумеюць адзін аднаго з паўслова, якія ніколі не падвядуць таварыша, не спіхнуць на яго нелюбімую работу, не ўколюць насмешкай, якія паспачуваюць, калі таварыш стаміўся, і падменяць яго. Адсюль і парада мая табе: вучыся сябраваць, шануй сяброў, даражы імі, не давай у крыўду.

Скажу яшчэ пра такія чалавечыя якасці, як смеласць і мужнасць, сумленнасць і прынцыповасць. На дрэва ўзлезці ці на дах дома — і то смеласць патрэбна, а паляцець у космас — тым больш. Ну, а сумленнасць і прынцыповасць павінны быць у кожным чалавеку. Каму патрэбны несумленны сябар? А што добрае можа зрабіць чалавек, калі ён беспрынцыпны, штораз мяняе сваю думку?

І вось што яшчэ. Кажу табе пра гэта напаследак, ды гэта, можа, самае важнае. Работа ў касманаўтаў хоць і рамантычная, але вельмі і вельмі нялёгкая. Паспяхова рабіць гэтую работу можна толькі тады, калі разумееш, што робіш яе ў імя высокіх ідэалаў. Чалавек тады здольны на подзвіг, калі ставіць перад сабой высокія і вялікія мэты. Ніколі не здзейсніць подзвігу чалавек, які думае пра сябе, пра свае ўласныя інтарэсы.

Усяго табе добрага, мой хлопчык».

Пётр Ільіч склаў лісток у чатыры столкі, паклаў яго ў канверт. Заўтра ён укіне канверт у паштовую скрынку. Пойдзе ліст з Зорнага гарадка, што пад Масквой, будзе ехаць у вагоне цягніка, пасля ў ку-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

заве грузавіка, потым на калёсах ці на веласіпедзе і прыйдзе ў далёкую вёску, і патрапіць у рукі да пяцікласніка Дзяніса, і будзе чытаць яго хлопчык, і ганарыцца, і паказваць ліст славутага касманаўта сябрукам...

І хто ведае, можа, ліст Пятра Ільіча Клімука дапаможа малому Дзянісу знайсці сваю сцяжыну ў жыцці, якая выведзе яго далёка і высока — ажно на касмічную арбіту; гэтак жа, як вывела яна калісьці такога ж вясковага хлапчука Пецю Клімука з вёскі Камароўка пад Брэстам (*Паводле М. Гіля*). (765 слоў)

1. Чаму Пётр Ільіч Клімук усё ж вырашыў адказаць пяцікласніку Дзянісу? Якімі якасцямі, на думку аўтара пісьма, павінен валодаць той, хто марыць стаць касманаўтам?

2. Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Якія тыпы маўлення спалучаны ў тэксце? Абгрунтуйце сваю думку.

3. Вызначце, колькі падтэм мае пісьмо Пятра Ільіча Клімука. Выпішыце ключавыя словы ў кожнай падтэме.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць тэксту пісьма, яго арыентацыя на адрасата?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў і спалучэнняў слоў: ***фізічна развіты***, ***спецыяльна падрыхтаваны***, ***народнагаспадарчых***, ***паўслова***, ***штораз***. Абгрунтуйце правапіс канчаткаў назоўнікаў: (***разбірацца***) ***у фізіцы і матэматыцы***, ***механіцы і электроніцы***, (***хадзіць***) ***на лыжах***, (***ездзіць***) ***на веласіпедзе***, (***гуляць***) ***у валейбол і футбол***, (***скакаць***) ***у даўжыню і вышыню***, (***займацца***) ***гімнастыкай*** і інш.

6. Напішыце выбарачны пераказ на тэму «Якасці, якімі павінен валодаць той, хто марыць стаць касманаўтам». Ці ўвойдуць у выбарачны пераказ выказванні тыпу ***Пра што яшчэ абавязкова хочацца табе сказаць, дык гэта...***; ***Скажу яшчэ пра такія чалавечыя якасці...***; ***Адсюль і парада мая табе...***; ***Кажу табе пра гэта напаследак...*** і інш., якія непасрэдна указваюць на адрасанта (Пятра Клімука) і адрасата (школьніка Дзяніса)?

## Пераказ з дадатковым заданнем

### «Навучы мяне лятаць!»

Ад нашай школы да нашага дома — пяць дамоў. Але дадому мне не хацелася: трэба аддаваць запіску ад Марыі Сяргееўны. У шэсць гадзін будзе бацькоўскі сход. А яшчэ ў запісцы прыпісана знізу: «Паговорым і аб паводзінах вашага Жэні».



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

«Пагаворым аб паводзінах...» А што я такога зрабіў, каб гаварыць аб маіх паводзінах на бацькоўскім сходзе? Я нікому не замінаў пісаць, сядзеў ціха-ціха, як мыш пад венікам. Праўда, я не пісаў і не слухаў, што настаўніца казала. Я думаў тады, чым здзівіць вучняў на перапынку.

Бабуля спачатку ўзяла запіску, а потым узялася за сэрца.

— Ой, дык гэта ж пара ўжо ісці на сход!.. — забегала яна. — А Марына з садзіка не прыведзена, не накормлена!

— Бабуля! Я прывяду і пакармлю.

У пярэдняй Марына падвяла да сваёй шафачкі. Мы пачалі апранацца. Не было адной шкарпэткі. Я абшукаў усё, абмацаў рукавы і кішэні паліто, абмацаў чаравікі — няма!

На нагу без шкарпэткі чаравік лёгка абуўся. А другую нагу мо цэлую гадзіну абувалі.

Апранalі паліто — бант развязаўся. Не стаў завязваць, зусім адарваў. Схаваў у кішэню...

Ух!.. Нарэшце мы дома.

Распрануў, разуваю. Што такое? На правай назе дзве шкарпэткі?

— А я невінаватая, яны абедзве правыя.

Засталося толькі адно: пакарміць.

Каб не ганяцца з лыжкаю за ёю па кватэры, я пасадзіў Марыну на падаконнік. Будзем глядзець, з якімі парасонамі ходзяць, і карміцца.

— Сіні... Чырвоны... Чорны... — пералічвала Марына.

Лыжку з маннаю кашаю згледзела ўжо каля самага рота. Круць! На шчацэ намалявалася белая паласа, а вуха манка замуравала роўна з берагамі.

— Ой, вуха зварыцца! Што, я так і буду з вараным вухам жыць?

На шчаку і на вуха пайшлі дзве папяровыя сурвэткі. Ну, гэта дробязь. Усё... Парадак... Можна даваць другую лыжку.

Марына не каўтае, трымае кашу за шчакою. Падношу трэцюю лыжку...

— Што ты мяўкаеш, як кошка? Разяўляй рот.

— Я не клот... У мяне ляма хласта. І влухі — во, блачыш дзе? А ў катлоў зверлху...

Пакуль гаварыла, кашы ў роце крыху паменела.

Забылася пра лыжку Марына... Я — чацвёртую! Пад нос! Н-на! Укінуў ёй і пятую.

— Чхры!!! — чхнула Марына.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Каша заляпіла шыбу ў акне, падаконнік, Марыніны панчохі, чорны паліраваны стол і мне вочы.

Схапіўся за вочы, а конаўку з кашаю — на акно.

Здаецца, міма паставіў...

Разлепліваю абедзвюма рукамі левае вока. Мамачкі! Разлепліваю правае — і ад страху зноў заплюшчваю. Конаўка пад тэлевізарам, а на падлозе наляпана дуга з кашы.

Намацаў Марыну, здымаю на падлогу.

— Што ты мяне паставіў у кашу?

— Дык ты ж глядзі! Я не бачу куды... Вядзі ў ванны пакой, пойдзем мыцца.

Марына ўзяла мяне за руку.

— Холадна... Цёпла... Горача... Пячэцца!!!

Позна! Левая нага мая стала ў кашу, прыклеілася.

— Я ж кажу — пячэцца, а ты ступаеш!

— Дык што, падымацца і ляцець?

— Ой, навучы і мяне лятаць! — Марына пусціла маю руку. — Во так: мах, мах!

Я замахаў рукамі, нібы хацеў зрабіць Марыніна «мах, мах!», і абсунуўся на падлогу на штосьці мяккае і мокрае...

Цяпер ужо ўсё роўна. Мы былі з Марынаю з ног да галавы ў салодкай, смачнай, спажыўнай кашы.

— Слухай, паглядзі ў конаўку, — голас мой здрадліва задрыжаў. — Няма там больш кашы?

Марына пастукала конаўкаю па падлозе.

— Ёсць трохі...

Марына пачала выскрэбваць і з вялікаю ахвотаю карміць мяне з лыжачкі.

Карміла і прыгаворвала:

— Не спі за сталом! Не круці галавою, ты не конь!.. Не ляпай ротам — ты не свіння! Пастаўлю ў кут!

У гэты час пачуўся званок у дзверы.

Марына кінула мне на калені конаўку і неаблізаную лыжку, пабегла адчыняць.

— Мамачка! А я тут Жэньку пакарміла! А зараз павяду памыю!

Што было потым, калі мама разгледзела, якія мы і што робіцца ў кватэры, я расказваць не буду. Прыдумайце самі.

Што ні прыдумаеце — усё будзе праўда (*Паводле П. Місько*). (580 слоў)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

1. Што перадае загаловак тэксту: тэму ці асноўную думку? Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Запішыце ўласны варыянт загалоўка да тэксту, які адлюстроўваў бы асноўную думку.

2. Вызначце стыль тэксту і яго адметныя адзнакі на лексічным, марфалагічным і сінтаксічным узроўнях. Які тып маўлення ў тэксце з'яўляецца дамінуючым? Дакажыце гэта.

3. Колькі частак у тэксце? Дайце часткам загалоўкі. Як суадносяцца межы частак тэксту і абзацы? Растлумачце прычыны супадзення ці несупадзення гэтых меж.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання? Якая часціна мовы з'яўляецца дамінуючай і чаму? Выпішыце словы, выразы, якія выкарыстоўвае аўтар для характарыстыкі паводзін герояў, іх думак і ўчынкаў.

5. Растлумачце значэнне і ролю наступных слоў і словазлучэнняў: ***як мыш пад венікам***, ***з вараным вухам жыць***, ***клот***, ***ляма хласта***, ***влух***, ***катлоў***, ***зверлху***. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

6. Дапоўніце пераказ, адказаўшы на пытанне: «Што было потым?»

***

Ласкавае сонца з кожным днём падымалася ўсё вышэй і вышэй. Дні прыкметна павялічыліся. На рацэ з грукатам і стогнам прашумеў крыгаход. Праз два дні паводка заліла прырэчныя лугі і палеткі. У вадзе апынуліся дубы на лугах, а прыбярэжныя лазнякі зусім зніклі пад вадой. Стала цёпла, абапал палявых дарог зазелянелі жыты, зазелянелі неяк раптоўна і так ярка, што калі глядзець на іх, прыжмурыўшы вочы, то здавалася, гэта былі зусім і не жыты, а дзівосны зялёны дыван з аксаміту, раскінуты на полі нейкім вясёлым і добрым чараўнікам. Буйная зеляніна неўзабаве зашумела ўсюды: і на палях, і ў садах, і на беразе рэчкі. Вясна клікала слухаць птушыныя спевы, шум паўнаводнай ракі, шапаценне першай лістоты на бярозах, дыхаць водарам лугавых кветак.

Але вучням гімназіі Зарэчча было не да гэтага: усе рыхтаваліся да экзаменаў. Алік Жураўлёў, вядомы выдумшчык і штукар, прыйшоў сёння на заняткі з нейкім асабліва вясёлым і бесклапотным выглядам. З пагардлівай усмешачкай, зверху ўніз паглядаў ён на сяброў, якія не разлучаліся з кніжкай нават у час перапынкаў. Заклаўшы



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

за спіну рукі, Алік, нібы знарок жадаючы звярнуць на сябе ўвагу, пахаджваў па класе.

Не без падстаў падазраючы, што за гэтай дэманстрацыяй Аліка хаваецца нейкая новая выдумка, да яго падышоў устрывожаны Бронік, староста класа.

— Ну, брат, — прызнаўся Броніку, чаму ён такі вясёлы, Алік. — За пераводныя экзамены я цяпер не баюся ні вось настолечкі, — паказаў ён самы кончык мезенага пальца. — Ты тэорыю імавернасці ведаеш? — хітра ўсміхнуўся Алік.

— І пры чым яна тут?

— Сакрэт вынаходцы! — як заўсёды з таямнічым выглядам сказаў Алік і пераможна пстрыкнуў пальцамі каля самага Бронікавага носа.

Колькі Бронік ні прасіў расказаць, якое дачыненне да экзаменаў гэта тэорыя мае, Алік так нічога яму і не сказаў.

Мінуў тыдзень, другі. Напярэдадні экзаменаў Бронік сустрэў Аліка на вуліцы. Яго моцна здзівіла, што выгляд звычайна самаўпэўненага Аліка сёння быў нейкі збянтэжаны.

— Бронік, — першым загаварыў Алік, — скажы, ты ўсё вывучыў?

— Вядома, усё. А як жа інакш?

У Броніка раптам трывожна ёкнула сэрца.

— Я паўтарыў па кнізе ўсю праграму. А ты?

— Дзівак! — з паказной бадзёрасцю ўсміхнуўся Алік. — Магу табе нешта расказаць, сакрэт раскрыю. Памятаеш, я табе казаў пра тэорыю імавернасці? Па гэтай тэорыі выходзіць, што, каб добра адказаць на экзаменах, не абавязкова вучыць адказы на ўсе білеты. Дастаткова вывучыць праз адзін. Ну, разумееш, на першы, трэці, пяты і гэтак далей.

— І як жа будзе?

— А так і будзе. У цябе дзевяноста дзевяць шанцаў выцягнуць на экзаменах вядомы табе білет і толькі адзін-адзінюткі шанц, што выцягнеш невядомы. Дык ці ж варта браць пад увагу гэтую нікчэмную выпадковасць? І яшчэ: менш білетаў — лепш можна вывучыць...

Бронік раптам рэзка ўскінуў галаву:

— Скажы, Алік, а цераз пятае на дзясятае па гэтай тэорыі вучыць нельга?

— Цераз пятае на дзясятае?.. — заморгаў вачыма збянтэжаны Алік, адчуваючы, як уся яго выдумка рассыпаецца прахам.

— Падлічыў, называецца, тэарэтык! Не дзевяноста дзевяць шанцаў супраць аднаго, а пяцьдзясят на пяцьдзясят! Галава!.. А хут-



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

чэй за ўсё, калі ты так вучыў, то і зусім нічога не ведаеш, і шанцаў у цябе нуль супраць ста.

Безнадзейна махнуўшы рукою, Бронік рашуча пакрочыў па вуліцы. Алік жа, нібы акамянеўшы, так і застаўся стаяць.

У класе, напэўна, не хутка забудуць, як здаваў экзамен іх Алік Жураўлёў. Гэта было не вельмі вясёлае, але павучальнае відовішча... (*Паводле У. Краўчанкі*). (517 слоў)

1. Падбярыце і запішыце загаловак у адпаведнасці з тэмай тэксту.

2. Вызначце стыль, жанр і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Выпішыце з кожнай часткі апорныя словы і выразы. Складзіце з імі сказы. Дайце часткам загалоўкі. Складзіце план тэксту.

4. Якія моўныя сродкі выкарыстоўвае аўтар тэксту для дасягнення выразнасці апавядання?

5. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з рознымі відамі сувязі.

6. Пашырце тэкст апісаннем экзамену, які здаваў Алік Жураўлёў.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

## Кантрольная па фізіцы

Настаўніка фізікі ўсе пабойваюцца. Яшчэ б! Тут, у лагеры «Зубраня», сабраліся, лічы, адны выдатнікі. А ён ужо на другім уроку, калі і імя яго яшчэ добра не запомнілі, паставіў дзве тройкі і двойку.

...Сёння — кантрольная. Віктар Іванавіч кожнаму раздаў лісткі з задачамі, якія не паўтараюцца.

Алесь чытае. Задачка простая. Ён рашае яе на чарнавіку за пяць хвілін. Яшчэ задачка. Прыклад рашыў — вось і ўся кантрольная.

Схіліў галаву ўбок: Надзея, яго суседка, глядзела ў атрыманы ад настаўніка квіток з адчаем. Ні на чарнавіку, ні ў чыставіку не было запісана ні адной лічбы.

Алесь крадком зазірае ў заданне суседкі. «З лука выстралілі вертыкальна ўгору...» Ну і што, не вельмі складаная задачка.

Надзея коратка зіркае ў бок Алеся, але не на яго самога, а на чарнавікі, дзе ўжо запісана рашэнне ўсёй кантрольнай. Потым глядзіць на наручны гадзіннік, уздыхае, зноў схіляецца над чыстым лістком паперы.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

...Надзея — самая прыгожая ў іхнім атрадзе дзяўчынка. Валасы ў яе чорныя, яна заплятае іх у тугую доўгую касу. Уся жывая, рухавая. А яшчэ — усмешка. Надзея ўсміхаецца не столькі вуснамі, колькі вачмі.

Але гэта другім яна ўсміхаецца.

Алесем Надзея проста грэбуе. У першы ж дзень, калі класная пасадзіла разам Алеся і Надзею, дзяўчына не стала знаёміцца з ім, дэманстратыўна не заўважала, быццам яго і не было побач за партай.

І на другі дзень не заўважала, і праз тыдзень.

Ён адчуваў сябе не проста лішнім, яму здавалася, што ён страшэнна агідны, брудны. Гэта было непрыемна, нават балюча, а галоўнае — Алесь не разумеў, з якой прычыны ім так грэбуюць.

І чаму яна так з ім? З усімі ж добразычлівая, лагодная, вунь з колькімі сябруе. Ды і сам Алесь ужо знайшоў тут сяброў, не маўчун, не зануда. Што ён ёй зрабіў?

...Задачы Алесь перапісаў на чыставік. А Надзея сядзела, выводзіла кручкі на паперыне, адчайна закусіўшы вусны.

«Вось так, цяпер папрасі мяне дапамагчы, папрасі! — салодкая злосць лёгка тлуміла галаву Алеся. — Вось парашай цяпер задачкі, прывязі двойку ў школу, прыгажуня!»

Надзея зіркнула на гадзіннік. Заставалася пятнаццаць хвілін.

«Вось табе і двойка», — падумаў Алесь, але радасці чамусьці не было.

Яго кантрольная была перапісана на чыставік, двойчы праверана.

...Ну і што, што яна грэбуе ім, ну і што? Яна ж ад гэтага не робіцца непрыгожай. Атрымае двойку, і настрой прападзе да апошніх дзён. Наўрад ці захочацца калі ўсміхацца...

Яшчэ імгненне вагаўся Алесь, а потым хутка перасунуў квіток задання Надзеі да сябе, а ёй — свой чыставік і свае заданні.

— Перапісвай хутчэй!

— А ты? — Надзея ўпершыню глянула ў вочы Алесю.

Алесь не адказаў, пачаў хутка запісваць умову задачы адразу ў чыставік.

«З лука выстралілі вертыкальна ўгору...» Дробязь, а не задача! Так, што маем?

Два адказы.

Алесь нібыта спатыкнуўся. Што ж гэта атрымалася? Страла будзе на вышыні 20 метраў праз 2 і праз 11 секунд?!



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Як гэта зразумець? Няправільна рашыў?

Непрыемны халадок ад кончыкаў пальцаў пракраўся ў сярэдзіну грудзей, і мутная хваля адчаю і панікі адгароджвала Алеся ад усяго свету.

Надзея ўжо перапісала сабе ў чыставік кантрольную, зазірнула ў лісток Алеся.

— Два адказы?

— Два...

— Гэта значыць... страла вярнулася.

Надзея ўсміхнулася куточкамі вуснаў, паўтарыла:

— Страла ўзляцела і вярнулася. І праз адметку 20 метраў праляцела двойчы...

Алесь кіўнуў. Раптоўна стала незвычайна лёгка на душы.

Ну, вядома ж, страла вярнулася...

Усё вяртаецца да цябе: выпушчаная з лука страла, сказанае слова, зробленая справа... (*Паводле В. Гапеева*). (530 слоў)

### Сёмае акно

Напэўна, гэта дужа сумны занятак — прадаваць на пошце маркі? Як вы лічыце?

Відаць, вы ніколі не задумваліся над такім пытаннем. І я таксама. А вось пасля ўчарашняга дня думка аб гэтым не выходзіць з маёй галавы. Колькі ўжо гадзін сяджу я ў сваім пакойчыку на трэцім паверсе і ўсё думаю, думаю, думаю... А божачкі, якая ж гэта сумная, мусіць, справа — прадаваць маркі! І як толькі я адважылася на такое!..

Многа ўсялякіх парад давалі мне сяброўкі. Вера настойвала, каб я ішла сакратаркай у Міністэрства сельскай гаспадаркі, дзе яна сама працавала ў нейкім аддзеле. Тоня ледзь не разраўлася, даводзячы, што мне абавязкова трэба стаць кінаартысткай: у мяне, маўляў, незвычайны талент, і будзе вялікі грэх, калі я загублю яго ў самым зародку. А Надзя безапеляцыйным тонам гаварыла, што я павінна вучыцца далей і толькі ў політэхнічным інстытуце, бо проста не маю права здраджваць сямейнай традыцыі.

Не, я не паслухала іх. Я вырашыла, што сама выберу сабе занятак.

І выбрала!..

І вось я сяджу на ложку і думаю, думаю... Ужо раніца. Праз якую гадзіну трэба ісці на працу. На пошту. Прадаваць маркі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Зазваніў будзільнік. Гэта я ўчора звечара накруціла яго, каб не праспаць...

На дварэ ідзе дождж. Фортка ў пакой адчынена, і я чую, як кроплі з шумам падаюць на лістоту клёна, што расце пад самым маім акном. Чамусьці ўяўляецца, быццам клён курчыцца, уздыхае і вось-вось пачне скардзіцца мне на панылы, надакучлівы дождж.

Я бяру парасон і выходжу з дому. У наш завулак залятае гарэзлівы ветрык. Стары клён нездаволена калыша галлём, пакуль я не збочваю на вуліцу.

Прыгадалася, як аднойчы, калі я была яшчэ зусім маленькая, бабуля-нябожчыца мне неяк сказала:

— Ох, і язычок у цябе, Ганначка! І трашчыш, і трашчыш — ну чыста сарока. Тых, у каго язык доўгі, пасылаюць на пошту. Стаяць яны там, высунуўшы свае языкі, а людзі падыходзяць і мачаюць аб іх свае маркі.

Мілая мая бабуля, каб жа гэта ты ведала, куды я зараз іду!..

Вялікі старадаўні гадзіннік, што стаяў на падлозе і ўзвышаўся ледзь не да сярэдзіны сцяны, прабіў дзевяць разоў.

— Прабачце... — пачуўся разгублены голас. — Грошы ў старым касцюме засталіся... Ну, што ты скажаш — ні капейкі!

У акно разгублена, то бялеючы, то чырванеючы, глядзеў малады чалавек, з выгляду студэнт. На ім быў новенькі шарсцяны касцюм з ледзь прыкметнай блакітнай палоскай і шэры капялюш. І яшчэ мне запомніўся яго ярка-чырвоны гальштук, завязаны на вялікі вузел.

— Што ж цяпер?.. — збянтэжана прамовіў малады чалавек, круцячы ў руках канверт. — Прамок, разумееце, раніцой, забег пераапрануцца, і вось — на табе... Што ж рабіць? — разгублена зірнуў ён на мяне.

— А нічога! — сказала я. — Прынесяце́ пры выпадку, другім разам.

Малады чалавек неяк няўмела, адчуваючы няёмкасць, стаў дзякаваць, ён некалькі разоў паўтарыў, што вядома ж, абавязкова прынясе грошы, прынясе сёння ж. Я заўважыла, што калі ён выходзіў з залы, то павярнуўся і яшчэ раз паглядзеў на мяне...

Перад самым заканчэннем майго першага працоўнага дня прыйшоў начальнік аддзела кадраў Гур’янчык.

— Гэты... студэнт не прыходзіў?

— Не...



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

— Чакайце, прыйдзе, а як жа! — у голасе Гур'янчыка гучала іронія.

Ён патаптаўся крыху на месцы, адышоў, потым зноў падышоў да майго стала.

— Вы вось што... Пакладзіце ў касу...

Кінуўшы мне на стол дзве манеты, Гур'янчык кароткімі сваімі крокамі выбег за дзверы. Не паспелі дзверы зачыніцца за ім, як я пачула ў акенцы знаёмы голас:

— Ледзь не спазніўся! Вось... Дзякую вам...

На мой стол побач з манетамі Гур'янчыка ляглі яшчэ дзве...

Вось і скончыўся мой першы дзень. Заўтра я зноў буду прадаваць маркі. Каму ж прыйдзецца заўтра ўручаць іх?..

Я ведаю каму. Прыходзьце, маё акно — сёмае (*Паводле Я. Васілёнка*). (570 слоў)

### Бульба

Уранні прыйшлі нашы: спачатку прагрукаталі, ляскаючы жалезам, танкі, пасля, можа, праз паўгадзіны, з-за пагорка паказалася пяхота. Калоны пехацінцаў павольна спускаліся ў нізіну, што перад вёскай, і адтуль, расцякаючыся, як ручаіны вясной, па лясных і палявых дарогах накіроўваліся далей, да Бесядзі. У вёсцы тым часам дагаралі хаты.

Ля вясковых могілак ужо бегалі артылерысты. Там спынілася гаўбічная[1] батарэя, і артылерыйскія разлікі ўстанаўлівалі гарматы, рылі акопы. За лесам, мусіць, ля самай Бесядзі, за якой акапаліся немцы — там цяпер была перадавая, — неўзабаве пачуліся густыя вінтовачныя стрэлы; часам адтуль даносіліся і кулямётныя чэргі.

Гулі маторы. І гэты гул іхні то нарастаў, нібы станавіўся сцяною, то заціхаў.

Па небе плылі нізкія хмары. Але дажджу не было. І ўжо каторы дзень. Відаць, хмары былі бясплодныя.

На папялішчы патроху сыходзіліся людзі. Ніхто не плакаў.

Не смяяліся і салдаты. Яны ішлі да Бесядзі маўклівыя.

У сорак трэцім мы былі яшчэ зусім малыя, але запомнілі гэтых салдат... У вёску тады першыя прыбеглі з лесу і ўжо цэлага паўдня сядзелі ў сасняку ля школы, запаліўшы вогнішча, і, як зачараваныя,

[1] Га́ўбічны, -ая, -ае. Які мае адносіны да гаўбіцы, гарматы, якая страляе навесным агнём.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

моўчкі ўглядаліся ў іх загарэлыя, стомленыя твары. Мы былі дзеці, і ў кожнага з нас на вайне быў бацька. Дык і думалася — а можа, якраз тупае бацька вось так у страі...

Вогнішча наша дыміла, сіпелі дровы, часам да вогнішча падбягалі салдаты. Яны гладзілі нас па галовах і, не распытваючы ні аб чым, спяшаліся даганяць сваіх. А гэтых «сваіх» было многа-многа!.. Нават здавалася, што якой-небудзь калоне канца-краю не будзе. Але праходзіў час, дарога раптам пусцела. Ды ненадоўга. Хутка зноў чуўся тупат. І зноў пад вокнамі школы пачынала калыхацца маўклівая шэра-зялёная салдацкая калона. А пад самы вечар, калі пачалі ўжо грамыхаць гаўбіцы, у сасняку, дзе гарэла вогнішча, спыніліся артылерысты. Іх было чалавек дваццаць, з адной-адзінай маленькай гарматкай, якую цягнулі коні. Коней артылерысты не распрагалі: павесілі ім на галовы брызентавыя вёдры, і коні лянiва хрумсталі авёс.

Артылерысты былі вясёлыя людзі. Яны тут жа сышліся да нашага вогнішча, пачалі жартаваць. Падышлі і афіцэры.

— Ведаеце, — загаварыў раптам старшы лейтэнант, які амаль увесь час маўчаў, — усё хацеў я бульбы печанай наесціся. Думаў, прыйдзем на беларускую зямлю, накапаю дзе-небудзь бульбы і напяку на такім вогнішчы. Ажно не. Усё не збяруся. Ужо другі дзень на гэтай зямлі, а бульбы не паспытаў.

Аднойчы як накармілі мяне печанай бульбай, дык і дагэтуль смаку той бульбы не забыў. Недзе пад Гомелем (у сорак першым) астаткі нашага палка — усяго некалькі чалавек — выходзілі з акружэння. Ішлі мы ўсю дарогу галодныя, пакуль не натрапілі на такіх вось хлапчукоў. Пасвілі яны цялят за вёскай і бульбу пяклі. Дык мы і навалiліся на іхнюю бульбу, ажно, небаракі, пячы не паспявалі. І вось з таго часу жыву надзеяй пакаштаваць калі-небудзь яшчэ печанай бульбы. Кажуць, беларуская нейкая асаблівая. Не ведаю, цяжка меркаваць мне, чалавеку, які нарадзіўся і жыў у пшанічным стэпе. Але, можа, і сапраўды смачней за яе нідзе не бывае.

Ён колькі часу маўчаў яшчэ, нібы раздумваў, як лепш зрабіць: ці зараз заняцца бульбай, ці адкласці на заўтра.

— Сёння позна ўжо. Я заўтра прыйду. Як, хлопцы, будзе бульба?

Па зямлі плыў добры вечар, калі нарэшце была з'едзена салдацкая каша. Мінула яшчэ гадзіна — і апусцеў сасняк, што каля школы. Артылерысты пастроіліся на дарозе і рушылі, ціха перагаворваючыся, услед за сваёй адзінай саракапяткай.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Уначы пачаўся на Бесядзі бой. Ля могілак грамыхалі, калоцячы зямлю, гарматы. Пад вокнамі школы, не заціхаючы, гулі машыны.

Пакуль ішлі баі, мы не адыходзілі ад вогнішча, якое ўсё палілі на адным і тым жа месцы. Па-ранейшаму паўз школу рухаліся к Бесядзі войскі. А адтуль, пачынаючы з самае раніцы, везлі на машынах раненых. Мы цярпліва сядзелі каля вогнішча і чакалі старшага лейтэнанта. У нас была напагатове для яго печаная бульба. Але старшы лейтэнант не прыйшоў... (*Паводле І. Чыгрынава*). (596 слоў)

**Прыліпала**

У пушчу я прыехаў ранішнім аўтобусам і ледзьве ступіў на двор мясцовага егера дзядзькі Юзіка, як з бульбоўніку выскачыў шустры ваяка. Ён наставіў на мяне свой аўтамат, але я адразу ўгледзеў, што ствол са сланечніку. Захапіўшы блазнюка[1] ў палон, тут жа ўчыніў яму першы допыт:

— Як зваць, прызнавайся!

— Сярожкам...

Мы шыбуем напрасткі: спачатку зялёным звілістым берагам, затым — логам і хмельнымі гародамі. Сярожка басанож шлапаціць па астылай зямлі побач са мною і сакоча безупынку.

— Ты, відаць, любіш пушчу? — пытаюся я, і ён нечакана абдымае мяне танклявай, але моцнай рукою, нібы кацяня, трэцца шчакою аб мой пінжак. І ад гэтай раптоўнай даверлівасці маленькага чалавечага сэрца робіцца неяк не па сабе.

— Я б усе дні сядзеў у лесе. Ці ля вальераў, дзе алені жывуць і зубры.

У сенцах мы выціраем ногі, а ўвайшоўшы ў хату, бачым, што ўся сям'я ў поўным зборы чакае нас на вячэру.

Неўзабаве на стале з'яўляецца вялікая эмаліраваная міска з белай гарачай бульбай. Старэйшы з хлопцаў, Жэня, нясе на стол гарлач з малаком, а сярэдні, Валодзя, старанна наразае мяккі хлеб. Сярожка бяжыць у суседні пакой і валачэ адтуль новае крэсла. Ён усаджвае мяне, а сам мосціцца побач, на ложку. Усе, хто тут, за сталом, не зводзяць вачэй са свайго чубатага чыжыка.

— Ну і прывязлівы ты, сынок, — падае голас маці. — Чалавек не паспеў агледзецца, а ты прыліп, як смала да рук.

---

[1] Блазню́к, -а, *м. Разм.* Пра непаўналетняга чалавека, хлопчыка, які дурэе, жартуе, весяліць іншых.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

І тут жа Валодзя:

— Нездарма ў школе прылiпалам завуць...

На дварэ змерклася, ад сонца не засталося і следу. З раніцы мы дамаўляліся з дзядзькам Юзікам на ўсю ноч ісці ў пушчу слухаць аленяў, але ўсе нашы планы рухнулі: ляснічы прыслаў дзядзьку загад сабрацца ў начное дзяжурства.

Праз нейкі час у веснікі бухнуўся Сярожка. Радаснае хваляванне рвалася з яго: бацька дазволіў ісці са мной.

Бралася ціхая ноч. І цёплая, быццам сагрэлася ў нашых кажухах. Паміж дрэў зыбаецца месяц, белы і круглы. Як не пад самым носам хрупнуў сушняк. Мы спыніліся і ўбачылі, як з лесу выйшаў рагач. Ён пастаяў, павёў галавой у наш бок, пагрозліва варухнуў магутнымі рагамі, сцішана, быццам чалавек, захроп, ударыў заднімі нагамі ў зямлю і кінуўся ў лес.

Яшчэ гадзіну назад мы меркавалі нанач вярнуцца дахаты, наесціся перад сном малака з хлебам, спаць на сухой атаве, а цяпер пра гэта я ўжо не думаў і спытаў:

— А калі мы тут заначуем?

Копы стаялі пасярэдзіне лугу. Мы выбралі бліжэйшую да лесу. У ботах і кажухах пазашываліся ў сена, якое там, усярэдзіне, абдало сухасцю і цеплынёю.

Я прачнуўся пад раніцу. Адкрыўшы вочы, разгледзеў над сабою месяц. Нешта кратаецца блізка, і я ўжо чую ціхі Сярожкаў голас:

— У мяне два яблыкі ёсць.

Расплюшчыўшы вочы, прыўзнімаю галаву і бачу, як са свежай, нібы раніца, усмешкай на мяне зіркае Сярожа. І мне зноў становіцца лёгка і супакойна.

Спакваля туман асядаў, з лясных берагоў спадала яго белая начная коўдра. Па белай малочнай рацэ плылі рогі аленя. На самым узлессі я заўважыў сілуэт яшчэ аднаго аленя. Неўзаметкі яны абодва нырнулі ў туман і замоўклі, а праз кароткі час адтуль данёсся сухі, нібы дрэва аб дрэва, удар, яшчэ ўдар... яшчэ... Там біліся рагачы.

Пакінуўшы ўгрэтыя сянныя пячоры, мы вярталіся дахаты. Сярожка зноў сакатаў, быццам не было ў яго трывожнай ночы і беганіны па лесе. Цікавасць да ягоных расказаў не гасла і цяпер.

Прылiпала... Гэтае Валодзева слоўца нечакана ўспыхнула ў маёй памяці зусім іншым святлом, як учора за вячэраю. Можа, тым, што праменяць ракавіны малюскаў, якія недзе на далёкіх марскіх шыротах вось гэтак жа даверліва ліпнуць да чужых караблёў, а потым,



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ужо ля берага, сарваныя з карабельнай абшыўкі чарнаногімі, як Сяргей, хлапчукамі, грэюцца на чалавечых далонях, радуюць чалавечыя душы гулам далёкіх мораў.

Як гэтая ноч з Сярожкам, узбуджанымі аленямі, капою цёплага сена, вялікасна-белым месяцам над галавой... (*Паводле В. Карамазава*). (600 слоў)

### Мянтуз

Вольнымі днямі, калі Міколкаў бацька адпачываў і не ездзіў на паравозе, Міколка з бацькам ішлі на рэчку, якая працякала недалёка ад станцыі. Тут лавіліся добрыя акунькі, траплялі шчупакі на шнур, часам пападаўся дробны сом. А больш за ўсё лавіліся плоткі. Цэлымі стайкамі хадзілі яны пад лазовымі кустамі, паблісківаючы на сонцы срэбнай луской. Толькі знай закідвай вудачку.

Неяк у вольны дзень пайшлі рыбу лавіць на раку. Хоць дзед і не меў асаблівай прыхільнасці да гэтага занятку, але паколькі ён быў вольны і хацелася яму крыху прайсціся, дык і далучыўся да рыбаловаў. Тыя ў вадзе плёскаюцца, а дзед на беразе сядзіць ды парады дае.

Спачатку Міколка з бацькам цялёпкаліся з таптухай[1], а потым узяліся рукамі плотак лавіць паміж карчоў. І намацаў тут бацька няйначай як ментуза. Вядома, мянтуз слізкі, цяжка яго рукамі ўзяць. Бацька Міколку на дапамогу клікнуў. Ловяць рукамі, між карчоў шаруюць.

Але як ты яго ні бяры, выслізгваецца, ды годзе. Выслізгваецца ад Міколкі, падаецца пад карчом да бацькі. Ад таго зноў назад.

Бацька яшчэ спрытней бярэцца за ментуза. Але нічога не выходзіць. А дзеда тут ужо і нясцерп бярэ, дужа ж тым ментузом зацікавіўся. Трэба сказаць, што дзед падабаў рыбу, ды яшчэ такую, як смажаны мянтуз.

І вось аж усхадзіўся на беразе дзед, забегаў. І піпка ў яго даўно патухла, знае толькі — рукамі махае ды нашых рыбаловаў ушчувае:

— Яшчэ рыбаловы! Ім рыбу! Вам толькі прусоў ганяць!

— Сам злаві, — усердаваў тут не на жарты бацька.

— І злаўлю!

І дзед самым рашучым чынам скінуў адзежу і, павесіўшы яе на плечы — баяўся пакідаць на беразе, каб не скралі пастушкі, — смела рушыў у ваду.

---

[1] Таптýха, -і, *ДМ* -тусе, *ж. Разм.* Адзін з відаў рыбалоўнай сеткі.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Аж Міколка падзівіўся з дзеда, з яго незвычайнай спрытнасці — дзед так захадзіўся каля карча, аж вада кіпела наўкола. І вось урэшце дзед урачыста крыкнуў:

— Ага! Папаўся-такі, не мінуў маіх рук! А вы — няўмекі!

Міколку з бацькам засталося толькі пераглянуцца між сабой. Ну і дзед, не чакалі такога спрыту! Магчыма, што дзеду з яго кастлявымі пальцамі было зручней упраўляцца з ментузом, таму хутчэй і падчапіў яго. Дзед цягнуў ментуза надзвычай марудна. Мо проста з-за асцярожнасці, каб не ўпусціць часам рыбіну, а мо знарок хацеў надалей расцягнуць такую ўрачыстую хвіліну.

Вось пад вадой паказалася ўжо нешта жывое. Міколка хацеў ужо крыкнуць, што няйначай гэты мянтуз будзе фунтаў з пятнаццаць, бо такі ж вялікі. Але тут падзеі прынялі зусім нечаканы зварот. Толькі гэта дзед, урачыста гледзячы на Міколку, вывалак свайго ментуза з вады, як глянулі на яго Міколкаў бацька ды і сам Міколка і, як бачыш, сiганулі на бераг. Толькі пырскі паляцелі па вадзе. Аж збялеў Міколка, засопся. Выскачыў на бераг, азірнуўся. Стаіць дзед і на іх глядзіць, дзівуецца, не разумеючы, чаго яны драпака далі.

Зірнуў тады дзед на свайго ментуза — і ледзь не самлеў. Аж прысеў у вадзе, умачыўшы сарочку. А тады як кіне ментуза падалей у рэчку ды як дасць драпака на бераг, аж адзенне згубіў, спатыкнуўшыся аб корч. Паплыло яно ўрачыста па рацэ. Ледзь злавіў яго потым Міколка, ад'ехаўшы на чоўне ад берага.

І калі аддыхаліся потым усе ад перапуду, дзед пачаў грозны наступ на Міколку і на яго бацьку:

— І якое ліха панесла вас вужаку лавіць?

Змоўчаў дзед на якую хвіліну. Гэтакі ж канфуз выйшаў — усё ішло так добра і гладка, і на табе, замест ментуза гада злавілі. А яшчэ парады даваў, а яшчэ выхваляўся. Пасля гэтага здарэння дзед канчаткова рашыў ніколі болей у ваду не лазіць. І калі траплялася часам Міколку з бацькам лавіць якую рыбіну ў рацэ, дзед асцерагаўся нават падыходзіць блізка да іх, калі яны выцягвалі на бераг таптуху альбо брэдзень[1].

Прызнацца, і Міколка з бацькам не адважваліся болей мацаць ментузоў і, да вялікай радасці дзеда, баяліся лазіць і па ракавых пячорах (*Паводле М. Лынькова*). (596 слоў)

---

[1] Брэ́дзень, -дня, *м.* Рыбалоўная сетка для лоўлі рыбы на мелкаводных месцах.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## Аркестр

Іграў аркестр. Не аркестр, а хутчэй сямейны ансамбль ці як яго яшчэ лепш назваць. Музыканты былі з Баранавіч, усе з адной яўрэйскай сям'і: дзве сястры, брат і муж адной з сясцёр. Чатыры музыканты на чатыры інструменты: скрыпку, акардэон, віяланчэль і бубен. Але як яны ігралі! Гэта трэба было чуць і бачыць. Больш за ўсіх кідалася ў вочы скрыпа́чка, апранутая ў чорную дарагую сукенку, чорненькая, невысокая і зграбная, з вялікімі цёмнымі вачыма на белым твары і чорнымі пышнымі валасамі. Другая, маладзейшая, была бландзінка, але вельмі падобная на старэйшую сястру — такі ж тып інтэлігенткі, толькі з прымессю нетутэйшай крыві. У яе таксама былі вялікія вочы і яркая белазубая ўсмешка, як і ў старэйшай сястры. Яна туліла да сваіх высокіх грудзей бліскучы ад перламутру вялікі акардэон. Мужчыны былі зусім розныя. Малодшы, брат жанчын, барабаншчык, быў яшчэ зусім юнак, невысокі і шчуплы, а той, што іграў на віяланчэлі, ці на басэтлі, як мы тады думалі, быў высокі і здаравенны мужчына з тыпова яўрэйскім гарбатым носам і капою густых рыжых валасоў, такіх густых і віхрастых, што, здавалася, як толькі і брала іх расчоска. Сваю віяланчэль ён мог бы трымаць так жа лёгка, як яго жонка скрыпку.

Іграючы, мужчыны сядзелі, а жанчыны стаялі. Саліравала чарнявая скрыпа́чка. Яна стаяла крыху наперадзе ўсіх і іграла. Іграла не толькі скрыпка ў яе руках. Яна ўся іграла сама — ад спрытных ног у элегантных чорных лакірках да кончыкаў валасоў над белым мармуровым ілбом, на якім не было ні адной маршчынкі.

Мазуркі[1], абэркі[2], паланэзы[3], танга, вальсы... Танцы ў розным тэмпе, з розным настроем, у кожнага была свая душа, свой гукавы воблік. І скрыпа́чка ўвесь час мянялася: іншы выраз твару быў у яе, іншая ўсмешка, іншая пастава; па-другому хадзіла правая рука, у якой свабодна і плаўна, як дасканалая дырыжорская палачка, лётаў тонкі рухавы смычок. Ён далікатна, але ўпэўнена дакранаўся да струн, і яны давалі жыццё тысячам чароўных гукаў, якія напаўнялі

---

[1] Мазу́рка, -і, *ДМ* -рцы; *Р мн.* -ак; *ж.* Польскі нацыянальны танец з трохдольным тактам, а таксама музыка да гэтага танца.

[2] Абэ́рак, -рка, *м.* Польскі народны танец, які выконваецца ў хуткім тэмпе.

[3] Паланэ́з, -а, *м.* Урачысты бальны танец, які вядзе пачатак ад польскага народнага танца; музыка гэтага танца.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

ўсё наваколле, западалі ў душу. О, гэтая скрыпка! Што яна рабіла з людзьмі!

А мо вінавата была не так скрыпка, як тая скрыпачка, што трымала яе ў сваіх віртуозных руках? Я ўпэўнены, што ў іншых руках тая скрыпка не мела б такой магічнай сілы. Яна жыла, дыхала, але жыццё гэтае перадавалася ёй ад чароўнай невялічкай жанчыны-артысткі, што, крыху нахіліўшы галаву і стоячы перад астатнімі музыкантамі, злёгку прытупвала правай нагою, нібы адбіваючы рытм. Смычок, як прыліпшы да струн, то лётаў, то плаўна перабягаў справа налева, то вяртаўся зноў. Першая струна вяла тоненька, аж ныла, як посвіст ветру праз саломінку, а калі смычок забіраў улева, пачынаў гусці бас — ён гуў, нібы вялізны чмель, і нават густыя пявучыя гукі віяланчэлі не маглі яго заглушыць. А ў гэты самы час пальцы левай рукі скрыпа́чкі, тонкія, далікатныя жаночыя пальцы, песцілі грыф, перабягалі па струнах, нібы гладзілі іх, пераскоквалі то ўверх, то ўніз, надаючы гуку характэрнае дрыжанне. Здавалася, скрыпка ўздыхала ледзь прыхаваным чалавечым болем (*Паводле У. Дамашэвіча*). (466 слоў)

**Тваё слова**

Вясновае сонца прыемна слепіць вочы. Ада ідзе са школы. Партфель у руцэ — нібы плыве ў паветры. Лёгка аблягае плечы адпрасаванае паліто. «Чок-чок-чок», — выбіваюць абцасы па тратуары. Ада ветліва ўсміхаецца прахожым, нібы хоча ім сказаць: «Любуйцеся, якая я прыгожая дзяўчынка. Амаль дарослая...»

...Раней Адзе не хацелася быць дзяўчынкай. Яна сябравала з хлопчыкамі, пераймала іх манеры: хадзіла шырокім крокам, горбілася, хавала рукі ў кішэні. Навучылася свістаць.

Дарослыя часта рабілі ёй заўвагі, пасмейваліся, называлі яе «атаманам». Ада не крыўдзілася за мянушку, наадварот, рабіла ўсё, каб апраўдаць яе. Раней за ўсіх аднагодкаў стала на канькі, злятала на лыжах з такіх горак, з якіх не кожны адважваўся з'ехаць. Нават звалі яе хлапечым імем — Адам.

У класе толькі адзін Коля Буры не прызнаваў яе верхаводства, загадкава ўсміхаўся і рабіў па-свойму.

Так было раней. Цяпер жа Ада хоча пазбавіцца ад усіх ранейшых прывычак. Яна ўжо амаль дарослая, і трэба, як кажа стрыечная сястра Ліза, падумаць пра свой выгляд.

Ада хоча быць прыгожай, дарослай дзяўчынай. Вырашыла ў першую чаргу змяніць сваю паходку. Ідучы ў школу, вядома, няма калі



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

думаць пра роўны крок — хаця б не спазніцца. А са школы ніхто не гоніць, можна ісці спакойна. Баялася толькі, каб хто з аднакласнікаў не заўважыў, як яна вучыцца хадзіць па-даросламу, а то яшчэ смяяцца будуць.

Як на зло, першым заўважыў Коля Буры. Перагнаў яе, азірнуўся і стаў як слуп.

— Ого, як важна ідзеш! — крутнуў ён галавою.

— А табе што?! — агрызнулася Ада.

— Нічога, — сумеўся Коля і пабег у свой двор.

Ада бачыла, што ён не пайшоў у пад'езд, а доўга стаяў ля веснічак і праводзіў яе позіркам. «Раскажа заўтра ў класе, будзе смяяцца», — падумала Ада.

Але Коля нікому не расказаў. І не смяяўся. Ада была ўдзячна яму за гэта, хоць і пабойвалася: можа, ён проста чакае зручнага моманту.

Дні праз два Ада ўбачыла, што пасля ўрокаў Коля не пайшоў дамоў, а падаўся на будоўлю. Яна ведала, што там хлопцы лазяць па недабудаваных дамах, падбіраюць розныя жалязякі, правадкі. І настаўнікі і бацькі за гэта сварацца.

Каля магазіна сустрэлася Колева маці. І Адзе раптам захацелася выручыць Колю. Яна сказала:

— Цётка Дзіна, а ваш Коля застаўся насценгазету выпускаць.

— Добра, дзякуй, — цётка Дзіна пяшчотна паглядзела на Аду.

Назаўтра Коля ёй удзячна ўсміхнуўся. Значыць, маці расказала яму.

Так паміж імі ўстанавілася маўклівая згода. Пры сустрэчы з Колевымі бацькамі Ада лічыла сваім абавязкам прыдумаць нейкую прычыну затрымкі іхняга сына. У тым, што ён затрымаецца, Ада не сумнявалася, бо каму хочацца ў прыгожы сонечны дзень ісці дамоў?!

«Чок-чок-чок», — прыгожа выбіваюць на тратуары выглянцаваныя, праўда, яшчэ не на шпільках, туфлі. Ада задаволена ўсміхаецца прахожым. Яна ўжо амаль дарослая, пазбавілася хлапчуковых манер.

З пад'езда выйшла цётка Дзіна, здзіўлена пазірае, нібы не верыць, што гэта — Ада, былы «атаман» двара.

— Цётка Дзіна, а ваш Коля на рэпетыцыі, — усміхаецца ёй Ада.

Твар цёткі Дзіны хмурнее. Ціха, з нейкім жалем у голасе яна кажа:

— Ты ўжо, Ада, амаль дарослая. Твае словы...

Цётка Дзіна не дагаворвае, паказвае рукой угору. Ада глядзіць туды і раптам бачыць... Колю, які прымацоўвае на ліпе шпакоўню.



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

Дзяўчынка маўчыць. Галава яе міжволі апускаецца, чырвань разліваецца па шчоках.

— Ну, ідзі дамоў, — уступае ёй дарогу цётка Дзіна. — Тваёй жа маці ніхто не сказаў, што ты на рэпетыцыі...

Ада ідзе. Толькі крок яе ўжо не такі роўны, туфлі не выбіваюць сваё «чок-чок», а сумна шоргаюць па асфальце. І спіна горбіцца, як тады, калі яна не хацела быць дзяўчынкай (*Паводле Х. Жычкі*). (544 словы)

**Сустрэча ў аўтобусе**

Мы, людзі, часцей за ўсё бачым спачатку толькі сябе і толькі сваё. Вядома, баліць больш за ўсё свая бяда. Калі нам весела, радасна, хораша, тады здаецца, што і ўсім гэтак жа весела і хораша. Тады мы забываем, што ў гэты час камусьці можа быць дужа кепска. А ўжо калі прыцісне бяда нас саміх, калі зваліцца на нас несуцешнае гора, мы ходзім тады ўчарнелыя і не можам нават уявіць, што ёсць на зямлі зараз людзі, якім хораша і весела, і кожную ўсмешку ці, горш таго, бесклапотны, здаровы рогат зацята ўспрымаем як асабістую крыўду: маўляў, хіба ў гэты цяжкі час нехта можа яшчэ смяяцца?

Алег успомніў, як аднойчы — летась ці пазалетась? — ён з сябрамі вяртаўся з лесу. Быў май, была цёплая сонечная вясна, і яны рашылі ў суботу выехаць на прыроду. На паляне расклалі агонь, смажылі шашлыкі, сала на ражончыках, смяяліся, спявалі, дзяцініліся, босыя бегалі навыперадкі.

У лесе было хораша. Чыстае паветра, ад якога аж кружылася галава, пах маладой травы, якая зазеляніла ўсю паляну, дзе яны ўладкаваліся, ледзь улоўны водар новых, зялёных галінак, угрэтая сонцам зямля, яе дух, які біў у нос сваёй першароднасцю, вясёлыя сябры, адчуванне бязмежнай волі і бесклапотнасці — усё гэта зрабіла іх самымі шчаслівымі людзьмі на зямлі. Гэты ж настрой унеслі яны з сабою і ў апошні, ужо амаль парожні — у ім сядзела толькі адна дзяўчына, — аўтобус, якім увечары вярталіся дадому. Яны, як і ў лесе, спявалі, галёкалі, да ікаўкі смяяліся з трапных жартаў. І толькі дзяўчына моўчкі глядзела ў акно — нібы не заўважала іх. Яны падсмейваліся з яе, настырныя жартаўнікі назначалі ёй нават спатканне, гаварылі ўсялякае глупства, а дзяўчына быццам і не чула іх: глядзела ў акно і маўчала. Калі ж хлопцы яшчэ больш пачалі назаляць ёй сваімі заляцаннямі, яна расплакалася і праз слёзы расказала Алегу, які сядзеў побач з ёю — але так, каб чулі і іншыя, — што яна



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

едзе з Бараўлян, з анкалагічнага дыспансера, куды ёй трэба класціся на аперацыю.

Гэта ўразіла Алега, ён нібы адчуў халодны дотык нечага страшнага, няўмольнага, як лёс, і яму стала брыдка за іхняе куражанне, за легкадумныя словы і заляцанні. Прыціхлі і хлопцы: яны зразумелі, што дзяўчына была ўжо ў нейкім іншым вымярэнні, што яна глядзела на іхняе балаўства менавіта з таго пункта гледжання, які з'яўляецца толькі ў час зразуметай небяспекі.

Зараз яны няўмела спрабавалі суцяшаць дзяўчыну — ды кіньце вы, усё абыдзецца, усё будзе добра, — але адчувалі, што іхнія словы перасядаюць у роце, нібы ў бязважкасці, павісаюць у паветры і не даходзяць не толькі да хворай, але і да іх саміх.

І вось тады Алег адчуў — нібыта сам увачавідкі ўсё гэта ўбачыў, — што шчасце і гора, радасць і бяда заўсёды ўжываюцца побач. Яму нават падумалася, што яны, нібы дружныя, хоць і нялюбыя адна адной сёстры, ходзяць па жыцці разам, пабраўшыся за рукі, і ўсё залежыць ад таго, хто з іх першай зверне на чалавека ўвагу.

Успомніўшы той вясновы выпадак, ён падумаў, што зараз стаў больш відушчы (*Паводле Я. Сіпакова*). (474 словы)



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

# Змест

Прадмова ........ 3

## ДЫКТАНТЫ

### 10 клас

Роля роднай мовы ў жыцці чалавека і грамадства ........ 8
Маўленне ........ 9
Слова ў тэксце ........ 19
Словазлучэнне і сказ у тэксце ........ 36

### 11 клас

Культура вуснага і пісьмовага маўлення ........ 53
Навучальныя дыктанты ........ 53
Правільнасць маўлення ........ 53
Арфаэпічныя нормы. Акцэнталагічныя нормы. Лагічны націск ........ 53
Арфаграфічныя нормы ........ 56
Марфалагічныя нормы ........ 78
Сінтаксічныя нормы ........ 100
Пунктуацыйныя нормы ........ 105
Кантрольныя дыктанты ........ 117
Арфаграфічныя нормы ........ 117
Пунктуацыйныя нормы ........ 120
Дакладнасць і лагічнасць маўлення. Чысціня маўлення. Багацце і выразнасць маўлення. Дарэчнасць маўлення ........ 122

## ПЕРАКАЗЫ

### 10 клас

Навучальныя пераказы ........ 126
Падрабязны пераказ ........ 126
Сціслы пераказ ........ 139
Выбарачны пераказ ........ 145
Пераказ з дадатковым заданнем ........ 151
Кантрольныя пераказы ........ 156



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»

## 11 клас

Навучальныя пераказы ... 169
Падрабязны пераказ ... 169
Сціслы пераказ ... 191
Выбарачны пераказ ... 195
Пераказ з дадатковым заданнем ... 200
Кантрольныя пераказы ... 205



© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
© ТДА «Аверсэв»